Уладзімір Някляеў

Аўтамат з газіроўкай з сіропам і без

Менскі раман

“Брадвэй”

Першы тралейбус пах свежавымытым жалезам і ранішнім халадком.

У ранішнім халадку плаваў водар пралесак, бо пачыналася вясна.

Пралескі, трохі падвялыя, ляжалі на заднім, запырсканым вадой сядзенні. Кандуктарка глядзела на іх і ўсміхалася.

У тралейбусе радавалася радыё, што раніца. “У сталіцы савецкай Беларусі сем гадзін, – сказала яно святочным голасам, і кандуктарка зірнула на гадзіннік. – Добрай раніцы, таварышы! Перадаем навіны. Учора Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў даслаў ліст вучням нью-ёркскай школы”.

У дынаміку пстрыкнула – і дыктар змоўк.

– Добрай раніцы, таварышы! – падрабляючыся пад радыё, голасам дыктара павітаўся кіроўца тралейбуса. – У сталіцы савецкай Беларусі сем гадзін. Наш тралейбус адпраўляецца па маршруце вакзал – абсерваторыя.

“Пстрык” – вярнуўся дыктар.

“Дарагія амерыканскія школьнікі! – напісана ў лісце. – Вы паведамляеце, што ў вашай школе вучыцца каля дзвюх тысяч чалавек, хлопчыкаў і дзяўчынак розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў. Спадзяюся, што гэта не замінае вам разам дружна вучыцца, весела гуляць і спяваць звонкія песні. Хачу паведаміць вам, што ў нашай краіне радасна і шчасліва жывуць і разам працуюць людзі многіх нацыянальнасцяў. Іх аб’ядноўвае агульнае імкненне жыць у міры і сяброўстве з усімі народамі зямлі”.

Пстрык…

– Мы за мір! – весела сказаў кіроўца. – Наступны прыпынак – плошча Леніна.

Хліпнуўшы, зачыніліся дзверы – і ў левым акне тралейбуса зрушыўся чыгуначны вакзал.

Бывай, татарка Нэла!

“Жадаю вам, як і ўсяму маладому пакаленню Амерыкі, дазнацца пра тое, што такое вайна, толькі з падручнікаў гісторыі і ніколі яе не бачыць. Жадаю вам шчасця і многа, многа дабра! Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, 17 сакавіка 1960 года”.

Во супадзенне!.. Учора, калі Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў пісаў ліст

амерыканскім школьнікам, я пазнаёміўся з амерыканцам!

– Набывайце квіткі ў кандуктаркі Віялеты Казіміраўны! – весяліўся кіроўца тралейбуса. – Сёння танна, сорак капеек, бо сямнаццатае сакавіка…

Кандуктарцы Віялеце Казіміраўне, падобнай на спявачку Ніну Дорду, якая штодня спявае па радыё песню “Ландышы”, гадоў трыццаць. Амаль старая, а ўсміхаецца.

“Чаго ўсміхаешся?.. – кісла глядзіць на кандуктарку дама ў каракулевым футры і каракулевай шапцы. – Можа, у цябе голас, як у Ніны Дорды? Тады чаму ты не ў каракулі? Чаго ў тралейбусе сядзіш? Ідзі на сцэну і ўсміхайся!..”

“Нехта і ў тралейбусе ўсміхацца павінен, – усміхаецца даме ў каракулі кандуктарка. – А то вунь кіслыя ўсе, як гуркамі кіслымі паснедалі”.

Я даў Віялеце Казіміраўне сорак капеек – яна мне квіток. Нумар 179872! Сумы трох першых лічбаў квітка і трох апошніх супадалі! Шчаслівы! 17 на 17! Во супадзенне!..

“Мінскае паравознае дэпо! – доўжыла радыё. – У дыспетчарскую заходзяць машыністы, абменьваюцца думкамі. Сярод іх – намеснік начальніка дэпо таварыш Папковіч.

– Мы хочам жыць у міры і дружбе з усімі народамі! – радасна закрычаў па радыё таварыш Папковіч. – Мы гатовы гандляваць з капіталістычнымі краінамі, спаборнічаць у вытворчасці прадуктаў на душу насельніцтва. Праводзячы міралюбівую палітыку, наша краіна ўжо шмат разоў скарачала свае ўзброеныя сілы”.

Краіна скарачае свае ўзброеныя сілы, а мне сёння ўвечары на вайну.

– Чым ён у паравозным дэпо гандляваць збіраецца? Парай у свісток?.. – ці то сама ў сябе, ці то ў кандуктаркі, купляючы квіток, спыталася дама ў каракулі, а кіроўца, у якога вясновы настрой, раптам заклікаў на плошчы Леніна:

– Дагонім і перагонім Амерыку! Наступны прыпынак – вуліца Валадарскага!

Дама ў каракулі, падварушваючы густа нафарбаванымі, малінавымі губамі, палічыла лічбы на квітку…

Не. Шчаслівы ў мяне.

– На тралейбусе, – незадаволена сказала дама, сядаючы. – Дагонім і перагонім.

Вуліца Валадарскага – прыпынак каля паштамта, адкуль пачынаецца праспект Сталіна. Нядаўна над уваходам у паштамт з’явіўся гадзіннік, які распеўна адбівае гадзіны з паўгадзінамі. Зараз

ён маўчыць, бо 7:05.

"Ведаеш, што ў Мінску мне найболей ненавіснае? – спытае праз многа-многа гадоў Эдзік Гарачы, пра якога размова наперадзе. – Гадзіннік на паштамце".

Але пакуль ён, Эдзік Гарачы, не ведае, што ўзненавідзіць гадзіннік на паштамце. Яшчэ ён не актор рускага тэатра імя А. М. Горкага, які мільгнуў у акне тралейбуса на вуліцы Валадарскага. Толькі-толькі скончыўшы тэатральны інстытут, грае Эдзік Гарачы ў Тэатры юнага гледача – і ў самым страшным сне не прысніцца яму, што пасадзяць яго ў "амерыканку", унутраную турму Камітэта дзяржаўнай бяспекі, будыніна якога расцягнулася на цэлы квартал у левым акне тралейбуса. І чуваць будзе Эдзіку ў турэмнай камеры бой гадзінніка на паштамце. Працягла – кожную гадзіну, і коратка – паўгадзіны… Днём і ўночы – кожную гадзіну з паўгадзінай… Коратка і працягла…

Гэта ўсё будзе пазней, тады, калі праспект Сталіна, колішняя вуліца Захар'еўская, былая Савецкая, стане праспектам Леніна – і Эдзік Гарачы апынецца ў створаным яшчэ пры Леніне лагеры ў Мардовіі. Пакуль жа ён – актор Тэатра юнага гледача, і знакаміты ў Мінску тым, што мае фотаздымак з аўтографамі Эдзі Рознэра і Луі Армстранга, якія стаяць на фотаздымку ў абдымку. "Эдзіку ад Эдзі і Луі" – напісана на звароце фотаздымка, і гэтага дастаткова, каб мець славу і не мець праблем пры знаёмстве з дзяўчатамі, якім Эдзік кажа, што ён саліст аркестра Эдзі Рознэра. Таго самага аркестра, у якім Ніна Дорда, на якую падобная кандуктарка Віялета Казіміраўна, спявае песню пра ландышы. І хоць аркестр Эдзі Рознэра быў Дзяржаўным джаз-аркестрам Беларускай ССР у той час, калі Эдзік Гарачы мог спяваць у ім толькі дзіцячыя песні, а цяпер аркестр у Маскве, гэта не замінае Эдзіку Гарачаму быць ягоным салістам. "Увечары, – кажа ён дзяўчатам, – сядаю на цягнік у Мінску – і раніцай спяваю ў Маскве".

"Утро красит нежным светом стены древнего Кремля, просыпается с рассветом вся советская земля! Кипучая! Могучая! Никем не победимая!.." – заспявала радыё, пажадаўшы поспехаў калектыву паравознага дэпо, намеснікам начальніка якога працуе таварыш Папковіч, і раптам мужык на сядзенні ўперадзе ўстаў, павярнуўся да кандуктаркі, да мяне, да дамы ў каракулі, да дзвюх бабулек у хусцінках і дзядка ў капелюшы, да падпалкоўніка ў пагонах, да ўсіх, хто ў тралейбусе, і абвясціў, стукнуўшы сябе ў грудзі: "Гэта я таварыш Папковіч! Там па радыё выступаю, а тут з вамі еду!.."

Яшчэ не ўзляцеў у космас першы савецкі касманаўт Гагарын, а тым больш ніхто не ведаў нічога пра другога касманаўта Цітова, касманаўта-3 Мікалаева і касманаўта-4 Паповіча, таму на намесніка начальніка паравознага дэпо таварыша Папковіча, які выступаў па радыё, вылупіліся ўсе, як на героя. І гонар нейкі – я па вачах кандуктаркі ўбачыў – узнік: вось ён, такі чалавек, які выступае па радыё, едзе з намі, з простымі людзьмі ў адным тралейбусе… І праз гэта трохі разгубіліся і дзве бабулі, і кандуктарка, і падпалкоўнік – усе, апроч дзядка, які раптам сказаў:

– Голас непадобны.

Намеснік начальніка дэпо глянуў на дзядка, на кандуктарку…

– Як непадобны?..

– А так, – насмешліва прыўзняў капялюш уедлівы дзядок. – Не твой.

– Дык зменены, – сказала кандуктарка, якой, канечне, хацелася, каб такі знакаміты чалавек, як таварыш Папковіч, ехаў у яе тралейбусе. – Што па радыё, а што так…

Голас у кандуктаркі аказаўся нечакана нізкі для жанчыны. Не як у Ніны Дорды. Гэтакі голас, што нават падпалкоўнік азірнуўся.

– Непадобны! – упарціўся дзядок. – Вунь у кіроўцы нашага як па радыё, гэтак і так.

– Кіроўца не па радыё, – не здавалася кандуктарка. – Ён у мікрафон.

– Вуліца Камсамольская! – абвясціў кіроўца. – Наступны прыпынак – Цэнтральная плошча.

На Цэнтральнай плошчы ў Палацы прафсаюзаў, дзе ўчора былі танцы, я і пазнаёміўся з амерыканцам.

“Широким проспектом шагаю и радостно мне оттого, что в этой красе величавой есть доля, есть доля труда моего!.. – пачало новую песню радыё, а дзядок ускочыў:

– А няхай пашпарт пакажа! – І спытаўся чамусьці ў падпалкоўніка. – Пашпарт у яго ёсць?

Падпалкоўнік, паправіўшы фуражку, адвярнуўся да акна.

– Ага… – крыўдліва сказаў, сядаючы, намеснік начальніка паравознага дэпо. – Буду я пашпарт цягаць, каб згубіць.

Дзядок пераможна, нібы гэта канчаткова нешта вырашала, тыцнуў у намесніка начальніка пальцам.

– Няма ў яго пашпарта!.. А калі б і быў, то што? Вось у мяне сусед – грузін Джугашвілі, дык ён хто: Сталін?

У тралейбусе, здалося, нават радыё прыціхла.

Чатыры гады таму ў Маскве сказалі, што Сталін быў не такі ўжо

вялікі, як здавалася, і яго няма за што асабліва любіць. Але гэта недзе ў Маскве, а не тут, у Мінску. У Мінску не любіць Сталіна не спяшаліся, бо раптам у Маскве перадумаюць…

– Хто ваш сусед? – спытала, не дачуўшы, дама ў каракулі, але дзядок яшчэ раз тое самае казаць палічыў залішне – і пытанне, зляцеўшы з малінавых губ, павісла ў сонечным паветры.

“Сталін – наша сонца, Сталін – наша слава, Сталін – наша вечная вясна…” – успомніліся словы, якія Эдзік Гарачы мог спяваць у аркестры Эдзі Рознэра, як я спяваў іх у піянерскім хоры, а жанчына ў каракулі перапытала дзядка. – Ваш сусед Сталін? – І малінавыя вусны падціснула. – Ён жа культ!

Дзядок і на гэта раз нічога ёй не адказаў. Па ўсім відаць было, што не падабаюцца яму дамы ў каракулі.

– Які ку-у-льт?.. – незадаволена працягнуў, гледзячы ў акно, падпалкоўнік. – Прычапіліся… – І стукнуў кулаком па калене. – Я з ім у Берлін увайшоў!

У левыя вокны тралейбуса ўплывала Цэнтральная плошча, пасярод якой стаяў у бронзавым шынялі, прыклаўшы бронзавую руку да бронзавых грудзей, Сталін. Дзесяціметровы, велічны на высокім, абкладзеным мармуровымі плітамі пастаменце, ён, здавалася, падпіраў неба над Мінскам, быў пастаўлены тут на векі вечныя, і ніхто ў нашым тралейбусе – ні кіроўца, ні кандуктарка, ні дзве бабулі, ні намеснік начальніка паравознага дэпо таварыш Папковіч, ні дзядок у капелюшы і ні дама ў каракулі, ні тым болей падпалкоўнік – уявіць не маглі, што помніка Сталіну некалі не стане…

Не стала. Знеслі за адну ноч восенню 1961-га – напярэдадні 44-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, якую Сталін звяршыў разам з Леніным, бо Ленін без Сталіна звяршыць яе не мог.

Цэнтральную плошчу агарадзілі высокім плотам, за якім нічога відаць не было, толькі чуліся гул ды скрыгат, і мы з татаркай Нэлай, а з намі Віл, Біг і Піля залезлі на дах найбліжэйшага да плошчы дома і адтуль глядзелі, як, накінуўшы трос на шыю, звальвалі бронзавага правадыра ўсіх часоў і народаў.

Правадыр упіраўся, не хацеў падаць. Каб зваліць яго, аднаго бронетраспарцёра, з-пад гусеніц якога іскрамі ляцела брукаванка плошчы, не хапіла. Па бляшаным даху бегаў за нашымі спінамі нізкарослы, п’яненькі мужычок і крычаў: “Юзік, трымайся!..” Але Юзік не ўтрымаўся. “Ніхто не ўтрымаецца, калі на яго ўсе астатнія разам накінуцца”, – сказала татарка Нэла. На плошчу падагналі яшчэ адзін бронетранспарцёр – і цугам яны правадыра павалілі.

“Зваліў Мікітка Юзіка…” – сказаў мужычок, сеў пад комін і

заплакаў…

– Я да вас не прычапіўся, – перагнуўся цераз сядзенне да падпалкоўніка дзядок. – Я кажу вам, што ён можа быць Папковічам, але не тым таварышам Папковічам, які выступаў па радыё.

– А якім тады?.. – не зразумела кандуктарка. – Якім, калі не тым?

– Цэнтральная плошча! – абвясціў кіроўца. – Наступны прыпынак – вуліца Янкі Купалы.

Кандуктарка, адарваўшы квіток дзяўчыне ў сінім каптурыку, глядзела на дзядка, чакаючы… Але паколькі намеснік начальніка паравознага дэпо, не збіраючыся болей нікому даводзіць, што ён ёсць ён, крыўдліва маўчаў, дзядок буркнуў, сеўшы:

– Скуль я ведаю, якім…

Дзяўчына села побач са мной. У тралейбусе было поўна вольных месцаў, а яна села побач.

Прыгожая. Але не такая, як Ася. Такіх, як Ася, болей няма. Куды да Асі гэтай – у каптурыку.

Мусібыць, праз Асю амерыканец і падышоў да нас. Мы танцавалі рок-н-рол, ён стаў танцаваць з намі. Файна танцаваў. Лепш за Гарыка Клябанава. А лепш за Гарыка рок-н-рол ніхто не танцуе.

– У цябе шчаслівы? – спытала дзяўчына, падлічыўшы лічбы на квітку. І засмяялася. – У мяне – не.

Кандуктарка амаль старая, а ўсміхаецца. У гэтай квіток не шчаслівы, а яна смяецца. “Жанчына ўся таемная, як рака падземная”, – пад гітару спявае Гарык, які лепш за ўсіх танцуе рок-н-рол.

У сіняга каптурыка і не магло быць шчаслівага нумара. Наступны шчаслівы – 179881. Але для таго, каб ён выпаў, кандуктарцы трэба прадаць дзевяць квіткоў. А каму прадаваць?..

– Не ведаю, ці шчаслівы, – зманіў я каптурыку. – Можам памяняцца.

Каптурык зноў засмяяўся.

– Ведаеш. Пра сваё шчасце ўсе ведаюць. І шчасцем не мяняюцца.

“Давай памяняемся, – сказаў учора Косця Воран амерыканцу. – Я танцую з Асяй, ты – з Марынай”.

І амерыканец памяняўся.

Калі б ён не памяняўся, дык, магчыма, была б інакшай уся сусветная гісторыя. Невядома толькі: са шчаслівым квітком, ці не?

Ніхто нічога не ведае пра сваё шчасце, каптурык.

У маёй кішэні было дзесяць рублёў і дзесяць капеек. Паснедаць: яечня – 1 рубель 10 капеек, каша – 70, кісель – 30, батон – бясплатна.

Гэта 2 рублі 10. Абед: салат – 50, паўбаршча – 80, катлета – 1 рубель 20, гарнір – 40, гарбата і хлеб за так. 2 рублі 90 капеек. Разам – 5 рублёў. Дзевяць квіткоў – 3 рублі 60 капеек. Усяго – 8 рублёў 60. У мяне застаецца паўтара рубля. Вечарам вайна, так што не да вячэры. А заўтра стыпендыя.

Я падаў чырвонец кандуктарцы:

– Мне дзевяць квіткоў.

Віялета Казіміраўна ўважліва ўглядзелася спачатку ў мяне, пасля ў маю суседку…

– Восем, – сказала кандуктарка, адлічыўшы квіткі і рэшту. – Адзін яна сама купіла.

– Вуліца Янкі Купалы! – абвясціў кіроўца. – Каму ў цырк, таму на выхад!

– Не, гэта цырк! – раптам зноў падхапіўся незадаволены дзядок. – Чалавек прысвойвае чужыя заслугі, а ўсе маўчаць! Ён дыктар радыё! А то я не ведаю дыктараў! Так ён і вашы заслугі прысвоіць, і мае! І што мне: аддаць?

Бабулі, абедзве ў ліловых хусцінках і чорных цыгейках, падняліся і пераселі ад дзядка далей – бліжэй да падпалкоўніка.

– Ён не казаў, што дыктар! – кінула займацца нашым з каптурыкам шчасцем Віялета Казіміраўна. – Ён сказаў, што выступаў, а вы ўсё перакручваеце!.. Ён жа перакручвае, таварыш палкоўнік!

Усе шукалі патрымкі ў чалавека, які ўвасабляў сілу. Слабыя ў моцнага.

У мяне старэйшы сябар Палкоўнік. Не сапраўдны палкоўнік, проста мянушка ў яго такая, але ён мацнейшы за сапраўднага. Ва ўсякім разе, за гэтага падпалкоўніка, які глядзіць на кандуктарку і не ведае, што сказаць.

– Падпалкоўнік я, – знайшоў, нарэшце, што сказаць, падпалкоўнік. – І адчуўшы, мусібыць, адказнасць за жанчын і дзяцей, абаронца краіны, якая скарачала свае ўзброеныя сілы, даволі строга спытаў дзядка. – А ў вас якія заслугі, каб іх прысвойваць?

Дзядок нібы толькі таго й чакаў.

– Вось! – выхапіў ён чырвоную кніжачку з кішэні! – Герой-падпольшчык!

Кандуктарка падхапілася:

– Там не напісана, што герой! Ездзіць можна бясплатна, я глядзела, але што герой – не напісана!

– Плошча Перамогі! – абвясціў кіроўца. – Ускладанне кветак героям!

Дама ў каракулі, якая не збіралася нікому ўскладаць кветкі,

павярнулася да кандуктаркі: “Якая плошча?..” – і тая ўздыхнула, сядаючы: “Ды Круглая, Круглая… Усе ведаюць, а кожны пытае”.

Усе ведаюць, а кожны пытае, бо Круглая плошча, на якой паставілі абеліск і запалілі Вечны агонь, плошчай Перамогі стала нядаўна. Да новай назвы не прызвычаілася не толькі дама ў каракулі – для мяне дасюль плошча гэтая Круглая.

– Глядзі, – сказала адна бабуля другой у момант той цішыні, перад якой расчыняюцца дзверы. – Агонь на плошчы…

– І праўда… – з цікаўнасцю прыпала да акна другая. – Пэўна, дзеці распалілі…

“Жы-шу-шых!..” – расчыніліся дзверы – і ў іх лёгка, як парушынка, выляцеў мой сіні каптурык.

Нават не развіталася.

Нават кандуктарка здзівілася.

Нават бабулі ёй услед зірнулі.

Больш ніхто з тралейбуса не выйшаў, ніхто не ўвайшоў – і дзверы зачыніліся: “Шых-жы-шу!..”

Ад Круглай плошчы дарогі разыходзяцца на чатыры бакі.

– Шчасце не купіш, – паглядзеўшы ў зачыненыя дзверы, сказала кандуктарка. – Пралескі мог падараваць. Вянуць без толку.

Мог падараваць… Без толку вянуць… Калі б гэта была Ася, я б выскачыў з тралейбуса, схапіўшы пралескі. Не ў дзверы, дык у акно. Але гэта была не Ася – сіні каптурык. Нават не татарка Нэла.

Учора татарка Нэла таксама танцавала ў Палацы прафсаюзаў. Потым мы ўпяцёх: я, Нэла, Віл, Піля і Гарык праводзілі Марыну з амерыканцам. Воран сказаў: “Я з Асяй, а вы Марыну праводзьце. Ці мала што: усё ж амерыканец”.

Марыну чакаў каля дома чубаты Толік. Амерыканец адразу наскочыў на яго. Завадны: упершыню ўбачыў – і біцца. Такога б на вайну… І яны пабіліся б, калі б не мы. Вось тут, каля Вечнага агню.

Вайна магла пачацца яшчэ ўчора. Але яе перанеслі на сёння. Грушаўка будзе біцца з Сельгаспасёлкам.

– Наступны прыпынак – Даўгабродская!

Я вучыўся ў электратэхнікуме сувязі і жыў у інтэрнаце на Падлеснай, таму гэтая вайна была не маёй. Але разам са мной вучыліся Кон, Грыц і Балік. Кон і Грыц біліся за Грушаўку, Балік – за Сельгаспасёлак. Ён разважыў, што будзе справядліва, калі мы, свае са сваімі, будзем біцца два на два.

Я не хацеў біцца ні два на два, ні пасёлак на пасёлак. Я хацеў танцаваць рок-н-рол, слухаць Дзюка Элінгтана, Дзіна Рыда і Элвіса Прэслі, чытаць Агату Крысці, якую пераклалі з ангельскай Біг з Вілам,

і кахаць Асю. Ды мала чаго я хацеў… Кон, Грыц і Балік сказалі: “Мы ўсе – адно. А ты – стыляга. Калі ты не з намі – ты супраць усіх”.

Я быў стылягам, але я не хацеў быць супраць усіх. Бо як супраць усіх – аднаму?

Татарка Нэла кажа: “Трэба быць усім з усімі, як татары з манголамі. Тады будзе Залатая арда”.

Тралейбус дугой каціўся па Круглай плошчы – і бабулі ўсё дзівіліся на агонь, які расклалі дзеці…

Татарка Нэла вучыцца на медсястру ў вучэльні на Падлеснай. Вучэльня – побач з Першай клінікай, у якой Нэла падрабляе. Яна пачала ўжо карыстацца парфумай – і ёй патрэбныя грошы. А бацькі на парфуму грошай не даюць.

– Ды якія дзеці! – сярдзіта не вытрываў, гледзячы на бабуляў, дзядок, але тлумачыць бабулям нічога не стаў. Буркнуў толькі, чакаючы падтрымкі ад дамы ў каракулі. – Дзярэўня!..

Дама ў каракулі яго не падтрымала, яна ўвогуле нікога не падтрымлівала. Паднялася і пайшла да выхаду. Круглатварая, яна была трохі падобная да маці татаркі Нэлы.

Я раскахаў Нэлу, калі закахаўся ў Асю.

Мне дзіўна было, што я раскахаў Нэлу. Я думаў, што каханне – на ўсё жыццё. Адно на адно.

Віл сказаў мне, што так не бывае. Ён старэйшы за мяне, але не настолькі, каб гэта ведаць. І я не паверыў бы яму, калі б не раскахаў татарку Нэлу.

Нэла таксама здзівілася, што я раскахаў яе, і сказала, што таксама мяне раскахала. Таму гатовая на ўсё, бо без кахання ўсё прасцей.

Жыла яна недалёка ад вакзала – на вуліцы Савецкай. Бацькі яе, чыгуначнікі, працавалі ў начной – і яна прывяла мяне да сябе. Пасля таго, як мы праводзілі амерыканца. Але ў нас нічога не выйшла, бо я не ведаў, як гэта рабіць. А сярод ночы раптам з’явіўся бацька – і Нэла запіхнула мяне пад стол, дзе я галяком прасядзеў да раніцы. Скачарнеў увесь, пасінеў, здранцвеў…

І цяпер адразу ваяваць?

Кон, Грыц і Балік адчулі, што я не з імі, што мы – не адно. Таму і ўцягнулі мяне ў не маю вайну. Бо тыя, хто разам быў на вайне – франтавыя сябры. Яны да смерці разам.

Кандуктарка забрала ў мяне стужку квіткоў і вярнула 3 рублі 20 капеек.

– Сышло тваё шчасце, – сказала яна і засмяялася. – Зэканоміў, усё да лепшага.

Смех у яе не супадаў з голасам, жыў вышэй.

Я загадаў: калі дама ў каракулі выйдзе і рушыць уперад па праспекце – ажанюся з Асяй, калі назад – з татаркай Нэлай. Я раскахаў яе, але не так, каб не закахацца зноў…

Дама выйшла і павярнула на Даўгабродскую.

Ні ажаніцца мне ні з кім…

Што ж, усё да лепшага. У абед можна з’есці дзве катлеты. І павячэраць. Вечарам вайна, дык трэба набрацца сілы.

Хоць і не пабіўся чубаты Толік з амерыканцам, а ўсё адно вайна. Не тая, дык іншая. Без вайны ў гэтым свеце, відаць, не абысціся.

Мой бацька і ягоны франтавы сябар на кожны дзень Перамогі напіваюцца і страляюць адзін у аднаго з пісталетаў. Адзін бяжыць праз лес – другі страляе. Пасля наадварот… Кожны раз прыязджае маёр з ваенкамата, забірае ў іх пісталеты, а пасля вяртае. Ён таксама франтавік, яны разам да смерці.

Кожны раз маці просіць маёра, каб забраў пісталеты назусім. Кожны раз маёр тлумачыць, што назусім забраць нельга. Яны імянныя. Ад маршала Жукава. Такая ўзнагарода большая за ордэн. І бацька кажа, праціраючы імянны надпіс на пісталеце: “Вось, сынок, што такое імя. Зняславіш – заб’ю!..”

Значыць, трэба ісці на вайну.

– А вы на вайне былі? – спытаў дзядок падпалкоўніка, мусібыць, для таго, каб зачапіць яго, бо той сказаў, што ў Берлін са Сталіным уваходзіў, і дзядку зайздросна стала, але падпалкоўнік не зачапіўся, коратка кіўнуў: “Быў. Усе былі”.

– Э, не ўсе!.. – падхапіўся дзядок, якога перапыніў кіроўца: “Наступны прыпынак – плошча Якуба Коласа”, – і дзядок, не зачапіўшыся за падпалкоўніка, зачапіўся за Коласа. – Колас не быў! І Купала не быў! П’яны з лесвіцы зваліўся! І ў аднаго – вуліца, у другога – плошча! Справядліва?

Ніхто не адказаў яму, нават падпалкоўнік, да якога дзядок чапляўся – і тут ужо я не стрываў:

– Яны паэты!

Дзядок толькі й чакаў, хто не стрывае.

– Паэты? А я падпольшчык! Чым я горшы?

– Нічым, – каб супакоіць дзядка, сказала кандуктарка. – І ёсць вуліца Падпольшчыкаў.

Такой вуліцы я не ведаў. Але ў Мінску сотні вуліц. Можа, недзе ёсць і такая, на якой жывуць падпольшчыкі. Цэлая вуліца падпольшчыкаў…

Грушаўка, на якой жывуць Кон з Грыцам, і Сельгаспасёлак, дзе

жыве Балік, варагуюць адно з адным даўно. І час ад часу б'юцца. Да дзявятай крыві. Як толькі дзявятаму байцу нюрбалку расквасяць, вайна канчаецца – дзясятага не б'юць. У каго меней пабітых, за тымі й перамога.

Гэтым разам Балік прапанаваў біцца ў парку Чалюскінцаў.

– У вас тады перавага, – сказаў Кон. – Парк Чалюскінцаў – ваша тэрыторыя.

– А дзе ў вас біцца? – спытаў Балік. – У парку Горкага, каб міліцыя забрала?

Нібыта ў парку Чалюскінцаў міліцыя не забярэ.

– Плошча Якуба Коласа! – абвясціў кіроўца, і дзядок, раззлавана махнуўшы рукой, выскачыў з тралейбуса. – Наступны прыпынак – Шостая лінія.

– Герой бабы старой, – услед дзядку пракінула кандуктарка. – Яшчэ жывы, скача, а ўжо вуліцу хоча. Памры спачатку.

– Беражы Бог, – сказала тая бабуля, якая першай з агню здзівілася, і перахрысцілася.

– Які Бог? – раздражнёна спытаў падпалкоўнік. – І каго беражэ?.. Гэтага старога латрыгу?

Бабуля перахрысцілася яшчэ раз:

– Усіх няхай Бог беражэ.

Кандуктарка таксама хацела перахрысціцца, але зірнула на падпалкоўніка і не перахрысцілася. Толькі губы, як дама ў каракулі, падціснула.

Прыпынак праехалі моўчкі.

На наступным я сышоў – і больш ніколі ў жыцці не спаткаліся мне ні тыя дзве бабулі, ні дзядок, ні падпалкоўнік, ні намеснік начальніка Мінскага паравознага дэпо, ні кандуктарка Віялета Казіміраўна, ні сіні каптурык... Над усім – толькі вясновы пах пралесак.

Вось што дзіўна: убачыць людзей, разам з якімі пражываеш свой век на зямлі, толькі на імгненне аднойчы ўраніцы...

А ўвечары была вайна.

Мы ўжо грушаўскіх дабівалі, засталося толькі адну, дзявятую кроў пусціць, калі на мяне наляцелі незнаёмыя мужыкі. Не з нашых. П'яныя, у наколках – з тых, каго нядаўна выпусцілі з турмы па амністыі. Блатныя. Адзін ударыў алавянкай – і ўвечары я апынуўся там, дзе сышоў з тралейбуса ўраніцы: у Першай клініцы на Падлеснай.

Першай, каго ўбачыў, вярнуўшыся з таго свету, была Ася. Я пазнаў яе і заплакаў: ніколі мне з ёй не ажаніцца. Дама ў каракулі сышла з тралейбуса і павярнула на Даўгабродскую...

Пляц Волі, былы Высокі Рынак

– З каго нічога не выбіць – таго не б’юць, – кажа мне Саламон Майсеевіч на мой аповед пра тое, як я ледзьве не апынуўся на тым свеце. – Хіба выпадкова. Стаіш на вуліцы, нехта падыходзіць: “Чаго тут стаіш?..” Ты і адказаць не паспееш, бо сам пакуль не ведаеш, чаго тут стаіш, а той, які падышоў – тыц! Ці ў пысу табе, ці куды папала. І далей рушыў па сваіх таемных справах. Не надта яму, аказваецца, цікава, чаго ты тут стаяў.

Я слухаю Саламона Майсеевіча і ў згодзе ківаю галавой, бо ўжо сам здагадваюся: людзі людзей на гэтым свеце прыблізна гэтаксама цікавяць, як і на тым. Ну, калі мець на ўвазе людзей, якія яны ёсць, а не якімі прыкідваюцца.

Прыкідвацца чалавеку, як яно ні дзіўна, куды лягчэй, чым быць самім сабой. Таму і шчэмяцца ў акторы ўсе… То ў вайну, то ў мір гуляюць.

Палкоўнік, пра якога размова далей, кажа, што актор – гэта той, хто не ведае, хто ён такі. Калі ён, канечне, не правізар, які ведае, што ён правізар. А Косця Воран з Палкоўнікам не згодны. “Сам пра сябе, – кажа Косця, – ніхто не ведае нічога. Нават правізар. Але ж не ўсе – акторы”.

“Ты хоць разумееш, што ты сказаў? – пытае Косцю Палкоўнік, спрабуючы задарма, не кінуўшы манету, выбіць з аўтамата газіроўку, але кулачок у Палкоўніка маленькі – і аўтамат толькі ўздрыгвае, пашыпваючы, а вады не дае. – Чаго пра сябе можа не ведаць правізар? Вось спытайся ў Саламона Майсеевіча: чаго ён пра сябе не ведае?”

“Але ж Саламон Майсеевіч не правізар…” – разгублена глядзіць Косця на Палкоўніка, якому ўсё адно, што там ведае ці не ведае пра сябе Саламон Майсеевіч, і толькі дзеля таго, каб Косця дапамог яму газіроўку з аўтамата выбіць, Палкоўнік кажа: “Але мог ім быць…”

“Гух!” – б’е Косця – і струменіць, зашыпеўшы, вада з аўтамата.

Мала каго так білі, як той першы ў Мінску аўтамат з газаванай вадой. І толькі праз тое, што з яго можна было нешта выбіць. Не Бог ведае што, шклянку вады з сіропам ці без, але ўсё ж…

Пасля хрушчоўскай грашовай рэформы шклянка газіроўкі без сіропу стала каштаваць не дзесяць капеек, а капейку, з сіропам – тры. З сіропам рэдка хто выбіваў. На маёй памяці толькі Косця Воран. І толькі аднойчы. Ці, можа, два разы. Але ён быў здаровы. У-у-у, які

здаровы быў Косця Воран! Калі ад яго Ася ў аўтобус скочыла, каб да Гурыка паехаць, гэта на Круглай плошчы, на канцавым прыпынку першага аўтобуснага маршруту было, дык Косця ўхапіў аўтобус за задні бампер і трымаў. Аўтобус газаваў, пакуль бампер не адарваўся.

А тут нейкі аўтамат з газіроўкай... Ён амаль штодня ламаўся – і яго амаль штодня рамантавалі.

Стаяў ён на пляцы Волі, на спуску да Нямігі, куды перанеслі яго з праспекта Леніна ад крамы пад гадзіннікам, шостай прадуктовай, у якой і пачалі прадаваць мінчукам пеністую ваду з сіропам і без. Чаму перанеслі, ніхто не ведаў. Але ўсе здагадваліся: каб ятку знесці, у якой раней мяса прадавалі. Мяса на ўсіх не хапала, і каб яго стала болей, увесь Савецкі Саюз засеялі кукурузай, пасля чаго мяса зусім прапала. Ятка стаяла пустой – і ў ёй сталі прадаваць газіроўку. Мінчукі падыходзілі, выпівалі і пыталіся: “А закусіць?” Калі ж ятку знеслі і аўтамат замест яе паставілі, дык у каго пра што пытацца? У аўтамата?..

А аднойчыі ён знік. Усе падумалі, што яго звезлі, каб нічога ўжо пра ятку з мясам не нагадвала. Але не, я ведаў: ён знік сам. Каб не замінаць Саламону Майсеевічу, які праз яго стаў беспрацоўным і напісаў скаргу ў Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі на Мінскі гарадскі выканкам дэпутатаў працоўных і на КДБ.

Я знайшоў зніклага на Берасцянскай, у двары дома, дзе аптэка. Сказаў, што Саламона Майсеевіча не стала – і цяпер яны адзін аднаму не замінаюць. Ні аўтамат Саламону Майсеевічу, ні Саламон Майсеевіч аўтамату. І ніхто ўжо не ўспамінае ятку.

Вось у той ятцы на спуску ад пляца Волі да Нямігі, у якой раней мяса прадавалі і на месцы якой, калі мяса прапала, аўтамат з газіроўкай паставілі, штодня й круціўся каля кранікаў з вадой і сіропам Саламон Майсеевіч Бланк. Хударлявы, перакошаны ў плячах, з гарбузаватай, злыселай ад лобу да макаўкі, галавой. Мітуслівы, ён вытыркаўся і вытыркаўся з ваконца яткі, як зязюля з гадзінніка.

Ці як шпак са шпакоўні.

Цяпер можна сказаць, што ён увогуле вытыркаўся з часу.

Яшчэ больш мітуслівымі, чым сам Саламон Майсеевіч, былі ягоныя рукі, якія жылі, здавалася, асобным і адна ад адной, і ад Саламона Майсеевіча жыццём. Калі нехта ваду без сіропу прасіў, дык дзвюх рук гэта не займала... Адной рукой кранікі круцячы, Саламон Майсеевіч другую ўскідваў, нібы ўвагі прасіў, каб з ваконца яткі зараз жа прамову пачаць.

Ку-ку!

А прамаўляць ён мог што заўгодна... Вось будзе стаяць на пляцы

Волі, на спуску да Нямігі, ад спёкі знемагаючы, чарга да вады, а Саламон Майсеевіч будзе казаць да ўсіх, у вакенца яткі вытыркаючыся:

– У галовы вам напякло! Бо ж нічога ў вас, дзе галовы! Хай на капялюш, на капялюшык шкадуеце, але ж ёсць цюбецейкі! Іх жа гару ў ГУМ завезлі, нібыта тут Туркменія! Да ГУМа ж дзве хвіліны хады! Рубля не каштуюць, шэсцьдзясят капеек! Дваццаць шклянак вады з сіропам! Дык вы сіропам захлынуцца гатовы, а галовы хай пячэ да смерці! А нашто вам сіроп без галоў? Хай сабе нават ананасны! Ні пра што ж не думаеце! А пра мяне думаеце: прыстроіўся кранікі круціць! І ў галаву яму не пячэ! Раз крутнуў, не даліў – капейка! Два разы крутнуў – дзве! Дык за дзень жа!.. Не адну цюбецейку купіць можна!.. А каб хоць нехта падумаў, што я наліваю не меней, а болей! Ніхто! Ніхто! Ніхто і ні пра каго ў гэтай краіне лепей не падумае! Толькі горай! І пакуль так будзе, я буду круціць, а вы без цюбецеек хадзіць і галовы паліць. Няма на вас таварыша Сталіна!..

– А Сталін тут пры чым? – не злавіўшы логікі ў апошніх словах Саламона Майсеевіча, раптам вытыркаецца мужык з чаргі і тут жа, насцярожана паазіраўшыся, шкадуе, што закарцела яму спытаць пра Сталіна, бо навошта было аднаму вытыркацца, калі ўсе астатнія п'юць ваду і маўчаць.

– Пры таварышы Сталіне вы ўсе ў цюбецейках хадзілі б! – адразае Саламон Майсеевіч, і паколькі чарга не пярэчыць, хоць ніхто ў ёй не разумее: чаму ў цюбецейках, калі Сталін грузін? – Саламон Майсеевіч прамаўляе далей. – Калі хочаце ведаць, я з 17 лістапада 1937 года моцна не ўзлюбіў таварыша Сталіна. І зусім не таму, што ён скрывіў лінію таварыша Леніна. 17 лістапада 1937 года забралі і невядома дзе падзелі майго брата Ізю. Мой брат Ізя быў паэт, а таварыш Сталін быў хто? Таварыш Сталін быў таварыш Сталін. У семінарыі вершы складаў, а хто чытаў? Вы чыталі? – пытаецца Саламон Майсеевіч у насцярожанага мужыка, які ўжо не рады, што яму піць захацелася. – Ніхто не чытаў. А вершы майго брата Ізі вы можаце пачытаць, у мяне кніжкі ёсць... – І прадаўшы разам з газіроўкай тузін кніг брата Ізі, Саламон Майсеевіч сканчае прамову.

– 25 лютага 1956 года раптам адкрылася, што таварыша Сталіна не любіў не толькі я, але і Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, які асудзіў таварыша Сталіна за культ асобы. І што з таго? Думаеце, знайшоўся невядома дзе падзеты брат мой Ізя? Не, не знайшоўся невядома дзе падзеты брат мой Ізя. Затое просты савецкі чалавек, маёр Юры Аляксеевіч Гагарын першым узляцеў у космас. Салам алейкум!.. – вытыркаецца з яткі Саламон Майсеевіч і робіць гэтакі

рух, нібы здымае з галавы цюбецейку.

Чаму салам алейкум?.. Таму што цюбецейкі ў ГУМ завезлі?..

Косця Воран неяк сказаў Саламону Майсеевічу, што той падобны да Леніна, толькі без барады. “А я сваяк ягоны, – вытыркнуўся з яткі Саламон Майсеевіч. – Ды пра гэта нікому!..” І за тое, што Косця распазнаў у ім сваяка Леніна, Саламон Майсеевіч наліў Косцю вады з ананасным сіропам.

Анідзе ў горадзе не было такіх сіропаў, як у Саламона Майсеевіча! Апроч звыклага яблычнага ці малінавага з вішнёвым, яшчэ і абрыкосавы, апельсінавы, ананасны… Ананасаў у Мінску ніхто ў вочы не бачыў, а сіроп ананасны ў Саламона Майсеевіча быў.

І яшчэ была ў яго дачка Ася.

Ані ў кога ў Мінску не было такой дачкі, як у Саламона Майсеевіча! Высокая, мармурова белая, з зеленаватым смуткам глыбінных, саміх у сабе затоеных, вачэй, над безданню якіх лунаў пажар агністых валасоў – уся не ў бацьку. А ці ў маці – невядома, бо маці яе, Соня Лямпель, загінула ў мінскім гета, ледзь паспеўшы нарадзіць дачку, якую ўзгадаваў Саламон Майсеевіч, каб Косця Воран згараў у пажары яе валасоў…

І не ён адзін.

Як толькі Ася ў белай сукенцы, на якой золатам плавіўся пажар яе валасоў, з’яўлялася каля яткі, дык нават у прахалодныя дні, калі нікому піць не хацелася, не канчалася чарга сасмяглых. З Асяй Саламон Майсеевіч мог бы прадаваць газіроўку нават зімой, калі б яна не ледзянела. Дый ледзяную пілі б, лёд бы хрумкалі, калі б Ася каля яткі стаяла. Неяк Асі ў Мінску з тыдзень не было, у Аўстрыю, у Вену да радні ездзіла, дык народу каля яткі адразу паменела: ніякай чаргі нават пры спякоце. З Вены Ася кока-колу прывезла, пра якую мы спявалі: “Не хадзіце, дзеці, ў школу, піце, дзеці, кока-колу…” – хоць самі кока-колу ніколі не пілі і, як аказалася, маглі й не піць – што там тая кока-кола ў параўнанні з шыпучай вадой з сіропам з яткі Саламона Майсеевіча!..

У той дзень, калі Косця Воран распазнаў у Саламоне Майсеевічы сваяка Леніна, каля яткі мы стаялі ўтраіх: Косця, Ася і я. Да нас падыходзіў Ас, але ён быў яшчэ наводдаль. Настолькі далёка, што наўрад ці мог пачуць тое, што сказаў Саламон Майсеевіч пра сваё сваяцтва з Леніным. Хоць хто яго ведае, з якой адлегласці чуюць лётчыкі, у якіх нябеснае здароўе. Калі нават яны былыя.

Ас хадзіў у шынялі з пагонамі генерал-маёра авіяцыі. Пад шынялём – зашмальцаваны, зацыраваны цывільны пінжак на чарнільна-сінюю майку. Таму шыняля ён ніколі не расшпільваў. Заходзіў у

кавярню "Вясна", дзе яго найчасцей можна было бачыць, прадстаўляўся ўсімі сваімі мянушкамі: "Ас! Генерал! Мёртвая пятля!" – і чакаў, пакуль нальюць. Калі не налівалі доўга, ставаў пасярод залы і пачынаў свістаць, імітуючы палёт куляў з асколкамі. Гэта ў яго здорава выходзіла: страшна, як на вайне! Калі быў у кавярні нехта новенькі, дык, уражаны, запрашаў Аса да стала.

Кожны раз Ас прасіў наліць яму адно і тое ж: шклянку партвейна "Агдам". Выпіўшы, штораз адно і тое распавядаў: колькі і як назбіваў самалётаў – нямецкіх і амерыканскіх. "Ён мне ў хвост, а я ў мёртвую пятлю..."

Новенькія ў кавярні здараліся зрэдку, таму наліваў Асу звычайна Косця Воран, ці амерыканец, у якога і адна з мянушак была такая, Амерыканец, і ён насамрэч быў амерыканцам. Тым самым амерыканцам, з якім пазнаёміліся мы на танцах у Палацы прафсаюзаў.

Амерыканец пытаўся ў Аса, наліваючы:

– А дзе ты збіваў амерыканскія самалёты?

Ас нёс несусветнае... Амерыканец гладзіў каленкі Марыны, Асінай сяброўкі, якая працавала ў шпітальнай аптэцы і прыносіла амерыканцу, якога звала Алікам, аплаткі, каб не балела ад нашага савецкага жыцця ягоная амерыканская галава. Гурык уважліва ўсіх слухаў... Гурык сябраваў з Косцем, кахаў Асю – і быў прыстаўленым да амерыканца гэбістам. Ён падазраваў, што амерыканец налівае Асу, каб выведаць у таго савецкія самалётныя сакрэты.

Ас казаў:

– Я збіваў вашыя самалёты паўсюль, бо вы, амерыканцы, засранцы!

П'яны амерыканец з акцэнтам, а таму, здавалася, не надта й брыдка, лаяўся і разам з Асам абзываў амерыканцаў засранцамі, але не згаджаўся, што ён такі ж самы, як яны, бо ўсе амерыканцы былі за капіталізм, а ён – за камунізм. Мы таксама былі за камунізм, мы яго нават, невядома як, будавалі, і амерыканец намагаўся ўцяміць: як? – але як мы пра той камунізм, самі не ўяўляючы, што ён такое, яму ні тлумачылі, так і не ўцяміў. Ён прыехаў з Амерыкі спачатку ў Маскву, пасля ў Мінск, ажаніўся з Марынай, вярнуўся са сваёй савецкай жонкай у Амерыку і забіў там свайго амерыканскага прэзідэнта. Не праз тое забіў, што амерыканцы – засранцы, якія не хацелі будаваць камунізм, а праз рэўнасць да Марыны, якая, прыехаўшы ў Амерыку, закахалася ў амерыканскага прэзідэнта. Амерыканскі прэзідэнт быў падобны на чубатага Толіка, і Марына выстрыгала партрэты прэзідэнта, падобнага на яе першага каханка, з усіх газет і часопісаў, пісала яму лісты. Аднойчы нават адказ атрымала. Ну, так яна казала,

што атрымала адказ, але не казала, які…

Ас чакаў, пакуль амерыканец нальe, і толькі тады, калі той налівае, казаў далей.

– Ты ведаеш, якія ў нас самалёты?.. Во, глядзі, – ён браў відэлец. – Во гэтыя восці, гэта, значыць, чатыры рэактыўныя рухавікі. І кожны з іх можа мяняць напрамак цягі. Таму во так, глядзі, – скрыўляў Ас восці алюмініевага відэльца ў адзін бок, – я магу ляцець наперад, а во так, – крывіў ён восці ў бок другі, – назад.

Амерыканец пытаўся: “А ўбок можаш?..” – і падхмялелы Гурык, сурова гледзячы на падвар’яцелага генерала, прыкладваў палец да губ: “Цыс-с-с…” Ён нахіляўся да Аса і шаптаў на вуха: “Я, старшы лейтэнант камітэта дзяржбяспекі, кажу вам: цыс-с-с!”

Калі амерыканец, якога Марына звала Алікам, а сапраўднае імя якога было Лі Гарві Освальд, вярнуўся ў Амерыку і забіў свайго амерыканскага прэзідэнта Джона Кенэдзі, Гурык сказаў Косцю, у кавярні “Вясна” выпіваючы: “Бачыў, як мы спрацавалі.”

Гурык не збіраўся доўга быць лейтэнантам, хай сабе нават старшым. Ён хацеў неяк хутка-хутка – невядома, як, але хуценька – стаць генералам і заняць у будыніне КДБ галоўны кабінет, у якім ён папіваў бы ірландскія ды ангельскія віскі, пакурваў бы амерыканскія цыгарэты і паплёўваў бы з акна на Ленінскі праспект.

Будыніна КДБ была непадалёк ад кавярні “Вясна” на Ленінскім праспекце. Амаль насупраць. Ас заўсёды праходзіў паўз яе страявым крокам.

Ніхто не ведаў прозвішча Аса, не мог назваць ягонае імя. Ас. Генерал. Мёртвая пятля. Гарадскі вар’ят. Неад’емная частка Мінскага жыцця апошніх гадоў адлігі, вясновы пах якой ледзьве даносіўся да Мінска з Масквы, перацякаў з левага берага Свіслачы на правы, ад Круглай плошчы да пляца Волі, блукаў па вуліцах Маркса і Энгельса, і, завіваючыся, губляўся ў псеўдаантычных калонах тэатра Юнага гледача, на прыступках якога казаліся прамовы пра адлігу і чыталіся вершы, якія любіў слухаць Алік: ці то амерыканец, ці то іншапланецянін.

Плошча Перамогі, былая Круглая

Здагадку пра тое, што амерыканец Алік ніякі не амерыканец, а іншапланецянін, нечакана для ўсіх выказаў Гарык Клябанаў, калі мы сядзелі ў кавярні “Бярозка”, чакаючы чубатага Толіка, якога Алік збіраўся забіць.

– Што ў нас рабіць амерыканцу? – спытаў Гарык. – Ну, вы падумайце…

Падумаўшы, мы не знайшлі для амерыканца занятку. А вось не думаючы, знаходзілі: на радыёзаводзе даганяць і пераганяць Амерыку. Савецкі Саюз у тыя часы ва ўсім тую Амерыку даганяў і пераганяў, ні ў чым і ніяк не даганяючы.

У адрозненне ад кавярні “Вясна” на рагу Ленінскага праспекта і вуліцы Камсамольскай, кавярня “Бярозка” на Круглай плошчы выглядала звычайнай сталоўкай. Амерыканца, які мог дазволіць сабе любы рэстаран, можна было ўбачыць у той сталоўцы толькі таму, што на Круглай плошчы жыла Марына. На самым пачатку іх знаёмства Алік вечар за вечарам прападаў у “Бярозцы”, цікуючы, калі і з кім Марына вернецца дахаты. А тая найчасцей вярталася пад руку з чубатым Толікам. Стылягам.

Стыляга – гэта стыль. Падпольна перапісаныя на “касцях”, скарыстаных рэнтгенаўскіх здымках, якія яшчэ называлі “шкілет маёй бабулі”, амерыканскія кружэлкі з рок-н-ролам. Набрыялінены кок. Порткі-дудачкі. Шыракаплечы пінжак. Стракатая кашуля. І абавязкова “трактары” ці “шузы”: на тоўстых падэшвах, што называліся “маннай кашай”, туфлі.

Стыляга – гэта ідэя: франдзёрскія адносіны да ўсяго шэрага, шараговага. Выходзіла, што да савецкага. Менавіта за ідэю, а не за набрыялінены кок са стракатай кашуляй, стылягу маглі выключыць з камсамолу і вытурыць з інстытута. Праз гэта камсамолкі спявалі: “Пад стылягу я не лягу…”А камсамольцы ў насценных газетах вершы пра стылягаў пісалі:

Иностранцы? Иностранки?
Нет! От мозга до костей
Это местные поганки!
Доморощенный “бродвей”!

Рок-н-рол з’явіўся ў Савецкім Саюзе перад вайной разам з Эдзі Рознэрам, а стылягі – пасля вайны, калі польскі габрэй Адольф Ігнацы

Рознэр, які змяніў імя сваё праз тое, што пры кожным знаёмстве ў яго пыталіся: “Адольф?.. Гітлер?..” – сядзеў у сталінскім лагеры на Калыме. Але ўсё адно яго можна лічыць першым у Савецким Саюзе стылягам, бо ён джазіст, а слова стыляга якраз са слэнгу джазістаў. Стыляць азначае граць у чужым стылі, і калі трубач ці саксафаніст грае пад некага, дык пра яго кажуць: стылягу дзьме. Эдзі Рознэр і быў стылягам: ён, не хаваючыся, дзьмуў пад Луі Армстранга, які падараваў Эдзі Рознэру свой фотаздымак, надпісаўшы яго: “Беламу Луі Армстрангу”.

Пасля вайны, калі Луі Армстранг-чорны граў на Брадвэі джаз, Луі Армстранг-белы валіў на Калыме лес, і вярнуўшыся адтуль з цынгой, без зубоў, што для трубача трагедыя, шапялявіў адно і тое: “Я не хашу болей на лешапавал”. Баючыся, каб яго, бронь Божа, зноў не западозрылі ў чым-небудзь не савецкім, ён усяляк дэманстраваў лаяльнасць, нават уключыў у рэпертуар аркестра песню, якую спявала Ніна Дорда:

Ты его, подружка, не ругай,
Может, он залетный попугай.
Может, когда маленьким он был,
Кто-то его на пол уронил,
Может, болен он, бедняга?
Нет, он попросту стиляга!

Апошнія словы выкрыкваў увесь аркестр, трубамі і саксафонамі паказваючы на дырыжора: “стылягу” Эдзі Рознэра. Зала патанала ў авацыях…

– Эдзі, што з табой зрабіла Масква? – спытаў Палкоўнік, калі пасля канцэрта мы зайшлі за кулісы. – Ты ў Мінску чалавекам быў.

Эдзі Рознэр быў старэйшы за Палкоўніка не менш як гадоў на дваццаць, але Палкоўнік не меў звычкі звяртацца да каго-небудзь на вы. Што ж да мяне, дык музыканта, роўнага Дзюку Элінгтану з Луі Армстрангам, бачыў я ўпершыню – і вачам сваім не верыў: няўжо гэта ён? Саліст джаз-аркестраў Марэка Вэбэра і Стэфана Вайнтраўба – найпершы трубач даваеннай Еўропы?.. І ён тут, у Мінску? І Палкоўнік з ім на ты?..

– Гэта не Масква, Кім, – вінавата ўздыхнуў Рознэр. – Гэта Калыма.

– Калыма і ёсць Масква, – незразумела што сказаў Палкоўнік, але Рознэр, мусібыць, зразумеў яго, бо кіўнуў.

– Так… Калі ў трыццаць дзявятым я перасек мяжу, апынуўся ў СССР і заўважыў уздоўж чыгункі жанчын з рыдлёўкамі і ламамі, чаго

нідзе раней не бачыў, я зразумеў, куды патрапіў. Але позна было.

Здавалася, ён вось-вось слязу пусціць, і Палкоўнік суцешыў яго.

– Не скуголь. Не патрапіў бы ў СССР, дык не стаў бы стылягам. Дзе яшчэ стылягі былі?

– Нідзе, – абняў Рознэр Палкоўніка і раптам заспяваў, шчоўкаючы пальцамі:

Pardon me, boy,
Is that the Chattanooga choo choo?
Track twenty nine,
Boy, you can give me a shine.

Гэта быў “Цягнік на Чаттанугу” з “Серэнады Сонечнай Даліны”. Амерыканскі гімн савецкіх стылягаў.

На маскоўскім “брадвэі”, вуліцы Максіма Горкага ад помніка Пушкіну да Манежа, стылягі з’явіліся, калі яшчэ я ў піянерскім хоры песні пра Сталіна спяваў. Семсот вёрст ад Масквы да Мінску стылягі, або, як яны самі сябе называлі, “штатнікі” йшлі амаль дзесяць гадоў – і шмат што за гэты час змянілася. Не стала Сталіна, празвінелі капяжы хрушчоўскай адлігі, краіна зняла фрэнч і надзела пінжак. Няхай мехаваты, як у Хрушчова, але ўсё ж не вайсковага крою. І стылягі ўжо не насілі неверагодна шырокія, шырэйшыя за пазнейшыя “клёшы”, штаны, капелюшы з шырокімі палямі, гальштукі “пажар у джунглях”, жоўта-чырвоныя шкарпэткі. З’явіліся порткі-дудачкі, вузкія гальштукі-селядцы, якія завязваліся ў тоненькі вузельчык, швэдры «з аленямі», як у Джона Пэйна з таго ж культавага фільма «Серэнада Сонечнай Даліны». Нязменнымі заставаліся хіба кашулі ў «гавайскім стылі» – з бананамі, пальмамі, малпамі ды папугамі.

Упершыню ўціснуўшыся ў светла-сінія дудачкі і надзеўшы кашулю з пальмамі, на якіх раслі бананы і сядзелі малпы з папугамі, я адчуў, што жыццё – свята. І ў той жа вечар займеў яго, калі ў кампаніі стылягаў, у якую быў дапушчаны праз Косцю, “кінуў брэк па броду”: прайшоўся па Мінскім “брадвэі” – праспекце Леніна ад паштамта да Круглай плошчы. Косця Воран, Піля Пястрак, Эдзік Гарачы, Гарык Клябанаў, Віл, Біг… Якая кампанія! Я не сніў, не марыў…

Як мы йшлі!.. Як стракатыя кашулі шапталіся ды скураныя шузы парыпвалі!.. “Брадвэй” рассцілаўся, расцякаўся перад намі, а мы па ім – культурненька, акуратненька. Не каля самых сцен, але й не нахабна пасярод, каб не надта сучаснікам замінаць, суайчыннікаў не моцна раздражняць, бо яны не вінаватыя, што такія… І кожнаму, каго выпадкова зачэпім, нашае даруйце, прабачце, а вось жа ўсё адно ўслед нам: “Стылягі! Малпы! Дармаеды! Амерыканцам прадаліся!

Куды міліцыя глядзіць!..”

А вось яна, міліцыя, якраз на нас глядзіць… І ў скверы на вуліцы Леніна, дзе цяпер помнік лётчыку Гараўцу стаіць, да нас падыходзіць. “Так… Вы сёння доўга тут?..” “А мы не ведаем! Сквер у колькі зачыняецца?” “Ты, Воран, глядзі! Дажартуешся!..” “А што глядзець?” “А тое… Акуркі ў сметніцу кідаць!..” “Ёсць!” “Даказыраешся! Сустрэнемся яшчэ…”

Пагаварылі – і разышліся.

Міліцыя – гэта нармалёва. Горш – брыгадміл. Брыгада садзейнічання міліцыі. Тое, што потым назвалі народнай дружынай.

Міліцыянты хадзілі ў той час без дубінак, а брыгадмілы – з дубінкамі. Прычым, рабілі іх самі, ніхто ім дубінкі не выдаваў. Разразалі на кавалкі тоўстыя гумовыя шлангі, устаўлялі ў шлангі жалезныя пруты – і батожылі нас так, што косці трашчалі. Міліцыя стаіць, у бок адвярнуўшыся, а яны лупяць. Пашчэнкі зламаюць, а пасля з нажніцамі накідваюцца порткі-дудачкі кроіць.

Яны чакалі нас у скверы насупраць цырка, дзе тады помнік лётчыку Гараўцу стаяў – на вуліцу Леніна яшчэ не перанесены. Прыкладна там, дзе цяпер помнік Купалу стаіць. Трое на мяне наскочылі: “Хто не з намі – той супраць нас!” Я гляджу: Кон, Грыц і Балік. За бойку ў парку Чалюскінцаў іх хацелі пад суд аддаць, але перадумалі і запісалі для перавыхавання ў брыгадміл. Яны з ног мяне збілі, давай штаны рэзаць. Воран кінуўся на дапамогу: “Вашы штаны?.. Вы яму іх шылі?!.” Раскідаў брыгадмілаў, палкі паадбіраў – тут і з міліцыяй новая сустрэча. Міліцыя ведала, што казала: “Сустрэнемся яшчэ”.

Пазней “брадвэй”, які прасавалі мы “шузамі”, іншыя хлопцы, маладзейшыя за нас, падмяталі “клёшамі”. Не скажу ні пра “клёшы”, ні пра тых, хто імі “брадвэй” падмятаў, нічога кепскага, але…

Мы былі мы.

Пра нас вершы складалі.

“Иностранцы? Иностранки?..”

У наскрозь бліскучай нашай кампаніі асобнай зоркай ззяў, канечне, Косця Воран. Ды гэта для мяне. А для некага – Віл.

Віл – мянушка Ледніка, якога зваць Віктарам, а па бацьку Іванавічам. Таму і Віл. Як Барыс Іванавіч Галушка – Біг. Такія мянушкі – па першых літарах імя і прозвішча – былі ў нашай кампаніі ў многіх.

У мяне была мянушка Князь. Не ведаю, чаму. Не помню нават, хто яе прыляпіў да мяне. Нехта ў тэхнікуме. Яшчэ тады, калі мы здавалі ўступныя экзамены. І, можа быць, тая мянушка таму да мяне

прыляпілася, што, калі ўсе шпаргалкі да экзаменаў пісалі, я пісаў вершы татарцы Нэле. “Нэла! Не граф я! И Вы – не графиня! Но со слезой, что течет по шипам, Алая роза в хрустальном графине Тайно завидует вам!” Але ў такім разе я павінен быў займець мянушку “граф”, а не “князь”. Дзе логіка?

Біг сказаў, каб я такой драбязой не пераймаўся, бо гэта ў нашай мове граф і князь – словы розныя, а ў мове сусу, на якой размаўляюць гвінейцы ў цэнтральнай Гвінеі, гэта адно слова. Праўда, ён забыўся, якое, на што Палкоўнік не прамінуў заўважыць, што наўрад ці Біг тое слова ўспомніць, бо ў Гвінеі, наколькі яму вядома, ёсць усё, апроч князёў з княгінямі і графаў з графінямі. Графы, канечне, былі там, калі Гвінея была калоніяй Францыі, але потым іх з’елі.

Гэта азначала, што я мог з’есці вершы, якія напісаў татарцы Нэле. Палкоўнік трываць не мог ні ружаў у крышталі, ні іншых прыгажосцяў, а Бігу вершы падабаліся – і верш пра ружу, якая зайздросціць татарцы Нэле, ён у піку Палкоўніку пераклаў на мову сусу.

Біг – геній. І геній – не яшчэ адна мянушка ягоная, ён насамрэч мае здольнасці генія. Ведае 54 мовы (ангельскую – з чатырма дыялектамі), а пастанавіў сабе ведаць 100. У тым ліку іўрыт. І будзе ведаць 100 з іўрытам. Калі захоча. Ніхто ў тым не сумняваўся, апроч Віла, які (толькі ў гэтым) зайздросціў Бігу.

Віл вучыўся на журфаку і ўжо друкаваўся ў газетах. А яшчэ займаўся радыёспортам, праз які ва ўсім свеце меў знаёмцаў. Можа, таму і стаў ён першым і ў нашай кампаніі, і ў Мінску, і ва ўсёй Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы чалавекам, які дазнаўся, што ёсць такое дзіва: джынсы.

Ды мала – дазнацца. Іншы б дазнаўся, што ёсць недзе дзіва – і няхай сабе яно там будзе. А Віл разгрузіў дзесяць вагонаў на таварнай станцыі, сабраў грошы, паехаў у Маскву і купіў джынсы за пяцьдзясят рублёў у фарцы – дзе яшчэ ў савецкі час можна было дзіва купіць? Няхай тое дзіва паношанае, выцертае, сто разоў пранае, але якая ад “Бярозкі” да “Вясны” была праходачка!..

Толік жа хоць і быў стыляга, але ў Маскву па дзіва не паехаў бы. Характар не той. Можа, таму ён і да кампаніі нашай не далучаўся. Ці не далучаўся праз тое, што жыў не ў цэнтры – не ведаю. Але думаю, што калі б ён прасаваў “брадвэй” разам з намі, дык нашу кампанію не сапсаваў бы. Чубаты, мускулісты, рослы, выглядаў ён так, што амерыканец Алік побач з ім ніяк не выглядаў. А вось надумаў адбіць у яго Марыну…

А як адбіць?.. А ўзяць ды Толіка забіць! Дзеля гэтага Алік запісаўся ў паляўнічае таварыства і купіў стрэльбу. Ён збіраўся

залезці на дах суседняга дома і, калі Толік, правёўшы Марыну, развітаецца з ёй, і тая зойдзе ў пад’езд, пакласці суперніка. На прыступках, не даўшы яму далёка адысці, каб Марына выбегла і ўбачыла, што Толік dead. Мёртвы. “You corpse!” – не раз наскокваў Алік на Толіка, пераймаючы стылягу пасля ягоных спатканняў з Марынай. Ніхто не звяртаў на гэта асаблівай увагі, а сам Толік, які мог пакласці Аліка адной левай, толькі адмахваўся ад Амерыканца, як ад мухі: “Добра, добра, я труп…”

Гэткія паблажлівыя адносіны даводзілі самалюбнага Амерыканца да шаленства – і перш чым забіць суперніка, ён вырашыў яго адмалаціць. Разумеючы, што сам-адзін зрабіць з Толікам нічога не здолее, Алік пачаў угаворваць нас дапамагчы яму. Ніхто не ўгаворваўся – і тады ён прапанаваў грошы. Па паўсотні кожнаму, хто згодзіцца. Гэта было ў чатыры разы болей за маю стыпендыю, але і за грошы лупіць стылягу Толіка, каб адбіць у яго Марыну для Амерыканца, ніхто не захацеў. Бо Амерыканец – чужынец, а стыляга Толік – свой.

Неяк у “Бярозцы” застаў я Амерыканца ў кампаніі з мужычком па мянушцы Ірад. Мянушку такую Ірад праз прозвішча меў: Ірадаў. Яны збіраліся ў цір пайсці, Ірад спытаў: “Хочаш пастраляць? Пару ворагаў забіць?..”

Я захацеў.

З усіх бакоў абкружалі ў той час Савецкі Саюз заклятыя ворагі, якія, калі пра нешта й марылі, дык толькі пра тое, каб нас знішчыць. Не ведалі толькі: як?.. Найлепш было б, як марыў амерыканскі сенатар Бары Галдуотэр, скінуць на нас атамную бомбу. Ён, праўда, як пазней высветлілася, удакладняў, куды хацеў бы тую бомбу скінуць: не на ўсіх нас, а толькі на Маскву. І не на ўсю Маскву, а выключна на Крэмль. І нават не на ўвесь Крэмль, які сенатар цаніў як сусветную архітэктурную каштоўнасць, а дакладненька на мужчынскі сарцір у Крамлі. Але пра абмежаванасць мары сенатара Галдуотэра мы тады не ведалі. Мы думалі, што амерыканцы прагнуць знішчыць нас усіх – і рыхтаваліся да адпору. Таму пры любой і кожнай савецкай установе, за выключэннем, можа быць, радзільняў і дзіцячых садкоў, меліся ціры, дзе нас вучылі цэліцца ў ворагаў, страляць іх, страляць і страляць.

Гэткі ж цір меўся і ў сутарэннях Мінскага радыёзавода, куды Ірад з Амерыканцам мяне прывялі, і дзе страляць можна было як па звычайных мішэнях, гэтак і па мішэнях-ворагах. Мусібыць, яшчэ ад першых пасляваенных гадоў пыліліся ў ціры стосы мішэняў з карыкатурнымі Гітлерам і Мусаліні, але і новых ворагаў хапала.

Ірад спытаў: “Табе каго павесіць?..” – і я выбраў Гітлера, а перад Амерыканцам Ірад, нічога ў таго не спытаўшы, павесіў фотаздымак стылягі Толіка. Страляў Амерыканец – трэба аддаць належнае ці амерыканскай марской пяхоце, у якой ён служыў перад тым, як рвануў у Савецкі Саюз, ці Іраду, які ўжо тут яго трэніраваў – як мае быць: дзесяць стрэлаў – і ўсе ў лоб.

Во рэўнасць! Бедны Толік… Я сказаў пра трэніроўкі ў ціры Ворану, і мы сталі падпільноўваць Толіка пасля ягоных спатканняў з Марынай. На ўсялякі выпадак, бо вораг ёсць вораг. Вунь амерыканцы на Кубе што вырабляюць! Свабоду на востраве Свабоды душаць!

Да таго ж гэты амерыканец Алік з мухамі. У яго шнар на левым запясці, дык Марына сказала, што гэта след ляза. Спроба самагубства. Яму ў Маскве, як толькі прыехаў і заяву напісаў, што хоча мець грамадзянства савецкае, адмовілі, дык ён сабе вены ўзрэзаў.

Партрэты нашых ворагаў у тагачасных газетах не друкаваліся, каб не замінаць фантазіям савецкіх людзей, якія ворагаў тых уяўлялі страшнейшымі за нячыстую сілу. Таму я не ведаў, як выглядае прэзідэнт Джон Кенэдзі. Калі ж Амерыканец вярнуўся ўАмерыку і свайго амерыканскага прэзідэнта забіў, партрэты Кенэдзі з’явіліся ў газетах. Я глядзеў і вачам не верыў: стыляга Толік! Толькі кок не набрыялінены…

Уражаны, я прыйшоў да Палкоўніка і спытаў, што ён пра гэта думае?.. Палкоўнік адказаў, што пра такую фіговіну ён нічога думаць не збіраецца. Калі б забілі правізара 13-й аптэкі, ён бы, можа, нешта й падумаў, бо правізар серную мазь з цынкавай для яго змешвае, а пра прэзідэнта яму – што думаць? Прэзідэнт – не правізар.

Усіх астатніх, апроч Палкоўніка, падабенства Толіка з амерыканскім прэзідэнтам зацікавіла больш, чым дэтэктывы Агаты Крысці. Чаго толькі кожны з нас ні выдумляў, якія ўзнікалі сюжэты!.. Нават калі Ас сказаў, што Джон Кенэдзі – гэта Толік, а Толік – гэта Джон Кенэдзі, які прыехаў у СССР разам з Алікам па дамоўленасці паміж ЦРУ і КДБ, ніхто не адмахнуўся, як звычайна, ад звар’яцелага генерала, а ўсе задумаліся, спрабуючы зразумець, як і для чаго такое магло быць… Бо меркаванне таго ж Аса: у Амерыцы плануецца будаўніцтва камунізму, і амерыканскага прэзідэнта прывезлі, каб павучыўся, як яго будаваць, – выглядала сумнеўным. Хоць, з іншага боку, у такім выпадку зразумела, за што забілі…

Пасля ад’езду Марыны з Алікам у Амерыку Толіка нідзе і ніхто не бачыў. Віл дазнаўся ў Марынінай цёткі, у кватэры якой на Круглай плошчы і жыла Марына, ягоны адрас. Мы паехалі па тым адрасе, але

дзверы былі замкнёныя, і суседзі сказалі, што ўжо больш за год тут ніхто не жыве.

Толік з’ехаў у Амерыку? І Амерыканец там яго забіў?..

Усё супадала! Невядома, што і з чым, але супадала ўсё!..

Пра тое, каго забіў Амерыканец, можна было дазнацца толькі ў яго самога, але сам ён быў у турме, і мы вырашылі напісаць Марыне, каб яна ці перадала яму наш ліст, ці сама ў яго спытала: каго ён забіў і за што?.. З адрасам зноў жа дапамагла цётка Марыны, але адказу з Амерыкі мы не дачакаліся, бо праз два дні пасля таго, як Амерыканец забіў ці Джона Кенэдзі, ці Толіка, нейкі Джэк Рубі забіў самога Амерыканца.

– Спадзяюся, ён хоць добра кончыў, перш чым кепска скончыць, – пачуўшыпра тое, што сталася з Джонам Кенэдзі і Амерыканцам, сказаў Саламон Майсеевіч. “Ты пра каго, Саламон?..” – спытаў Палкоўнік, але Саламон Майсеевіч не стаў удакладняць, ці меў ён на ўвазе марскога пехацінца, ці Прэзідэнта ЗША?

Калі Амерыканца не стала, дазнацца пра тое, па кім, у чый лоб страляў ён, трэніруючыся ў ціры Мінскага радыёзавода, ужо не было ў каго. Вось тады Гарык Клябанаў і спытаў: “Ну, што я вам казаў?..” І зноў пачаў даводзіць, што Алік ніякі не амерыканец, бо навошта амерыканцу забіваць свайго амерыканскага прэзідэнта? Алік – іншапланецянін, пасланы на Зямлю вышэйшай за нашую цывілізацыяй.

Вышэйшым за нас Амерыканец не выглядаў ні ў якім сэнсе, але што ж… Гарык у адрозненне ад Гурыка, які быў гэбістам, быў паэтам і любімцам Палкоўніка. Ці, калі па прыярытэтах, дык наадварот: любімцам Палкоўніка і паэтам. І яшчэ уфолагам, хоць слова гэткага ў той час мы не ведалі. Гарык першым і ў нашай кампаніі, і ў Мінску, і ва ўсёй Беларускай Савецкай Сацыялістычный Рэспубліцы дазнаўся, што ёсць дзіва яшчэ большае, чым джынсы: НЛА. Неапазнаныя лятаючыя талеркі.

Таямніцу гэтую ён адкрыў нам не дзе-небудзь, а ў найадпаведным для гэтага месцы: у нацыянальнай бібліятэцы. У “ленінцы”, як яе ўсе называлі, бо, канечне ж, галоўная бібліятэка БССР, як і галоўная плошча, і галоўны праспект, і галоўная вуліца павінны былі насіць і насіла імя сваяка Саламона Майсеевіча.

У “ленінцы” мы збіраліся нават часцей, чым у кавярні, абмяркоўваючы ўсё, што прачыталі. Знаёмыя бібліятэкаркі прыносілі нам кнігі нават з тых сховішчаў, адкуль іх нельга было браць без адпаведнага дазволу. Дзяўчаты рызыкавалі, але што ж: за гэта яны цалаваліся з Вілам, Бігам, Пілям, Гарыкам – стылягамі, найпершымі хлопцамі Мінску.

– Хто ведае Алена Хайнэка? – спытаў Гарык на чарговай нашай сходцы ў ленінцы.

Ніхто не ведаў.

– І пра Леанарда Стрынгфілда не чулі?..

Не чуў ніхто.

– А пра што яны пішуць? – пацікавіўся Біг, мяркуючы, як, зрэшты, і ўсе мы, што Хайнэк са Стрынгфілдам – літаратары кшталту Агаты Крысці, кнігу якой выкапалі Біг з Вілам у замежным аддзеле ленінкі, пераклалі, перадрукавалі на машынцы і яна, тая кніга, хадзіла ў Мінску па руках разам з пастэрнакаўскім “Доктарам Жывагам”, ахматаўскай паэмай “Рэквіем”, апавяданнямі Салжаніцына...

– Пра лятаючыя талеркі яны пішуць, – дастаў Гарык з кішэні пакамечаную газету. – Мне кружэлку нядаўна з Амерыкі даслалі, у гэтую газету загорнутую... Дзіўна ўвогуле: газету як газету перасылаць нельга, а калі ў яе загарнуць нешта – можна... Дык вось слухайце... Загаловак: “Прэзідэнта Кенэдзі забілі іншапланецяне!” Нішто сабе?.. І далей тэкст амаль на дзве паласы, я ўсё не буду перакладаць... “Ад першага дня свайго знаходжання ў Белым Доме Ліндан Джонсан, на якога пасля трагедыі ў Даласе былі ўскладзеныя абавязкі прэзідэнта, распачаў актыўную і даволі дзіўную дзейнасць. Пятага снежня ён сустрэўся з Бары Галдуотэрам, сенатарам ад штата Арызона, былым генералам ваенна-паветраных сіл, куратарам звышсакрэтных праектаў Пентагона. Праз дзень пасля сустрэчы Галдуотэр выпраўляецца ў сваю штаб-кватэру ў Арызону, у пустэчах якой над базамі ВПС адразу ж назіраецца ўсплёск актыўнасці лятаючых талерак: 9 снежня – Чайна-Лэйк, 15 снежня – Нагалес і Бісбі, 18 снежня – Рыа-Грандэ. Пад канец снежня разведупраўленне міністэрства абароны (РУМА) атрымлівае калядны падарунак: 200 мільёнаў даляраў дадатковых асігнаванняў “на мэты, звязаныя з новымі касмічнымі аб’ектамі”.

Якімі “новымі”? Неапазнанымі?..

Як вынікае з нядаўна надрукаваных дакументаў, прысвечаных дзейнасці таямнічай групы “Маджэстык-12”, хросным бацькам якой быў прэзідэнт Гары Трумэн і ў якую, апроч вярхоўкі амерыканскай уладнай эліты, уваходзілі іншапланецяне, Джон Кенэдзі меў намеры рассакрэціць усё, што звязана з НЛА. Ён лічыў, што грамадзяне Злучаных Штатаў Амерыкі прымуць факт іншапланетнай прысутнасці без страху і панікі, што народ у любым выпадку мае права ведаць праўду. Але так лічылі не ўсе, у тым ліку самі іншапланецяне, якімі, альбо па настойлівым патрабаванні якіх, прэзідэнт Кенэдзі і быў забіты. Прычым, не толькі ён сам, але і ўсе тыя, хто праз яго быў

далучаны да іншапланетнай таямніцы: ягоны брат, міністр юстыцыі Роберт Кенэдзі, ягоная палюбоўніца акторка Мэрылін Манро, міністр абароны пры прэзідэнце Трумэне… і далей, – Гарык прагартаў газету, – пералік знішчаных людзей, пасля чаго самае цікавае… Калі ў ЗША быў запрошаны савецкі лідар Мікіта Хрушчоў, на здымках фільма “Канкан” у Галівудзе яго пазнаёмілі з Мэрылін Манро, праз якую падчас іх кароткага, але бурнага рамана, Хрушчову наўмысна была перададзеная інфармацыя пра кантакты з НЛА ды іншапланецянамі. Вярнуўшыся ў СССР, Хрушчоў загадаў пашырыць сакрэтныя даследванні ў гэтым накірунку, збіраючыся, як і Кенэдзі, сказаць праўду народу, таму лагічна чакаць, што менавіта ён неўзабаве папоўніць прыведзены спіс” – склаў газету Гурык. – Ну, як вам гэта?..

Усе агаломшана маўчалі. Дапусціць, што ў газеце, няхай амерыканскай, напісана няпраўда, мы, няхай стылягі, але стылягі савецкія, не маглі. Бо газета – не кніга, не дэтэктыў Агаты Крысці.

Амерыканец – іншапланецянін? Ён, канечне, дзіўнаваты быў, не без таго, але… Але ўсё адно выходзіла, што ў СССР яго паслалі, каб ён забіў Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Савета Міністраў СССР Мікіту Сяргеевіча Хрушчова, які, сказаўшы народу праўду пра культ асобы, збіраўся сказаць праўду пра іншапланецян. Тады чаму ўсё ж ён забіў не Хрушчова, а Кенэдзі? Хоць мусіў забіць абодвух. Хрушчоў раздумаў праўду казаць?..

– А памятаеце, – перапыніў нашыя сутаргавыя развагі Гарык, – як Палкоўнік пры першай сустрэчы спытаўся ў Аліка, чаго ён з Амерыкі да нас прыпёрся? І што той адказаў, памятаеце?.. “З чаго вы ўзялі, – ён спытаў, – што я з Амерыкі? Я не з Амерыкі зусім…” Хоць пасля ўжо казаў, што з Амерыкі… Ну, што вы пра ўсё гэта думаеце?

– Перш чым думаць, трэба падумаць, – сказаў Косця Воран, і ніхто ў яго не запытаў, што гэта ён сказаў, з чаго вынікала: аніякіх думак наконт гэтага ані ў каго з нас няма.

Вуліца Няміга, былая рака

Жыццё ў Мінску цякло ціхае, павольнае, як вада ў Свіслачы. Косця Воран казаў: “І гэткае ж мелкае! Мястэчка габрэйскае, а не горад!..” – на што Саламон Майсеевіч толькі ўздыхаў самотна: “Каб жа яно было, габрэйскае мястэчка...”

Косця жыў непадалёк ад былой яткі, у якой цяпер круціў кранікі Саламон Майсеевіч. На Нямізе, на гарышчы трохпавярховага дома Косця меў больш падобны на галубятню, чым на чалавечае жытло, пакой з гаўбцом, які скошана навісаў над вулачкай, парыпваў над ёй, нібы збіраўся вось-вось абрынуцца сам па сабе, а на ім таўклося іншым разам паўтузіна людзей – і ён не падаў. Няміга тады не была яшчэ зруйнаваная, і ў яе лабірынтных, саміх у сабе заблытаных дворыках, у якія староннияму чалавеку можна было забрысці і не выйсці, слупамі стаяў сонечны пыл, прывідна лунала тое, па чым, мусібыць, і ўздыхаў самотна Саламон Майсеевіч.

Мне здаецца, што я чую ягоныя ўздыхі, мне мроіцца, нібы йдзем мы з ім у тым залатым пыле па той, яшчэ старой, Нямізе, шукаючы месца, на якое найлепш перанесці ятку, калі старшыня Мінгарвыканкама таварыш Шарапаў дазволіць яе перанесці.

– Ты ведаеш, – раптам спыняецца Саламон Майсеевіч, – чаму я хачу, каб ятка стаяла менавіта на Нямізе, а не дзе-небудзь яшчэ? – І тлумачыць, не чакаючы майго адказу. – Бо ўсе ведаюць, што на Нямізе – гэта на Нямізе. А калі дзе-небудзь на Кастрычніцкай ці на Гастэла, дык кожны другі перапытае: гэта дзе? На Лекерта?

– А дзе гэта на Лекерта? – пытаю я, і Саламон Майсеевіч кажа:

– Дык на Кастрычніцкай ці на Гастэла.

Я намагаюся ўцяміць, як такое можа быць, каб “на Лекерта” было адразу і на Кастрычніцкай, і на Гастэла, па розныя бакі Нямігі, але ўцяміць не магу, бо Косця Воран яшчэ не распавёў мне, што імем Гіршы Лекерта, які няўдала замахнуўся некалі на жыццё Віленскага генерал-губернатара фон Валя, называлася ў Мінску спачатку адна вуліца, цяперашняя Кастрычніцкая, колішняя Ніжне-Ляхаўская, а пасля другая, цяперашняя Гастэлы, колішняя Правіянцкая. Не ведаю я пакуль і пра тое, што імем гэтага шаўца-тэрарыста не толькі вуліцы ў Мінску называліся, але і помнік яму стаяў, і не дзе-небудзь “на Лекерта”, а на пляцы Волі, і не на спуску да Нямігі, дзе мясцілася ятка Саламона Майсеевіча, а ў цэнтры – на месцы помніка імператару Аляксандру II. Косця Воран яшчэ не сказаў мне, што дарма я гэтак

замілоўваюся Мінскам, бо ціхі, правінцыйны Мінск – любімы горад бандытаў і тэрарыстаў: ад Лекерта з Пуліхававым да Лі Гарві Освальда.

Я пра многае пакуль не ведаю… І нават не ўяўляю, што дажыву да часоў, калі з’явяцца ў Мінску новыя тэрарысты – і выбухне бомба ў метро. Дый як можна ўявіць такое, калі яшчэ няма метро ў Мінску?

З пляца Волі, дзе Саламон Майсеевіч паказвае мне месца, на якім стаяў спачатку помнік імператару, а потым тэрарысту, мы ідзем па вуліцы Рэвалюцыйнай, былой Койданаўскай, паўз колішні дом Мінскага віцэ-губернатара, банкірскую кантору Ліўшыца і хірургічную лякарню Шапіры, гатэлі “Нова-Варшава” і “Лівадыя”; ідзем паўз дзве камяніцы былога Інбелкульта, Інстытута беларускай культуры, у адной з якіх працаваў брат Саламона Майсеевіча Ізя, а ў другой, пазней, калі Інбелкульт ператварыўся ў Беларускую акадэмію навук і перабраўся ў дом на рагу вуліц Леніна і Кірава, размясціўся следчы ізалятар НКУС, Народнага камісарыята ўнутраных спраў, куды 17 лістапада 1937 года брата Саламона Майсеевіча Ізю забралі і невядома дзе падзелі, і, нарэшце, Саламон Майсеевіч прыпыняецца насупраць колішняга дома Залкінда, на вокны якога любіць ён хвілінку-другую паглядзець ды сёе-тое паўспамінаць. Калісьці ў доме гэтым мясцілася прыватная жаночая гімназія мадам Рэйман, дзе ў класе Алексютовіча, знакамітага балетмайстара, вучылася Сонечка Лямпель – будучая маці Асі…

– Ой… ёй-ёй… ёй-ёй-ёй, як яна танчыла… – тройчы ўздыхае Саламон Майсеевіч і доўга маўчыць. Пасля кажа ціха, неяк недаўменна: – Ізю – камуністы, Соню – фашысты… – і зноў маўчыць, пакуль зноў не выходзім мы на Нямігу, дзе ён пытае. – А ведаеш, як немцы ў час вайны Нямігу называлі?.. Хаімштрасе… Мы тут жылі, на Нямізе, а яны зрабілі тут гета на Хаімштрасе, забілі маю Соню, асіраццілі маю Асю… А цяпер ятку зносяць, – сканчае ён, нібы забыўшыся, што тых немцаў, якія Нямігу Хаімштрасе называлі, у Мінску даўно няма. – І Нямігу знясуць, пабачыш. Як знеслі помнік бітве на Нямізе: вось тут ён стаяў, дзе зараз мы стаім – на пустым месцы… Можа, сюды ятку перанесці, калі таварыш Шарапаў дазволіць?.. Каб месца такое не было пустое.

Чамусьці я ўпэўнены, што ятку перанесці Саламону Майсеевічу не дазволіць ніхто і нікуды, але казаць пра гэта яму не хачу, ды ён пра гэта мяне й не пытае, вітаючыся з чалавекам у чорным гарнітуры, у акулярах і з газетай пад пахай:

– Дзень добры, Яша, як жывеш, куды йдзеш, ты таварыша Шарапава ведаеш?..

Я пакуль не ведаю, што Яша, Якаў Барысавіч Мельцэрзон, выкладае фізіку ў 42-й школе на вуліцы Камсамольскай, дзе вучылася Ася і дзе раней, да рэвалюцыі, калі Камсамольская называлася Багадзельнай, а перад тым – Феліцыянскай, была на месцы школы прыватная чатырохкласная габрэйская жаночая гімназія мадам Лявідавай-Нейфах, якую скончыла цётка Асі, сястра Саламона Майсеевіча прыгажуня Ада, у час вайны павешаная ў гестапа на вуліцы Ракаўскай, якая ў савецкія часы стала вуліцай Астроўскага, дзе жыве цяпер Якаў Барысавіч. І не ведаю я пакуль пра тое, што ўжо ад пачатку вуліцы Астроўскага ў вокнах дома № 7, таго самага, дзе мясцілася гестапа, відаць было, як Ада і яшчэ чатары чалавекі, разам з ёю павешаныя, вісяць… Яны некалькі дзён віселі, і кожны дзень Саламон Майсеевіч бачыў сястру, калі яго вялі з гета на працу і пасля працы ў гета.

– Туды іду, дзе жыву, а Шарапава не ведаю, – адказвае Саламону Майсеевічу Якаў Барысавіч, у якога, апроч Асі, вучыліся і Косця Воран, і Ігар Гурковіч, і шмат хто яшчэ, але на фізіка вывучыўся толькі Жарэс Алфёраў, які стаў доктарам навук і нават Нобелеўскім лаўрэатам, хоць быў стылягам, насіў порткі-дудачкі ды стракатую кашулю з малпамі.

Я пакуль не ведаю, што Якаў Барысавіч ўратаваў Асю. У адным з пагромаў у мінскім гета Асіну маці застрэлілі на Юбілейнай плошчы. Саламона Майсеевіча ў той дзень, як заўсёды, пагналі на працу, а Якаў Барысавіч, у пагроме ўцалеўшы, прыбіраў забітых. Ён і знайшоў Асю, якую накрыла сабой яе маці. Ася амаль не дыхала. Якаў Барысавіч паклаў яе разам з маці на вазок і, не ведаючы, што рабіць, бо карнікі і дзяцей дабівалі, пацягнуў вазок да габрэйскіх могілкаў. Там, за агароджай, стаяла жанчына, з якой ён быў знаёмы. Звалі яе Вера Леанардаўна, яна працавала ў дзіцячым доме, і Якаў Барысавіч скінуў Асю з вазка пад агароджу… Пасля вайны ў тым дзіцячым доме, дзе працавала тая жанчына, Ася і знайшлася…

Раздумаўшы ставіць ятку на месцы, дзе высіўся некалі помнік бітве на Нямізе, Саламон Майсеевіч ідзе з Якавам Барысавічам туды, дзе той жыве, бо яны даўно, з учора, не бачыліся – і ёсць ім пра што паразмаўляць сам-насам, без мяне, бо што я ведаю?..

Я нават не ведаю, як яны самі ў гета ўратаваліся. Ас распавядае гісторыю пра маладую габрэйку, якую звалі Ліна. Яна была прыгажуня, гуляла з тымі, каго габрэі называлі газлонім, бандыты. Усе лічылі яе прастытуткай. “А Ліна была савецкай разведчыцай і працавала на аэрадроме!” – кажа Ас так, нібы савецкай разведчыцай прастытутка неяк яшчэ можа быць, але на аэрадроме працаваць ніяк

не можа. – І была звязаная з партызанамі, да якіх вывела з гета амаль трыццаць чалавек – сярод іх і Саламона Майсеевіча з Якавам Барысавічам”.

Калі б на тым Ас спыняўся, дык гісторыя была б праўдападобная. Але Ас не спыняўся, расказваў, як з Крыма, у небе над якім ён ваяваў, яго выклікаў Сталін і загадаў ляцець у Мінск, каб забраць разведчыцу, якой удалося займець сакрэтныя дакументы, нядаўна падпісаныя Гітлерам: новы план вайны. “Ляці, сокал!” – сказаў Сталін, і Ас пераляцеў лінію фронта, сеў на аэрадроме ў Мінску і забраў разведчыцу Ліну, якую Саламон Майсеевіч з Якавам Барысавічам прыкрывалі агнём, пакуль яна бегла да самалёта. “Азохэн вэй!” – заўсёды ўсклікваў у гэтым месцы аповеду Саламон Майсеевіч іналіваў Асу газіроўкі з сіропам…

Калі ад месца, дзе некалі помнік бітве на Нямізе стаяў, падняцца ўверх па вуліцы Калектарнай, дык можна выйсці якраз да габрэйскіх могілкаў, дзе ляжыць Асіна маці, і куды некалькі разоў я хадзіў з Асяй, але зараз я адзін – і што мне там рабіць? Таму, пастаяўшы на месцы помніка, я паварочваю назад, іду па Нямізе проста для таго, каб па ёй ісці.

Старая Няміга – нават не вуліца, а даўжэзны калідор вялізнай камунальнай кватэры. Справа і злева – драўляныя і жалезныя, каваныя брамы і брамкі, што вядуцьу двары і дворыкі, у якія проста так не зойдзеш, бо нехта, седзячы пры керагазе ці дыван выбіваючы, абавязкова спытае: “А вы да каго будзеце?..” “Да Косці Ворана…” “Косця-я-я!.. – адразу ж прагалёкае на ўвесь двор, на ўсю Нямігу той, хто спытаў. – Шпэндрык да цябе нейкі!..” – і зноў займецца керагазам ці дываном, залаты пыл з яго выбіваючы, і нават не спрабуй даводзіць некаму ў тым пыле, што ты не шпэндрык. Не ведаюць цябе на Нямізе, значыць, шпэндрык.

А пад вуліцай Нямігай бяжыць Няміга-рака… Хоць і схаваная ў трубу, але тая самая, бітве на якой – помнік. Не толькі той, каменны, які знеслі. Ёсць помнікі, якія не знясеш. Не каменныя. “Нямізе крывавы брэзе не балагам бяхуць пасеяны, пасеяны касцьмі…”

Косця кажа, што зусім не на Мінскай Нямізе была тая бітва, бо не было тут за што і каму біцца. І што ўвогуле не б’юцца на рэках даўжынёю ў тры вярсты. Можа, яно і так, але, давяраючы Ворану ва ўсім, у гэтым я не веру яму. Біцца заўсёды ёсць за што і ёсць каму ў любым месцы. А тым больш на Нямізе…

На Нямізе, на гаўбцы, скошана навіслым над вуліцай, я ўпершыню ўбачыў Асю. Ускінуўшы рукі, стрункаю цягнучыся ўвышыню, яна стаяла ў белай сукенцы, на якой золатам плавіўся

пажар яе валасоў, і, здавалася, над Нямігай, якая была і вуліцай, і ракой, плыла ў нябёсах разам з асветленымі вечаровым сонцам аблачынамі... Я забыўся, куды і па што іду лабірынтамі Нямігі, стаяў аслупянела, як пыл у дворыку, пакуль яна не апусціла адну руку на парэнчы гаўбца і не ўзмахнула другой рукой уздоўж вуліцы, у мой бок – я падумаў: мне! Сэрца ўдарыла пад горла, ёкнула і ўпала, але з-за спіны маёй імклівым, пругкім крокам вымкнуў нехта, хто быў вышэйшы за мяне, мацнейшы, прыгажэйшы – і, вымыкаючы з-за маёй спіны, ён адной рукой, у якой нёс скручаны ліст ватману, прыабняў мяне за плечы, а другую руку, у якой было шампанскае, ускінуў і крыкнуў: "Стань маёй – і горад гэты я кіну да ног тваіх!.."

Шампанскае, з корка якога загадзя была скручаная драціна, беніста стрэліла ўгору – у нябёсы, адкуль рассыпаўся смех, нібы кінулі адтуль жменю срэбных манет...

Так я пазнаёміўся з Асяй, якая жыла ў нябёсах, і з Косцем, які жыў на зямлі. А заадно і з Гурыкам, які жыў паміж Косцем і Асяй, паміж зямлёю і небам, паміж усімі і ўсім... Ну, так, як жывуць гэбісты.

Як я ні ўпіраўся, Косця, які зразумеў, што я сканаю, калі зблізку не ўбачу тое, з чаго аслупянеў здаля, зацягнуў мяне на сваю галубятню, якая была і ягонай майстэрняй, і кватэрай, дзверы ў якую амаль ніколі не замыкаліся, і, калі гаспадара не было дома, госці ягоныя не чакалі ў парозе. Гэтым разам, апроч Асі, не чакаў гаспадара ў парозе і Гурык, які ў куце, адгароджаным кавалкам фанеры пад кухню, гатаваў каву, і сказаў, як толькі Воран ўпіхнуў мяне ў дзверы: "Стаўшы тваёй, яна варонай стане".

– Няміга можа не стаць Нямігай, – кінуў Косця на канапу скручаны ліст ватману і ў рознакаляровыя, пафарбаваныя слоікі, што стаялі на заваленым кнігамі і малюнкамі стале, пачаў разліваць шампанскае. – Чуць не хочуць пра рэканструкцыю. Знесці ўсё збіраюцца, магістраль ім патрэбная. "Мы разгладзім старыя маршчыны!.." – перадражніў ён некага. – Ды д'ябла ім лысага! Хрушчоў прыязджае, да Хрушчова прарвемся! Калі ў Маскве перамены, чаму ў Мінску без перамен?..

– Якія перамены?.. – прамуркаў Гурык, асцярожна несучы кубачак кавы на гаўбец. – Што на што мяняюць?.. – паставіў ён кубачак перад Асяй, якая з гаўбца спытала: "Косця, а што на што ў Менску мянялі?.." – і Косця дацiснуў з бутэлькі апошнія кроплі шампанскага: "Шыла на мыла".

Назва Менск, даводзіў Косця, паходзіць не ад славянскіх слоў мяняць ці мена, а ад лацінскага, якое перайшло да балтаў, гэта

значыць, да нас, слова menkas, што азначае мелкі, маленькі. Таму і мелкую рэчку назвалі некалі Менкай, і заснаванае на ёй паселішча – Менскам. І было гэта не тут, дзе сённяшні Мінск, а за 15 вёрст адсюль на захад, дзе тая Менка цячэ…

“Вось з таго часу, – сказаў Гурык, – у Менску без перамен…” “Пара вершы слухаць! – дапіла каву і ступіла з гаўбца Ася, толькі тут, нарэшце, убачыўшы мяне, лысага, сёння з раніцы пад шар пастрыжанага. – А гэта хто?..” “Паэт, – нібы падцягнуў мяне да сябе ўчэпістым позіркам Гурык. – У заклад, што паэт…” “Скуль ты ведаеш?” – спытала Ася, прашумеўшы белай шоўкавай сукенкай, праплыўшы белым пахам ландышаў, і Гурык адказаў, кінуўшыся дзверы перад ёй адчыняць: “Па вушах бачу”. “Па вушах? Якія ў яго вушы?” “Зрыфмаваныя”. “А шампанскае? – вярнуў іх Косця, і яны паднялі слоікі: Косця зялёны, Ася жоўты, Гурык чырвоны… – Гэта ўнук Хрушчова, – падаў мне, скамянела-лысаму, сіні слоік Косця. – Так што глядзі, Гурык… За перамены!..”

Было лета, з вуліцы пахла ліпамі і нагрэтай чарапіцай, шырока біла ў акно сонца, рознакаляровым святлом насычаючы ў слоіках, нібы ў кожным рознае, у каго якое, віно, і я, аслупянелы, але такі шчаслівы, якім ні раней не быў, ні потым, упершыню ў жыцці п’ю шампанскае, і мне ўсміхаецца найпершая ў Мінску прыгажуня, і са мной, з падшыванцам, як з роўным, выпіваюць найпершыя ў Мінску хлопцы… і я дасюль, як толькі падыходжу да светлафора, на якім міргаюць зялёны, жоўты і чырвоны колеры, згадваю тое рознакаляровае шампанскае, той дзень, тое лета, тое сонца, тое свята, тое жыццё… і слупянею… і мяне ніводнага разу не аштрафавалі за парушэнне правілаў пераходу вуліцы… бо як перайсці тую вуліцу, якой няма?..

Завейныя веі!
Пад неба завеі, пад месяц!
Чаму мы не ўмеем
Святочнае лашчыць і песціць?
Будзённасць атуліць.
Няміга заб’ецца галінкай.
Там лета было, ты адтуль мне
Махаеш хусцінкай…

У любым месцы ёсць за што і ёсць каму біцца.

Вуліца Энгельса, колішняя Дамініканская, былая Петрапаўлаўская

У павольнай плыні Мінскага жыцця пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя бывалі і ўсплёскі. Двойчы на тыдзень, вечарамі, Косця Воран падымаўся ўвесь у белым на прыступкі тэатра Юнага гледача, ставаў, як патрыцый, паміж псеўдаантычнымі калонамі, азіраў вольных менчукоў, што сабраліся ўнізе, і абрушваў на іх густы, быццам гул на званарні, голас.

– Кожны горад, які хоча застацца ў вечнасці, павінен мець свайго гарадскога вар'ята! У Афінах – Сакрат, у нас – Ас! У Рыме ўсе былі ненармальнымі, таму ён і вечны горад! Дагонім Рым па вечнасці! Першым даганяе Гарык Клябанаў…

На прыступкі таэтра Юнага гледача ўскокваў рэдкавалосы, кораткастрыжаны, каб не надта заўважным было рэдкавалоссе, хударлявы юнак з гітарай і па-беларуску пачынаў спяваць тое, што ўсе звыклі слухаць па-руску:

“Я ўсё адно ўпаду на той,
На той далёкай Грамадзянскай,
І камісары ў пыльных шлемах
Галовы схіляць нада мной…”

Гарык Клябанаў і ў нашай кампаніі, і ў Мінску, і ва ўсёй Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы быў першы, хто песні рускіх бардаў заспяваў па-беларуску – і спяваў ён так, што камісары, якія схілялі над ім галовы, былі падобныя не на тых, перацягнутых кулямётнымі стужкамі, людзей у скуранках, якіх паказвалі ў фільмах пра Грамадзянскую вайну, а на касіянераў Каліноўскага.

Вечарамі на прыступках тэатра Юнага гледача спяваліся песні і чыталіся вершы. Ас у шынялі з пагонамі генерал-маёра авіяцыі стаяў сярод бардаў і паэтаў, Гурык у цывільным – насупраць. Апроч Гурыка, снаўдалі сярод вольных менчукоў яшчэ з дзясятак ягоных калег. Яны ўчэпіста ўзіраліся і ў тых, хто чытаў і спяваў, даганяючы Рым па вечнасці, і ў тых, хто слухаў, не даганяючы.

“Спартак, Спартак! Героі ўсіх эпох!
Ці не такі быў лёс ваш у фінале:
Як нехта моцна спаў, вас распіналі,

Вы ціха на крыжы сваім каналі,
І білася жанчына каля ног!”

– ускідваў руку ў фінальным жэсце цыбаты, прыхарошаны ў мадняцкую вадалазку і шыракаплечы пінжак, паэт, і незразумела як і з чаго ад гэтых радкоў пра паўсталага рымскага раба павявала з-за псеўдаантычных калонаў тэатра скразняком крамолы... А ўжо ад верша не пра раба, а пра маршала – і не пра рымскага – цягнула сіберам.

“Як вам днём жывецца, маршал? Спіцца ўночы?
Вам не сняцца твары нашы? Нашы вочы?
Вам не мрояцца хімеры: нашы цені,
Што фанерай над Берлінам праляцелі?..”
На Чырвонай плошчы заклікі ды маршы,
І на маршальскай кабыле скача маршал!
Медзі музыка літая поўніць плошчу!..
“Маршал, – мама запытае, – дзе мой хлопчык?..”
“Слава паўшым!..” – стане плошча на калені.
І парадным строем пройдуць нашы цені.
Трыста тысячаў разоў, таварыш маршал,
Вы манілі зноў і зноў матулям нашым!..

– сціскаючы ўскінутыя ўгору кулачкі, крычаў так, што рэха тузалася ў калонах, пасляваеннага вырабу хлапчук, і ніхто не мог зразумець, чаму маніў маршал менавіта трыста тысяч разоў?..

– Час прабіў! – ускінуў, паўтараючы жэст хлапчука, кулакі ўгору Ас, як толькі хлапчук дачытаў верш пра маршала. – Ваш час, Палкоўнік!

Палкоўнік падняўся і стаў побач з Асам.

Вершы Палкоўнік не чытаў і песні не спяваў, але на прыступкі тэатра Юнага гледача, каб нешта сказаць, падымаўся. І калі ён падымаўся, каб нешта сказаць, дык тое, што ён казаў, больш за вершы з песнямі напружвала і вольных менчукоў, і Гурыка з дзясяткам ягоных калег у цывільным.

– Трыста тысяч!.. Вас тут і трохсот не набярэцца, а там – трыста тысяч! Трыста тысяч салдацікаў паклаў маршал Жукаў па загадзе генералісімуса Сталіна пры штурме Берліна вясной сорак пятага года! Трыццаць тысяч іх палягло ў адзін дзень на Зеелаўскіх вышынях! Штурм нічога не вырашаў, Берлін быў абкружаны! Дык дзеля чаго кінулі на смерць столькі людзей? Якія маглі вярнуцца з вайны, будаваць дамы, гадаваць дзяцей! Толькі дзеля таго, каб не

амерыканскія, а савецкія войскі першымі ўвайшлі ў Берлін! Толькі дзеля задавальнення сталінскай фанабэрыі! А хто палёг на Зеелаўскіх вышынях? Мінскія хлопчыкі, мабілізаваныя на фронт пад самы канец вайны! Таму Мінск – вечны горад загубленых геніяў!..

Калі Палкоўнік спусціўся з прыступак, да яго падышоў Гурык і адвёў убок… Нешта сказаў яму, а Палкоўнік павярнуўся да ўсіх і крыкнуў:

– Ведаеце, што ён мне сказаў?.. Што маршала Жукава можна не любіць, але не ў нас, а ў Маскве! А ў нас загад любіць яго ніхто не адмяняў! Дык мне ў Маскву ехаць?..

– Не! – ускрычалі ў адзін голас вольныя мінчукі, а Гурык узяў Палкоўніка пад локаць:

– Пройдзем!

Прайсці з Палкоўнікам старшаму лейтэнанту Гурковічу не ўдалося, бо з прыступак скочыў Ас, адпіхнуў Гурыка і пацягнуў Палкоўніка ў гушчар вольных мінчукоў, якія пляскалі абодвум вар'ятам…

Так, меўся ў Мінску, апроч Аса, яшчэ адзін вар'ят, як у Афінах Сакрат. Але гэты, Палкоўнік, у адрозненне ад толькі на сябе самога падобнага Аса, быў насамрэч падобны на Сакрата. Так што, калі, як казаў Косця Воран, гораду для вечнасці патрэбны ненармальны, дык Мінск на вечнасць можа разлічваць двойчы.

Мінск – горад-двойчы вар'ят.

Убачыўшы, што Гурык і ягоныя калегі ў цывільным занятыя Палкоўнікам, на прыступкі нерашуча падняўся чарнявы, з кудзеркамі, юнак у футболцы і картовых штанах, з-пад якіх вытыркаліся стаптаныя чаравікі з абарванымі, якіх не хапала, каб зашнуравацца на усе дзірачкі, шнуркамі. Ён і блізка не паходзіў на Гарыка ці Косцю, гарадскіх стылягаў. Па ўсім было відаць, што хлапчына ў футболцы – вясковец, які апынуўся ў Мінску, паступіўшы на філфак універсітэта ці педінстытута. Трохі заікаючыся, ён прачытаў хутка і ціха – так, што мала хто пачуў:

Рахманыя, няўпартыя,
Мы ўсе – адзін калгас.
Кіруе намі партыя
І думае за нас.
Дазвол ёсць жыць у лагеры
Сацыялізма ўсім.
Дарма буржуі звягаюць,
Мы не зайздросцім ім.

На волю нам не хочацца,
Мы рушым свет стары,
І вораг не праточыцца
У цвёрдыя муры.
Дакладна кожны ведае:
Быў камуніст – Ікар!
Для мар пра заўтра светлае
Хапае голых нар.

Як ні ціха прагучалі вершы, адзін з калегаў Гурыка ўсё ж нешта расчуў і пачаў прабірацца да прыступкаў, каб перастрэць крамольнага філфакаўца, але барды і паэты, за спінамі якіх прыадчыніліся ўваходныя дзверы тэатра, засланілі крамольніка. Ён хуценька праслізнуў у тэатр – і дзверы зачыніліся, як нічога й не было. Але ж было, было – і яшчэ невядома, ці ўдасца філфакаўцу ўцячы праз тэатр на свой філфак. Калі ж сёння ён і ўцячэ, дык заўтра нехта з аднакурснікаў на яго данясе, і будуць у філфакаўца праблемы, хай нават гэбісты, занятыя Палкоўнікам, толкам вершы ягоныя і не расчулі.

“Гісторыі кола
Заўсёды круціла крамола!
Стагналі Афіны,
Цары вар'яцелі на тронах,
Чырвонай цаглінай
Слізгала крамола па скронях!..”

– ударылі па гітарных струнах і заспявалі Гарык Клябанаў, Віл, Воран і Ас, які умеў не толькі лепш за ўсіх свістаць, але й на гітары граць за ўсіх не горай, а вольныя мінчукі, спрабуючы зратаваць Палкоўніка, абкружылі яго і павялі ўверх па вуліцы Энгельса да Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, пад левым крылом якога ўтульненька патанаў у засені клёнаў з таполямі трохпавярховы дом, у якім 21 верасня 1943 года Герой Савецкага Саюза, былая афіцыянтка сталовай таго ж ЦК КП (Б) Алена Мазанік падклала міну пад ложак гаўляйтэра Беларусі Вільгельма Кубэ…

Можа быць, праз тое, што Кубэ быў не толькі гаўляйтэрам, але і літаратарам, паэтам і драматургам, былы дом ягоны стаў пасля вайны домам Саюза пісьменнікаў, а былая спальня – кабінетам літаратурных кансультантаў, куды вольныя мінчукі і зацягнулі Палкоўніка. Гурык з калегамі ў цывільным пакруціліся паблізу, пра нешта пашапталіся, але забраць Палкоўніка здому пад крылом ЦК не рашыліся.

Шкада, што пазней, ужо ў 70-х гадах, махнуў крылом беларускі партыйны ЦК – і не стала ні таго дома, ні тапляў з клёнамі. Знеслі, скарчавалі. Не так, канечне, шкада той дом, як шкада Нямігу, але ўсё ж…

У кабінеце літаратурных кансультантаў Саюза пісьменнікаў стаялі тры сталы, кансультанты сядзелі за адным з іх, сярэднім, і выпівалі. Пад крылом ЦК яны не баяліся выпіваць, не зачыняючы дзверы.

– Вы да каго?.. – пацікавіўся ў вольных мінчукоў вялізны, з галавой дзіцяці, кансультант, і Палкоўнік адказаў, што і ён, і Анатоль Пястрак, сын вядомага беларускага пісьменніка-рэвалюцыянера Піліпа Пестрака, і ўсе вольныя мінчукі… Віл, Воран, Гарачы, грамадзянка Бланкі вось гэты… ён не ведаў, як мяне зваць, і ніяк не назваў… прыйшлі да кансультантаў, бо на дзвярах кабінета з таго боку напісана, што тут кансультанты сядзяць.

– Не сядзяць, – паправіў Палкоўніка той жа “дзіцячы” кансультант. – Працуюць. – І хоць папраўка ягоная не зусім адпавядала рэальнасці, Палкоўнік не стаў спрачацца, спытаўшы:

– А хто з вас Пятрусь Броўка?

Кансультанты пераглянуліся…

– Ніхто з нас не Пятрусь Броўка, – не надта прыязна адказаў іншы кансультант, з лысінай, пузаты і круглатвары. – Пятро Усцінавіч Броўка – старшыня Саюза пісьменнікаў, а мы – кансультанты. Па прозе, паэзіі і драматургіі. – І кансультант з лысінай, пахмурна зірнуўшы на Палкоўніка, паўтарыў пытанне кансультанта з дзіцячай галавой. – Вы да каго?.. У якім жанры сябе спрабуеце?..

Падумаўшы, Палкоўнік адказаў, што ён спрабуе сябе ў жанры крытыкі, але ў былой спальні гаўляйтера Вільгельма Кубэ стаялі сталы для кансультантаў па прозе, паэзіі і драматурггі, а вось па крытыцы ні кансультанта, ні стала для яго не было.

– Па крытыцы кансультанта няма… – вінавата сказаў пузаты, і Палкоўнік адчуў, што ёсць магчымасць выявіць свой акторскі талент не калісьці і дзе-небудзь, а зараз і тут.

– Та-а-ак… – працягнуў ён, уважліва гледзячы на пузатага. – Як старшыня партыйна-камсамольска-рэвалюцыйна-рэвізійнай камісіі па праверцы… – не дагаварыў ён, па праверцы чаго, і спытаў напорыста. – Можа быць, Саюз пісьменнікаў Беларусі не лічыць літаратурную крытыку важным жанрам, у той час як партыя вызначае яе ролю ў развіцці савецкай літаратуры як вядучую?.. Можа быць, – перакінуўся старшыня немаведама якой партыйна-камсамольска-рэвалюцыйна-рэвізійнай камісіі з пузатага кансультанта, які раптам спаў з твару, на кансультанта з дзіцячай галавой, –

кансультанты Саюза пісьменнікаў Беларусі не чыталі прамову першага сакратара ЦК КПСС таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова на трэцім з’ездзе савецкіх пісьменнікаў?.. Чыталі?.. – тузануў Палкоўнік за плячо яшчэ аднаго кансультанта, худога мужыка ў паласатай безрукаўцы са споўзлымі на нос акулярамі, які, роўненька седзячы, драмаў за сталом і, тым не менш, нават не разумеючы, чаго яго тузаюць, прачамкаў: “Чыталі… мы чыталі…” – а Палкоўнік штурхнуў худога ў другое плячо так, што ў таго акуляры зляцелі, і ва ўсіх запытаў з жалезам у голасе: “Як называецца прамова, калі вы яе чыталі?”

Кансультанты яшчэ не выпілі столькі, каб нічога не баяцца, таму на ўсялякі выпадак спалохаліся. Спрацавалі гены з інстынктамі ды яшчэ тое, што Палкоўнік адразу ўдарыў цяжкой артылерыяй: камісія, партыя, першы сакратар…

– Не помню… – прамямліў кансультант з дзіцячай галавой, безнадзейна гледзячы на худога кансультанта ў безрукаўцы, які, шукаючы акуляры і ўсё яшчэ не цямячы, што адбываецца, прамаўчаў, а пузаты паўтарыў: “Мы кансультанты…” – і голас ягоны ўжо быў прыязны, і позірк не пахмурны, а ліслівы.

Палкоўнік злавіў кураж і, не паддаўшыся на ліслівасць, ускочыў на каня.

– І верш найвялікшага савецкага паэта, найблізкага сябра першага сакратара ЦК КПСС таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, пра якога таварыш Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў казаў на з’ездзе савецкіх пісьменнікаў як пра прыклад, пра ўзор паэта і паэзіі, таксама не памятаеце?.. Га? – зусім разышоўшыся, схапіў Палкоўнік загрудкі пузатага. – Памятаеш, ці не?.. Хто з вас кансультант па паэзіі? Ён?.. Ён? Ты?.. А, ты!.. – ледзь не парваў Палкоўнік кашулю на пузатым кансультанце па паэзіі, і я падумаў, што ад гэбістаў, можа, сёння мы і адарваліся, але міліцыі не праміне́м. – Тады імя назаві! Імя паэта, найблізкага сябра таварыша Хрушчова, калі ты, кансультант, вершаў не помніш! Ну, імя?..

– Панцялей Махіня, – пачуўся раптам за маёй спінай, ад дзвярэй, у якія нехта ўвайшоў незаўважна, мякка-насмешлівы голас. Павярнуўшыся, я блізка, твар у твар убачыў дзецюка з русявымі, хваляй спадаючымі на лоб, валасамі і з гэткімі ж мякка-насмешлівымі, як і голас, вачамі, якія, пры ўсёй мяккасці позірку, нечакана здзіўлялі, нават насцярожвалі тым, што былі рознакаляровыя: правае вока – шэра-зялёнае, а левае – светла-карычневае, арэхавае, якое глядзела да таго ж паўз цябе, нібы трохі косячы. І, трохі косячы на Палкоўніка, русявы дзяцюк з мякка-

насмешлівым голасам прадэкламаваў:

“Люблю за книгою правдивой
Огни эмоций зажигать,
Чтоб в жизни нашей суетливой
Гореть, гореть и не сгорать.
Чтоб был порыв, чтоб были силы
Сердца людские зажигать,
Бороться с тьмою до могилы,
Чтоб жизнь напрасно не проспать.
Ведь долг мой, братья, поколенью
Хоть каплю оставить честного труда,
Чтоб там, за черной загробной тенью
Не грызла б совесть никогда”.

Палкоўнік не чакаў, што нехта, апроч яго і Хрушчова, можа ведаць – ды яшчэ на памяць – вершы Панцялея Махіні, таму глянуў на русявага так, як рэдка на каго глядзеў: з павагай.

– Ну, чуў?.. – адпусціў ён, нарэшце, пузатага кансультанта, якога ўсё яшчэ трымаў за кашулю. – Гарэць і не згараць!.. Каб не праспаць! А вы тут спіце п’яныя – і сумленне вас не грызе!..

– Я не п’яны… – сказаў усё, што мог сказаць, пузаты кансультант па паэзіі, а кансультант з дзіцячай галавой, які, пакуль чыталіся вершы, паспеў агледзецца і нешта западозрыць, спытаў:

– Вы з якой камісіі?.. Пакажыце пасведчанне, з якой?..

– Позна! – адрэзаў Палкоўнік. – Камісія праверку скончыла! І зрабіла высновы!

Пузаты кансультант з лысінай і худы кансультант у паласатай безрукаўцы глянулі на вялізнага кансультанта з дзіцячай галавой, не ўхваляючы яго за смеласць…

– Ды што вы перапудзіліся! – прайшоўшы да стала, за якім сядзелі запалоханыя кансультанты, паставіў перад імі пляшку гарэлкі рознаколеравокі дзяцюк. – Гэта ж Палкоўнік! Кім, Сысой!..

У Палкоўніка, як і ў Аса, было яшчэ некалькі мянушак: Сысой, Кім… Апошняя, аказалася, ягонае сапраўднае імя, якім назвалі яго бацькі, татарын-казак і габрэйка-бундаўка, у гонар Камуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі. КІМа. Бацькі Палкоўніка былі нейкімі надта заўзятымі бальшавікамі, нават большымі бальшавікамі, чым сам таварыш Сталін, якога Кім неўзлюбіў хоць і пазней за Саламона Майсеевіча, але сказаў пра гэта раней: не па смерці правадыра ўсіх народаў, у тым ліку і татарскага з габрэйскім, а пры ягоным жыцці. І сказаў не з ваконца яткі, каля якой стаяла млявая чарга па газіроўку,

а ва ўніверсітэце, дзе праходзіў бурлівы сход самага зацятага атрада Камуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі. Праз гэта Кім, які пазней, зарабляючы на хлеб і гарэлку, напісаў процьму кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, назаўсёды застаўся недавукам, пераведзеным з універсітэта ва Уладзімірскі цэнтрал, са студэнцкай лаўкі на турэмныя нары, на якіх навучыўся не любіць не толькі таварыша Сталіна, але і Хрушчова, і Брэжнева, і ўсіх, хто быў пасля.

Аднойчы, калі мы, усе свае (хоць Палкоўнік ніколі не быў для нас сваім – як і мы, дый усе астатнія, не былі для яго сваімі, бо ён быў адзін) стаялі каля яткі, Саламон Майсеевіч спытаў журботна: “А чаму гэта, Кіме мой, – ён толькі так чамусьці звяртаўся да Палкоўніка: Кіме мой, – цябе ў той час не расстралялі?..” – на што Кім прашыпеў, як кранік, калі ў ім газіроўка канчалася: “А таму што ў той час КІМа, Камуністычнага Інтэрнацыяналу моладзі, ужо не было, а быў АЗЛК, аўтамабільны завод Ленінскага камсамола!” – і ніхто не ўцяміў нічога, а Саламон Майсеевіч, цэдзячы ў шклянку малінавы, густы і чырвоны, як кроў, сіроп, і гледзячы на Кіма так, як глядзеў бы на брата Ізю, паківаў галавой і працягнуў: “А-а-а...”

Мусібыць, Саламон Майсеевіч таксама мала што ўцяміў, зразумеў у Палкоўніку. Не толькі ў той дзень, калі спытаў, чаму яго пры Сталіне не расстралялі, а ўвогуле... І калі ўжо Саламон Майсеевіч нечага не разумеў, дык каму тады разумець было?..

Па скон жыцця Кім застаўся дысідэнтам, легендай Мінска, насамрэч вольным, хоць і двойчы адсядзелым, гараджанінам, якому ў кабінеце кансультантаў Саюза пісьменнікаў працягнуў руку дзяцюк з рознакаляровымі вачыма:

– Караткевіч. Уладзімір.

З рэдкай, нават выключнай для ягонага з’едліва-нахабнага характару павагай Палкоўнік пацісную працягнутую яму руку. Уладзімір Караткевіч яшчэ не быў легендай, да легенды далёка было, але Палкоўнік нібы наперад ведаў, каму руку паціскае.

– Адну прынёс, Валодзя?.. – знайшоўшы, нарэшце, акуляры і ўбачыўшы пляшку, спытаў худы кансультант у паласатай безрукаўцы, і ўсе кансультанты глянулі на Караткевіча, чакаючы...

– Другую прынясу, калі прамову Хрушчова прачытаеце, – рушыў да дзвярэй, прапускаючы паперадзе Палкоўніка, Караткевіч. – Дарэчы, раю: песня, а не прамова!..

Хвілінаў праз дзесяць мы ўсе, вольныя мінчукі, былі на Нямізе каля яткі Саламона Майсеевіча, і, ахаладжваючыся, пілі ваду з сіропам – з малінавым і вішнёвым, персікавым і ананасным, хто з якім хацеў.

– Як вы думаеце, – спытаў, пашыпваючы кранікам, Саламон Майсеевіч, – а што было б, калі б першы сакратар ЦК КПСС таварыш Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў прачытаў на III з'ездзе савецкіх пісьменнікаў вершы майго брата Ізі?.. – І сам адказаў, не чакаючы, пакуль нехта яму нешта адкажа. – Справядлівасць была б…

– І пайшлі б мы наперад да перамогі сіянізму, – дапіў ваду з малінавым сіропам Палкоўнік, сын габрэйкі-бундаўкі.

Вуліца Першамайская, колішняя Вясёлая

Тыдні за два да таго, як Косця Воран распазнаў у Саламоне Майсеевічы сваяка Леніна, Саламон Майсеевіч меў размову з Гурыкам і нам пра яе распавёў.

– Вы ведаеце, з чым ён да мяне падышоў?.. Дык і я думаў: вады выпіць – нічога іншага. Як заўсёды… Налiваю яму з малiнавым, кажу так між намі, што Асю ў тэатральны не прынялі, намякаючы, чаму, бо ён усё ж там служыць, дзе кажуць, што ўсе людзі роўныя, хоць сярод іх ёсць габрэі, а ён пытае: “Почему вы, Саломон Моисеевич, демонстративно разговариваете по-белорусски”? І ведаеце, што я адказаў? “Каб не думалі, што тут Ізраіль”. Толькі і ўсяго… Гэта што: кепскі жарт? Да таго ж гэта Гурык, а не хто-небудзь… А ён мне: “Вы с Кимом антисоветчики, мы с вами разберемся!..” Нібы таксама жарт… А назаўтра мяне адсюль клічуць, вунь туды вядуць і палітычна страшаць, каб я нешта падпісаў. І Гурык там ужо не адзін, з нейкім старшым маёрам – да якіх там жартаў?.. Я пытаюся: “Што я вам магу расказаць, чаго вы не ведаеце? Каму тое трэба, што людзі кажуць, калі ваду п’юць? А калі ўсё ж трэба, дык скажыце, што?..” Дык той старшы маёр пальцам – тыц: “Вы ў нас дажартуецеся!” І некуды падаўся па сваіх таемных справах, не сказаўшы, каб мяне адпусцілі, і я ў іх там сядзеў… Мяне, пакруціўшы, адпусцілі, але як вам Гурык? Ён жа выкруціў так, што мяне амаль арыштавалі! І за што?.. За тое, што тут не Ізраіль?..

– Можа, за тое, што вы сваяк Леніна?.. – спытаў я няўпэўнена, і Саламон Майсеевіч глянуў на мяне, як на чалавека, які ніколі не піў газіроўкі ні з сіропам, ні без.

– Вы яго паслухайце! Вы чулі такое?.. Каб у краіне Леніна некага арыштавалі за тое, што ён сваяк Леніна!.. Чаму цябе ў тэхнікуме вучаць і не выганяюць?

– Дык ты ж не сваяк, Саламон, – заступіўся за мяне Палкоўнік, і Саламон Майсеевіч перакінуўся на яго.

– А не сваякоў Леніна ў краіне Леніна арыштоўваюць?

– Арыштоўваюць… – дапіў ваду і кіўнуў Палкоўнік. – Не сваякоў арыштоўваюць.

Саламон Майсеевіч вытыркнуўся з акенца яткі.

– І цябе арыштавалі і пасадзілі за тое, што ты не сваяк Леніна?

Палкоўнік падаў Саломону Майсеевіча пустую шклянку, узяў у Косці недапаленую цыгарку, зацягнуўся і спытаў сур’ёзна:

– А за што яшчэ, Саламон?

Саламон Майсеевіч, вінавата глянуўшы на Палкоўніка, абмяк у акенцы, прамармытаўшы:

– Гурык надта хоча старшым маёрам стаць…

Косця Воран, які некалі ў войску служыў, зморшчыўся.

– Саламон Майсеевіч, не бывае старшых маёраў, – і Саламон Майсеевіч здзівіўся:

– Пры мне былі.

– Не магло іх быць пры вас.

– Чаму?

– Бо іх не бывае.

– Па якой прычыне?

– Без прычыны. Не бывае – і ўсё!

– А хто бывае?..

– Лейтэнанты. Гурык вунь старшы…

Косця не служыў гэбістам, таму не ведаў, што пры Саламоне Майсеевічы старшыя маёры – два ромбы на пятліцах – усё ж былі, іх адмянілі ў 1943 годзе, зрабіўшы спачатку камісарамі, тры ромбы на пятліцах, а пасля генерал-маёрамі. Гурык у рэшце рэшт да генерал-маёра і даслужыўся.

Гурык, Ігар Гурковіч, вучыўся з Косцем Воранам у адной школе. Некалі яны хадзілі ў адзін клас, сядзелі за адной партай. Нават у войску разам служылі ў Нямеччыне. Ну, калі ў Нямеччыне савецкае войска стаяла… Але потым Косця Воран вывучыўся на скульптара, а Гурык – на гэбіста.

Я вучыўся ў электратэхнікуме сувязі, маладзейшы быў за іх на дзесяць гадоў, але гэтаксама, як і Косця з Гурыкам, быў закаханы ў Асю, толькі безнадзейна – і, можа, праз тую безнадзейную закаханасць, каб хоць неяк я суцешыўся, яны дазволілі мне сябраваць з імі. Я шчасліваўся, што маю такіх сяброў, і сяброўствам з Гурыкам ганарыўся нават болей, чым сяброўствам с Косцем. Асабліва пасля таго, як убачыў Гурыка ў форме: увесь з бліскучымі пагонамі…

Было гэта на вуліцы Першамайскай у рэстаране “Лета”, які месціцца ў доме пры павароце на вуліцу тэрарыста Пуліхава. Калісьці Першамайская ад вуліцы Змітрака Бядулі да маста праз Свіслач і вуліца Ульянаўская ад гэтага маста да Чырвонаармейскай называліся вуліцай Вясёлай. Можа быць, праз тое і з’явіўся тут вясёлы рэстаран, які быў атабараны курсантамі і выпускнікамі вышэйшай школы Камітэта дзяржбяспекі.

На той час у Мінску ва ўсіх былі свае месцы для, як пазней сталі казаць, тусовак. Акторы збіраліся ў “мутным воку”, буфеце філармоніі,

якую перанеслі з клуба імя Сталіна і якая пасля стала Домам мастацтваў, куды хадзіць акторам недалёка даводзілася: і беларускі Купалаўскі тэатр, і рускі тэатр Горкага, і Оперны, і тэатр Юнага гледача месціліся побач…

О, “мутнае вока!..” Гэты гул, гэты чад, гэты гам, у якім кожны чуе тое, што хоча чуць – найперш, зразумела, сябе. Тут кожны хоча сябе паказаць, бо не тут, не ў “мутным воку”, за сценамі ягонымі кожны з нас іншы, не той, кім ён напраўдзе ёсць – хоць на камсамольскім сходзе, хоць у спектаклі “Як гартавалася сталь”. Быць самім сабой нельга нідзе, а ў “мутным воку” можна – вось што цягнула сюды ўвечары, каб заставацца тут да ночы, а то й да раніцы, актораў.

Мастакі вечаравалі ці ў кавярні “Вясна”, бо і ў доме з кавярняй, і ў суседніх дамах былі іх майстэрні, ці ў цукерні “Ласунак”. Ад пачатку гэтая цукерня па-руску называлася “Лакомка” і была адзіным месцам у Мінску, дзе ў той час можна было выпіць не гарэлкі з віном, як у “Вясне”, а кавы, якую хоць і чэрпалі апалонікам з катла, але гэта была насамрэч кава… А вось чаму гэбісты аблюбавалі рэстаран “Лета”, ніхто як тады не ведаў, гэтак і цяпер не ведае. Косця Воран казаў: бо побач трамвайная лінія, можна вагоны падганяць – і адразу з “Лета” ў зіму, на Калыму, дзе Эдзі Рознэр восем гадоў граў у лагерах…

Так ён, Воран, і сказаў у той вечар, калі я ўбачыў Гурыка з бліскучымі пагонамі. Косця быў нападпітку і гучна гэта сказаў, на ўвесь рэстаран. Гэбісты там нешта спраўлялі, таксама былі не надта цвярозыя, накінуліся на Косцю. Не арыштоўваць, проста біць. Косця хоць і быў здаровы, але ж не супраць усіх… Мяне, як шчанюка, адкінулі, а Косцю – нагамі на падлозе… Вось тут Гурык і ўскочыў, вось тут ён мне і глянуўся, увесь у бліскучых пагонах: бутэльку аб стол – гах! “Стаяць! Усім – стаяць!..” І калі ўсе застылі, сплюнуў да Косці: “Вымятайся, сука, пакуль жывы…”

Ну, сукай ён Косцю абазваў так… бо трэба ж было, як я зразумеў, пры гэбістах сваіх нешта сказаць. А Косця мне на гэта кінуў: “Ні хрэна ты, шчанюк, не разумееш…”

– Ні хрэна ты не разумееш! – накінуўся Гурык на Косцю, калі Саламона Майсеевіча забралі ў другі раз і ўжо не выпусцілі ні праз дзень, ні праз тыдзень. – Жарты яму! Калі ён сваяк Леніну, дык хто тады Ленін?!.

– Скуль ты ведаеш, што ён сваяк? Хто табе сказаў? Хто?

– Ніхто! Ведаю!

– А хто Карл Маркс? – насядаў на Гурыка Косця. – Карл Маркс хто? Чаму ён можа быць, а Ленін…

– Не можа!

– Святы?

– Святы!

– А найпершы святы – хто?

– Хрыстос!

– Юда!..

І зноў яны загрудкі…

Тое, што біліся яны не праз Леніна і не праз Саламона Майсеевіча, не праз тое, што Гурык гэбіст, а Косця скульптар, і наогул не праз каго-небудзь ці праз што-небудзь іншае, а толькі праз Асю, я зразумеў пазней, калі спазнаў розніцу паміж летуценнай, лёгкай, няхай сабе і безнадзейна-безадказнай, юначай закаханасцю і пакутлівым, пякельным, дарослым каханнем.

Мне не падабалася, што Гурык і Косця б’юцца. Мне хацелася, каб яны сябравалі, і я пытаў Саламона Майсеевіча: што можна зрабіць, каб іх сяброўства не скончылася? Можа, Асю ўгаварыць выйсці замуж за абодвух?.. “Усё адно скончыцца, – сумна адказваў Саламон Майсеевіч. – Гурык пасадзіць Косцю – і скончыцца”.

Саламон Майсеевіч быў сумны не праз тое, што Косця з Гурыкам Асю падзяліць не маглі. Махаў рукой: “Яна сама іх, як захоча, падзеліць…” Былі ў яго больш сур’ёзныя праблемы.

Калі на месцы яткі аўтамат паставілі, і Саламон Майсеевіч, застаўшыся беспрацоўным, напісаў скаргу ў Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі Беларусі, дык Алік, амерыканец, які быў за камунізм, а значыць, за людзей працы і добрай волі, прапанаваў Саламону Майсеевічу перакласці скаргу на ангельскую мову і даслаць не толькі ў Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі Беларусі, але і ў Белы дом, у Амерыку, дзе таксама ёсць праблема беспрацоўя – і нават большая, чым у нас. Саламон Майсеевіч, каб дапамагчы людзям працы і добрай волі, згадзіўся. Можа быць, адчуўшы пахі адлігі, якія даносіліся з Масквы, ён вырашыў, што цяпер можна ўсё, нават скаргі пісаць адначасова ў Белы дом і ЦК, але пахі той адлігі былі такімі няўлоўнымі, што Саламон Майсеевіч не ўнюхаў, чым насамрэч пахла…

Адсылаючы скаргу ў арыгінале і перакладзе, Саламон Майсеевіч, як пасля спрабаваў ён апраўдацца, вельмі хваляваўся, таму пераблытаў адрасы на канвертах, і ў Белы дом адаслаў арыгінал. А ў Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі Беларусі прыйшла скарга, напісаная па-ангельску…

“У ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ
КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ
ТАВАРЫШУ МАЗУРАВУ К. Т.
ад Бланка Саламона Майсеевіча, беспартыйнага,

СКАРГА.

З дня 17 лістапада 1937 года, калі забралі і невядома дзе падзелі майго брата Ізю, па дзень 5 сакавіка 1953 года я не любіў таварыша Сталіна. Пачуццяў сваіх ніяк, ні словам ні дзеяннем, я не выяўляў, бо наўкол была ўсенародная любоў.

25 лютага 1956 года адкрылася, што таварыша Сталіна не любіў не толькі я, але і Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш М. С. Хрушчоў, які асудзіў таварыша Сталіна за культ асобы. У выніку пераадолення памылак культу 11 красавіка 1961 года просты савецкі чалавек, маёр Юры Аляксеевіч Гагарын, першым узляцеў у космас.

Поспехі савецкай касманаўтыкі далі магутны штуршок тэхнічнаму прагрэсу. 1 чэрвеня 1961 года з праспекта Леніна ад шостай прадуктовай крамы на спуск ад пляца Волі да Нямігі быў перанесены аўтамат з газаванай вадой. Усталявалі яго на тым самым месцы, дзе была ятка, у якой прадавалася такая самая вада. Ятку знеслі, і я застаўся часова беспрацоўным.

2 чэрвеня 1961 года мной быў напісаны ліст у Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт дэпутатаў працоўных, у якім я прасіў растлумачыць, чаму аўтамат перанеслі туды, дзе ўжо была вада, а не туды, дзе яе няма? Напрыклад, на рог вуліц Леніна і Карла Маркса каля авіякасы, дзе народ смягне, асабліва летам, бо з раніцы да ночы душыцца ў чэргах па квіткі. Праз гэта ў чэргах выказваецца незадаволенасць кіраўніцтвам савецкай краіны і персанальна Першым сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Савета Міністраў СССР таварышам М. С. Хрушчовым, "які без вады ў чэргах па квіткі не душыцца". Узятыя ў двухкоссе словы належаць не мне, а грамадзянам з чаргі.

5 чэрвеня 1961 года старшым лейтэнантам таварышам І.А. Гурковічам я быў дастаўлены ў Камітэт дзяржаўнай бяспекі, дзе таварыш у цывільным, які назваўся маёрам Гагарыным (!), даў мне паперу і алоўак, каб я напісаў прозвішчы тых, хто выказвае незадаволенасць кіраўніцтвам савецкай краіны. Я сказаў, што не магу напісаць ніякіх прозвішчаў, бо не ведаю іх. Таварыш маёр Гагарын (!) выказаў меркаванне, што гэта я сам незадаволены кіраўніцтвам савецкай краіны і падбіваю да незадаволенасці іншых, назваўшы пры гэтым імёны некалькіх маладых людзей, якія каля мяне, як таварыш маёр Гагарын (!) сцвярджаў, групуюцца. Гэтых маладых людзей я ведаю як абсалютна савецкіх, камсамольскіх, і выключна праз іх знаёмства з маёй таксама савецкай, камсамольскай дачкой. Таму я адказаў таварышу маёру Гагарыну (!), што нікога і ні да чаго я не падбіваю, моладзь каля мяне не групуецца, як ён сцвярджае, а п'е, як і

ўсе астатнія грамадзяне, газіроўку з сіропам і без. Што ж да мяне асабіста, дык з усіх кіраўнікоў савецкай краіны я меў незадаволенасць толькі таварышам Сталіным, але нават яе не выказваў, бо за мяне яе выказаў Першы сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш М. С. Хрушчоў. Таварыш маёр Гагарын (!) згадзіўся, што таварышам Сталіным у асобных момантах сёння можна быць незадаволеным, але ні ў якім разе не ў Мінску, а толькі ў Маскве. Ён прапанаваў мне падпісаць паперу аб супрацоўніцтве, але я не зразумеў, якое можа быць супрацоўніцтва такой паважнай установы, як Камітэт дзяржаўнай бяспекі, з чалавекам, які прадае газаваную ваду, і ён параіў мне моцна падумаць.

6 чэрвеня 1961 года, роўна за два месяцы да 16-ай гадавіны атамнай бамбардзіроўкі амерыканскімі імперыялістамі японскага горада Хірасіма, галоўнай мэтай якой была спроба застрашыць Савецкі Саюз новай звышмагутнай зброяй, чаго не ўдалося, бо намаганнямі самай перадавой у свеце савецкай навукі ў нас з’явілася свая атамная бомба, я паспрабаваў запісацца на прыём да старшыні Мінскага гарадскога выканкама дэпутатаў працоўных таварыша Шарапава В.І. па пытанні пераносу аўтамата з газаванай вадой са спуску ад пляцу Волі да Нямігі на рог вуліц Леніна і Карла Маркса. У прыёме мне адмовілі, патлумачыўшы, што аўтамат з газаванай вадой пастаўлены на спуску ад пляцу Волі да Нямігі згодна з планам устаноўкі аўтаматаў з газаванай вадой у горадзе Мінску, зацверджаным на сесіі Мінскага гарадскога выканкама дэпутатаў працоўных і падпісаным старшынёй Мінскага гарадскога выканкама дэпутатаў працоўных тав. Шарапавым В.І., які вызначаецца прынцыповасцю і прынятых ім рашэнняў ніколі не мяняе. Прашу памяняць ці тав. Шарапава В.І., ці прынятае ім рашэнне, якое шкодзіць справе выхавання савецкага чалавека як будаўніка камунізму, які на рагу вуліц Леніна і Карла Маркса (падкрэслена мной) не можа выпіць вады. І гэта адбываецца ў той час (!), калі ўвесь савецкі народ скіраваны ў космас і вось-вось пераселіцца на Месяц і ў іншыя сусветы, пра што сведчыць узнёслая прамова першага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Савета МіністраўСССР таварыша М. С. Хрушчована святкаванні 40-годдзя БССР і камуністычнай партыі Беларусі (тэкст прамовы дадаецца).

Да ўсяго ўласнаручны подпіс: Бланк С. М., беспартыйны”.

У Цэнтральным камітэце камуністычнай партыі Беларусі не знайшлося, мусібыць, перакладчыка з ангельскай – і скаргу Саламона Майсеевіча Бланка з дададзеным да яе тэкстам прамовы Мікіты Сяргеевіча Хрушчова пераправілі ў КДБ.

Вуліца Камуністычная, колішняя Другая Міхайлаўская

З Амерыкі, дзе поўна ўсялякіх імігрантаў, таму перакладчыка знайсці не праблема, скаргу Саламона Майсеевіча нікуды не перапраўлялі, але і не адказалі на яе. Мусібыць, пакрыўдзіліся. Не трэба было Саламону Майсеевічу пра амерыканскі імперыялізм пісаць. Ён, можа, думаў, што гэта яму дапаможа, але не дапамагло. Як не памагла і дададзеная да скаргі прамова Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, якую Саламон Майсеевіч, каб у ЦК КПБ прачыталі яе па-беларуску, выразаў з газеты "Звязда".

"Ён разлічваў, што яго за антысавеччыну вышлюць. На "Ту-134" у 72 гадзіны ў Ізраіль", – казаў Гурык, калі Саламона Майсеевіча арыштавалі ў другі раз.

За якую антысавеччыну, калі ў скарзе Саламона Майсеевіча скразная антыамерыканшчына?.. Косця нават спытаў Амерыканца, ці не выкрасліў той, як амерыканскі камуніст, што-небудзь антысавецкае пры перакладзе? Арыгінала мы не бачылі, Амерыканец паказаў нам пераклад, з якога, перш чым аддаць яго Саламону Майсеевічу, зрабіў копію на радыёзаводзе, дзе працаваў. Вось тут бы ў гэбістаў спытацца: хто гэта амерыканца і, можа быць, шпіёна на савецкім заводзе да капіравальнай тэхнікі дапускае?..

Ніхто, канечне, не спытаўся… Але дарэмна Гурык выгляд рабіў, нібы арыштавалі Саламона Майсеевіча толькі цяпер, пасля скаргі ў ЦК, а ў першы раз не арыштоўвалі. Ну, пасля таго, як Саламон Майсеевіч сказаў, што ён сваяк Леніна, чаго ніхто, апроч мяне, Асі і Косці, не чуў. Яшчэ Ас да нас падыходзіў, які мог пачуць…

"Ас мог пачуць", – сказаў я Косцю, які пасля бойкі з Гурыкам наўпрост спытаў мяне: "Хто?.."

Не Ася ж данесла, што бацька ў сваякі да Леніна набіваецца. Тады і яна Леніну радня… Як і Эдзі Рознэру… І не сам жа Косця, які адрэзаў: "Ас пачуць не мог!"

Выходзіла, што я данёс. Ці сам на сябе Саламон Майсеевіч… Каб на "Ту-134" у 72 гадзіны ў Ізраіль.

У любым выпадку трэба было неяк Саламону Майсеевічу дапамагаць, пакуль у Маскве адліга. Ці хоць бы паспрабаваць дапамагчы, пакуль і ў Мінску нешта такое…

А як дапамагчы?..

– Давесці трэба, – прыдумаў Косця, – што ён савецкі чалавек і на ўсіх нас па-савецку ўплывае.

А дзе давесці?.. Каму?.. Гурыку?.. А то Гурык не ведае, хто такі Саламон Майсеевіч.

– Калі за Амерыканцам сочаць, а мы ведаем, што за ім сочаць, дык павінны праслухоўваць і тэлефон, і ўсю кватэру, – сказаў Косця. – Збіраемся там – і каму трэба, той нас пачуе.

Амерыканец жыў на колішняй вуліцы 2-й Міхайлаўскай. Пазней яна называлася Мопраўскай, потым – Калініна, а ці не адразу ж па прыездзе Амерыканца яе перайменавалі ў Камуністычную. Кватэра ягоная была ў доме № 2, набліжэйшым да праспекта Сталіна, які таксама перайменавалі – і ён стаў праспектам Леніна.

Пасля таго, як Амерыканец вярнуўся ў Амерыку і забіў там свайго амерыканскага прэзідэнта, дом, у якім жыў ён у Мінску, знік. Новыя нумары на ім сведчылі, што гэта дом № 4, а дома № 2 нібы й не было. Значыць, ніхто ў ім ніколі жыць не мог. Тым больш амерыканец... Які амерыканец? Скуль узяўся, з пылу зляпіўся?.. Тут Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, а не Амерыка.

І ўсё ж дом, у якім жыў Амерынец, быў і ёсць, хоць і пад іншым нумарам, і стаіць, як стаяў, амаль насупраць музея Першага з’езда РСДРП. Відаць, нехта доўга думаў, перш чым на вуліцы з такой назвай ды яшчэ ў такім суседстве пасяліць Аліка, амерыканскага камуніста ці шпіёна.

Даводзіць невядома каму, што Саламон Майсеевіч савецкі чалавек і па-савецку на ўсіх уплывае, сабраліся Косця, Ася і я. Па дарозе да нас прыбіўся Ас. Прыйшлі да Амерыканца, а ў яго, апроч Марыны, якая ўжо год была за ім замужам, яшчэ і Палкоўнік. Не маючы свайго жытла, ён жыў то ў сястры каля стадыёна, то ў маці каля радыёзавода – і па-суседску зазіраў да Амерыканца, у якога заўсёды былі апляткі, якія прыносіла са сваёй шпітальнай аптэкі Марына. “Калёсы”, да якіх прызвычаіўся Палкоўнік у турме. Прыходзіў ён з кавенькай, такою важкаю палкай, і казаў: “Кватэры пераблытаў”.

Як ён мог іх пераблытаць?.. Жылі яны абодва – і Амерыканец, і Палкоўнік – у кватэрах з нумарам 24, але ж на розных вуліцах у розных дамах. Амерыканец з Марынай – на Камуністычнай, а Палкоўнік з сястрой – на Энгельса. І, каб кватэры пераблытаць, трэба, як мінімум, мост цераз Свіслач перайсці...

Ці Палкоўнік не пераходзіў мост?

Між іншым, і кватэра на вуліцы Кісялёва, былой Старажоўскай, дзе жыла маці Палкоўніка, а пасля, калі бальшавічка-бундаўка памерла, жыў ён адзін, мела нумар 24. Гэткае супадзенне павінна, мусібыць, нешта азначаць, але я не ведаю, што яно азначае...

Не думаю, што Палкоўнік завітваў да Амерыканца толькі дзеля "калёсаў". Ён быў Настаўнік, Гуру, вучні якога ўсё, чаго б ён ні пажадаў, з-пад зямлі б дасталі. Але нічога асаблівага Палкоўнік ніколі не хацеў. Ён нават без "калёсаў" мог абыходзіцца, п'ючы, калі тых не было, віно ці гарэлку. Тады чаго ён да Амерыканца цягаўся?.. Не сачыць жа яго, ворага народа, за чужаземцам прыставілі. Хоць усё можа быць. Вунь прыставілі ж сына паэта Шушкевіча, які ў лагеры сядзеў, Амерыканца рускай мове вучыць. Хіба не дзіўна? Сын беларускага рэпрасаванага паэта, а навучае амерыканца рускай мове…

Нешта заблытваюць гэбісты.

Панастаўлялі жучкоў…

Тое, што дома была Марына, нам ніяк не замінала і не шкодзіла, нават наадварот: тых, на каго Саламон Майсеевіч па-савецку паўплываў, разам з ёй было болей. Але Палкоўнік…

– Мы думалі, што і Саламон Майсеевіч тут, – сказаў Косця, нібы пра тое, што Саламона Майсеевіча арыштавалі, не чуў і не ведаў, дый не мог чуць і ведаць, бо такога быць не магло, і Палкоўнік зірнуў на яго нядобра. Косця ж доўжыў сваё. – Шкада, што яго няма, ён так узнёсла чытаў даклад таварыша Хрушчова… – а Палкоўнік, як толькі гаспадыня паставіла на стол, сам сабе наліў, бо, мусіць, "калёсаў" гэтым разам Марына не прынесла, выпіў і здзівіўся: "Як чытаў?.. Што?.."

– …на XXI з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза… узнёсла… – доўжыў і міргаў, і пальцамі ў столь і ва ўсе сцены тыркаў Косця… – сённяшняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!.. – а Палкоўнік закрычаў раптам, не закусіўшы: "Ты што тут разміргаўся! Пальцамі растыкаўся! Саламон генетычны антысаветчык! Як ён чытаць мог такое г…! Ды яшчэ ўзнёсла! Хіба на ўнітазе ўзнёсся… – і хоць Косця ўжо кулакамі трос, вочы ўгору закочваючы, Палкоўнік цішэй, але дагаварыў… – з газетай для натуральных патрэб…"

Косця кінуў кулакі ўніз, расціснуў іх і бязвольна абсеў на крэсле…

Амерыканец, пэўна, таксама ведаў, што і тэлефон ягоны, і кватэру ягоную праслухоўваюць, таму паспрабаваў заспрачацца з Палкоўнікам: "Гэта амерыканскія газеты для натуральных патрэб, не савецкія", – на што Палкоўнік заявіў, што ўсе газеты ва ўсім свеце выключна для натуральных патрэб, ні для чаго болей, а тут Ася сказала:

– Мой бацька не антысаветчык.

– Антысаветчык! – гнуў сваё Палкоўнік, які, прайшоўшы турму, ведаў, што такое людзі, і не меў да іх ні асаблівай павагі, ні спагады. –

Хто ж яшчэ, калі не антысаветчык? Габрэй, значыць, антысаветчык. Быў бы напалову габрэй – быў бы напалову антысаветчык. Як я. А ён цалкам. І нават больш…

Ас, які, не скінуўшы шыняля з генеральскімі пагонамі, стаяў у дзвярах, нібы мы былі ўжо арыштаваныя, і ён на такім высокім, на генеральскім узроўні нас вартаваў, спытаў нечакана:

– Як можа быць больш, калі цалкам? Такога не можа быць.

– Не антысаветчык! – раптам коратка ўсхліпнула Ася. – Гэта ўсё праз мяне, гэта Гурык… старшы лейтэнант Ігар Гурковіч… – цвёрда прагаварыла яна ў столь, праглынуўшы ўсхліп… – калі бацьку яшчэ тады, за Леніна арыштавалі, сказаў, каб я падумала, з кім быць, з ім ці з Косцем, калі хачу…

Косця ўскочыў: “Што?!. Поскудзь!..” – і перакуліў, ускокваючы, шклянку з гарбатай, якую толькі што наліла Марына, на жывот Палкоўніку і ніжэй… а Палкоўнік нават не войкнуў, нібы нічога ў яго там, спераду, не было – гэтак у турме загартаваўся, толькі сказаў, порткі атрасаючы: “У-ё-бі-шча.”

– …каб бацьку адпусцілі і не чапалі, радню чэкіста чапаць не будуць, – здзівіўшыся з вытрымкі Палкоўніка і пасядзеўшы хвіліну з разяўленым ротам, дагаварыла Ася, а Палкоўнік зноў сказаў, хакнуўшы: “Ха! У-ё-бі-шча!” – і незразумела было, пра каго ён, пра Гурыка, ці пра Косцю, які таксама незразумела каго назваў поскуддзю: Гурыка ці Асю?

– Як больш, калі цалкам?.. – паўтарыў сваё пытанне Ас, адзіны, хто, мусіць, не ўцяміў нічога з таго, што зараз тут адбылося, а я стаяў каля акна, гледзячы з якога на павольную раку, на мост цераз яе і парк за ёю, на горад, што падымаўся ўверх ад парку, зайздросціў Аліку, які прыпёрся з Амерыкі – і адразу яму такую кватэру, якой мне ніколі не мець… ды гары яна гарам, кватэра, няхай прападае ўсё, бо, канечне ж, не Ася, а Гурык, увесь у бліскучых пагонах, поскудзь, і, канечне ж, ён, а не Косця “ўё-бі-шча”, толькі як такое можа быць?..

– Як можа быць больш, калі цалкам? – трэцім разам спытаў Ас, мазгі якога, і без таго звернутыя, на гэтым “цалкам” заклініла, а Марына паднялася і пачала прыбіраць са стала: “Выбачайце, тут не вар’ятня…”

Пазней, калі мы насамрэч апынуліся ў вар’ятні, я ўспомніў, што першай пра яе сказала менавіта Марына, якая толькі год пабыла за Амерыканцам, а ўжо паводзілася, як амерыканка, хоць я ні тады не ведаў, ні цяпер не ведаю, як яны ў такіх выпадках паводзяцца, амерыканцы…

Мы дык так сабе…

Аліку стала няёмка праз тое, што жонка ягоная гасцей ягоных пратурыла, і ён пайшоў нас праводзіць.

– Як мне ўсё гэта разумець?.. – спытаў, калі мы спусціліся ў двор і рушылі да Круглай плошчы, Палкоўнік, і калі Косця сказаў яму, што гэта быў спектакль для гэбістаў, уздыхнуў. – Тады квіткі трэба было прадаваць, прыдуркі... Ты, Ася, не цягайся з гэтымі ўбогімі, ты за Гурыка трымайся. Замуж за яго выходзь. Марына за Аліка, а ты за Гурыка, і яшчэ невядома, каму лепш будзе...

– І выйду! – раптам скочыла Ася ў аўтобус, мы якраз да аўтобуснага прыпынку выйшлі, і тут жа дзверы за ёй зачыніліся. Косця грукнуў у іх, ды без толку. Ася крыкнула кіроўцу, каб не адчыняў, і той, раз такая прыгажуня папрасіла, не адчыніў, паехаў, а Косця схапіўся за задні бампер і, з усіх сіл упіраючыся, трымаў аўтобус, які газаваў, газаваў, пакуль бампер... – за які ўжо ўчапіліся і Ас, і я, і Амерыканец, і, невядома скуль узяўшыся, Віл са сваімі сябрукамі, канадцамі Джымам і Джонам... – пакуль бампер са скрыгатам не адарваўся. Кіроўца заўважыў у люстэрку, што бампер адарвалі, прытармазіў, каб спыніцца, ды раптам Ас рвануўся ўслед за аўтобусам – і кіроўца, убачыўшы, што за ім гоніцца генерал з бамперам наперавес, вырашыў не звязвацца, халера з ім, з тым бамперам, і зноў газануў, звозячы Асю ад Косці да Гурыка... А ад Вечнага агню на Круглай плошчы, давячыся свістком, бег да нас паставы міліцыянт.

Пастарунак быў недалёка, на плошчы Якуба Коласа, таму нас не павезлі, а пагналі па Ленінскім праспекце, як палонных немцаў. Усе, нават Амерыканец з канадцамі, ішлі рукі за спіну, моўчкі, толькі Палкоўнік дабіваўся справядлівасці: грозна грукаў кавенькай, даводзячы, што ён не ўдзельнічаў, як пасля запісалі ў пратаколе, "у хуліганскіх дзеяннях па адрыванні задняга бампера гарадскога аўтобуса маршрута № 1", – але яго ніхто не слухаў...

Калі б хто-небудзь мне сказаў, што праз гады ў пратаколе майго затрымання напішуць, што я ўдзельнічаў у хуліганскіх дзеяннях, якія выклікалі масавыя беспарадкі, і мне будзе пагражаць за гэта не 15 сутак, а пятнаццаць гадоў, я б падумаў, што чую такое ад куды большага вар'ята, чым Ас, які бяжыць і бяжыць у маёй памяці ад плошчы Перамогі да маста цераз Свіслач – і ветразем развяваецца ў прыцемках бліскуча чырвонае крысо ягонага генеральскага шыняля.

– Цікавая кампанія... – зрабіўшы націск і на першым, і на другім слове, задуменна сказаў, прачытаўшы нашы паказанні, міліцэйскі капітан, які, мусібыць, быў у той дзень у тым пастарунку за галоўнага. – І спытаў Аліка. – Лі Гарві Освальд?.. Вы сапраўды амерыканец?

Алік кіўнуў. Маўляў, так, амерыканец.

– Джым... Джон... хто з вас Джым? – перагартаў капітан паперкі, і Джым, як у арміі, ступіў крок наперад:

– Я!

– Канадзец?

– Канадзец!

Капітан зірнуў на яго ўважліва.

– А чаму прозвішча рускае? Калеснікаў...

– З рускіх эмігрантаў!

– Значыць, з белых?

– Не! З ранейшых!

Капітан не зразумеў.

– З якіх ранейшых?.. – У ягоным разуменні, мусібыць, да белай эміграцыі з Расіі ніякіх эмігрантаў не было і быць не магло. – Ну ды разбярэмся... І вы, Джон, белы?

У Джона, які прыехаў з Канады ў беларускую кансерваторыю вучыцца граць на рускім баяне і зараз не цяміў, дзе ён знаходзіцца і што з ім адбываецца, маці была мурынкай, таму ні на белага эмігранта, ні проста на белага ён ніяк не выглядаў, але з капітанам згадзіўся:

– Белы. На баяне...

– Гэта потым! – перапыніў ягоныя спробы растлумачыць, што ён культурны чалавек і грае на белым баяне, капітан. – Найграешся на Калыме. – І Палкоўнік, успомніўшы, мусібыць, Эдзі Рознэра, хакнуў: “Ха!”

– На чым?.. – зморшчыў лоб, намагаючыся зразумець, на чым яму граць прапануюць, Джон, але капітан ужо перагарнуў паперку. – А вы... – павярнуўся ён да Віла, які выпадкова апынуўся на Круглай плошчы з Джонам і Джымам якраз у той момант, калі мы бампер адрывалі... – радыст?

– Не, – як нешта адчуўшы, не захацеў быць радыстам Віл. – Маё прозвішча Леднік. А радыстам мяне называюць, бо...

– Бо вы радыст! – лагічна заключыў капітан. – Хоць, можа быць, і Леднік. Вось жа тут, у паказаннях грамадзяніна Ворана, напісана: “... і зусім выпадкова з намі аказаўся Радыст з канадцамі”. Дык вы і з імі выпадкова аказаліся, і выпадкова з канадцамі, і выпадкова называецеся радыстам?..

Віл разгубіўся.

– Гэта мянушка... Вунь у яго, – ён паказаў на мяне, – мянушка Князь, хоць ён малы і непадобны... А ў мяне яшчэ адна ёсць: Віл... Мы, я і Воран, разам у школе вучыліся, дык у ёй... – і капітан рэзка перапыніў яго, твар у твар нахіліўшыся:

– У якой? Нямецкай, амерыканскай? ЦРУ? Ну!..

– У 42-й сярэдняй… – ледзьве прамямліў, насмерць не рады, што звязаўся з намі, Віл, а капітан, у вачах якога хай, можа, і не генеральскія, як на пагонах Аса, але ўсё ж зоркі засвяціліся, перакінуўся на Палкоўніка:

“І вы, грамадзянін Сысой Кім Іванавіч, аднойчы ўжо асуджаны за антысавецкую дзейнасць, таксама зусім выпадкова ў гэтай кампаніі?..”

У сутарэннях дома на рагу вуліцы Чырвонай з праспектам Леніна, на плошчы Якуба Коласа, у каменным, даволі вялікім пакоі анікога, апроч нас і капітана, не было. Допыт шпіёна амерыканскага і двух канадскіх шпіёнаў, радыста, антысаветчыка і яшчэ трох завербаваных агентаў, адзін з якіх хоць адстаўны і не зусім здаровы, але генерал авіяцыі, капітан вырашыў правесці без сведкаў – ці мала што?..

Цяжка сказаць, якія фантазіі блукалі ў ягонай галаве, калі, загадаўшы нам выстраіцца ўздоўж сцяны па росце, ён падыходзіў да кожнага блізка-блізка, ставаў твар у твар, доўга і пранізліва глядзеў вочы ў вочы, пасля адступаў паволі – спінай да процілеглай сцяны – і яшчэ раз узіраўся ў кожнага па чарзе: у Косцю, у Аса, у Віла, у абодвух канадцаў, у Амерыканца, у мяне і, нарэшце, у Палкоўніка, які стаяў апошнім, і які раптам сказаў капітану вочы ў вочы: “Слухай, у-ё-біш-ча! Ты арыштаваў таварыша Лі Гарві Освальда, першага сакратара камуністычнай партыі Злучаных Штатаў, якому сёння ўвечары ехаць у Маскву, каб заўтра ўраніцы сустракацца з першым сакратаром ЦК КПСС таварышам Хрушчовым. Падумай, што табе за гэта будзе”.

І ўсё, больш нічога не сказаў Палкоўнік. Мусібыць, вырашыў, што гэтага дастаткова, каб капітан спалохаўся і першага сакратара кампартыі ЗША разам з канадцамі і ўсімі намі адпусціў.

Капітан савецкай міліцыі глядзеў на маленькага, лядашчага антысаветчыка і прыкідваў, што яму рабіць?.. З аднаго боку – зоркі… пагоны… З іншага – калі б нешта, невядома, што, за ўсім гэтым не стаяла, ды так нахабна абазваць яго, начальніка, былы зэк не мог бы. Гэта маглі быць, канечне, і зэкаўскія панты, але ж быў і амерыканец, сапраўдны амерыканец, і канадцы, няхай адзін з іх белы, а другі чорны. Павагаўшыся, капітан усё ж забаяўся, але не так моцна, каб нас адпусціць, а роўна настолькі, каб дакласціся ў КДБ – і праз дзесяць хвілін па нас прыехалі. Гурыка сярод тых, хто прыехаў, не было…

Плошча Якуба Коласа, былая Камароўская

Дзе тое лета пачатку 60-х?.. Праз трыццаць гадоў, летам напачатку 90-х, у былым міліцэйскім пастарунку на плошчы Якуба Коласа, які стаў рэстаранам "На ростанях", я сустрэў Асю.

Тварам да акна і спінай да залы яна сядзела адна за сталом – і я пазнаў яе са спіны. На яе плячах гарэў, рассыпаны па белай блузцы, пажар валасоў. Прытушаны, але пажар…

Я падышоў і, баючыся таго, што будзе, калі яна павернецца, павітаўся.

Плечы ўздрыгнулі, пажар хіснуўся – яна павярнулася. Глядзела, не пазнаючы, і я глядзеў, не пазнаючы, хоць ведаў, што гэта Ася. Бязлітасны час ні да чаго гэтак не бязлітасны, як да прыгажосці, і ні да каго ён не бязлітасны так, як да прыгажунь з гарачай, як кіпень, крывёй…

– Я пастарэла? – спытала яна, яшчэ не ўспомніўшы, хто я, і праз прастору ў трыццаць гадоў, праз час, у якім столькі ўсяго спласталася: жарсці, здрады, страты, смерці – пытанне гэтае было і самым банальным з усіх, якія магла яна задаць, і самым для яе важным.

Мая колішняя аднакурсніца, з якой я вучыўся ў электратэхнікуме сувязі, спраўляла дзень народзінаў. Я прыйшоў у рэстаран з лілеямі – з кветкамі, якія любіў, бо помніў, што іх любіла Ася, і ніякіх іншых кветак для мяне не існавала. Белыя лілеі я дарыў ёй аднойчы, стоячы на каленях, таму і цяпер не прыдумаў нічога іншага, як укленчыць… але тады я стаў на абодва калены, а цяпер на адно, на адно…

– Ася, не выходзь ні за Гурыка, ні за Косцю, я адзін цябе кахаю больш за ўсіх, і клянуся, што зраблю цябе шчаслівай, толькі ты пачакай… – падаў я ёй лілеі, якія яна, нахіліўшыся, абняла разам са мной, і хутка-хутка сляза з яе шчакі скацілася на маю шчаку: "А я цябе не пазнала, жыдоўка старая…"

"Хлопчык, ты яшчэ знойдзеш сваё каханне, а я для цябе жыдоўка старая… – сказала яна ў той дзень, калі выходзіла за Гурыка, і Косця выправіў мяне, каб я перадаў ёй, што ён пляваць на яе хацеў, посцілку гэбісцкую, во так, цьфу, але я нічога не перадаў, я прынёс ёй белыя лілеі, бо ведаў, што яна іх любіць, і папрасіў пачакаць, пакуль я змагу па законе з ёй ажаніцца… – і пры чым тут, дурненькі, закон?.."

"Ты бацьку ратуеш?.." – спытаў я тады, і яна адказала: "Усіх".

"Ды падсцялілі яе пад Гурыка!" – махаў перада мной рукамі Віл. Рукі ягоныя, якімі ён цэмент грузіў, каб на джынсы зарабіць, былі з

такімі мазалямі, што ён на далоні, як на цёрцы, моркву дзёр. “Хто падсцяліў?” “Жыды!”

Віл не быў антысемітам, ён быў братам карэспандэнта Усесаюзнага радыё, які нядаўна даў яму прачытаць кнігу пра тое, як габрэі заваёўваюць свет.

“У іх палітыка такая масонская: кожнага, хто ў органах, ва ўладзе, павязваць са сваімі. Вось Гурыка і павязалі! І пабачыш: высока ўзляціць, тут масоны пастараюцца”.

Ася дазволіла сабе толькі адну слязу…

– Што ж мы з табой нарабілі? – высушыла яна на вейцы другую слязінку, а трэцяй ужо не было. – Жыццё асобна пражылі…

Пасля перформансу з кветкамі я не ведаў, што рабіць далей, што казаць?.. Раптам стала ніякавата, як на сцэне, на якую штукар цябе выцягнуў з залы, каб чужы партманэт з тваёй кішэні дастаць, а ты стаіш, чакаеш, пакуль ён дастане ці не дастане, і не ведаеш, куды рукі падзець… Таму сказаў, час марудзячы: “Ты блузку залілеіла…” – і яна стрэсла з блузкі жаўтаваты пыл кветак: “Так заўсёды з лілеямі, але я ўсё адно іх люблю, дзякуй, што ўспомніў…” – і я спытаў не вельмі ўдала, агледзеўшы пусты стол, за якім яна сядзела:

– Ты адна?

Яна не стала казаць, што гэта не найлепшае пытанне.

– Адна.

Зрэшты, яна таксама не лепш спытала: “Я пастарэла?”

– Чаму ты адна?

– Бо з усімі развітваюся… – Яна пасунулася і села бокам да акна: цяпер вечаровае сонца высвятляла не ўсе маршчынкі на яе твары. – Прысядзь. Ці ты спяшаешся?

– Не. – Я сеў. – З кім ты развітваешся? – Кіўнуў на стол. – Нікога ж няма.

– О!.. Іх многа. Усіх не ўмясціць. – Яна раскінула рукі. —Таму і няма нікога. Зрэшты, у мяне нікога й не было. Апроч бацькі. Ты помніш яго?

– Помню. – І я зноў спытаў праз трыццаць гадоў. – Ты за Гурыка выйшла, каб бацьку ўратаваць?

Яна паклала рукі, самыя прыгожыя ў свеце рукі, якія толькі могуць быць, якія толькі можна ўявіць, адну на адну, далонь на далонь, паглядзела на мяне ўважліва.

– Цябе дасюль гэта цікавіць?

– Дасюль.

– Дзіўна… І ты дасюль раўнуеш мяне да мора, ветру, сонца?

Мне пад горла падкаціла: яна помніць!..

Даўно, калі мы аднойчы ў Крым, у Новы свет паехалі, я сказаў ёй, што раўную яе да сонца, ветру, мора. Бо вецер абдымае яе, сонца цалуе, мора лашчыць…

Цяпер такога ўва мне не было – і я сказаў праўду:

– Не. Не раўную.

Мне здалося, што ёй хацелася б, каб я дасюль раўнаваў. І памаўчыўшы, нібы ўзважваючы, ці доўжыць размову, яна прагаварыла амаль скарагаворкай.

– Я пайшла за Гурыка, бо Кім Іванавіч сказаў мне, каб я за яго пайшла.

– Хто сказаў?

– Сысой. Палкоўнік.

– Я гэта чуў. Яно было не ўсур'ёз.

– Як ты мог чуць? Я нікому не казала.

Яна не ўсё помніла. Забылася пра Круглую плошчу, пра першы аўтобус…

– Ён сам сказаў. Пры мне, пры ўсіх. Перад тым, як ты скочыла ў аўтобус, каб да Гурыка ехаць. "Ты, Ася, не цягайся з гэтымі ўбогімі. Ты за Гурыка трымайся. Замуж за яго выходзь. Марына за Аліка, а ты за Гурыка, і яшчэ невядома, каму лепш будзе…" Вось так ён сказаў слова ў слова, але гэта было не ўсур'ёз. Ён проста насміхаўся з таго, як мы прыдумалі Саламона Майсеевіча ратаваць. Расказваць у кватэры амерыканца, каб чулі гэбісты, які твой бацька савецкі чалавек.

– А-а-а… – Ася засмяялася. Амаль гэтаксама, як некалі. Нібы анёл з неба жменьку срэбных манетак кінуў. Толькі, пакуль тыя манеткі да зямлі ляцелі, шмат якія ветрам знесла. – Гэта і праўда смешна выглядала. Цяпер выглядае смешна… А тады страшна. І я так вам была ўдзячная, што вы са мной… – Яна хіснула галавой, пажар пераліўся з пляча на плячо. – А ўсур'ёз мне Кім, каб я за Гурыка выходзіла, сказаў пазней. Калі я прыйшла да яго, каб… Ты выпіць са мной не хочаш?

– Можам выпіць. Шампанскае?..

– Шампанскае.

– З пафарбаных слоікаў?.. У вас ёсць, – падазваў і спытаў я афіцыянта, – пафарбаваныя слоікі?

Той не зразумеў.

– Што?

– Слоікі, – паказала рукамі Ася. – Паўлітровыя пафарбаныя слоікі. Адзін жоўты і адзін… – яна вінавата зірнула на мяне…

– Сіні.

– Сініх сёння няма, – сказаў афіцыянт, які аказаўся з гумарам,

што рэдкасць для афіцыянта. – А жоўтыя заўтра будуць. Будзеце чакаць?..

“Не, – не згадзіўся я чакаць, – я трыццаць год чакаў”, – на што афіцыянт сказаў: “Дык дзень туды, дзень сюды...”, – але пайшоў і вярнуўся хутка з шампанскім і двума бакаламі, абгорнутымі ў жоўтую і сінюю сурвэткі. – Так падыдзе?..”

Зусім як некалі, у кватэрцы Косці на Нямізе, падала з акна на стол вечаровае сонца, і мы паднялі рознакаляровыя бакалы з вінам, кожны са сваім:

“За цябе”. “За цябе”. “За нас”. “За сустрэчу”. “За Саламона Майсеевіча”. “За Аса”. “За Палкоўніка”. “За Аліка”. “За Гурыка”. “За Косцю”. “За Нямігу”. “За калоны”. “За якія калоны?..” “Тэатра Юнага гледача”. “За калоны тэатра Юнага гледача”. “За Свіслач”. “За Мінск, у якім былі такія людзі”. “Чаму былі? Ёсць. За нашага афіцыянта”. “За Мінск, у якім ёсць такія людзі. Хоць ты не развітвайся і не з’язджай”. “А куды ты?..” “Туды, куды бацька не даехаў”. “У Ізраіль?” “Так, там нейкая цётка мая яшчэ жывая. Яна і раней клікала, але Гурык...” “Што Гурык?..” “Жонка генерала КДБ – і ў Ізраіль?” “А цяпер ты не жонка?” “Цяпер ён не генерал”. “А хто?” “Нябожчык”. “Чакай... Гурык памёр?..” “Не, але яго, як бы гэта сказаць... памёрлі”. “Як так?..” “А так, што адно наша ведамства на запыт аднаго амерыканскага ведамства афіцыйна адказала, што ён памёр”. “Чаму?” “Бо нейкі шпіён... карацей, знайшліся паперы. Копіі”. “Якія паперы?” “Па Аліку”. “Па якім Аліку?” “Па Амерыканцы. З іх вынікае, што Гурык рыхтаваў яго да забойства Кенэдзі”. “Глупства!” “Глупства, але праз гэта ў Гурыка і пайшла кар’ера. Пасля забойства яго амаль адразу перавялі ў Маскву, павысілі ў званні...” “Ды дурата!.. Яны, можа, выгляд хацелі зрабіць, што гэта іх работа. На ўсялякі выпадак”. “Можа быць. Але цяпер з амерыканскімі прэзідэнтамі цалуюцца, так што Гурык – генерал-нябожчык”. “І з табой едзе ў Ізраіль?” “Цябе і гэта цікавіць?” “А як ты думаеш?..” “А ты сам падумай: як нябожчык можа некуды ехаць?..”.

Афіцыянт падышоў:

– Яшчэ шампанскага?

Ася глянула на пустую бутэльку:

– Хутка мы....

– Пад размовы не заўважаем, – сказаў афіцыянт. – А пасля і размоў не помнім.

– Тады давайце, каб не помніць, – неяк адчайна рашылася Ася, і гэтак жа адчайна, як толькі прынёс і наліў афіцыянт шампанскае, выпіла і стала казаць, не перапыняючыся, нібыта баючыся, што, калі

перапыніцца, дык не дагаворыць. – Я кахала Косцю, але не так, як Палкоўніка, якога любіла, разумееш, любіла, як, можа быць, Бога трэба любіць, ён адзін ведаў столькі, колькі ўсе, і адзін сярод усіх быў вольны ў той савецкай турме, тады, у той час не баяўся, роўных яму людзей я побач не бачыла, таму прыйшла да яго аднойчы пад ноч і сказала, што гатова аддаць яму, такая дурненькая была, гатова аддаць яму ўсё, што маю, а ён засмяяўся: “А што ў цябе ёсць, апроч пыткі?” – я ўпершыню слова такое пачула: пытка. “Дык яна ў любой лярвы ёсць, але што ж, даеш, дык вазьму, кладзіся…” – і я лягла, а ён сказаў, што яму некуды схадзіць трэба, пайшоў, я да раніцы чакала, мяне ўсю клапы скусалі, бо ў ягоным ложку, ды які там ложак, матрац падраны з падранай коўдрай на падлозе, можа, толькі скарпіёнаў не было, а ён недзе цягаўся ўсю ноч, вярнуўся п’яны і спытаў: “Ты што тут робіш?..” – і калі я паўтарыла, што ён для мяне, як Бог, і я гатова аддаць яму ўсё, што маю, закрычаў: “Ідзі Гурыку ўсё аддай, у-ё-біш-ча!..” – і выпіхнуў мяне, голую, у калідор, следам адзежу кінуўшы: “Гурыку!..” – і я ўся ў клапах, у блохах, у гнідах, у вошах, нават на лабку гэтыя вошы былі, хоць яны, кажуць, гэтак не перадаюцца, прыпёрлася раніцай да Гурыка і сказала, што згодная быць ягонай, калі ён абяцае, што бацьку адпусцяць і чапаць не будуць, і ён паабяцаў, і я заразіла яго тымі вошамі лабковымі, мандавошкамі, вось з чаго ў нас сумеснае жыццё пачалося, а бацька ў турме памёр, Гурык сказаў, што ўночы, дык хто ж вінаваты, і, можа быць, насамрэч ніхто, але я і адразу падумала на Гурыка, і потым, і цяпер думаю, што гэта ён памерці бацьку дапамог, бо не мог, канечне, бо хто ён такі, каб яго вызваліць, вось так я з ім жыццё і пражыла… ці, магчыма, не так ужо я пастарэла, нешта ў жыцці маім яшчэ можа быць, ці ўжо нічога быць не можа, як ты думаеш?..

Прамаўляючы ўсё гэта, яна сядзела роўна, нерухома, і рукі яе нерухома ляжалі на стале – далонь на далоні. Я нахіліўся і пацалаваў іх. Ася не торгнулася, не зрабіла выгляд, што ёй няёмка: прывыкла да таго, што ёй цалуюць рукі. Адну руку яна пакінула пад маімі губамі, другой пагладзіла па галаве:

– Хочаш, я ў Ізраіль цябе звязу, помніш, нам Віл расказваў… дарэчы, ён жывы?..

– Жывы…

– А Эдзік?

– Жывы.

– Дык яшчэ многа жывых? Біг? Гарык?.. Піля?

– Біг памёр, а Гарык і Піля жывыя. Многа яшчэ жывых…

– Дзякуй Богу… Дык помніш, як Віл, якому брат кніжкі антысе-

міцкія чытаць даваў, нам пра Ізраіль расказваў і расказваў, хоць там не быў, толькі з радыстамі нейкімі ізраільскімі звязваўся…

– Не з нейкімі. З міністрам…

– Так, з міністрам, я ўспомніла! І з каралём Кувэйта…

– Не Кувэйта, Іарданіі… З Хусэйнам.

– З Хусэйнам, так, і з Бары Галдуотэрам, гэтым, як яго…

– Сенатарам.

– Сенатарам-то сенатарам, але як яго ў нас тады называлі…

– Ястрабам.

– Так, ястрабам. Ворагам СССР. З вас жа праз гэта шпіёнаў і антысаветчыкаў маскоўскія гэбісты прыдумалі, а Гурык…

– Што Гурык?..

– А ты не здагадваешся?

– Пра што мне здагадвацца?

– Пра тое, што яго не толькі праз Амерыканца, а яшчэ і праз вас у Маскву перавялі і ў званні павысілі.

– Праз нас?.. Праз каго праз нас?..

– Праз Палкоўніка, праз Эдзіка Гарачага, Косцю, Віла і ягонага брата… Ён жа з вас тэрарыстаў зляпіў, якія разам з Амерыканцам хацелі забіць Хрушчова, а ён вас выкрыў…

– Хто выкрыў? Брат Віла?

– Які брат Віла? Гурык! Ён пра гэта мне расказаў, калі генералам быць перастаў…

Я адсунуўся ад жонкі гэбісцкага генерала, які памёр, але жывы, а яна, нібыта ўдава ягоная, з’язджае ў Ізраіль, і паглядзеў на Асю ўважліва: не жартуе?.. Не падобна было, каб яна жартавала.

Мне захацелася выпіць. Глынуць адразу шклянку, каб стаць адразу п’яным, як аднойчы ў кавярні “Вясна”, калі нейкі вайсковец наліў Асу дзве шклянкі, а той адну да мяне падсунуў: “Пі”.

“Не можа быць, – сказаў я, зноў падсунуўшыся і узяўшы Асю за плечы, але яна пацепнулася, і я апусціў рукі. – Турмой для Кіма і Эдзіка такое не абышлося б, нас бы ўсіх расстралялі”. “Маглі й расстраляць, калі ў турму прывезлі. Але Хрушчоў спытаў, як яно ўсё будзе выглядаць? Ён прыехаў да беларусаў, пахваліў іх, сказаў, што яны першыя ў камунізме будуць, а яны яго за гэта – забіваць? І хто?.. Камсамольцы, студэнты. І каго?.. Таго, хто вядзе іх да камунізму? Які ж тады камунізм?.. Вось і пастанавілі вас у вар’ятні трымаць, як псіхічна хворых. І трымалі б, калі б не твая клінічная смерць. Яны спалохаліся, вырашылі спробу замаху засакрэціць, абысціся антысавеччынай”. “Які замах?.. Не было ж ніякага замаху, што ж было засакрэчваць?” “Тое, чаго не было, і засакрэцілі. І яно пачало як бы быць. Бо кожны стаў думаць: калі засакрэцілі, значыць, ёсць. Так часцяком робіцца, ты хіба не ведаеш?.. Палкоўнік, калі помніш, таксама ўсялякую лухту засакрэчваў – і яна

выглядала як бы не лухтой...”

Зусім не да месца Ася рассмяялася, але не так, як срэбныя манеткі сыпануліся, а як лыжачка ў надтрэснутай шклянцы празвінела. І калі да гэтага надтрэснутага смеху я збіраўся сказаць ёй праўду пра смерць Саламона Майсеевіча, толькі не ведаў, як гэта лепей зрабіць, дык цяпер раптам падумаў: а навошта? Каб яна дарэшты ўсвядоміла, з кім пражыла жыццё, і яшчэ болей узненавідзела Гурыка? І што з таго?..

Гурыку – нічога. Усё – ёй.

– Не помню я, каб Палкоўнік нешта засакрэчваў.

– А што ён усіх нас здаў, помніш? Што мы ўсе апынуліся ў ягонай антысавецкай групоўцы, помніш? Напляваць на ўсіх было Палкоўніку! На вас, на мяне... Хто мы такія?.. – Смех у ёй нервова перарваўся, і яна сказала, падрабляючыся пад Палкоўніка. – Ідзі Гурыку ўсё аддай, у-ё-біш-ча... – І дагаварыла ўжо сваім голасам. – А сам ён хто?.. Адну казку пра салдата і смерць усё жыццё піша, піша, піша і дапісаць не можа.

Яна не даравала Палкоўніку. Праз столькі часу...

Чаму? Не таму, што Палкоўнік некага здаў... Жанчына не можа дараваць насмешку над каханнем. Здраду – даруе, насмешку – не.

– Напіша, – сказаў я. – Калі ты застанешся.

Яна паглядзела так, як умеюць глядзець толькі габрэйкі: адначасова ў мінулае і ў будучае.

– Дзеля чаго? Казкі ўжо не будзе, калі нават ён напіша яе.

Мы абодва адчулі, што гаварыць больш няма пра што, і яна паднялася.

– Паеду. Тут мяне ўжо кожны, хто мог, пакусаў. І клапы, і божыя кароўкі. А там яшчэ не.

Быў пачатак 90-х. На літаграфіі, што вісела ў фае рэстарана, дзе мы з Асяй развіталіся, скакаў рыцар на белым кані. Адначасова ў мінулае і ў будучае, у якім яшчэ дзесяць гадоў будзе жыць у барачным доме на вуліцы Кісялёва, былой Старажоўскай, Кім, Сысой, Палкоўнік. Але ён так і не дапіша сваю казку:

“Наперед глаза обернул солдат – на трупинке ани души, ни существа, ни вещества, ни прызраку, ни маны, ни морока и не грези. Птицы-тройки быстрей помчалась под им трупинка, и внезапь ему опустила солдата у самова синево моря, и пересталась видетца в сей же миг.

И над морем солнечьно и оглядисто взошла в дневный поход заря”.

(З недапісанай казкі Палкоўніка “Салдат і смерць”.)

Вуліца Інтэрнацыянальная, колішняя Зборавая, Волацкая, былая Хрышчэнская, Прэабражэнская

Ужо ўздымалася ў дзённы паход зара, калі ўсіх нас, апроч Аса, якога ў каршэнь выштурхалі з пастарунку, перавезлі з вуліцы Чырвонай на вуліцу Інтэрнацыянальную ў двор з тылу галоўнай будыніны КДБ. Двор утвараўся некалькімі дамамі і сцяной, аточанай калючым дротам, за якой віднелася "амерыканка": унутраная турма КДБ. Машына, на якой нас прывезлі, развярнулася і, здалося, ашчэрыўшы пашчу, зноў рушыла ў горад. За ёю, іржава парыпваючы, зачыніліся жалезныя вароты.

– Да сцяны! – скамандаваў адзін з вартавых, прымаючы нас ад канваіраў, і мне ўпершыню з таго моманту, як нас забралі на Круглай плошчы, стала страшна. Я не падумаў, што нас расстраляюць, але раптам нечага забаяўся. Дый не я адзін забаяўся. Віл спытаў здушана, калі вартавы падпіхнуў яго: "Чаго да сцяны?.." – і той вылаяўся: "Расстраляем на х…"

Сцяна, за якой віднелася турма, была ў шчарбінах і чырвоных пырсках. Хутчэй за ўсё, яна была ў фарбе, якой пырснулі, калі фарбавалі вядро, што адзінотна вісела на пажарным шчыце пры варотах. Нічога страшнага тут быць не магло, і ніхто пра страшнае і не падумаў бы, калі б пырскі тыя былі зялёныя, жоўтыя ці сінія. Але яны былі чырвоныя…

Як Ася сказала: гэта цяпер смешна. І то не надта. А тады з часу смерці Сталіна не прамінула і дзесяці гадоў, і амаль у кожнага з нас, апроч амерыканца з канадцамі, нехта з радні быў аднойчы забраны, патрапіў у гэткі самы, можа быць, двор – і не вярнуўся.

Уздоўж турэмнай сцяны і дома насупраць яе стаялі лаўкі – звычайныя дошкі на калодах. Не ведаю, чаму, але Амерыканец з канадцамі селі на "турэмную" лаўку, а мы ўсе – насупраць. І стараліся адзін на аднаго не глядзець.

Першым паклікалі Палкоўніка… І пасля доўга, гадзіны дзве, не клікалі нікога. Увесь гэты час раз за разам адчыняліся вароты: на машынах прывозілі ўсё новых і новых людзей. Амаль усіх іх – ці праз Косцю, ці праз Віла, а найбольш праз Палкоўніка – я ведаў. Любімчык Палкоўніка Гарык Клябанаў… Эдзік Гарачы і Эдзік Зельдовіч… Рыжык, Ося Рыжыкаў… Слава Буйнікоў… Лёня Макаранка… Валера Высоцкі… Віктар Лібенсон, вілаянчэліст, скрыпач, Ілля Фраўчы,

піяніст… Толя Пястрак з мянушкай Піля, сын пісьменніка Піліпа Пестрака… Вадзім Някрасаў… Сергей Будкевіч… Шыдляк, Генік Шыдлоўскі… Віця Шульман, сын знакамітага рэжысёра, які зняў кіно “Чалавек не здаецца” і якога праз сына пагналі з партыі, а значыць, з кінастудыі, з работы, з самога жыцця – і ён памёр урэшце недзе ў Канадзе… Амаль усе, за выключэннем Лібенсона і Фраўчы, – студэнты ўніверсітэта. Яны абміналі амерыканца з канадцамі, падыходзілі да нашай лаўкі, месца на якой ужо не хапала, і ставалі побач. Ніхто ні з кім не вітаўся, не казаў адзін аднаму ні слова. Усім было страшна. Не мне аднаму, усім…

Гадзіны праз дзве недзе ў доме, куды адвялі Палкоўніка, нешта ляснула. Суха, коратка. Нібы ссохлую галіну пераламілі. Ці стрэлілі. І адразу ў той жа дом павялі Амерыканца з канадцамі. Іх лаўка засталася вольная, але ніхто на яе не сеў. Усе, як стаялі, так і працягвалі стаяць каля нашай лаўкі, каля сваёй сцяны.

– Во гады… – збялела шапнуў Віл, які сядзеў паміж мной і Косцем. – Няўжо ў сутарэннях страляюць?..

І тут паклікалі яго. Ён падхапіўся, сеў, зноў падхапіўся, зрабіў крок, хістка пайшоў у другі бок, уздоўж запырскана-чырвонай сцяны… “Ты куды?” – крыкнуў адзін вартавы з ганку, а другі падышоў і павярнуў Віла, падштурхоўваючы прыкладам аўтамата: “Туды давай, туды…”

– А ён думаў яго тут, у двары… – на дзіва спакойна ўслед Вілу сказаў Косця. – Каб увесь горад чуў.

Я і тады, у тым двары, у тым жаху, і пасля, калі ўсё скончылася, здзіўляўся: чаму Косця, калі яго паклікалі ў дом, у які мы адзін за адным уваходзілі і з якога ніхто не выходзіў, у якім нешта суха ляскала, быццам у ім стралялі, падняўся і пайшоў, нічога не баючыся?.. Я бачыў, што ён не баіцца, нібы наперад ведаючы, што нічога ў тым доме з ім не станецца. Там, у тым двары, я думаў, што ён герой, а пасля, калі мы спрабавалі вылічыць, хто ж нас здаў, хто сярод нас стукач, нічога геройскага пра Косцю я ўжо не думаў. Менавіта таму, што ён адзін сярод нас выглядаў героем. Чаму гэта ён герой, калі мы ўсе перастрашыліся?.. Я падазраваў, успамінаў, сам у сябе пытаўся: ад каго Гурык пра тое, што Саламон Майсеевіч сваяк Леніна, дазнаўся? Калі мы толькі ўтраіх каля яткі былі: Ася, Косця і я?.. Я ўжо не верыў Косцю, як самому сабе, я ўжо ніяк яму не верыў. І не ганарыўся я сяброўствам з ім, і не здаваўся ён мне, як раней, найкруцейшым у Мінску…

Вось што робіць з намі страх.

А пасля Косця зноў здаўся мне героем… Калі адкрылася, што ўсё

пра ўсіх нас расказаў і напісаў у тым доме, дзе яго павінны былі расстраляць, але не расстралялі, Палкоўнік. Праз яго мы ўсе аказаліся ў адной, пра якую ведаць не ведалі, падпольнай арганізацыі: антысавецкай групоўцы Кіма Сысоя.

Пазней, калі Палкоўнік, якога пасадзілі за стварэнне антысавецкай групоўкі ягонага імя, адбыў два з паловай гады ў турме ў Піцеры і зноў з'явіўся ў Мінску, я пры першай жа сустрэчы спытаў: чаму?.. Чаму ён расказаў і напісаў усё за нас?.. "Бо наперад ведаў, – адказаў Палкоўнік, – што вы прызнаецеся ва ўсім, чаго яны захочуць. Дык лепей я сам".

Мяне паклікалі апошнім. Не ў сутарэнні, а ў звычайны пакой з адным акном, нават не закратаваным. Уся мэбля – скураная канапа каля сцяны, шафа ды стол з тэлефонам і графінам з вадой. За сталом, пастукваючы алоўкам па графіне, сядзеў мужчына гадоў трыццаці ў галіфэ і пінжаку вайсковага крою, які моўчкі паказаў мне на крэсла пасярод пакою.

Я сеў, падабраўшы ногі. Выпраставаў іх. Зноў падабраў. Я не ведаў, як на гэтым крэсле пасярод пакою сядзець? Куды глядзець? Сядзеў і глядзеў уніз.

– Я маёр Гагарын, – перастаў пастукваць, як з аўтамата пастрэльваць, мужчына ў галіфэ, і я сказаў таропка, каб спадабацца яму і паказаць, што на ўсё гатовы:

– Я ведаю.

Я чакаў, што гэта яму спадабаецца, а яму не спадабалася.

– Скуль ты ведаеш?..

Я не ведаў, як адказаць, скуль я гэта ведаю, каб не падставіць Саламона Майсеевіча, які напісаў на маёра Гагарына скаргу ў партыйны ЦК. Таму маўчаў, пакутліва ўсведамляючы, што спёкся ўжо на самым першым пытанні і цяпер мне не выкруціцца, а маёр не стаў чакаць, калі я што-небудзь для выкруткі прыдумаю.

– А ты ведаеш, што па апошнім законе, прынятым Вярхоўным Саветам у сувязі з абвастрэннем адносін з Амерыкай, ворагі СССР расстрэльваюцца без суда і следства! І ты пад гэты закон падпадаеш, ведаеш?!.

Скуль мне было такое ведаць?.. Як і тое, што такога закона няма і быць не можа. Я нават не ведаў, што законы прымаюцца Вярхоўным Саветам, і калі маёр Гагарын са словамі "і ты пад гэты закон падпадаеш!" узняўся над сталом, нада мною, над шафай, над усім светам – я страціў прытомнасць. Паплыў на тым крэсле, седзячы на якім не ведаў, куды глядзець і куды ногі падзець…

З таго моманту праз таго маёра Гагарына я ўжо не марыў, як

марыў раней, калі сапраўдны Гагарын у космас узляцеў, стаць касманаўтам.

Ачуняў я лежачы на канапе. Маёр Гагарын стаяў нада мной і пырскаў вадой, якая здалася мне прысоленай.

– З цябе вораг, як з гаўна куля, – пырснуў апошні раз маёр, і я сказаў, спрабуючы сесці і пачуваючы сябе так, нібы на спатканні з Асяй у порткі нарабіў:

– Я не вораг.

Мне здалося, што маёр паглядзеў на мае калашыны: ці не абмачыўся?..

– Дык я й кажу… Які з цябе вораг? Нармальны савецкі чалавек. Ты ж савецкі?

Я заківаў, выціраючыся:

– Савецкі.

– Вось бачыш, савецкі. Камсамолец. Сценгазетавец. Ты ж у сценгазету пішаш?

– Пішу. Вершы.

– Вось бачыш, пішаш. – Ён паставіў графін на стол. – Дык і нам напішы. Вершаў не трэба, прозу… Дакументальную, без ніякіх там мастацкіх вобразаў, прозу: я сустрэўся з тым і тым, той і той сказалі мне тое і тое… Ды не ўставай, можаш на канапе сядзець. А для пачатку скажы: радыёстанцыю ты ўжо змайстраваў?..

Я сабраўся ўстаць з канапы і, стоячы, з гонарам сказаць, што я не стукач, ніякай прозы для іх пісаць не буду – і не ўстаў. Бо пад ложкам маім у інтэрнаце электратэхнікума сувязі ляжаў заплечнік, а ў ім – радыёдэталі, пра якія ніхто, апроч мяне, не ведаў. Апроч мяне і, як аказалася, маёра Гагарына.

Скуль ён ведае?.. Пад ложак мой ён не лазіў. Выходзіць, нехта піша ў інтэрнаце электратэхнікума сувязі дакументальную прозу?..

Адмаўляцца, казаць, што нічога не майструю і майстраваць не збіраюся, было б па-дурному. Тым больш, што радыёспорт – не злачынства. Ім у той час займаліся ўсе, хто хацеў. Дакладней, хто мог. У тым ліку афіцэры з тэхнічных аддзелаў КДБ, якія, па-першае, у большасці сваёй ведалі ангельскую мову, і якім, па-другое, радыёстанцыю займець было найпрасцей.

– Не сабраў. Дэталяў не хапае.

– Якіх?..

Ён спытаў так, нібы готовы быў дапамагчы мне дастаць тыя дэталі.

– Пары лямпаў… Кандэнсатараў… Шмат яшчэ чаго…

– Шмат яшчэ чаго… – паўтарыў маёр, сядаючы. – А дзе ты бярэш

тыя лямпы з кандэнсатарамі? Купляеш?..

Ён не збіраўся мне дапамагаць… Ён збіраўся мяне пасадзіць, бо тыя лямпы з кандэнсатарамі нідзе ў тыя часы нельга было купіць. Ва ўсякім разе, у краме, дзе прадавалася хіба што драбяза для радыёлаў. А дэталі для радыёстанцыі можна было толькі дастаць. Наўпрост кажучы, скрасці. Ці самому, ці папрасіць каго-небудзь, каб скраў. Сцягнуў у войску, выламаўшы іх з “Крата” або з “Р-250”, ці вынес з завода.

Не ведаючы, што адказаць, я тужліва глядзеў на маёра. Яму дастаткова было паслаць некага ў інтэрнат, каб знайшлі пад маім ложкам радыёдэталі, і мяне пасадзяць. Як звычайнага злодзея, без ніякай палітыкі.

Зрабіўшы паўзу, каб я ўсё асэнсаваў і ўцяміў, што са мной можа быць, маёр дапытаў:

– Амерыканец табе іх з завода цягае?

Ён даваў мне накірунак… Шлях, па якім я магу выбрацца з кута, у які ён мяне загнаў. І, магчыма, я рушыў бы гэтым шляхам, але Амерыканец не цягаў для мяне дэталі. Ні для каго не цягаў. Віл аднойчы папрасіў яго прынесці шкалу настройкі, кавалачак звычайнай пластмасы, на што Алік адказаў, што ён не рускі, каб красці. Нібы ў ягонай у Амерыцы не крадуць, а толькі кіно пра гэта паказваюць. І сам ён не п’е аплаткі, якія крадзе для яго ў шпітальнай аптэцы Марына.

Ну ды гэта ягоная справа. Дэталі для мяне ён не цягаў.

– Не. Ён для мяне не цягаў дэталі.

– А хто?

– Ніхто. Я сам.

– Ты сам?..

Суха зглынуўшы, голасу свайго я не знайшоў, таму толькі кіўнуў. Маёр падняўся, адчыніў дзверцы шафы, узяў чысты аркуш паперы, паклаў на край стала.

– Значыць, ты сам?

Я зноў кіўнуў.

– Тады сядай і пішы…

Я ўстаў з канапы – ногі трымалі слаба.

Сеўшы да стала і яшчэ раз зглынуўшы, я ўсё ж знайшоў голас, хоць і слабы.

– Што пісаць?..

– Тое, у чым ты мне толькі што прызнаўся… Што ты неяк… абавязкова напішы, як?.. прабіраешся на рэжымны завод і крадзеш дэталі. За што дадуць табе не менш за пятнаццаць гадоў…

Крымінальны кодэкс паказаць, ці на слова паверыш?

Ён мяне ўжо нават не ў кут заганяў. У пастку. У турму.

Я узяў аловак, якім маёр, калі я ўвайшоў, пастукваў па графіне.

– Як гэта назваць?.. Паказанні?..

– А табе хто рацыю дае, калі сваёй не маеш? – нечакана змяніў накірунак, якім мне выбірацца ўжо не з кута, а з турмы, маёр Гагарын. – Гарачы?.. Ці ты працуеш на пару з Леднікам?

– Гарачы не займаецца радыё... – пачаў я і замаўчаў, зразумеўшы, што ўжо адказаў на ягоныя пытанне. Калі не Гарачы, дык Віл, дзіця я горкае, з кім боркацца ўздумаў...

Якраз праз Віла я і заняўся радыёспортам. Калі ў мігценні зялёных агеньчыкаў радыёстанцыі правёў я з ім некалькі начных гадзін, за якія ён пабываў і ў Індыі, і ў Амерыцы, і ў Аўстраліі, і пагаварыў пра джаз, як свой са сваім, не з кім-небудзь, а з самім Луі Армстрангам, які паабяцаў даслаць яму (і праз пару тыдняў даслаў!) кружэлку з аўтографам, я трызніць стаў тымі зялёнымі агеньчыкамі. А калі сам пачаў працаваць у эфіры, дык дамовіўся з тым жа Луі Армстрангам, што вышлю яму фота, на якім ён у абдымку з Эдзі Рознэрам, каб ён надпісаў яго і даслаў Эдзіку Гарачаму – вось праз што ў Эдзіка не было праблем пры знаёмстве з дзяўчатамі...

Адкручвацца не выпадала, дый патрэбы не было адкручвацца. Што з таго, што Віл падвучвае мяне на сваёй радыёстанцыі? Яна зарэгістраваная, які тут крымінал?..

– Я не працую з Леднікам, у яго першая катэгорыя, права працаваць з тэлефонам ва ўсіх дыяпазонах, а ў мяне...

– І ў цябе будзе, – узяў маёр Гагарын верхнюю паперку са стосу паперын на стале. – Усё ў цябе будзе... І катэгорыя, і права, а пакуль што... Ты быў у Ледніка, калі ён звязваўся з амерыканскім сенатарам Гары Балдуотэрам?

– Бары Галдуотэрам?..

Перапытаў я дарэмна. Маёра Гагарына, які проста агаварыўся, перасмыкнула.

– Ну, Бары Галдуотэрам. Значыць, быў?

– Не. Проста ведаю, што ёсць такі.

– І ведаеш, хто ён?

– Амерыканскі сенатар. Вы ж самі сказалі.

Маёр зірнуў на мяне так, каб я зразумеў, што ў недаўмеку з ім гуляць ён мне не рэкамендуе. У гэта, маўляў, мы ўжо пагулялі.

– Сенатараў амерыканскіх шмат... Але не ўсе гатовыя да вайны з Савецкім Саюзам. – Маёр паклаў паперку на стол, тыкнуў у яе пальцам. – Гэта ястраб! Вораг! Ён заклікае знішчыць нас, пачаць

супраць нас атамную вайну, а вы з ім на сувязі! Што за такое можа быць, як ты думаеш?..

Зразумела, што ўжо не пятнаццаць гадоў турмы... І нават не дваццаць...

Прытомнасці гэтым разам я не страціў, але ўвесь, з галавой, якую нядоўга засталося насіць, уціснуўся ў крэсла. Калі падаць на следстве і судзе, ці недзе там без суда і следства, усё так, як падае маёр Гагарын, дык пра тое, што за такое можа быць, і пытацца няма чаго.

Расстрэл.

І як ратавацца?

– Ён радыёаматар...

– Хто радыёаматар?

– Галдуотэр... Другое месца ў чэмпіянаце свету... У Віла першае, а ў яго другое.

Маёр Гагарын здзівіўся. Можа быць, праз тое, што вось ён – маёр КДБ, а не ўсё пра ўсіх ведае. І спытаў, як не паверыў:

– Леднік – чэмпіён?..

Гэта была праўда. Амерыканцы, працуючы на шыкоўных радыёстанцыях вытворчасці найлепшых фірмаў, ніяк не маглі перамагчы нас у чэмпіянатах свету – з нашымі самаробнымі, з абычаго злепленымі, “скрынкамі”. Чэмпіянаты ў той час праводзіліся часопісам “CQ”, што на міжнародным кодзе азначае да ўсіх, хто мяне чуе, і былі неафіцыйнымі. Сенатар Галдуотэр займаўся радыёспортам заўзята, у яго была свая радыёстанцыя ў сенаце, а ўсё адно ён быў другім. Быць другім не толькі ў спорце, а ва ўсім, было яму, пэўна, лёсам наканавана, бо не стаў ён першым і ў выбарах Прэзідэнта ЗША, на якіх пасля таго, як Алік забіў Джона Кенэдзі, Бары Галдуотэр змагаўся з Лінданам Джонсанам. Тут яму радыёстанцыя ў сенаце, на гмаху якога тырчэў падвойны квадрат ягонай радыёантэны, па тэлебачанні паказанай на ўсю Амерыку, здорава зашкодзіла. Выступаючы па тым жа тэлебачанні, ягоны сапернік Джонсан нібы між іншым, як не пра галоўнае, але ўсё ж і не дробязнае, пракінуў: “Спадзяюся, нашы з вамі суайчыннікі, сенатар, паважаючы Амерыку і яе сімвалы, не дапусцяць падвойных квадратаў над Белым домам”.

Скуль мы гэта ведалі?.. Мы ведалі гэта з эфіру, хоць размовы ў ім пра палітыку і ўсё, што блізкае да яе, былі забароненыя міжнародным Статутам, выконваць які абавязваўся кожны радыёаматар, хоць ён гэбіст, хоць ён сенатар. Ды чаго толькі нам ні забаранялі...

Выбраўшы прэзідэнтам Джонсана, амерыканцы не дапусцілі

падвойных квадратаў над Белым домам, але з будыніны сената Галдуотэр іх не зняў, як яго да таго ні змушалі. І мы павіншавалі яго з перамогай!..

Вось што такое радыё, зялёныя агеньчыкі ўначы… Гэта вам не ў прэзідэнтах быць і нават не кадэін, не “калёсы” глытаць. Гэта тысячы тысяч галасоў, якім ты можаш падаць свой голас…

Нехта шукае галасы ў выбарчых скрынях, нехта – у сусвеце. Але хіба давядзеш гэта маёру?..

Маёр раптам адклаў расстрэл.

– А з каралём Іярданіі Хусэйнам?.. Ты быў у Ледніка, калі ён звязваўся з каралём Іярданіі?

Мне трохі адпусціла горла, ужо не так моцна сушыла і здушвала… Кароль – не сенатар, Іярданія не збіраецца з намі ваяваць. Можа, не расстраляюць?

Маёр выцягнуў, пакруціў у пальцах і назад уставіў корак графіна:

– Ну?..

Я глядзеў на графін, мацаў горла і не разумеў, чаму я баюся папрасіць маёра, каб наліў вады?.. Трэба пераадолець страх, папрасіць, я ж хачу піць, і я ўжо разняў сшорхлыя вусны, каб сказаць: “Таварыш маёр, наліце, калі ласка, вады…” – але тут зазваніў тэлефон.

– Ёсць! – падхапіўся маёр, зняўшы трубку, хоць той, хто тэлефанаваў, не мог бачыць, падхапіўся ён, ці сядзіць, як сядзеў, і маёр адчуў, што я пра гэта падумаў, яму стала ніякавата і ён, ужо трубку паклаўшы, раптам закрычаў: “Пайшоў адсюль! Спатрэбішся – знойдзем!” – і стаў таропка збіраць паперы, каб да некага, каму ён адказаў, ускочыўшы, “ёсць”, з паперамі бегчы, а я падняўся і пайшоў, ніхто мяне не затрымліваў, толькі вартавы, калі я ў дзверы, што ў двор вялі, пасунуўся, сказаў: “Не туды, у тыя!..” – і праз дзверы, на якія паказаў, ён вывеў мяне нейкімі пераходамі на вуліцу Інтэрнацыянальную, былую Зборавую, па якой дайшоў я да кінатэатра “Перамога”, дзе купіў квіток на бліжэйшы сеанс і ў буфеце піў, піў і піў ваду…

Кінатэатр “Перамога” быў некалі клубам імя Сталіна – і тут жа была філармонія, дзе ў красавіку 1940 года прайшлі першыя канцэрты аркестра Эдзі Рознэра. Музыканты, габрэі з Берліна, Прагі, Вены, Варшавы, якіх прыгнала вайна ў Савецкі Саюз, дзе яны думалі ўратавацца ад Гітлера, а патрапілі да Сталіна, гралі так, што ўвесь Мінск гудзеў! “Ды які там Лёня, які там Яша!..” – чулася каля пашкамутаных ветрам афішаў з рэпертуарам аркестраў Уцёсава і

Скамароўскага. – Вось наш Эдзюня!..” Пяці канцэртаў хапіла, каб дагэтуль нікому ў Мінску невядомы польскі габрэй Эдзі Рознэр стаў “нашым Эдзюнем”, а “Беластоцкі тэатралізаваны джаз”, якім страсянуў Эдзюня Мінск, стаў “Дзяржаўным джаз-аркестрам Беларускай ССР”.

“Што вам трэба, – спытаў Эдзюню начальнік Савецкай Беларусі Панцеляймон Панамарэнка, – каб з такім жа фурорам выступіць у Маскве на дэкадзе беларускага мастацтва?” “Ап-пар-р-ратура, гоп, ап-пар-р-ратура!..” – праспяваў яму Рознэр, і займеў такую гоп-апаратуру, якой не было ні ў адным аркестры СССР: з радыёзавода, што працаваў па ліцэнзіі кампаніі “Тэлефункен”. Радыёзавод з Вільні, якая восенню 1939 года адышла да Літвы, вывезлі ў Мінск, дзе ён стаў заводам імя Леніна, на якім працуе цяпер амерыканец Алік. Хоць пры чым тут амерыканец Алік? Ні пры чым…

З гэтага завода займеў радыёапаратуру для свайго джаз-аркестра Эдзі Рознэр. І дзе ён праз тое апынуўся? На Калыме.

З гэтага завода – лямпы і кандэнсатары, схаваныя ў маім заплечніку пад ложкам у інтэрнаце электратэхнікума сувязі! Дык чаго я тут сяджу і ваду п’ю, нібы ў Саламона Майсеевіча той вады не напіўся?..

З кінатэатра, у дзвярах якога кантралёрка спытала: “А кіно?..” – я пратрусіў на “брадвэй”, скочыў у першы тралейбус, даехаў да Падлеснай, дабег да інтэрната, схапіў заплечнік, доўга мітусіўся на вуліцы, не знаходзячы месца, дзе можна ад таго, што ў ім, пазбавіцца – у гэтым гэбісцкім горадзе няма куды выкінуць нават самы маленькі, не большы за канцылярскую скрэпку, рэзістар! Нарэшце ўбачыў люк з надпісам ГТС, побач з ім кінуты кавалак арматуры, якім прыпадняў люк, адсунуў яго ўбок і ссыпаў увесь свой скарб з заплечніка ў цёмную прорву калодзежа гарадской тэлефоннай сувязі. Азірнуўшыся, ці не сочаць за мной, паставіў люк на месца і зноў пабег па Падлеснай, скочыў у першы тралейбус і, праязджаючы вуліцу Леніна, убачыў на лаўках у скверы тых, хто яшчэ зусім нядаўна стаяў каля сцяны і сядзеў на лаўцы побач са мной у двары на Інтэрнацыянальнай. Усе былі тут, апроч Амерыканца з канадцамі і Палкоўніка, які стварыў з нас антысавецкую групоўку, назваўшы яе сваім імем, каб мы адчулі, як напісаў ён у сваёй няскончанай казцы, “трагедыйнасць быцця і яшчэ шмат чаго экзістэнцыйнага, што не мае назвы”.

Вуліца Кісялёва, былая Старажоўская

Адчуўшы ў поўнай меры трагедыйнасць быцця і яшчэ шмат чаго экзістэнцыйнага, што не мае назвы, мы рушылі шукаць Палкоўніка, якога знайшлі ў доме сястры. Але не з сястрой, а з Асяй, якая павінна была быць з Гурыкам. Ад Гурыка Ася дазналася, што нас арыштавалі, і прыскакала. Косця паспрабаваў зрабіць выгляд, нібы яму ўсё адно, дзе і з кім яна скача, ды не стрываў. “Праз цябе...” – пачаў ён, збіраючыся, мусібыць, сказаць, што, каб не яна са сваімі скокамі, мы бампер не адарвалі б, нас бы ў міліцыю не забралі і ў той двор не загналі, дзе мы чакалі, калі нас расстраляюць, але Палкоўнік перапыніў Косцю:

– Што праз яе?!. Вайна?!.

Ён крыкнуў гэта, тыкнуўшы пальцам у Асю, і тая выбегла, не зачыніўшы дзверы...

Асі было дваццаць, Палкоўніку за трыццаць. У маіх вачах іх падзяляла бездань. І ніводнага разу мне не падумалася, што і Косця, і Гурык куды бліжэй па ўзросце да Палкоўніка, чым да мяне. Палкоўнік нібыта аднолькава быў старэйшы і за іх, і за Асю – за ўсіх. Але ж яно было не так...

Доўга я не мог зразумець: як Палкоўнік ставіцца да Косці, Гурыка? Да ўсіх – і найперш да мяне? Думаў, што да мяне – абыякава, ніяк, пакуль Гарык Клябанаў, які быў не толькі любімцам Палкоўніка, але і раўніўцам, аднойчы не спытаў раздражнёна: “А што за сын палка сярод нас круціцца?” Было гэта тут, у гэтай кватэры, і я кінуўся, як толькі што кінулася Ася, да дзвярэй, а Палкоўнік злавіў мяне за руку: “Ён не сын палка, а сын Палкоўніка!..”

Гэта была мая першая перамога ў кампаніі, якая гуртавалася вакол Палкоўніка: ён як бы прыраўняў мяне да астатніх. Я застаўся – і цяпер мы ўсе стаялі, гледзячы на дзверы, якія, хіснуўшыся туды-сюды, самі зачыніліся за Асяй.

– З бабамі пасля... – сказаў Віл, нібы выручаючы Косцю, які не знайшоў, што адказаць Палкоўніку. – Між намі мужыкамі давайце разбярэмся.

Палкоўнік ніколі не быў мяккай цацкай, а тут, здалося, жалезныя іскры з яго сыпанулі – так ён накінуўся на Віла.

– У чым разбірацца?!. З канадцамі кінь цягацца! Хто ў іх валюту цыганіць? Я?!.

Ніхто з нас не ведаў, што Палкоўнік напісаў для маёра Гагарына

“дакументальную прозу”, таму ніхто не разумеў, што з ім?..

Валюту ў канадцаў мы сапраўды цыганілі. Найчасцей цыганіў Віл, які прыдумаў байку, нібы, выпіваючы за валюту, ён пачувае сябе Эрнэстам Хэмінгуэем. Калі ж п’е за рублі, яму сніцца, што ён Піліп Пестрак. Пестраком жа Віл сябе нават сніць не хацеў, хоць за валюту ён, як і за рублі, купляў не кальвадос, які любіў Хэмінгуэй, а любімую пестракоўскую гарэлку. Аддаючы ў мастацтве перавагу ўсяму замежнаму, у жыцці Віл прытрымліваўся айчынных традыцый, схіляючыся не да таго, што лепш, а да таго, чаго больш.

Калі ў 1961 годзе была праведзеная дэнамінацыя рубля, названая самай гуманнай у гісторыі грашовай рэформай, і замест рубля старога з’явіўся новы, у дзесяць разоў даражэйшы, ён маляваўся ў газетах, як асілак, які ўзняў молат над уціснутай у плечы галавой карліка – змарнелага долара. Але за пяць рублёў-асілкаў можна было купіць у звычайнай краме толькі адну пляшку гарэлкі, якая каштавала 2 87, плюс ікра жоўтая (кабачковая), сыр “Каўбасны” і каўбаса “Ліверная”, а за пяць карлікаў-долараў у краме валютнай – дзве пляшкі гарэлкі плюс ікра чорная (асятровая), сыр “Швейцарскі” і каўбаса “Зубрыная”. Ці, калі купляць без ікры, дык тры пляшкі з каўбасой. І як яно так выходзіла, што за меней, бо долар у газетах каштаваў 90 капеек, можна купіць болей, ведалі хіба фарцоўшчыкі, якія куплялі долары ў замежнікаў даражэй, чым за капейкі, але за колькі – не распавядалі нікому, апроч КДБ.

Віл не быў фарцоўшчыкам, таму ягоныя фінансавыя стасункі з іншаземцамі цвёрда палягалі на тым, што друкавалася ў савецкіх газетах. Пазычаючы валюту, ён вяртаў пазыку рублямі па афіцыйным курсе. Выходзіла, што замест дзвюх пляшак вяртаў адну, замест ікры асятровай – кабачковую, замест каўбасы “Зубрынай” – “Ліверную”. Крэдыторы з гэтым найчасцей мірыліся, бо пазычалася драбяза. Калі ж яны выяўлялі незадаволенасць, Віл прыносіў газету з асілкам, які ўздымаў молатам над карлікам, і пытаўся: “Вы супраць нашага курса? Вучыцца ў нас не жадаеце?..”

Канадцы Джым Калеснікаў і Джон Дак вучыцца ў нас жадалі. Дзе б яшчэ іх так – за так! – вучылі?..

З Джонам была праблема: перш чым пазычыць пяцёрку, ён граў на баяне. І змушаў тых, каму пазычаў, слухаць. Гадзіну, а то й болей граў – гэтак любіў мурын рускі баян. Віла, якому свае кружэлкі з аўтографамі дасылаў Луі Армстранг, нудзіла, але ён трываў. Бо мала было стрэсці з баяніста пяцёрку “карлікаў”, трэба было яго ж і па гарэлку з ікрой зганяць. Самому ўзяць лепш не спрабаваць, таму што каля ўваходу ў валютную краму стаіць, апроч міліцыянта,

непрыкметны такі чалавечак, які дакладна ведае, у каго валюта можа быць, а ў каго яе быць не павінна. І калі ў цябе быць яе не павінна, а яна ў цябе ёсць, дык, калі ласка, да маёра Гагарына…

Джым Калеснікаў па мянушцы Кола, які вучыўся не ў кансерваторыі на баяне, а ва ўніверсітэце на філфаку, музычных здольнасцей не меў. Таму ён меў значна большыя страты праз фінансавыя стасункі з Вілам. “Нічога, Кола, – суцяшаў яго Віл. – Не будзь жлабом – і ўсё табе вернецца. Нават з гакам”.

Віл угадаў: Джыму ўсё вярнулася. Нават з гакам…

Калі 60-я гады неверагодным чынам перакруціліся ў 90-я, я спаткаў Джыма Калеснікава ў Маскве. Ён адкупіў дом свайго прадзеда на праспекце Міра, былой вуліцы Мяшчанскай, і глядзеўся так, нібы мог скупіць усю Маскву, ды ўся яна яму ні для чаго. А грошы, каб глядзецца так, ніба ён можа скупіць усю Маскву, зарабіў ён не дзе-небудзь, а ў былым СССР. “У Мінску я й пачаў вучыцца здабываць іх без залішніх цырымоній. Так што, – узняў шклянку з віскі ў сваім доме ў Маскве на вуліцы Мяшчанскай канадзец Джым Калеснікаў па мянушцы Кола, – за Мінск! І за Віла, як ён там цяпер?..”

Віл цяпер, дзякуй Богу, нічога, хоць, канечне, час, узрост. Сэрца, вочы… Мы сустракаемся зрэдку на даху дома, у якім ён жыве, і падцягваем правіслыя драты, раўняем пахіленую ветрам антэну: падвойны квадрат. З дома цераз вуліцу і трохі наўскос, дзе Міністэрства ўнутраных спраў, глядзяць на нас маёры і падпалкоўнікі, а мы, замацаваўшы антэну, сядаем спінамі да коміна, выцяжной трубы, і глядзім на наш горад.

Адсюль, з даху дома на вуліцы Гарадскі Вал, колішнім Захар’еўскім правулку, ён, наш горад, як на паштоўцы з мінулага. Былая Зборавая, Базарная, пляц Волі з ратушай, былыя Траецкая, Вялікая Татарская, Замкавая, Васкрасенская, Завальная, Мясніцкая, Няміга-Ракаўская, былыя Ракаўскі і Семінарскі правулкі, Няміга, ад якой засталася толькі Жоўтая царква – усё былое… Нам трохі сумнавата, ды раптам Віл згадвае, што яшчэ зусім нядаўна вуліца Гарадскі Вал называлася імем бандыта Урыцкага, і мы весялеем, бо нешта ўсё ж у нашым жыцці зрушылася да лепшага. Вунь і ўнізе, на першым паверсе дома, дзе ў часы, калі вуліца называлася імем бандыта Урыцкага, была крама “Садавіна-гародніна” – цяпер рэстарацыя “Мірскі замак”. Там сядзець нам не па кішэні, дык мы сядзім тут, на даху – не горш. “Так што… – кажа Віл, дастаючы з кішэні пляскатую пляшку каньяку, хоць піць яму дактары забаранілі пад страхам смерці, але, калі ўжо паміраць, дык ад лепшага… – давай за Мінск!” Мы патрохі выпіваем, згадваючы Эдзі Рознэра і Луі Армстранга, Бары

Галдуотэра і караля Кувейта, Кенэдзі і Аліка, Аса і Біга, Гурыка і Косцю, Асю і Марыну, а найчасцей Палкоўніка… І кожны раз, калі мы яго згадваем, маёры і падпалкоўнікі з дома, які трохі наўскос цераз вуліцу, глядзяць на нас асабліва ўважліва. Раптам я ўспамінаю, што сустракаў у Маскве Джыма Калеснікава, які вучыўся ў Мінску на філолага, а стаў прэзідэнтам нейкай найбагатай руска-канадскай карпарацыі, на што Віл кажа: “Шкада, што ён не ў Мінску, я б у яго пяць баксаў сцыганіў… Хоць што цяпер за пяць баксаў купіш?”

“Пляшку, – я кажу, – купіць можна”.

“Але ж не тры з ікрой, – уздыхае Віл. – Як усё змянілася…”

Ён забыўся: з ікрой можна было купіць дзве пляшкі. Тры – гэта ўжо без ікры.

З даху дома на Гарадскім Вале добра відаць двор у квартале вуліц Камсамольскай з Інтэрнацыянальнай, у які праз жалезныя вароты то ўязджаюць, то выязджаюць машыны. На варотах стаіць вартавы, на пажарным шчыце адзінотна вісіць вядро. Там не змянілася нічога. Хіба што вароты цяпер расчыняюцца не ў бакі, як некалі, а падымаюцца ўверх.

– А помніш, як з цябе Палкоўнік фарцоўшчыка вырабляў? – пытаюся я ў Віла. – Каб мы падумалі, што нас за валюту расстраляць хацелі?

– З мяне?.. – здзіўляецца Віл. – Фарцоўшчыка?..

Ён не помніць. Сэрца, вочы, скляроз… Са склярозам і я сябрую, але не так блізка. Ва ўсякім разе, усё, што хоць неяк звязана з Асяй, помню… Як яна выбегла, як дзверы за ёй самі зачыніліся і як Палкоўнік накінуўся на Віла, што ён валюту ў канадцаў цыганіць…

… – Ніхто ні ў кога пра валюту не пытаўся, – заступіўся за Віла Косця, і Палкоўнік агрызнуўся:

– Гэта ў цябе не пыталіся! А мяне асталі вашай валютай!

Відаць было, што ён маніў. І незразумела было, навошта?..

Косця адышоў да дзвярэй, якія яшчэ ўздрыгвалі, зачыніўшыся за Асяй. Торгнуў дзверы за ручку, зачыніў шчыльна.

– Каго яшчэ асталі валютай? – Ён глянуў на Пілю. – Цябе?..

– Не… – Піля пабойваўся і Палкоўніка, і Ворана, не кажучы ўжо пра маёра Гагарына. – Мяне бацькам даставалі.

– Якім бацькам?

– Маім… Каб я падумаў, што з ім будзе, калі ўсе дазнаюцца, што я, сын рэвалюцыянера, такога пісьменніка…

– Ха! – хакнуў Палкоўнік, які, можа быць, і лічыў яшчэ каго-небудзь, апроч сябе, рэвалюцыянерам і пісьменнікам, але не Піліпа Пестрака, і тут раптам Эдзік Гарачы, сябар Пілі, крыкнуў: “Не хакай!”,

– і ўскінуў руку, нібы ў піянерскім салюце:

– Антыасаркан!

Здорава ў яго ўсё гэта выйшла: і “не хакай!”, і піянерскі салют, і, падобнае на “no passaran!”, тарабарскае слова антыасаркан! Нездарма ён актор Тэатра юнага гледача, на прыступках якога чыталіся вершы і ў калонах якога блукалі, пераплываючы з левага берага Свіслачы на правы, пахі далёкай маскоўскай адлігі.

З Палкоўнікам найчасцей лаяўся Косця. Ці Шыдляк, напорысты Генік Шыдлоўскі. Але ад Эдзіка, звычайна ціхага, найцішэйшага ў нашай кампаніі, ніхто напору такога не чакаў, нават Палкоўнік на дзверы азірнуўся:

– Ты што гэта?..

– Гэта тое, пра што пыталіся. Хто прывёз кнігу ў Мінск, хто чытаў, хто і каму перадаваў? У мяне пыталі, хто перадаў мне…

Палкоўнік, які і прывёз з Масквы раман “Анты-Асаркан”, пра які чуў я ў размовах, але не чытаў, бо да мяне, як да наймалодшага, кніга не дайшла і ўжо, падобна, не дойдзе, перапытаў насцярожана:

– І што?..

– Нічога, – апусціў руку, якую ўсё яшчэ трымаў, нібы ў піянерскім салюце, Эдзік. – Ніхто не перадаваў. Раніцай іду ў тэатр, а нешта ляжыць на прыступках за калонай. Скручанае так, як вялізная кубінская сігара. Спыталі: чаму кубінская? Я спытаў: а якая яшчэ?..

З даху дома на Гарадскім Вале, дзе сядзім мы з Вілам, відаць дом на праспекце Незалежнасці, дзе некалі была крама “Тытунь”, у якой куплялі мы кубінскія сігары. У бліскучых, быццам срэбных, падобных на ракеты, якія Савецкі Саюз хацеў паставіць на Кубе, каб страшыць Амерыку, футуральчыках, укладзеных у драўляныя скрыначкі. Адна такая сігара ў Амерыцы (Віл пацікавіўся пра гэта ў сенатара Галдуотэра) каштавала 20 долараў, а ў нас – 20 капеек. Галдуотэр не паверыў…

У краме “Тытунь” на праспекце Незалежнасці, у той час праспекце Леніна, я купіў свой першы пачак цыгарак. Доўга вагаўся, выбіраючы паміж “Шыпкай” і “Джэбэлам”. І хоць пачак “Шыпкі” – пляскаты, з тонкага кардону, падобны на пачак з папіросамі “Казбек” ці “Герцагавіна Флор”, якія курыў Сталін – выглядаў прыгажэйшым за звычайны, папяровы пачак “Джэбэлу”, я выбраў апошні. Каб не пачынаць з таго, што хоць неяк нагадвала пра Сталіна, праз якога пасадзілі ў турму Палкоўніка.

Я ўгадаў з цыгаркамі… Тытунь, з якога яны выраблялiся, быў з дабаўкай. З траўкай, якая аказалася наркатычнай. Ледзь-ледзь, але ўсё ж… З паўпачка можна было нармалёва палятаць. Але даволі хутка

з “Джэбэлам” разабраліся, прадаваць цыгаркі забаралілі, імпарт іх спынілі – і палёты скончыліся.

Не знайшоўшы лятучага паліва ні ў “Шыпцы”, ні ў ніякіх іншых цыгарках, якімі спрабаваў замяніць “Джэбэл”, я кінуў паліць.

“Шыпку” нам прывозілі балгары, а “Джэбэл”… Вось і не помню, хто і адкуль прывозіў нам такія лятучыя цыгарэты… Хіба тыя ж балгары? Чаму тады “Джэбэл”, д’ябал? Не падобна на сяброў, не падобна… І не кубінцы “Джэбэл” прывозілі, яны таксама, як і балгары, сябры… Можа, парагвайцы… Каб, накурыўшыся, мы паставілі ў іх ракеты – і пачалася вайна.

– Віл, – пытаю я, гледзячы ў той бок, дзе некалі была крама “Тытунь” з кубінскімі сігарамі па дваццаць капеек, – а што ў той кнізе было?

– У якой?..

– Праз якую Эдзіка Гарачага пасадзілі.

– “Доктар Жывага”?

“Доктара Жывага” я чытаў: Палкоўнік меў (пакуль гэбісты не забралі) італьянскае, у вішнёвай вокладцы, выданне.

– Не.

– “Ракавы корпус”?

– Не… Тарабарская нейкая назва…

– “Анты-Асаркан”?

– Так.

– Ты хіба не чытаў?

– Не. Да мяне, як да наймалодшага, чарга не дайшла.

Віл адпівае трохі з пляшкі, перадае пляшку мне.

– Шкада, што не я быў наймалодшы.

Я раблю глыток.

– Кепская кніга?

– Не помню… Калі б я быў наймалодшы тады, дык быў бы наймалодшы й цяпер.

– А…

– Што “а”?..

– Чаму “Анты-Асаркан”?

– Ха! – хакае Віл, на ўсё жыццё набраўшыся гэтага ў Палкоўніка. – Ты не помніш?

Ён задаволены, што я, маладзейшы, не помню. І я пацвярджаю, што не помню, адмоўна ківаючы галавой.

– Быў такі Аляксандр Асаркан, крытык тэатральны. Маскоўскі мураш, як яго называлі. Ён сядзеў ва Ўладзімірскім цэнтрале разам з Палкоўнікам і Паўлам Уліціным… Ты Паўла Уліціна чытаў?

Я чуў пра Уліціна, але не чытаў яго, таму зноў адмоўна ківаю галавой, і Віл глядзіць на мяне, як на чалавека, які зрабіў нешта непрыстойнае. Ці не, не так: ён глядзіць на мяне, як на чалавека, які павінен быў і мог зрабіць нешта прыстойнае, але не зрабіў. Не прачытаў Уліціна…

– Ведаеш, што ў ягонай біяграфіі было?

– Турма, калі з Палкоўнікам сядзеў.

– Турма… Ты што-небудзь страшнейшае за турму ўявіць можаш?

– Магу.

– Што?

Я не ведаю, што?..

– Лагер?

– Лагер… Не сядзеў ты ніколі – вось табе і страшна. А ўяві: твайму бацьку, каморніку, адсякаюць галаву. Ці то белыя, ці то чырвоныя… Сям'я Уліціна адразу пасля рэвалюцыі на Доне жыла… І вось ён, трохгадовы хлопчык, прачынаецца ўночы, а пасярод хаты маці стаіць з галавой бацькі ў руках. Не ведаючы, куды яе падзець… Пасля кладзе на зэдаль, ідзе на двор і вяртаецца з целам… Усцягвае на стол і пачынае прышываць да цела галаву…

Я ўявіў – і пацягнуўся да Віла па каньяк.

– Скончыўся, – пабоўтаў пляшку Віл. – А ты – турма… Пайшлі ў тэатр да Эдзіка, у бары пасядзім.

Рускі тэатр, у якім працуе цяпер Эдзік Гарачы, можна ўбачыць з даху дома на Гарадскім вале, калі павярнуцца ад Жоўтай царквы на Нямізе да турмы на Валадарскага. Турму называюць Пішчалаўскім замкам. У "замку" разбурылася адна з вежаў, і з даху цікава назіраць, як турэмшчыкі ходзяць каля яе, не ведаючы, што з ёй рабіць…

– Дык вось яны ўтрох, Палкоўнік, Асаркан і Уліцін, напісалі ў турме авантурны раман. Той раман авантурны начальнік турмы… Ты чытаў "Размову пра рыбу" Уліціна? – так і не дазнаўся я, што зрабіў з авантурным раманам авантурны начальнік турмы, бо пра Уліціна размаўляць Вілу цікавей, чым пра Асаркана і нават пра Палкоўніка.

– Не чытаў.

– А "Браму Каўказа"? – паціху спускаецца Віл са свайго даху на свой сёмы паверх, дзе ўжо ў кватэры паказвае мне фотаздымак, на якім побач з Палкоўнікам стаіць фацэтны чалавечак у берэціку з кіёчкам, які, здаецца, толькі што зваліўся з даху і зламаў нагу. Гледзячы ў ягоныя смутныя, як ва ўсіх габрэяў, і ў той жа час весела звар'яваныя вочы, чамусьці думаеш, што наўрад ці сярод напісанага ім можна вычытаць нешта талковае.

– Калі маці ягоная памерла, – кажа Віл, улюбёна гледзячы на фацэтнага чалавечка з кіёчкам, – ён напісаў ёй ліст.

– Куды?..

– На той свет. Куды яшчэ нябожчыкам пісаць?..

Вуліца Валадарскага, колішняя Лошыцкая, былая Серпухаўская

Эдзік Гарачы адмарозіў ногі ў лагеры, таму ходзіць па тэатры ў валёнках. Ён нават ролі ў спектаклях просіць такія, каб можна было ў валёнках граць. За савецкім часам такіх роляў хапала, а цяпер не стала – і Эдзік у спектаклях амаль не заняты. Затое спакойна можа сядзець у тэатральным бары. Ніхто не падбяжыць: “Ты што перад спектаклем п’еш?!.” А калі нехта й падскочыць, не разабраўшыся, дык Эдзік адкажа: “Віно…”

У Эдзіка здароўе ўжо не тое, каб каньяк піць.

Вось чаму яго аднаго, калі не лічыць Палкоўніка, пасадзілі? А не Пілю, ці яшчэ некага з нас… І я пытаю, схадзіўшы, як наймалодшы, па каньяк для мяне з Вілам і па віно для Эдзіка: як ён думае, чаму аднаго яго?

– Бо аднаго ім было дастаткова, – адпівае віна Эдзік. – А мяне, бо каго яшчэ?.. У Пілі бацька пісьменнік, у Шульмана – рэжысёр, у Фані Файнберг – член-карэспандэнт, у Паліцаева – гэбэшнік… А ў мяне бацькі няма, а маці – санітарка.

Віл крывіцца:

– Пры чым тут гэта?.. Генералаў садзілі, маршалаў…

– Пры Сталіне, – ківае Эдзік. – А са мной у Дубраўлагу ўжо ахова сталінская сядзела. У старым, яшчэ ленінскім лагеры. Прычым, у адным бараку – ахова Сталіна, а ў другім – ахова Берыі. І берыяўскія грэбавалі сталінскімі, называлі іх мяснікамі…

Раней Гарачы нічога такога не расказваў, два лагерныя гады свае наогул перамоўчваў, і зацікаўлены Віл падаўся да яго, каб Эдзік імпэт распавядаць не страціў:

– Чаму?

– Бо яны жанчын, якіх Сталіну прывозілі, пасля рэзалі. Берыяўскія пасля гаспадара самі іх гвалцілі, але ўсё ж жывымі адпускалі, а сталінскія рэзалі. Ну, ці стралялі…

Нейкі час мы няўцямна глядзім на Эдзіка, пасля я кажу, што такога не магло быць, бо, калі б такое было, дык даўно б стала вядома, а Эдзік пытае: “Ад каго?.. Ад жанчын, якіх даўно няма?..”

– Калі я там, – паказвае ён пальцам за спіну ў бок будыніны КДБ, – сядзеў у час следства, акно камеры выходзіла на праспект, дзе буркаталі галубы і біў гадзіннік на паштамце. Яго толькі-толькі

ўсталявалі, і ён біў… Так доўжылася амаль паўгода, з таго часу я не трываю буркатання галубоў і вар'яцею ад бою гадзіннікаў. Дык вось, скуль бы вы пра гадзіннік з галубамі ведалі, калі б мяне не стала? Хто б зараз вам пра гэта сказаў? Галубы?..

– Ну, ты параўнаў, – уражаны, круціць галавой Віл. – Што адно, а што другое…

– А ты сядзеў? – мякка, бо ён па характары мяккі, перабівае Віла Эдзік. – Ты слухаў, як гадзіннік б'е і як галубы за акном камеры буркочуць? Праз сотню метраў ад кавярні "Вясна", дзе вы Асу партвейн наліваеце…

Лепш не казаў бы ён гэтага, бо і мне, і Вілу ніякавата…

– Ас прапаў… – вінавата кажа Віл, і Гарачы адпівае віна:

– Ды я не да таго… Як яно ўвогуле пачалося? Паўла Уліціна ў Маскве арыштоўваюць, шукаючы ягоны раман. Ён кажа, што кніга ў Мінску… Не ведае, у каго… Пачынаюць шукаць, у каго? Робяць ператрус у Палкоўніка, не знаходзяць… Тут мой сябрук, таксама актор, на адной сцэне стаялі, ён пасля ў Амерыку з'ехаў, даносіць, што кніга ў Гарачага. І хоць яна ўжо ў Асі Бланк, бяруць не Асю, а мяне… І там, – Эдзік зноў вялікім пальцам паказвае за спіну ў бок, дзе КДБ, – Гурык мне ціха раіць, каб на допыце я ўспомніў, што кнігу ўзяла не сама Ася, а яе бацька, якому ўсё адно сядзець. Я спытаў: "А за што Саламону Майсеевічу сядзець", – і Гурык, старшы лейтэнант Ігар Гуркові ч, адказаў: "За ўсё…"

"Што?!. Поскудзь!.." – успомнілася мне, як на кватэры Амерыканца крыкнуў пра Гурыка, ускочыўшы, Косця і перакуліў, ускокваючы, шклянку з гарбатай на жывот Палкоўніку, а Палкоўнік хакнуў, порткі атрасаючы: "Ха! У-ё-бі-шча!" – і цяпер, праз гады, як і тады, я не зразумеў, пра каго ён хакнуў: пра Косцю, які ратаваў Саламона Майсеевіча, ці пра Гурыка, які ратаваў Асю, забіраючы ў яе бацьку. Да гэтай пары ўсё ўва мне працівіцца таму, што сярод нас у той час маглі быць мярзотнікі.

– А ўсё ж гэты раман… – спрабую адвесці я размову ад самага непрыемнага… – што ў ім было такое, каб за яго ў турму садзіць?

– Не помню, – адказвае, як і Віл на даху, Эдзік у бары. – Нічога асаблівага, балбатня на сурвэтках.

– На якіх сурвэтках?..

– На папяровых. Кніга ж самвыдатаўская… Папера тонкая, сурвэтачная… Шмат на якіх старонках і не разабраць, што надрукавана. Дый не асабліва гэбэшнікі разбіраліся. Арыштоўвалі яны не кнігу, аўтара. Ён раззлаваў іх, на антысавецкі мітынг прыпёрся ў інвалідным вазку. У Маскве, на плошчы Маякоўскга… Ды

яшчэ дысідэнта вядомага з-пад носа іхняга на тым вазку звёз. Вось яны і давай шукаць кнігу, каб аўтара пасадзіць. Прыехалі ў Мінск, а тут цэлая групоўка антысавецкая. І Мінскія гэбэшнікі, якія займаліся гэтай групоўкай, адразу аказаліся пад кантролем гэбэшнікаў маскоўскіх… Вось чаму далі мне два гады! – нечакана сканчае Эдзік. – А не таму, што маці – санітарка.

Ён нібы толькі што гэта ўсвядоміў – і глядзіць на нас разгублена…

– Ды не разабраць тады было, чаму аднаму адно, а іншым іншае… – усё яшчэ вінавата пазірае на Эдзіка Віл. – Мяне з камсамола выгналі, але пакінулі ва ўніверсітэце. Вадзіка Някрасава пратурылі з інстытута, але забыліся выключыць з камсамола… А Будкевіча, які ўвогуле быў збоку прыпёку, пагналі адусюль…

Эдзіку не надта цікава слухаць, кога там адкуль пагналі ці не пагналі, і ён кажа нам гэтаксама, як і глядзіць на нас, разгублена:

– Я ж за два гады пяцьсот спектакляў не сыграў… Паўтысячы… І ўвогуле мог… Дай закурыць, – просіць ён Віла, хоць не курыць, і калі Віл дае яму цыгарку, прыпальвае, зацягваецца і кашляе, запіўшы кашаль вінам… – Радыё ў бараку звычайна а дзясятай адключалася, адбой. А тут, у канцы лістапада, роўна ў дзесяць: “Забіты прэзідэнт Джон Кенэдзі”. І такая ў бараку цішыня раптоўная… Поўная смерці, я такой ніколі не чуў. Усе як адзін усё зразумелі, падумалі ўсе пра адно: а раптам вайна? Гэта ж лагер… Куды нас, ворагаў, калі не ў расход? Толькі ў расход. – Эдзік тушыць цыгарку. – Брыдота якая, як ты яе смокчаш?.. Я, калі вызваліўся, іду ад лагера да станцыі… Поцьма называецца станцыя… А паперадзе мяне афіцэрык… З валізай, з пакункамі, усё ў яго падае… Я дагнаў, прапанаваў дапамагчы… Падняў валізу, дайшлі мы да той Поцьмы, ён пытае: “Скуль я вас ведаю? Твар ваш мне знаёмы…” “Я з сёмага лагера…” Ён так на мяне глянуў!.. Трэба было бачыць, як ён на мяне глядзеў… Гэтак на тое глядзяць, чаго быць не можа… Я забіць яго павінен, бо ён бы ў тую ноч, калі вайна пачацца магла, мяне б расстраляў, дый у любую іншую ноч, у любы дзень мог забіць, а я дапамагаю яму, валізу падношу…

– Дык нармальная рэч між нармальнымі людзьмі, што тут такога… – пачынае Віл і сканчае. – Хоць уяўляю карціну…

Эдзік узіраецца ў Віла так, нібы спрабуе ўбачыць, якая ж карціна Вілу ўяўляецца, і кажа, не ўбачыўшы:

– Чорны квадрат. Ты не ўяўляеш, які чорны… Калі памёр следчы, які мяне пасадзіў, Гарулёў было ягонае прозвішча, я адчуў такое гора! Вось ён памёр, не забілі яго, сам памёр, а я не паспеў

адпомсціць! Нічым і ніяк. Пасля пайшоў на ягоную магілу і паклаў кветку. Адну. З такім шчасцем, з такой асалодай…

“Я малюю белай фарбай на цемры…” – спяваў некалі Гарык Клябанаў, і гэта была наша філасофія. Прынцыпова іншая, чым філасофія чорнага квадрата. Калі яна ўвогуле ў ім, у тым квадраце, ёсць.

– Ты што гэта перад спектаклем п’еш?!. – пытаецца ў Эдзіка, ціха падкраўшыся да яго з-за спіны, галоўны рэжысёр тэатра, і Эдзік адказвае, не павярнуўшыся: “Віно, Барыс Іванавіч…”

Галоўны рэжысёр забыўся, што ў рэпертуары тэатра не засталося спектакляў, у якіх Эдзік мог бы граць у валёнках. Ён увогуле шмат чаго не памятае… Можа патэлефанаваць сярод ночы: “Даруй мне…” – а спытаеш: “Што дараваць?..” – ён маўчыць.

Некалі Барыс Іванавіч быў блізкі да Палкоўніка, але ні ў антысавецкіх, ні ў якіх іншых групоўках не ўдзельнічаў. Так і пражыў жыццё ў тэатры…

Таэтр – месца ўтульнае. Калісьці, калі вуліца Валадарскага называлася Лошыцкай, тут была сінагога. Ад рабіна галоўнаму рэжысёру дастаўся някепскі кабінет.

– Вы чаго сабраліся? – цікавіцца ён, успомніўшы, што Эдзік не заняты ў спектаклі. – З якой прычыны п’янка?

– Ні з якой, – адказвае Эдзік, наліваючы Барысу Іванавічу майго з Вілам каньяку. – Проста п’янка… “Бо пакуль на абшарах Айчыны, што ўсё толькі збіраецца быць, аніводнай не знойдзеш прычыны, каб не піць…”

– А… – падсоўвае да сябе каньяк галоўны рэжысёр. – Тады, канечне… – і Эдзік пытаецца ў яго, руку на руку паклаўшы.

– Ты памятаеш Гурыка?.. Ну, Гурковіча, гэбіста, які з Асяй ажаніўся?

Заімгліўшыся на ўспаміне пра нейкага Гурыка, пры ўспаміне пра Асю твар Барыса Іванавіча з палёгкай прасвятляецца.

Асю памятаюць усе.

– За яе! – куляе чарку Барыс Іванавіч, які любіць выпіваць за ўсё былое. Скажам, чарку за ўсяго Бертольда Брэхта – і асобны кілішак за ягоную п’есу “Трохграшовая опера”, праз спекталь па якой Барыс Іванавіч займеў мімалётную славу ў апошняй чвэрці мінулага стагоддзя. Славу амаль такую ж, якую займеў ягоны калега Валерый Мікалаевіч, якога пахавалі з ганаровай вартай. Ён быў таксама галоўным рэжысёрам тэатра, але іншага.

Віл напісаў п’есу, якая ў першым акце – пра час, калі Барыс Іванавіч і Валерый Мікалаевіч былі яшчэ маладыя, а ў другім – пра

час, калі яны дажывалі век. Там адзін персанаж кажа пра яшчэ аднаго: “І паліто ён даўжэй даношваў, чым насіў новае, і жыццё дажываў даўжэй, чым жыў”.

За тое, што ні Валерый Мікалаевіч, ні Барыс Іванавіч не паставілі спектакль па ягонай п’есе, Віл злаваў на абодвух. Цяпер злуе на аднаго. І прапануе: “Барыс, давай вып’ем за будучыню!..”

За будучыню Барыс Іванавіч выпіваць не любіць, бо нічога там добрага. Смерць тэатра і духоўная дэградацыя. І калі Эдзік налівае яшчэ чарку, Барыс Іванавіч выпівае яе моўчкі. Але мы ведаем, за што. За час, у якім займеў мімалётную славу праз “Трохграшовую оперу”.

Віл таксама любіць выпіваць за “Трохграшовую оперу”, бо ў спектаклі грала актрыса, якую ён кахаў. На тры дні яна нават выйшла за яго замуж, і хоць больш з гэтага нічога не атрымалася – усё адно Віл выпіваць любіць. Дый я ніколі не быў супраць таго, каб падняць чарку за “Трохграшовую оперу”. Чаму не?.. У кожнага з нас ёсць свая трохграшовая опера.

“І кожны выпіў за сябе...” – напісаў паэт, якога пахавалі без ганаровай варты.

П’еса Віла – пра антысавецкую групоўку Сысоя. Палкоўніка. Эдзік Гарачы мог бы сыграць у спектаклі па гэтай п’есе сябе самога. І Віл мог сыграць самога сябе, і я, але не Барыс Іванавіч. Ён там ёсць, але граць сябе там не хоча. Таму й спектакль не збіраецца ставіць.

– Я пайду, – кажа ён. – У мяне спектакль.

– Чакай, – спрабуе спыніць яго Эдзік. – Дык ты помніш Гурыка?.. – і Барыс Іванавіч перапытвае, адыходзячы:

– Які бацьку Асі пасадзіў?..

– Які бацьку Асі пасадзіў... Дык помніш?..

– Не помню... Для чаго яго помніць?..

– Ні для чаго!.. Проста помніш, ці не?

– Ні для чаго не помню... – пакідае нас галоўны рэжысёр, у якога спектакль, і Эдзік уздыхае: “Вось памяць, мне б такую...”

Я пытаю:

– А нашто табе, каб помніў?

– Бо я помню, я!.. – без аніякай, як мне здаецца, сувязі з самім Барысам Іванавічам і з тым, што ён помніць ці не, налівае сам сабе і адным глытком выпівае Эдзік... – Недзе праз тыдзень пасля таго, як Амерыканец забіў Кенэдзі, і мы яшчэ гадалі, ці пачнецца вайна, расстраляюць нас ці не, мяне прыводзяць да начальніка лагера, а там ён! – прыстуквае Эдзік па стале і глядзіць услед Барысу Іванавічу.

– Хто ён?.. – пытае Віл, хоць зразумела, што там, у начальніка

лагера, не мог быць Бырас Іванавіч.

– Гурык! Увесь бліскучы… “Здароў, актор пагарэлага тэатра!” І што пачынае выкручваць!.. “Ты хадзіў, – пытае, – страляць у цір радыёзавода?” “Хадзіў”. “З Амерыканцам? З Лі Харві Освальдам?” “Не толькі, – кажу, – з ім”. “А з кім яшчэ?” “З Воранам…” “Яшчэ з кім?” “З Гарыкам Клябанавым…” “Яшчэ?” “З Вілам…” “А з братам?..” “Якім братам?” “Братам Віла, карэспандэнтам Усесаюзнага радыё?..” “І з ім стралялі, – падняўшыся з-за стала, нахіляецца Эдзік да Віла. – Што тут такога?..” “А з Палкоўнікам? З Кімам?..” “І з Палкоўнікам, і з Кімам…” “І па кім вы там стралілі?..” “Па мішэнях”. “Па якіх мішэнях?” “Па звычайных”. “А па незвычайных?..” “Па якіх незвычайных?..” “А вось па такіх! – раскручвае ён на стале перада мной трубку папяровую, плакат, памятаеце, плакаты такія былі з партрэтамі членаў Палітбюро, ці як яно тады называлася, Прэзідыума ЦК КПСС. – Па кіраўніках партыі і дзяржавы! Рыхтаваліся забіць першага сакратара ЦК, Старшыню Савета Міністраў СССР Мікіту Сяргеевіча Хрушчова! І за гэта ты хочаш толькі два гады?..” Уявіце: увесь плакат у слядах куль, у прабоінах… Мяне потам халодным прабіла… Ён мне тэрмін накруціць прыехаў, а, можа, і пад вышку падвесці, гад! “Не страляў я ні па кім і не рыхтаваўся нікога забіць!” “А хто страляў і рыхтаваўся? Хто?..” “Ніхто!” “Скажаш, адсядзіш, колькі табе засталося – і на волю, у свой пагарэлы тэатр. Вы ж і Кенэдзі ўвялі ў склад ЦК, і ў яго стралялі!” “Не ў яго! І не я!” “А ў каго? І хто?” “Амерыканец у Толіка!” “У ягога Толіка?” “У стылягу Толіка, падобнага на Кенэдзі!” “А на Хрушчова хто падобны быў? Хто на Хрушчова?..” І тут я ляпнуў, – абмякае Эдзік, стоячы сыграўшы сцэну з Гурыкам і зноў сядаючы да стала: “На Хрушчова быў падобны сам Хрушчоў!” – І Гурык па плячы мне: “Ну вось і малайчына, што прызнаўся! Засталося аформіць…”

Віл глядзіць на Эдзіка, чакаючы… Брата Віла, карэспандэнта Усесаюзнага радыё, які вёў рэпартажы з сустрэч Мікіты Сяргеевіча Хрушчова з працоўнымі Беларусі, арыштавалі напрыканцы 1963-га…

– Ды нічога ён са мной не аформіў, – складвае і паказвае дулю ў мінулае Эдзік. – Але з некім іншым мог аформіць, – ківае ён Вілу, які нервова выпівае і пытае, выпіўшы: “Што ж ты раней маўчаў?..” – і Эдзік расціскае дулю: “А ты пытаўся?..”

У мяне ёсць такая штуковіна ў мазгах, як відэамагнітафон, нейкія моманты пракручваюцца па некалькі разоў, я нават у вар’ятні з гэтым ляжаў, калі ў галаве круцілася і круцілася: “Самалёт ляціць над усёй бальніцай…” – і доктар сказаў, што гэта, канечне, адхіленне, але, калі яно не надта замінае, дык ён не будзе яго лячыць, бо не ведае, чым?.. – дык вось і зараз яшчэ раз пракруцілася, як на

відэамагнітафоне:

– Што ж ты раней маўчаў? – пытае Віл, нервова выпіўшы каньяк.

Эдзік расціскае дулю:

– А ты пытаўся?.. – І доўжыць, не надта зважаючы на нервовасць Віла. – У Маскву Гурык пераверўся і ў генералы выбіўся, і праз тое, што Амерыканца падрыхтаваў Кенэдзі забіць, і праз тое, што не даў забіць Хрушчова, выкрыў групоўку тэрарыстаў, – вось што такое Гурык. І вы мне будзеце казаць, што мы сярод нармальных людзей у нармальным часе жылі?.. Выклікаць ува мне настальгію?

Ніхто нічога пра час, у якім мы жылі, Эдзіку не казаў і настальгію не выклікаў – ён сам сказаў і выклікаў. Нам усім у тым часе, як, зрэшты, і ў гэтым, трэба было б да псіхіятра, калі б ён ведаў, чым лячыць?.. У мазгах краіны, дзе мы жылі і жывем, бо нікуды яна не падзелася, ёсць штуковіна такая, як відэамагнітафон, і ўсё паўтараецца раз за разам – самалёт ляціць над усёй бальніцай…

Але нашто нам было Хрушчова забіваць?

Віл не разумее тое самае, што і я, таму адсоўвае пусты кілішак і пытаецца ў Эдзіка, ды нават не ў Эдзіка, а нібыта ва ўсіх: “А за што майму брату Хрушчова было забіваць?..” – і Эдзік нібы за ўсіх адказвае: “Відаць, было за што, калі забіць хацеў”.

– Амерыканец хацеў забіць Хрушчова, а не брат, – пачакаўшы, пакуль каньяк у ім сагрэецца, закусвае скрылікам лімона Віл. – Вы што: забыліся?..

Я помню… Таму пытаюся ў Віла:

– А навошта яно Амерыканцу было?..

Плошча Незалежнасці, былая Плошча Леніна

– Ты чаму ў інтэрнаце жывеш? – спытаў аднойчы Амерыканец Джыма Калеснікава па мянушцы Кола, студэнта філфака Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. – Грошай на кватэру не маеш?

Грошы ў Джыма былі – і Амерыканец, каб Джыму зручна было, параіў яму зняць кватэру ў доме цераз дарогу ад галоўнага ўніверсітэцкага корпуса. Дом той, цагляны, чатырохпавярховы, з калонамі і ляпнінай, з прадуктовай крамай на першым паверсе, фасадам глядзеў на вуліцу Савецкую, правым крылом выходзячы на плошчу Леніна. Цяпер яго няма – зруйнавалі. Прагульваючыся па Мінску, Першы сакрататар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў, які меў цікаўнасць да архітэктуры, заўважыў, што, калі дом знесці, дык плошча Леніна ў беларускай сталіцы стане самай вялікай плошчай Леніна ва ўсім Савецкім Саюзе. “Гэта было б, – сказаў ён, – сімвалічна, бо беларусы – найверныя ленінцы, якія першымі ўступяць у камунізм”. І Мікіта Сяргеевіч, зрабіўшы крок наперад, тупнуў нагой, дэманструючы, як яно, тое ўступленне ў камунізм, прыблізна будзе выглядаць.

– Ён хацеў бы, каб усе беларусы, уступіўшы ў камунізм, змясціліся на адной плошчы, – выказаў меркаванне Палкоўнік, і калі Віл, не зразумеўшы, спытаў: “Навошта?..” – Палкоўнік тыцнуў пальцам у акно: – Каб выступаць адразу перад усімі!

Два акны кватэры, якую Амерыканец параіў наняць канадцу Джыму, выходзілі на Дом урада, з гаўбца якога на другім паверсе выступаў перад сагнанымі на плошчу менчукамі таварыш Хрушчоў. Маленькі, таўсценькі, у куцавата-шэрым паліто з каракулевым каўняром, ён, падскокваючы, кідаўся і кідаўся грудзьмі на парэнчы гаўбца, крычаў і крычаў, размахваючы заціснутай у кулак каракулевай папахай, і каракулевая пара, вырываючыся з ягонага роту, клубілася над ягонай лысінай.

“Таварышы!

Мы сабраліся сёння ў слаўнай сталіцы Беларусі горадзе Мінску, дзе 60 год назад праходзіла работа Першага з’езда Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі”. *(Апладысменты).*

– Калі яго ў музей прывозілі, я на заводзе быў, – кажа Амерыканец, які жыве насупраць музея першага з’езда РСДРП. – Шкада…

– Чаго табе шкада? – пытае Кола, да якога набіліся мы ў госці,

каб паглядзець на сустрэчу Хрушчова з народам, і амерыканскі марскі пехацінец, які прыехаў у СССР, паверыўшы ў камунізм, кажа сыну канадскага мільянера: “Савецкага народа шкада…”

Гэта значыць: нас. Мяне, Эдзіка, Віла, Біга, Гарыка – усіх. А чаго нас шкадаваць? Вось мы сядзім, крымскі партвейн п’ём, швейцарскім сырам закусваем…

Шкада, што Асі няма. Не прыйшла.

І Воран не прыйшоў.

Дзе няма Асі, там няма Ворана.

“Народ сёння радуецца таму, што нашы вучоныя, інжынеры, рабочыя стварылі і паспяхова запусцілі касмічную ракету, якая цяпер імкліва ляціць па зададзеным курсе ў напрамку да Месяца”. (Бурныя апладысменты).

З вокнаў добра відаць, як бурна, паставіўшы баян у ногі і ўзняўшы рукі над галавой, стараецца выпляскаць сваё захапленне студэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Джон Дак, Джон-вуця – адзіны на ўсю плошчу мурын. Джона наўмысна паставілі ў першы шэраг насупраць гаўбца, каб Мікіта Сяргевіч бачыў, што паўсюль, дзе б ён ні выступаў, хай сабе нават у Мінску, яго слухае і ім захапляецца ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. І не ведае таварыш Хрушчоў, што пасля таго, як прагрэсіўнага мурына ледзь не расстралялі ў двары Камітэта дзяржбяспекі, ён гатовы зрабіць усё, што скажуць. Сказалі прыйсці з баянам без футурала і пляскаць – прыйшоў з баянам без футурала і пляскае. Пасля баян пад паху – і ў Канаду! І перастраляйце вы тут па дарозе да камунізму хоць усе ўсіх…

– Алік, – адкаркоўвае ўжо трэцюю пляшку віна Віл, – а чаму амерыканскія ракеты да Месяца не далятаюць?

Амерыканец маўчыць, стаіць побач з Палкоўнікам і глядзіць у акно, а Віл, не чакаючы адказу, налівае і выпівае шклянку віна, крымскага партвейну “Кактэбель”, які купілі мы ў краме на першым паверсе таго ж дома, на апошнім паверсе якога зараз яго п’ём, закусваючы швейцарскім сырам іназіраючы за маўклівым народам і гаваркім правадыром.

Пакуль правадыр не прыехаў у Мінск, ніводнага разу крымскага партвейну, як і швейцарскага сыра, якім партвейн закусваем, мы ў нашай краме не бачылі. Гэта ўчора з вечара навезлі ўсяго, але да раніцы нічога не давалі – і ўсю ноч каля крамы таўклося столькі людзей, што іх якраз хапіла на мітынг.

Шчаслiўцаў, якім удалося ў краме нешта ўхапіць, на плошчы нямнога… У Віла крамніца знаёмая, таму мы з віном і сырам.

– Бо савецкія ракеты ўсіх даганяюць і пераганяюць… – ківаецца

ўзад-уперад Палкоўнік і раптам кажа Амерыканцу. – Калі яго канчаць, дык адсюль зручна. Зручней не прыдумаеш.

Віл паварочваецца да Палкоўніка:

– Каго канчаць? Хрушчова?

– Джона, – гэтак жа задумліва гледзячы на плошчу, адказвае Палкоўнік. – Расплюскаўся там…

Палкоўнік не любіць Джона не за тое, што той мурын. Ці чорны ты, ці белы – Палкоўніку напляваць. Ён не любіць Джона за сквапнасць. А яшчэ больш за тое, што бацька Джона – капіталіст.

Палкоўнік аднолькава не трывае і камунізм, і капіталізм. Апошні – чыста тэарэтычна. Але з тэорыі вынікае, што капіталізм, як і камунізм, г. но. Першы прывязвае чалавека да ідыёцкіх ідэй, другі – да прыдуманых ідыётамі рэчаў. Да грошай. Нідзе няма свабоды. Таму, намагаючыся стварыць мадэль насамрэч вольнага грамадства, Палкоўнік спрабуе вырвацца з рэальных палітычна-грамадскіх фармацый – але як і куды?..

Гэтага ён пакуль не ведае, таму схіляецца да анархіі. Да Крапоткіна. І нас схіляе. Я нават вершы пра Крапоткіна напісаў:

Вас кіне ў пот! Вы накладзеце ў порткі,
Калі дастане пісталет Крапоткін!

Эдзік Гарачы, які ціха сядзіць каля акна, папівае віно і глядзіць на плошчу, чытаў гэтыя вершы ў тэатры. У спектаклі пра рэвалюцыю. Калі рэжысёр спытаў, якое права мае актор прамаўляць нешта такое, чаго няма ў тэксце п’есы, Эдзік адказаў: “Права творчай свабоды”. Больш ён у тым спектаклі не ўдзельнічае. Добра, што ў тэатры пакінулі.

“Мы радуемся таму, што гэтая новая вялікая перамога Савецкага Саюза супала з вашым слаўным юбілеем”. *(Апладысменты).*

У Палкоўніка сёння слаўны юбілей. Ён падлічыў, што яму споўнілася 32 гады 2 месяцы і 3 дні. Калі дні паставіць папередзе месяцаў, атрымаецца 32: колькасць дзён і месяцаў супадзе з колькасцю гадоў. Лепш, канечне, каб споўнілася 32 гады, 3 месяцы і 2 дні, тады і лічбы перастаўляць не трэба было б. Але такі слаўны юбілей яшчэ наперадзе, да яго застаўся адзін месяц без аднаго дня.

Іншым разам мне здаецца, што Палкоўнік сапраўды не надта нармальны – і яго зусім не за Сталіна ў турэмную вар’ятню заканапацілі, калі яму было 22 гады 2 месяцы і 2 дні…

“Запуск савецкай касмічнай ракеты азначае, што мы першымі ў свеце пракладваем шлях ад Зямлі да Месяца”. *(Апладысменты).*

– А чаго гэта Воран там туляецца? – раптам пытае Палкоўнік. – Ды яшчэ з Асяй…

– Дзе?.. – не магу я знайсці сярод процьмы людзей Асю з Косцем, і Палкоўнік паказвае: “Ды вунь у першыя шэрагі шчэмяцца, да Джона прабіраюцца… З плакатам “Слава КПСС!”

Нарэшце, я заўважаю Асю і Косцю, якія спрабуюць праціснуцца скрозь натоўп. Але не да мурына з баянам, як думае Палкоўнік, прабіраецца Косця – ён прабіваецца да Хрушчова. І ў руках ягоных не плакат “Слава ПСС!”, а скручаны ў трубку ліст ватмана: план рэканструкцыі Нямігі.

Вось што Воран прыдумаў!

Вось чаму ён партвейн з намі піць не захацеў!..

Косця ўжо колькі гадоў абіваў парогі кабінетаў розных начальнікаў, рассцілаў перад імі ватман, даводзіў, тлумачыў: “Гэтак мы захаваем памяць, рамантыку, дыханне, залаты пыл старога Мінску” – усё без толку. Адны не чулі, іншыя казалі, што не яны такія пытанні вырашаюць, трэція і слухаць не хацелі. “Які залаты пыл!.. Горад задыхаецца ў завулках, яму новая транспартная магістраль патрэбная, а не рамантыка!”

“Ты да таварыша Шарапава схадзі, да таварыша Шарапава… – нудзеў і нудзеў Саламон Майсеевіч. Ён думаў так: калі саму вуліцу таварыш Шарапаў і не ўратуе, дык ятку з газіроўкай вярнуць на Нямігу можа. Але таварыш Шарапаў, калі Косця ўрэшце патрапіў да яго, не захацеў слухаць ні пра вуліцу, ні пра ятку, бо ў горадзе былі ўжо праблемы не толькі з мясам, але і з хлебам. “Упёршыся ў тупік Нямігі, мы не хутка да камунізму дойдзем, таварыш Воран! А што партыя ўрачыста абвяшчае? Партыя абвяшчае, што ўжо цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме! Ты будзеш жыць, разумеш? І там табе не ваду з сіропам піць!..”

“Сіропу не будзе?..” – пажартаваў Косця – і быў выштурханы з кабінета старшыні гарвыканкама таварыша Шарапава пад такую лаянку, якой не чуў ні на Грушаўцы, ні ў Сельгаспасёлку. А праз два дні на камсамольскім сходзе інстытута “Мінскпраект” маладога спецыяліста Ворана выключылі з камсамола. З работы не пагналі, перавялі з інжынера ў тэхнікі. На перавыхаванне. Бо калі зусім з работы пагнаць, дык дзе тады перавыхоўваць?.. І вось цяпер Воран – выключаны з камсамола і амаль пагнаны з работы, пераведзены з інжынера ў тэхнікі – прэцца з ватманам пад пахай да першага сакратара ЦК КПС. Цераз плошчу, праз кардоны міліцыі…

Папруць яго з работы. Гэта ў лепшым выпадку. А ў горшым – пад суд. Там прыдумаюць, дзе яго перавыхоўваць. Запруць у

“шарашку”, як некалі ягонага бацьку, акадэміка, які займаўся оптыкай, што ляціць зараз у космасе на савецкай ракеце.

“Гэтая перамога – вынік творчай працы савецкіх людзей, якія будуюць камуністычнае грамадства. Наша стваральная праца ўздымае савецкую Радзіму да новых ззяючых вышынь. Яна лепш за ўсё паказвае, якіх перамог можа дабіцца народ, які пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ідзе па шляху, азораным вялікім вучэннем марксізма-ленінізма”. *(Працяглыя апладысменты).*

– Там весялей, – кажа Амерыканец і апранаецца. – Пайду да Джона. Буду ў першых шэрагах прагрэсіўнага чалавецтва.

– Ага, – кідае ўслед яму Гарык. – Пусцяць цябе, ворага. – І ўбачыўшы пустыя пляшкі, крычыць на Віла. – Падлюга! Ты ўсё вылыктаў!

Віл, які заўсёды выпівае болей за ўсіх, бо болей за ўсіх любіць выпіць, хавае бутэльку пад стол і ўздыхае.

– Малавата ўзялі... Джым, дай чырвонец, я ў краму спушчуся, пакуль Хрушчову партвейну крымскага ды сыру швейцарскага не захацелася.

Дзіўна, але Джым, не спрачаючыся, дае Вілу дзясятку. Мусібыць, каб наступным разам пяць даляраў не даваць.

– Chattanooga choo choo... – задаволена напяваючы, ідзе да дзвярэй Віл і мне адтуль шапку кідае. – Пайшлі са мной, пазнаёмлю з крамніцай. Татарка, на Нэлу падобная.

Мая трусіная шапка ляціць і пыліць поўсцю – такая старая. Яе даўно пара выкінуць, але нельга: яна – рэліквія. Палкоўнік яе ў турме насіў.

Не ў кожнага шапка, якую Палкоўнік насіў у турме. Ні ў кога, толькі ў мяне. Ён аддаў мне яе пасля таго, як сказаў, што я не сын палка, а сын Палкоўніка.

– Выкінь ты яе, – чмыхнуўшы, кажа Палкоўнік, у якога алергія на пыл. У яго алергія, а ў кватэры ягонай ад пылу не прадыхнуць. І прыбрацца не дае нікому, Ася колькі разоў спрабавала.

– Хадзіце сюды! – кліча ад акна Гарык. – Зірніце, што робіцца!

На плошчы каля Дома ўрада, адгароджваючы правадыра ад улюбёнага ў яго народа, ланцужком стаялі міліцыянты – і Воран з Асяй рванулі скрозь гэты ланцуг. Джон, які прабіўся ў першыя шэрагі прагрэсіўнага чалавецтва і якому немаведама што ўзбрыло ў ягоную мурынскую галаву, з баянам затрусіў за імі. Міліцыянты і таварышы ў цывільным, вынырнуўшы раптам з натоўпу, беглі за імі, а Хрушчоў, перагінаючыся цераз парэнчу гаўбца, з якога выступаў, нешта ўсім крычаў і махаў рукамі.

– Пасадзяць Ворана, – чмыхае Палкоўнік. – У лагеры будзе Нямігу рэканструяваць.

Я спрабую адчыніць акно:

– Там Ася з ім!

Гарык спыняе мяне: “Хочаш, каб па нас стрэльнулі?” – а Палкоўнік кажа абыякава:

– І Асю пасадзяць. І затрахаюць на зоне, пархатую.

Ён нечым раздражнены, незадаволены. Моцна незадаволены і раздражнены. І глядзіць у акно неадрыўна, як чакае нечага…

Міліцыянты першым схапілі Джона, потым Асю, а таварышы ў цывільным дагналі Ворана.

Як гэта іх пасадзяць?.. Трэба на плошчу бегчы, растлумачыць там, што яны не хацелі нічога кепскага!.. Нямігу пакінуць Нямігай!..

Хоць навошта канадскаму мурыну мінская Няміга? Нафіга казе баян?..

Як пасля аказалася, менавіта гэта й зацікавіла да ўсяго цікаўнага Хрушчова: чаго да яго бяжыць мурын з баянам? Ён тут жа вырашыў гэта высветліць, што ўратавала і Косцю, і Асю, і ўсіх нас, а, можа, і самога Мікіту Сяргеевіча.

Трэба ў гэтым свеце цікаўным быць…

На маю запыленую шапку яшчэ й сыпанула пацярухай, калі я выскачыў за Вілам на лесвічную пляцоўку. Узняўшы галовы, мы паспелі ўбачыць, як нехта прычыніў люк на дах. З таго боку, з даху.

– Алік!.. – гукнуў Віл, які не насіў шапкі ні ў снег, ні ў дождж, і пацяруха яму на валасы сыпанула. – Гэта ты, Алік?

Ніхто не азваўся. Напэўна, на даху гэбісты з аховы, што там Амерыканцу рабіць?..

Я абтрос шапку.

– Што там рабіць Амерыканцу?..

– А ну ў двор! – кінуўся ледзьве не сторч галавою ўніз па лесвіцы Віл. – Зараз пабачым, што яму там рабіць!..

У двары каля абітых бляхай дзвярэй чорнага ўваходу ў краму, у якой Віл збіраўся дакупіць партвейну, стаяла “Варшава” – службовая машына старэйшага брата Віла, карэспандэнта Усесаюзнага радыё Арцёма Ледніка, які сто разоў нас выручаў, а мы столькі ж разоў яго падстаўлялі. Падобна было, што падставілі ў сто першы раз…

Каля бампера “Варшавы”, у якой быў адчынены багажнік, побач з Арцёмам стаяў Гурык. Ён быў не “ўвесь у бліскучым” – у цывільным.

– Кажу табе: на паляванні ўчора былі. Пасля выпілі. Позна лёг. Рана ўстаў. Забыўся дастаць. Дый часу не было, – рэбрамі абедзвюх далоняў рассякаў Арцём паветра над багажнікам, ад якога Гурык,

засунуўшы рукі ў кішэні, не адрываў вачэй. Машына стаяла бокам да нас, нам не было відаць, што ў багажніку, але мы й не гледзячы ведалі: новенькая “іжэўка” і карабін “Browning”. Учора, калі мы вярнуліся з палявання, Арцём сказаў Амерыканцу (гэта ягоная новенькая “іжэўка”) і Вілу (гэта ягоны “Browning”), каб забралі з багажніка ўсё лішняе, бо яму заўтра з раніцы працаваць, а Віл з Амерыканцам не палічылі стрэльбу і карабін лішнімі. Калі б яны забралі іх, трэба было б ісці дахаты – не пацягнешся ж з дубальтоўкамі на танцы ў Палац прафсаюзаў. Вось яны і пакінулі іх у багажніку службовай машыны карэспандэнта Усесаюзнага радыё ў дзень, калі з плошчы імя Леніна ён вёў рэпартаж пра сустрэчу Першага сакратара ЦК КПСС Мікіты Сяргеевіча Хрушчова з працоўнымі Мінска, чаму й “Варшаву” ягоную на плошчу прапусцілі.

Раптам у двор убеглі людзі, чалавек дзесяць, адзін падбег да Гурыка, нешта сказаў яму – Гурык ляснуў дзверцай багажніка і заштурхаў Арцёма ў машыну.

– Вы хто? Давай адсюль! – падскочыў да нас адзін з гэбістаў, а гэта былі яны, бо каго ж яшчэ, як сваіх, сустрэў бы Гурык, які ўбачыў нас і замахаў рукамі, каб мы сыходзілі, і Віл рушыў да ўвахода ў краму, але яшчэ адзін гэбіст пераняў яго: “Куды?! У пад’езд!” – і ў гэты момант укаціўся ў двор пузаценькі чалавек у каракулевай шапцы і ў доўгім, мехаватым паліто: Хрушчоў! Я пазнаў яго, хоць і вачам сваім не паверыў. І Віл яго пазнаў… І абодва мы пазналі Джона і Асю з Воранам: яны ледзь паспявалі за Першым сакратаром ЦК КПСС, які немаведама чаго папёрся з плошчы ў двор, дзе стаяла машына з дзвюма стрэльбамі ў багажніку, адна з якіх належала амерыканцу, а другая – актывісту антысавецкай групоўкі Сысоя. “Капец нам!” – мільгнула ў галаве, калі я ўбачыў, што Хрушчоў коціцца калабком не ў дзверы крамы, дзе ён, як Віл казаў, захацеў купіць крымскага партвейну і швейцарскага сыру, а кіруе наўпрост да нас, да мяне з Вілам – ды яшчэ крычыць: “Гэта вы тут перадавая моладзь, якая пратэстуе супраць зносу ўсялякага барахла?!.” А Косця Воран бяжыць побач з ім і дробна ківае: “Яны, яны, яны…”

Калі Хрушчоў, зацікаўлены чорным чалавекам з белым баянам, выйшаў на плошчу, дык у першым шэрагу прагрэсіўнага чалавецтва, аточаным міліцыянтамі і гэбістамі, убачыў побач з мурынам высокую, з зеленаватым смуткам глыбінных, самих у сабе затоеных, вачэй, прыгажуню, якая сунула яму пад нос ватман, а нейкі хлопец нешта на тым ватмане спрабаваў паказаць і штосьці мямліў пра нейкую старую Нямігу і нейкую архітэктурную рэканструкцыю. Мікіта Сяргеевіч любіў прастату стандартных, складзеных з блокаў пяціпавярховікаў,

кватэркі ў якіх у ягоны гонар народ назваў хрушчоўкамі. Аніякіх архітэктурных рэканструкцый, як і мастацкіх абстракцый, ён не трываў, таму страціў цікаўнасць да баяніста і вырашыў разабрацца з архітэктарам. А тое, як ён з ім – і ўсімі намі – разбярэцца, залежыла ўжо не ад Ворана з ягоным ватманам. Залежыла ад Гурыка. Ад таго, адчыніць ці не адчыніць ён багажнік "Варшавы", дзе ляжалі паляўнічая "іжэўка" і двухствольны, пяцізарадны "Browning", ніжні ствол якога – пад паляўнічы патрон 12-га калібру, а верхні – пад баявы патрон калібру 7,62.

Гісторый пра замахі на жыццё Хрушчова то ў Белавежскай пушчы, дзе яго нібыта памежнік нейкі застрэліць збіраўся, то на Хрэшчаціку ў Кіеве, дзе на яго накінулася жанчына з нажом, то ў Тбілісі, дзе ў яго збіраліся шпурнуць бомбу, распавядалася шмат, але насамрэч ні застрэліць, ні зарэзаць, ні бомбай падарваць Першага сакратара ЦК КПСС ніхто ўсур'ёз не спрабаваў – і ён не быў гэтым напалоханы. Таму і бегаў па дварах, дзе стаялі машыны, у багажніках якіх маглі стрэльбы ляжаць.

Пры такім спакойным жыцці незразумела было, за што атрымлівалі грошы гэбісты, якія ахоўвалі Хрушчова, і яны прыдумалі гісторыю з Кэнетам Крэбам, вадалазам ВМС Вялікабрытаніі, які нібыта прымацаваў да днішча крэйсера "Арджанікідзе", на якім знаходзіўся Хрушчоў падчас візіту ў Англію, міну. Гэбісты, канечне, і пад вадой міну ўбачылі, правадыр застаўся жывы, а вось Крэба не стала – і ніхто дасюль не ведае: як?

Калі б Гурык адчыніў багажнік «Варшавы», нас магло не стаць – і ніхто дасюль не ведаў бы, як…

Перад Гурыкам была дылема: адразу выкрыць антысавецкую групоўку, якая падрыхтавала замах на жыццё Першага сакратара ЦК КПСС, ці адкласці выкрыццё на потым, калі Хрушчоў будзе далей ад стрэльбы з карабінам? «Ну, добра, – мусібыць, вагаўся ён. – Выкрыў. А як дапусціў?..» Праз гэта гэбіста Гурыка таксама магло не стаць, невядома як. Як вадалаза Крэба.

Пакуль Гурык вагаўся, з рыпам адчыніліся абітыя бляхай дзверы, што вялі з двара ў краму. З іх выйшла крамніца Анжэла, знаёмая Віла. Яна зірнула недаўменна на Хрушчова, на мурына побач з ім, на Віла, на гэбістаў, дастала цыгаркі з кішэні халата і запаліла.

– Вось! – тыркнуў пальцам у яе Хрушчоў і ўзяўся рукі ў бокі. – Пе-ра-да-ва-я моладзь! Піць ды паліць, як у Амерыцы! Тут што такое?.. – падскочыў ён да Анжэлы, адпіхнуў яе ўбок і з чорнага хода рынуўся ў краму – па швейцарскі сыр ды крымскі партвейн…

Калі Хрушчоў праз парадныя дзверы выйшаў з крамы, нас усіх

разам з крамніцай Анжэлай заштурхалі ў склад, дзе было віно з сырам, потым падагналі машыну – і з двара дома на Савецкай, якога ўжо няма, прывезлі ў двор будынка КДБ, які стаіць, як стаяў. Нас не сталі трымаць у двары, адразу павялі ў сутарэнні. Кожнага паасобку.

Праходзячы цераз двор, я зірнуў на сцяну ў чырвоных пырсках і ўжо не меў сумневу: расстраляюць.

Вуліца Камсамольская, колішняя Феліцыянская

У гэтыя сутарэнні, у гэты глухі, падобны на пенал падвальны пакой мяне зноў кінуць праз многа-многа гадоў. Голага вырвуць з-пад кропельніцы ў палаце рэанімацыі, закруцяць у коўдру і выкрадуць са шпіталю, у якім, на горкі яблык збіты міліцыяй, я, ужо не хлопчык, не студэнт электратэхнікума сувязі, а кандыдат у прэзідэнты, якога міліцыя павінна была не біць, а ахоўваць, апынуся па дарозе да той самай плошчы, з якой прывезлі мяне цяпер.

«Лёсу кругі, як кругі на вадзе:
Кропелька падае з рук.
Кожны з кругоў на Боскім судзе —
Адзін і той жа круг»,

– спяваў Гарык Клябанаў, і Палкоўнік, ківаючы, казаў: «Так-так, нам толькі здаецца, што кругоў многа, а круг адзін. Так што можна іх не лічыць».

Ён ківаў і гэтак казаў, але лічыў свае кругі.

Праз многа-многа гадоў ва ўжо нібыта не савецкай, а незалежнай Беларусі я прыйду ў дзень галасавання на выбарах прэзідэнта на вуліцу Інтэрнацыянальную да Генеральнай пракуратуры, каб... Зрэшты, не так важна, дзеля чаго я прыйду да Генеральнай пракуратуры, побач з якой каля кінатэатра «Перамога», які быў некалі клубам імя Сталіна, дзе выступаў джаз-аркестр Эдзі Рознэра, убачу татарку Нэлу. Мы адразу пазнаемся, хоць не бачыліся з таго дня, як я з'ехаў ад яе ў вясновым тралейбусе, у якім пахла першымі пралескамі. Аднойчы сустракаліся, праўда, у тралейбусе зімовым, але, сустрэўшыся, не ўбачыліся. Так бывае... І праз многа-многа гадоў у валасах татаркі Нэлы сіненькім агеньчыкам будзе свяціцца заколка, падобная на пралеску. Вось што важна, а не тое, дзеля чаго я прыйду да Генеральнай пракуратуры.

«Пакляніся, што правядзеш мяне праз усё жыццё пад руку!..» – капрызна запатрабавала татарка Нэла, калі я, ніякавата азіраючыся па баках, вёў яе пад руку з танцаў у Палацы прафсаюзаў. Я пакляўся. Але ўсе нашы клятвы пішуцца на хуткаплыннай вадзе...

Татарку Нэлу вёў пад руку мужчына ў доўгім, падобным да шыняля, шэрым паліто і ў каракулевай, як у той дамы з першага тралейбуса, шапцы. Той самай дамы, на якую я загадаў: калі яна выйдзе з тралейбуса і рушыць уперад па праспекце – ажанюся з

габрэйкай Асяй, калі пойдзе назад – з татаркай Нэлай. Але дама не пайшла па праспекце ні наперад, ні назад, звярнула на вуліцу Даўгабродскую – і ні з татаркай Нэлай, ні з габрэйкай Асяй я не ажаніўся. З Асяй ажаніўся Гурык, а з Нэлай, хутчэй за ўсё, вось гэты – у шэрым шынялі і каракулевай шапцы: маёр Гагарын. Не той, які ўзляцеў у космас, а той, які дапытваў мяне ў КДБ, і якога, як і Нэлу, я адразу пазнаў.

Маёр Гагарын таксама пазнаў мяне адразу. Некалі ён дапытваў мяне не толькі ў КДБ – яшчэ і ў тэхнікуме, у якім я вучыўся і з якога мяне праз КДБ з ягонымі генераламі, маёрамі і старшымі лейтэнантамі маглі выгнаць. «Глядзі, твой кандыдат у прэзідэнты...» – сказаў ён татарцы Нэле, пакуль я разгублена вырашаў, што мне рабіць: заўважыць Нэлу, ці не пазнаць праз многа-многа гадоў? Жанчыны не любяць, калі на іх глядзяць праз гады...

Татарка Нэла зірнула на мяне і залілася румянцам.

Гэтаксама румянілася і габрэйка Ася. Абедзве мае каханыя, заліваючыся румянцам, выйшлі замуж за гэбістаў.

«Ты абвінавачваешся ў спробе замаху на жыццё Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў СССР Мікіты Сяргеевіча Хрушчова...» – сталёва гледзячы мне ў вочы, дзёўб маёр Гагарын, які нездарма паабяцаў, што мы яшчэ сустрэнемся, і пульсавала ў маіх скронях, білася ў грудзях, трэслася ў пальцах: рас-стра-ля-юць... рас-стра-ля-юць... рас-стра-ля-юць...

«Вы абвінавачваецеся ў падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту, у спробе ўзброенага захопу ўлады...» – крываротa, гледзячы некуды ўбок, бо сам не верыў у тое, у чым абвінавачваў, гугнеў праз шмат гадоў адзін з трох гэбістаў, якія з'явіліся сярод ночы ў глухое, у якое мяне ўкінулі голага, сутарэнне «амерыканкі», унутранай турмы КДБ. На вуліцы лютаваў мароз, на сценах сутарэння бялела шэрань. Я так скачанеў, што ўжо не рухаўся, і мне ўсё адно было: расстраляюць мяне, павесяць, ці на кастры спаляць, але лепей бы спалілі – цяплей было б...

«Давайце будзем дамаўляцца, – сказаў другі гэбіст, у нечым падобны да маёра Гагарына. – Прапаную вам падпісаць вось гэтую паперу...»

– Давай з табой так дамовімся, – у гэтым самым сутарэнні прапанаваў мне маёр Гагарын. – Ты падрабязна расказваеш нам, вось на гэтай паперы вось гэтай асадкай пішаш пра тое, як твае старэйшыя... – ён памяў губу аб губу... – я хацеў сказаць: старэйшыя

сябры, – але сябрамі іх назваць нельга, яны ворагі, нашы з табой ворагі, разумееш?.. як грамадзянін Сысой, браты Леднікі, Гарачы, Галушка, Клябанаў… хто там яшчэ?… ну, хто?..

– Болей нікога…

– Як нікога?.. А Воран?

– Дык ён…

– Што ён?.. Ну?.. Што ён?..

– Ён пазней прыйшоў…

– Куды пазней прыйшоў? Пазней за што?.. Чаго змоўк, га?.. Добра, пра гэта потым… Значыць, Сысой, браты Леднікі, Гарачы, Галушка, Клябанаў, Воран, які прыйшоў пазней, у змове з грамадзянінам ЗША… як яго?..

– Амерыканец…

– Зразумела, што амерыканец… Як яго?..

– Алік…

– Які ён Алік! Як яго зваць?

– Вы ж ведаеце…

– Ведаю! Але хачу, каб ты сказаў! Чым болей ты сам скажаш, тым для цябе самога лепей. Разумееш? Як яго зваць?

– Лі…

– Што: Лі? Лі – і ўсё?

– Харві. Лі Харві Освальд…

– Вось бачыш… Сказаў – і ўжо лепей… У змове з грамадзянінам Злучаных Штатаў Амерыкі Лі Харві Освальдам і грамадзянінам Канады… Ну, што маўчыш?

– А што казаць?

– Імя! У змове з грамадзянінам Амерыкі Лі Харві Освальдам і грамадзянінам Канады…

– Іх двое…

– Правільна, двое. Значыць, з грамадзянамі Канады… ну…

– Там толькі Джым быў. А Джон…

– Які Джым? Які Джон?

– Джым Калеснікаў. А Джон – Дак. Ён таксама пазней прыйшоў.

– З кім?

– З Воранам.

– Пазней з Воранам… Добра. Далей?

– Што далей?

– Далей што было?

– Нічога.

– Як нічога? Што было далей?

– Напраўду нічога! Мы сядзелі, елі…

– Вось бачыш: сядзелі, елі… А ты кажаш: нічога. Што елі?
– Сыр.
– Пілі? Што пілі?
– Віно.
– Якое?
– Партвейн.
– Партвейн. Ты піў?
– Не.
– А хто піў?
– Віл, Гарык… Усе патрохі.
– Усе патрохі… Напіліся і…
Маёр Гагарын зрабіў паўзу і глядзеў на мяне, чакаючы…
У часы пабудовы камунізму да выпівохаў адносіліся паблажліва, будаваць камунізм яны не заміналі, а калі нехта з іх і ўчыняў нешта нападпітку, гэта не абцяжарвала ягоную віну, а наадварот… Можа, маёр і праўда хоча, каб і мне, і ўсім нам лепей было? Але ж мы нічога не ўчынялі.
– Ніхто не напіўся.
– Значыць, цвярозыя па зброю пайшлі?
Мяне сцяла: вось яно! Хоць Гурык і не адчыніў багажнік…
Маёр заўважыў, як я сцяўся, нахіліўся да мяне і так, што з курткі гузік адляцеў, згроб загрудкі.
– Чыя зброя?
Маўчаць не было як – дый без толку: іжэўка і карабін зарэгістраваныя.
– Іжэўка – Амерыканца, карабін – Віла.
Маёр як згроб мяне – гэтак і адпусціў. Сам напружыўся.
– Які карабін?
– Браўнінг.
– Які браўнінг?
– Двухствольны. На калібр 12 і на 7.62.
– Хіба такія бываюць?..
Я са здзіўленнем паглядзеў на маёра дзяржбяспекі, які не ведае, што ёсць такія карабіны – і тут маёр пачаў падымацца: павольна, упёршыся рукамі ў стол.
– Дык у машыне быў яшчэ й карабін? Іжэўка і браўнінг пад баявы патрон калібру 7,62?.. – І калі я, не разумеючы ягонага здзіўлення, кіўнуў, ён ткнуў пальцам у пакладзены на стол аркуш паперы: “Пішы! Усё пішы пад-ра-бя-зна!..” – і, грукнуўшы ў дзверы: “Ахова!..” – выскачыў з пакоя. Ён гэтак у дзверы грукнуў – кулаком ды яшчэ нагой, абцасам, што са столі вапна пасыпалася, і я ўспомніў, як

у пад’ездзе, калі мы з Вілам з кватэры Джыма выйшлі, сыпанула пацяруха з люка на гарышчы. Хто на гарышча падняўся?.. Амерыканец?.. Для чаго?.. І я з жахам уцяміў, што карабіна ў машыне, калі брат Ледніка адчыніў для Гурыка багажнік, ужо магло й не быць. Багажнік дабітай леднікаўскай “Варшавы” і без ключа адчыняўся – цвічком…

– Вось пісталеты, вось гранаты, якія знайшлі мы ў вашым офісе, – раскладваў перада мной праз многа-многа гадоў фотаздымкі на стале наймаладзейшы з трох гэбістаў, мусібыць, аператыўнік. – І з такімі цацкамі вы будзеце даводзіць, што заклікалі людзей прыйсці на плошчу для мірнай акцыі?

Я адсунуў фотаздымкі ўбок.

– У нас не было зброі. І ніхто вам не паверыць, што была.

– А ну ўстаць! – раптам крыкнуў той, які прапанаваў мне падпісаць паперу, падобны на маёра Гагарына і, як выглядала па ягоных паводзінах, старэйшы з іх. – Стаяць!

Я не падняўся. Голаму перад апранутымі і сядзець ніякавата, а не тое, што стаяць…

– Вам што сказалі!.. – рыўком за валасы падняў мяне аператыўнік, а старэйшы стаў насупраць, твар у твар: да чаго ж на маёра падобны! І позірк, як у таго, з адлівам сталёвым – дзе ім гэткія позіркі адліваюць? І гэтаксама не гаворыць, дзяўбе. – Людзі ў справакаваным вамі натоўпе падушылі адзін аднаго. За вамі – трупы. Вы дзе-небудзь чулі пра мірныя акцыі з трупамі?.. Вось і я не чуў. Разам з падрыхтоўкай дзяржаўнага перавароту і спробай узброенага захопу ўлады – гэта ці 25 гадоў, ці найвышэйшая мера! Прычым, у закрытым судзе, так што ні казак пра вас не раскажуць, ні песень пра вас не спяюць!.. Падпісвайце паперу, у вас проста няма іншага выйсця.

З паперы, якую яны прапаноўвалі мне падпісаць, вынікала, што мяне ўцягнулі ў прэзідэнцкія выбары, у барацьбу супраць законнай беларускай улады ворагі Беларусі, завербаваныя замежнымі разведкамі, і называліся імёны ворагаў – маіх паплечнікаў…

– Пакажыце пісталеты. І гранаты пакажыце.

Аператыўнік абсадзіў мяне на прыкручаны да падлогі зэдаль, зноў падсунуў фотаздымкі.

– А гэта што?

– Пісталеты пакажыце, – паўтарыў я. – А не фотакарткі. Пакажыце гранаты.

Старэйшы, падобны на маёра Гагарына, спытаў:

– Можа, вам і трупы паказаць?

Я кіўнуў.

– Так. І трупы.

– Давайце куды-небудзь зойдзем, – прапанаваў маёр Гагарын, муж татаркі Нэлы. – Раз мы ўжо спаткаліся.

І памяў губу аб губу.

Нашы звычкі з намі назаўсёды.

Татарка Нэла паглядзела на яго не надта ласкава – яна ўмела не надта ласкава глядзець.

– Нам няма калі.

Паўжыцця не бачыліся, а ёй няма калі…

У мяне насамрэч часу не было, меней за паўдня да пачатку мітынга на Плошчы заставалася, але раз яна так сказала…

У доме насупраць кінатэатра "Перамога" месцілася кавярня – і я прапанаваў маёру, ці кім ён цяпер быў:

– Можа, сюды?.. Тут жа ўсталяваная ваша праслухоўка?

– Можна й сюды, – рушыў ён цераз вуліцу. – Праслухоўка ў нас паўсюль. – І хмыкнуў. – Толькі я нічога і нікога больш не слухаю. У адстаўцы.

– Генерал?

– Не дацягнуў. Ці можна сказаць: не дашустрыў. Сябрук ваш шустрэйшы аказаўся.

Я спыніўся ў дзвярах кавярні, якія маёр расчыніў, прапускаючы мяне і Нэлу.

– Які сябрук? У мяне сярод вашых няма сябрукоў.

– Ёсць. Генерал Гурковіч. Ён, дарэчы, тут. Учора прыехаў з Масквы. Можна сказаць: назіральнікам за выбарамі.

Гурык у Мінску?… Тады нечага трэба чакаць. І не найлепшага. Там, дзе Гурык, добрага не дачакаешся. Хоць ён на пенсіі.

– Ён жа на пенсіі.

Маёр зноў хмыкнуў.

– А я дзе?..

Былых гэбістаў не бывае.

Кавярня была пустая. Увесь горад у гэты марозны дзень здаваўся спусцелым, і мяне непакоіла толькі адно: ці выйдуць у такі холад людзі на плошчу? Усё залежыла менавіта ад гэтага: выйдуць ці не выйдуць? А калі выйдуць, то колькі?.. Трэба было столькі, каб у іх пабаяліся страляць.

– Вам не дадуць дайсці да плошчы, – памяўшы губу аб губу, сказаў, як толькі мы селі за столік, маёр Гагарын, і татарка Нэла зноў зірнула на яго няласкава.

Па тым, як яна з ім паводзілася, як размаўляла, не выглядала на

тое, што яна купаецца ў сямейным шчасці. Не выглядала…

Мне патрэбная была хоць нейкая паўза, каб уцяміць, чаму гэтак нечакана пачаў размову маёр – і я, шукаючы паўзу, дакрануўся да рукі Нэлы.

– Як ты, Нэла?… – І прабачыўся перад маёрам. – Выбачайце.

– Нічога. Яна вас кахае. Усё жыццё. Ва ўсякім разе, так кажа.

Калі так, дык многа-многа гадоў назад не трэба было мяне голага ўсю ноч пад сталом трымаць. А самой пасля з тралейбуса, як сіні каптурык, выскокваць.

– Яна мне ўсё пра вас расказвала! – раптам рассмяяўся маёр, нібы здагадаўшыся, пра што я ўспомніў. – Прычым, яе для гэтага нават вербаваць не трэба было. – І паглядзеў на мяне сур’ёзна. – Вы позна вылезлі з-пад стала.

Я зразумеў, пра што ён, але спытаў:

– Вы пра што?

– Вам трэба было вылазіць раней. У канцы мінулага стагоддзя. Яно было нашым. Вашым і маім. Я чакаў, дый шмат хто са мной, што вы вылезеце.

Гэта магло быць: ён мог чакаць. Тады многія чакалі: што будзе? А галоўнае: хто?

– Чаму ж не сказалі, што вылазіць пара?

– Дык вы ж не захацелі! Не пажадалі быць з намі, – нахіліўся да мяне маёр. – Вось тут, на гэтай вуліцы, памятаеце?.. – Ён адхіліўся. – Памыліліся са мной, дык цяпер, глядзіце, не памыліцеся з маім сынам… – І паўтарыў, стараючыся як найглыбей зазірнуць мне ў вочы. – Не памыліцеся.

Значыць, і сын гэбіст.

– Ён наперад закідвае… – бачачы маю разгубленасць, паклала мне руку на руку татарка Нэла. – А раптам ты прэзідэнтам станеш.

У позірку, якім глянуў на яе маёр, не было любові.

Але й нянавісці не было.

Пусты позірк.

Гэбісцкі.

Як яны яго выпрацоўваюць? Гэта ж не голас падвышаць навучыцца, не паўзу трымаць…

– Як сына зваць? – спытаў я татарку Нэлу, і маёр адказаў за яе:

– Як і вас.

– Ваша прозвішча Гагарын? – спытаў я гэбіста, які прапанаўваў мне падпісаць пакаяльную паперу.

Ён прамаўчаў.

Сын.

“Лёсу кругі – як кругі па вадзе...”

Раней, калі бацька ягоны мяне дапытваў, яны называлі свае прозвішчы. Цяпер – не.

– Вы разумеце, што з вамі можа быць? – спытаў ён замест адказу. – Нам патрэбны вынік. У нас загад. І мы яго выканаем. Таму, калі будзеце ўпірацца, нічога добрага вас не чакае. Між іншым, яны не ўпіраліся.

– Хто – яны?

Ён ткнуў пальцам у паперу.

– Вашы сябры ў палітыцы. Звалілі ўсё на вас.

Брэша... Дый што яны зваліць на мяне маглі?

– У мяне ў палітыцы няма сяброў.

– Значыць, ворагі.

– І ворагаў няма.

– А хто ў вас там? З кім вы?

– Нікога. Адзін.

Той, які палохаў мяне знойдзенымі ў маім офісе пісталетамі і гранатамі, сабраў фотаздымкі са стала і паклаў на стол шпрыц.

– Тады тым болей, – сказаў сын маёра Гагарына. – Калі яны вам ніхто...

– Яны табе ніхто! – шмат гадоў таму крычаў мне Гурык. – Ніякія не сябры! Сябры цябе гэтак не падставілі б! Не зацягнулі б у дом, з даху якога збіраліся забіць кіраўніка краіны!

– Ды ніхто не збіраўся...

– Тады на дах чаго падымаліся? Хто падымаўся?.. Дзе карабін?..

Яны шукалі карабін на даху – і не знайшлі. Калі б я не прагаварыўся, што ў машыне не толькі іжэўка, але й карабін быў, дык яны пра яго б і не ведалі. Я падставіў Віла і ягонага брата Арцёма, Палкоўніка, Эдзіка, Гарыка, Ворана, Джыма, Амерыканца... Але ж я і ўявіць не мог, у які бок маёр Гагарын той карабін паверне! І што Гурык прычэпіцца: “Хто страляць збіраўся?..” – ведаючы, што нікому з нас такое ў галаву б не ўзбрыло... Апроч хіба Палкоўніка і Амерыканца.

– Палкоўнік збіраўся? Амерыканец?.. – не адчапляўся Гурык, які дапытваў мяне пасля маёра Гагарына і даставаў нават больш, чым маёр.

Амерыканец мне, канечне, ніхто, але скуль я ведаю: збіраўся ён, не збіраўся? І я не бачыў, як ён на дах палез, толькі падумаў, што гэта мог быць ён... Дык што я казаць буду?

– Не збіраўся ніхто...

– Не збіраўся?.. Ніхто?... Хлопчык, ты разумееш, у што ты

ўблытаўся? Па-мойму, не…

Гурык ступіў да дзвярэй, грукнуў у іх гэтаксама, як маёр Гагарын – кулаком і абцасам: “Ахова!..” Дзверы расчыніліся, Гурык падазваў мяне: “Сюды…” – і калі я падышоў, засунуў мае пальцы ў шчыліну паміж дзвярыма і вушаком, кінуўшы ахоўніку: “Давай!..” Ахоўнік, з якім прыём гэты быў, мусібыць, адпрацаваны, пачаў павольна прычыняць дзверы, а Гурык казаць: “Вось так табе будуць заціскаць пальцы на руках, на нагах… потым заціснуць тое, што ў цябе паміж ног… ты нават уявіць не можаш, як будзе балець… гэта яшчэ не баліць… ціснуць будуць датуль, пакуль ты ўсё не скажаш… нават тое, чаго не было… зразумеў?..” Я, пэўна, збялеў ад болю, бо ён, зірнуўшы на мяне, махнуў ахоўніку: “Досыць…”

– Вы не ўяўляеце, як будзе балець… – гледзячы, як аператыўнік набірае шпрыц, казаў той крывароты гэбіст, які няўпэўнена зачытваў пастанову пра мой арышт, але цяпер голас ягоны быў упэўнены: ён ведаў, пра што казаў. – Сутаргава, у вас здараліся сутаргі? Мяркую, здараліся, вы дастаткова пражылі. Яны пачнуцца ў нагах і руках, скручваючы кожны палец, пасля ў спіне, ва ўсім целе, але найстрашнае – болі ў галаве, іх немагчыма трываць… І вы падпішаце любыя паперы, назавеце ўсе, якія мы скажам вам называць, імёны. Усе замежныя разведкі. Прыдумаеце нават такія, якіх няма. Ні на Зямлі, ні на Месяцы… Так што падпісвайце, пакуль ёсць выбар, цацкацца з вамі ніхто не збіраецца.

– Як і з намі, – сказаў сын маёра Гагарына. – Думаю, гэта вы таксама разумееце.

Гэта я разумеў… Але нічога з таго, што загадалі ім выбіць з мяне іхнія гаспадары, не існавала. Нідзе не было. Ні на Зямлі, ні на Месяцы.

– Я не буду падпісваць. Калі здолею вытрываць…

Сын маёра Гагарына пакруціў галавой:

– Не здолееце.

Ён круціў галавой так, як сказаць нешта хацеў, каб астатнія не пачулі. Як падаваў нейкі знак… Я й раней заўважаў, што ён хоча ад іншых гэбістаў неяк адасобіцца, паказаць, што ён з імі толькі па нявыкрутцы. Але ж круціцца з імі – дык чаго тады галавой круціць?..

Бацька ягоны не круціў. Толькі губы мяў адну аб адну.

– Нашага сына завуць, як цябе, і ён многае пра цябе ведае, – сказала татарка Нэла. – Нават пра тое, як вы з Амерыканцам хацелі Хрушчова забіць, і Амерыканец карабін у нашай кватэры схаваў.

Шмат гадоў таму татарка Нэла жыла ў тым жа доме, у тым жа пад’ездзе, дзе здымаў кватэру канадзец Джым Калеснікаў. На тым жа

апошнім паверсе, на той жа лесвічнай пляцоўцы – дзверы ў дзверы. З тых дзвярэй я некалі выйшаў пад раніцу, каб ужо не пастукаць у іх ні днём, ні вечарам… У тыя дзверы пастукаўся Амерыканец, які, падняўшыся на дах, убачыў, што ў двор дома ўслед за Хрушчовым бягуць гэбісты. Ён спусціўся з гарышча, яму трэба было недзе схаваць карабін, – і ён ведаў, дзе жыве татарка Нэла, якая танцавала з ім рок-н-рол у Палацы прафсаюзаў.

Аднойчы пасля танцаў у Палацы прафсаюзаў Нэла выйшла з кватэры Джыма Калеснікава і ўвайшла ў сваю кватэру ўся падраная… І дапытваць яе прыехалі маёр і старшы лейтэнант. Гагарын з Гурыкам.

– Шкада, карабін я тады не знайшоў… – хмыкнуў маёр Гагарын. – Стаў бы генералам і меў бы жонку-генеральшу. Я адразу, як толькі яна дзверы адчыніла, па ёй убачыў: дзеванька ведае, чаго мы да яе прыйшлі. Зброя тут. Але знізу раптам крыкнулі, мы ўсе кватэрыператрасалі: “Знайшлі!..” Я спусціўся: карабін. Браўнінг. Пасля аказалася: не той. І гаспадар – наш супрацоўнік. З тэхнічнай службы, але наш. Я зноў наверх, усё абшарылі – нічога. А Нэла, пакуль мы ўнізе з нашым тэхнічным супрацоўнікам разбіраліся, карабін на гарышча падняла. Ну, хто будзе шукаць там, дзе ўжо шукалі?.. Дый падумаць я не мог, што яна на такое здольная. – Ён пацёр шыю, нібы яму гальштук муляў. – Так што вы ёй абавязаны. А я – вам. Не ляпні вы спачатку пра карабін, а пасля пра Нэлу – не стала б яна маёй жонкай. Усё наша жыццё з адных ляпаў.

– Чаму наша? – няласкава спытала татарка Нэла. – Тваё… – І праз гэтую няласкавасць зноў я ўспомніў, як некалі з’ехаў ад яе ў вясновым тралейбусе, у якім пахла першымі пралескамі, і як потым спрабаваў вярнуцца ў тралейбусе зімовым, але вярнуцца ўжо было немагчыма, позна. Я і ўспамінаць не хацеў пра гэта, бо вінаваты быў, наскрозь вінаваты і нават не думаў, што некалі яна мне даруе, а татарка Нэла зазірнула мне ў вочы. – Ты чаму не вярнуўся?.. Я за яго пайшла, бо за цябе баялася. Ён мяне застрашыў… І тым карабінам, і тым афрыканцам, якія мяне… якога ты…

Яна заплакала…

Я ўстаў і пацалаваў заколку ў яе валасах. Сам не чакаў, што пацалую…

Гэта выглядала, канечне, тэатральна, маёр нават скрывіўся: маўляў, тэатр – але што ёсць наша жыццё? І хто ў маім жыцці маёр Гагарын, каб я зважаў, крывіцца ён ці не?..

Нэла скрозь слёзы ўсё зазірала мне ў вочы – я ледзь вытрываў позірк…

– Чаму ты не вярнуўся?.. – паўтарыла яна, мезенцам слязінку скінуўшы.

– Бо дама ў каракулі павярнула на Даўгабродскую.

– Што? – не зразумела Нэла. – Якая дама?..

Каб я ведаў…

Нікога і нічога мы не ведаем. Мяркуючы, што ведаем усё пра ўсё і ўсё пра ўсіх.

Некалі, апроч дамы ў каракулі, была яшчэ дама з мандарынамі. Я на абедзвюх загадваў, як на лёс, а яны прабеглі міма па вуліцах Даўгабродскай і Падлеснай, і нават на імгненне думка ў іх не мільгнула, што яны прабеглі – і ўсё бягуць – праз маё жыццё…

Час падціскаў, я развітаўся, каб пайсці – маёр Гагарын прыпыніў мяне.

– Ваш Гурык, генерал Гурковіч, прыехаў назіраць за вамі. Разумееце?.. Я вас папярэдзіў. Лічыце, што аддзячыў. – І ён кіўнуў у бок татаркі Нэлы. – За яе.

Шкада, што яна дасталася яму.

Нэла ўратавала Віла, Палкоўніка, Гарыка, Эдзіка, Амерыканца, мяне… Не ўратавала толькі Джона Кенэдзі. Калі б яна не схавала карабін, наўрад ці Амерыканец пабачыў бы Амерыку. І Прэзідэнта Злучаных Штатаў, які разам з Хрушчовым хацеў адкрыць свету таямніцу іншапланецянаў, ніхто б не забіў.

Ці ўсё адно забіў бы нехта?..

– Скажыце, – спытаў я, ужо выходзячы з кавярні, пра тое, пра што ад самага пачатку хацеў спытаць. – У Навінках… у вар’ятні…

Я зрабіў паўзу, каб пaглядзець, як ён зрэагуе. На ягоным твары нічога не зварухнулася.

– Што ў Навінках у вар’ятні?..

Не скажа.

– Нічога.

Сын маёра Гагарына паклаў маю руку локцем на край стала.

– Не падпішаце вы – нехта падпіша. Нам усё адно, хто… Кандыдатаў хапае. Але я асабіста хацеў бы, каб гэта былі вы. Разумееце?..

Я зразумеў, чаго ён галавой круціў. І чаму маёр Гагарын двойчы сказаў: “З маім сынам не памыліцеся…”

Яны прапануюць мне гульню.

Але я нагуляўся.

– Няхай падпісвае, хто хоча.

– А вы – не?

Я пакруціў галавой. Гэтаксама, як ён.

– Ну, што ж… Торгніцеся – зламаю! – прыціснуў ён мой локаць да стала і кіўнуў аператыўніку. Той наклаў жгут, намацаў вену…

Некалі ў вар’ятні мне заломвалі руку, калолі. Цяпер – тое самае ў турме. Што ж яны да мяне прычапіліся? Праз усё жыццё…

Боль, як і казаў крывароты гэбіст, які зачытваў мне пастанову пра арышт, пачаўся ў нагах і руках, выкручваў кожны палец, пранізваў спіну і да чырвані распаленым свярдзёлкам укручваўся ў галаву, яго немагчыма было трываць – і я не вытрываў, страціў прытомнасць…

Ачомаўся ад лаянкі і крыку. “Чаму без доктара?! Калі б ён жмурыка сыграў – хто б адказваў?!.”

Грацъ жмура – грацъ на пахаванні. Жмурыка сыграць – памерці. Гэта я ведаў. Так лабухі казалі, ад іх навучыліся зэкі. І генералы.

Той, на каго крычалі, вінавата апраўдваўся.

“Дык не сыграў… Жывы…”

“Жывы! А што толку, калі не падпісаў!”

“Падпіша…”

Апраўдваўся сын маёра Гагарына. Лаяўся – я не мог не пазнаць ягоны голас – Гурык. Генерал Гурковіч. Адстаўны генерал беларускага КДБ і расійскага ФСБ, які прыехаў з Масквы назіраць і за выбарамі, і за мной, і за беларускімі маёрамі.

“Лёсу кругі, як кругі на вадзе…”

– Падпісвай, – падсунуў да мяне паперу Гурык. – Ніхто не будзе ведаць, што ты падпісаў. Толькі я. А каб ты мне паверыў, я табе скажу такое, пра што будзеш ведаць толькі ты.

Гэта было шмат гадоў таму… Ні Ворану, ні Вілу, ні Палкоўніку, – нікому я пра гэта не казаў, бо не ведаў: як сказаць? Не сказаў нават Асі, з якой выпадкова сустрэўся ў рэстаране “На ростанях” перад тым, як яна з’ехала ў Ізраіль, і якой сказаць трэба было б… Ёй, можа, я й сказаў бы, але што гэта мяняла, калі Ася з’язджала?..

– Яны мае сябры, – адсунуў я паперу, – і Гурык ускочыў.

– Сябры?.. А хто цябе падставіў?.. Уцягнуў?.. Яны! Палкоўнік, Віл, Воран! А хто хоча выцягнуць?.. Я! Запомні на ўсё жыццё: сябар той, хто хоча дапамагчы! Выцягнуць! І не толькі хоча, бо хацець – цьфу! Хто можа! Сябры – тыя, якія могуць! Я твой сябар, бо я – магу! Бо за мной – сіла! І яна можа быць за табой. Калі дурнем не будзеш. Калі ўцяміш: да ўлады, да грошай, да славы не па зямлі ідуць! Адзін па адным! Топчуць, трушчаць! Па мясе, па касцях! Жывыя па жывых і мёртвыя па мёртвых!.. Гэта і ёсць шлях. Адзіны! Іншага няма. Толькі такі! Бязлітасны! На падарожнай напісана: “Знішчай усіх, хто замінае!” Не шкадуючы. А калі захочаш некага пашкадаваць, дык

пашкадуй сябе самога. Толькі нядоўга, бо ўсе шкадавальнікі – брук, па якім ідуць… Помніш песню: “Чалавек, пашкадуй сябе сам?”

Я помніў песню, якая называлася “Чалавек, памажы сабе сам” – але якая розніца…

– Гурык, – спытаў я, – а дзе гэта мёртвыя ходзяць па мёртвых?..

Праз шмат гадоў, ачомаўшыся пасля ін’екцыі і з цяжкасцю расплюшчыўшы вочы, я ўбачыў, што ўжо не ў сутарэнні ляжу, а ў абкладзеным бякла-сіняй пліткай і праз тое падобным да трупярні, пакоі, на ложку за цыратавай фіранкай, на якой, бо з таго боку свяціла лямпа, рухаліся цені, адзін з якіх я пазнаў не толькі па голасе, але і па абрысах, хоць за многа гадоў ён стаптаўся і прыгорбіўся, але гэта быў ён – і я спытаў праз цырату, праз гады:

– Скажы, Гурык… навошта…

Ува мне яшчэ блукаў боль – і ў горле задзёрла так, нібы прамоўленыя мной словы былі абсыпаныя жалезным пілавіннем, я ледзьве пракаўтнуў іх, а Гурык адшморгнуў фіранку: “Што табе сказаць?..” – і мне падалося раптам, што перада мной паўстала ўсё, разам з ім пражытае, стаптанае і прыгорбленае жыццё, і мне крыўдна стала нават больш, чым балюча, але я дагаварыў, хоць у горле дзёрла… – Навошта некалі ты сам прызнаўся мне, што ты поскудзь?..

Я ўспомніў Гурыка маладога, усяго ў бліскучых пагонах у рэстаране “Лета”, калі ён біўся з Воранам, і я думаў тады, што яны б’юцца праз Саламона Майсеевіча, а яны біліся праз Асю, дый не праз Асю – яны проста не маглі не біцца, бо Гурык гатовы быў прайсці па Воране “жывым па жывым і мёртвым па мёртвым”, а Воран быў не з тых, хто рады сцяліцца, каб па ім хадзілі, ён быў з тых, хто дапамагаў пасцеленым падняцца, а Гурык зноў іх валіў – вось ён і цяпер прыйшоў паваліць мяне, калі я падняўся, і спакойна адказвае мне, чаму ў тым, што ён поскудзь, сам некалі прызнаўся:

– Каб у цябе ніколі наконт гэтага аніякага сумневу не было.

Нічога ў ім не змянілася. Не змянілася наўкол нічога, што змусіла б яго змяніцца – сам чалавек не мяняецца.

“Па жыцці ідуць адзін па адным. Жывыя па жывых і мёртвыя па мёртвых. Бязлітасна. Злітуешся – капец. Той, над кім злітуешся ты, не злітуецца над табой. Таму я не мог злітавацца над ім…”

– Над кім? – спытаў я шмат гадоў таму.

– Над бацькам Асі. Над Саламон Майсеевічам. Бо на падарожнай напісана: “Знішчай усіх, хто замінае табе!” А ён, калі патрапіў да нас, як звар’яцеў. “Вы майго брата Ізю – у трыццаць сёмым! Маю Аду – у сорак другім! Маю Соню – у сорак трэцім! Цяпер – мяне!..” Нават сястру сваю, якую ў гестапа павесілі, на нас павесіў.

Крычаў мне на кожным допыце: “Не аддам табе Асю! Касцьмі лягу, а не аддам”. І я зразумеў, што не аддасць… – Гурык нечакана паклаў руку мне на плячо. – Ты кахаеш Асю? І я табе замінаю?..

Асю я кахаў. Але Гурык мне не замінаў. Як ён мог мне замінаць? Яго Ася не кахала. Яна кахала Ворана.

– Табе замінае Воран, – сціснуў маё плячо Гурык. – Дык падпішы – і яго не стане. А пра тое, чаму яго не стала, будзем ведаць толькі я і ты. Як і пра тое, чаму не стала Саламона Майсеевіча. Калі двое ведаюць адну таямніцу, гэта… – Гурык памаўчаў напружана. – Я скажу табе, чаму яго не стала. Каб ты мне паверыў. Каб не толькі я пра цябе, але і ты пра мяне ведаў нешта, чаго не ведае ніхто…

Ён страшны стаў, я ніколі такім яго не бачыў – і папрасіў:

– Не трэба, Гурык…

– Трэба! Слухай!.. Ён мне замінаў. І я сказаў яму на апошнім допыце, што арыштавалі яго праз Асю. Што гэта дачка ягоная сдала яго. Напісала, як ён супраць партыі народ каля яткі агітаваў. Ён збялеў: “Не!..” – і за сэрца. Яно ў яго слабое было, Ася лекі перадавала. Я мог сам яму дапамагчы, нас гэтаму вучылі. Мог адразу паклікаць доктара. Але я не дапамог і не паклікаў. Пачакаў… – Гурык адпусціў маё плячо. – Паклікаў, калі позна было…

Гурык казаў гэта – мне сціскала сэрца. Мацней, чым Гурык сціскаў плячо. Але было мне толькі пятнаццаць – і сэрца было не такое слабое, як у Саламона Майсеевіча.

– Думай, – сказаў Гурык, выходзячы. – А то ці расстрэл, ці што-небудзь яшчэ горшае…

Што горшае?

– Што горшае?!. – кінуўся я ўслед Гурыку, грымнуў кулаком у жалезныя дзверы. Гэтак Косця Воран газіроўку з аўтамата выбіваў. Але вада не заўсёды лілася. З сіропам дык увогуле рэдка ўдавалася выбіць. Амаль ніколі.

Вуліца Броўкі, былая Падлесная

“Вуліца Падлесная цёмная і цесная...” – спяваў Гарык Клябанаў пра вуліцу Падлесную, на якой стаяў – і цяпер стаіць – электратэхнікум сувязі, у якім я вучыўся, ды інтэрнат, у якім я жыў. Яшчэ там – паміж інтэрнатам і тэхнікумам – была крама, дзе прадаваліся батоны, ліверная каўбаса і каўбасны сыр, кефір, кансервы “Часцік у тамаце”, сітро “Байкал” і віно “Агдам” – таннае пітво, якое лічылася партвейнам, хоць да партвейна ніякіх адносін не мела, проста задурвала галаву. Крама тая на Падлеснай, што стала вуліцай Броўкі, ёсць і цяпер, але ні “Байкала”, ні тым больш “Агдама”, які цешыў савецкіх студэнтаў і алкаголікаў, у ёй не купіш: ён знік у пачатку 90-х разам з СССР. І цяпер ужо наўрад ці ўзнікне, бо Арменія, захапіўшы Агдамскі раён Азербайджана, дзе рос вінаград, з якога выробляўся “Агдам”, знішчыла вінаграднікі.

Знішчаць – дык знішчаць...

Сустрэўшыся ў электратэхнікуме на Падлеснай праз шмат гадоў, мы, колішнія студэнты, пілі на падваконніку каля нашай аўдыторыі віскі “Royal salute”, прастаўленае нашым аднакашнікам Сатушам, які нечакана для ўсіх стаў расійскім алігархам, і спявалі:

Пардон, мадам, батон напапалам,
Напапалам, мадам, партвейн “Агдам”,
Яшчэ, мадам, у асарціменце
Сітро “Байкал” і рыбка ў тамаце...

Песню гэтую таксама прыдумаў Гарык Клябанаў, які ў тэхнікуме з намі хоць і не вучыўся, але “Агдам” у нашым інтэрнаце выпіваць любіў, і калі яго папракалі ў парушэнні граматыкі: маўляў, рыбка ў тамаце, а не ў тамаце, – адказваў, што напісаў гэтую песню для студэнтаў з Гвінеі, а ў гвінейскай мове няма граматыкі. Чаму? Бо ў Гвінеі і мовы гвінейскай няма, афіцыйная мова там французская, а размаўляюць гвінейцы на розных мовах, пераважна фула і сусу, на адну з якіх, на сусу, Біг пераклаў верш пра татарку Нэлу, якой таемна зайздросціць ружа ў крыштальнай вазе, але калі Гарык падабраў да верша мелодыю і саспяваў гвінейцам, яны нічога не зразумелі. Значыць, няма ў Гвінеі граматыкі ні ў чым.

Замежныя студэнты, з’явіўшыся ў Мінску ў пачатку 60-х, вучыліся не толькі ў кансерваторыі і ўніверсітэце. Два афрыканцы былі студэнтамі электратэхнікума сувязі – і аднаму з іх, якога звалі

Аджа, напярэдадні Новага года выбілі зуб. У калідоры інтэрната, дзе Аджы стукнулі па зубах, загадзя выкруцілі лямпачку, і ён не мог сказаць, хто на яго напаў. Толькі паказваў свой выбіты зуб – белы, як саксонскі фарфор.

Выбіты зуб студэнта з Афрыкі, запрошанага на вучобу ў Мінскі электратэхнікум сувязі ўрадам СССР дзеля дапамогі краінам, што сталі на сацыялістычны шлях развіцця – гэта вам не выбітыя зубы Кона, Грыца ці Баліка, якія можна знайсці і на Падлеснай, і ў парку Чалюскінцаў, і ў парку 40-годдзя БССР – па ўсім Мінску. Кона, Грыца і Баліка можна біць па зубах хоць кожны дзень, бо ніхто з іх не пляменнік Секу Турэ, прэзідэнта Гвінеі, якая першая ў Афрыцы стала незалежнай рэспублікай і пасябравала з Савецкім Саюзам, кіраўнік якога Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў пасябраваў з гвінейскім прэзідэнтам, дзядзькам Аджы. Таму ў той жа вечар, у які студэнту з братняй Гвінейскай Рэспублікі выбілі зуб, у інтэрнат электратэхнікума на вуліцу Падлесную прыехаў старшыня Камітэта дзяржбяспекі БССР таварыш генерал Пятроў, якога называлі Чапаевым, бо ён быў Васілём Іванавічам. Назаўтра ўвесь тэхнікум выглядаў падобным на школу міліцыі, столькі на ўсіх паверхах ва ўсіх калідорах круцілася людзей у форме і без яе, але ўсё адно форменных. Цывільныя касцюмы глядзеліся на іх, як мундзіры, і хадзілі яны так, што на іх, здавалася, рыпелі партупеі. Яны дапытвалі студэнтаў, выкладчыкаў, электрыкаў, прыбіральшчыц, вахцёраў, але не знаходзілі вінаватага, бо не маглі знайсці прычыну, па якой нехта напаў на Аджу. У краіне сацыялістычнага інтэрнацыяналізму прычына гэтая не магла быць расавай, а іншай не было.

– Чаго мы прыляпіліся да падваконніка? – пытае Сатуш, колішні наш аднакашнік і цяперашні расійскі алігарх, які праставіў нам віскі “Royal salute”. – Пайшлі ў спартовую залу піць! Памятаеце, як нас там мардавалі?

У Сатуша столькі грошай, што ён можа купіць і падваконнік, і спартовую залу, і ўвесь тэхнікум, але Міколу Лобу, які як быў, гэтак і праз гады застаецца старастам нашай групы ТР, што значыць тэлевізійная тэхніка і радыёрэлейная сувязь, на грошы напляваць, і ён насоўваецца на Сатуша: “А ў лоб не хочаш? У спартовай зале спортам займаюцца, а не п’юць!..”

Лоб – гэта Лоб, які ён быў, такі й застаўся: “У спартовай зале спортам займаюцца, а не п’юць!..” – і Сатуш адсоўвецца ад Лоба далей, бо той першы раз пытае: “А ў лоб не хочаш?..” – а другі раз б’е. Таму шмат гадоў назад, калі пачалі шукаць таго, хто Аджы зуб выбіў, дык першым, каго западозрылі, быў Лоб.

– Хто і за што? – спытаў мяне, выклікаўшы да сябе ў кабінет, дырэктар тэхнікума. – Лоб?.. Кон? Грыц? Балік?.. Ты павінен ведаць.

– Чаму я павінен ведаць?

– Бо ў цябе костачка на правай руцэ збітая. Вунь, на сярэднім пальцы. Ты ж не ляўша?

– Не ляўша.

– Значыць, калі не Лоб, не Кон, не Грыц і не Балік, тады ты. Разумееш?

Дзіўная логіка ў дырэктара. Чаму, калі не Лоб, Кон, Грыц ці Балік, дык я? І інтэрнаце трыста чалавек жыве – і яшчэ трыста ў госці прыходзіць.

Прозвішча нашага дырэктара Тумас – і нейкі ён не такі дырэктар, якім трэба быць дырэктару. Арганізаваў у тэхнікуме секцыю бокса і разам са студэнтамі трэніруецца. На кожнай выпускной вечарыне кожная група выпускнога курса выстаўляе супраць яго свайго найлепшага баксёра. Ідуць у сутарэнне, дзе рынг, і б'юцца. Калі перамагае дырэктар, дык ніякіх групе выгодаў: усе едуць працаваць па размеркаванні. Калі перамагае выпускнік, ён атрымлівае вольны дыплом, а тыя з ягонай групы, хто займаўся боксам, размяркоўваюцца з улікам асабістых пажаданняў. За такое, скажу вам, варта пабіцца, бо калі ты размяркоўваешся, як усе, дык едзеш сувязістам на Кушку, Сахалін, Камчатку ці Новую Зямлю. Таму боксам у электратэхнікуме сувязі займаліся апантана. Нават дзявочая група ў секцыі бокса была.

На стале дырэктара Тумаса стаяў не надта чысты графін з вадой. Гэтакі самы, як на стале маёра Гагарына. Дырэктар заўважыў, што я гляджу на графін, і наліў вады.

– На, выпі. Дык хто?..

Я выпіў. Вада ў дырэктарскім графіне, як і ў графіне маёрскім, здалася падсоленай. Што ім усім падсыпаюць, каб яны маёрамі ды дырэктарамі былі?..

– Не ведаю, Павел Фёдаравіч.

– Не ведаеш… Помніш, як тут, у гэтым кабінеце, просячы за цябе, маці твая прыніжалася, калі цябе з інтэрната за твае выхадкі папёрлі? Хочаш, каб яна зноў прыніжалася, калі цябе папруць з тэхнікума?

Ніякіх выхадак за мной не было, але з інтэрната мяне папёрлі. І я помніў, што было тут, у дырэктарскім кабінеце – і зноў гэтага не хацеў. Не перажыў бы зноў такое.

Камендант вучэбнага корпуса краў спірт з хімічнай лабараторыі – і ўз'еўся на мяне, поскудзь, калі я дзяжурыў у лабараторыі і падлавіў

яго. Ён піў крадзены спірт з камедантам інтэрната, якога падбіў выселіць мяне за порткі-дудачкі і кашулю з папугамі. “За знешні выгляд, – як напісаў камендант інтэрната ў загадзе на высяленне, – які не адпавядае выгляду савецкага студэнта Мінскага элекратэхнікума сувязі”. Дырэктару жаліцца я не стаў, два тыдні начаваў на вакзале, пакуль міліцыянты да мяне не прычапіліся. Затрымалі, паведамілі ў тэхнікум і бацькам. Маці прыехала, мяне за руку – пайшлі да дырэктара. Яна перад ім ледзь не кленчыць… Насоўку дастала завязаную, развязвае яе, плача… “Павел Фёдаравіч, даражэнькі, пашкадуйце вы яго…” Рукі ў яе дрыжаць, ледзь тую насоўку развязала, разгарнула няўдала – і грошы на падлогу… Па рублю, па тры, якія напазычала… Хабар даць хацела, Госпадзі!.. Нахілілася збіраць, як паклон біць – дырэктар яе за плечы: “Прашу вас, не трэба! Калі ласка, сядзьце…” Пасадзіў на крэсла, да мяне крочыў, я каля шафы з кнігамі стаяў, паміраў ад сораму – і аперкот! Такі, што я ўзляцеў разам з папугамі – і грымнуўся ў кут за шафу… Пасля ён змусіў мяне грошы на падлозе збіраць і рукі маці цалаваць… Я збіраў і цалаваў… Маці сядзела, як каменная…

Вось хіба гэта нармальны дырэктар? Я, канечне, зразумеў навуку ягоную і на ўсё жыццё запомніў, але хіба такі дырэктар нармальны?

– Хто папрэ? – спытаў я, стоячы цяпер у тым жа кабінеце каля той жа шафы і ўважліва сочачы за дырэктарскімі кулакамі. – Вы ж дырэктар…

– Я й папру! – цвёрда сказаў Тумас. – Іначай мяне папруць.

Назаўтра раніцай, калі мы прыйшлі на заняткі, нас пагналі ў спартовую залу. З усяго курса толькі нашу групу. Там паставілі ў шэраг і загадалі выцягнуць рукі ўперад далонямі ўніз. Са збітымі костачкамі на руках вывелі з шэрагу сямёх: Лоба, Кона, Грыца, Баліка, Ждана, Сатуша і мяне…

– У спартзалу ўсё ж давайце зойдзем, – глынуўшы “Royal salute”, якому болей гадоў, чым было нам, калі мы скончылі тэхнікум, сказаў, падабрэўшы, Лоб. – Там ёсць што ўспомніць. – І скамандаваў, як толькі мы зайшлі ў спартзалу. – А ну ў шарэг! Рукі ўперад далонямі ўніз!.. Вунь ва ўсіх пальцы дрыжаць, а яны п’юць на падваконніку!

Я паглядзеў: нават у тых, каго тады не вывелі з шэрагу, у Ханені, Жука, Ігана, Івашкі, Сцепаненкі, Стукача, Кашыца сапраўды дрыжалі пальцы. Яны ўспомнілі той страх…

Як кожны з нас баяўся: выганяць! І што рабіць? Куды падацца? Дахаты вяртацца? Што дома сказаць? Бацькам, суседзям?..

Ніхто не думаў, што могуць пасадзіць. За што?.. Але пачаліся

допыты – і да страху, што выганяць, дадаўся жах, што пасадзяць.

Што мы тады ведалі?.. Нічога. Дый тым, хто нас дапытваў, наўрад ці было вядома, што прэзідэнт маладой Рэспублікі Гвінея Секу Турэ, які ўжо выцыганіў у Хрушчова болей за 30 мільёнаў залатых рублёў, раптам замест візіту ў СССР рвануў у ЗША і атрымаў там 16 мільёнаў долараў пад абяцанне, што забароніць савецкім самалётам сядаць пры палётах да Кубы на аэрадром у сталіцы Гвінеі Канакры, які наўмысна дзеля гэтага савецкімі спецыялістамі быў адбудаваны. Нарастаў Карыбскі крызіс, СССР нарошчваў на Кубе ваенную сілу, забарона на прамежкавую пасадку самалётаў у Гвінеі перапыняла хуткую дастаўку грузаў і вайскоўцаў, таму прыкладаліся неверагодныя намаганні, каб вярнуць блуднага афрыканскага сына ў лона савецка-гвінейскага сяброўства – і ў гэты час у гэтым лоне любімаму пляменніку блуднага сына выбіваюць зуб. “А!.. – сказаў Секу Турэ. – Во як вы сябруеце! Гэтак і мне, калі з’яўлюся да вас, зубы пералічыце! Не, лепш я да амерыканцаў...”

У інтэрнаце электратэхнікума сувязі зрабіліператрус. Шмат у каго ў тумбачках, у ложках і ў валізах пад ложкамі пазнаходзілі невядома дзе ўзятыя, бо ў крамах такія не прадаваліся, радыёдэталі, а ў пакоі, у якім жылі Лоб, Ждан, Сатуш, Пашок, Лан і я, знайшлі незарэгістраваную радыёстанцыю. Мы сабралі яе зусім нядаўна, ніводнага разу яшчэ не выходзілі ў эфір, але каму ты гэта давядзеш?..

– Вы, пэўна, не ўяўляеце, у якую патрапілі гісторыю, – прайшоўся перад намі, парыпваючы чорна-бліскучымі ботамі на новым, нядаўна перасцеленым у спартзале светла-бліскучым паркеце, маёр Гагарын, які глядзеў на мяне гэтаксама, як і на ўсіх астатніх: нібы ўпершыню бачыў. – Вы хоць ведаеце, з якой краіны прыехаў вучыцца студэнт, якога вы ледзь не забілі?

“Хто яго ледзь не забіў?.. Выбіць зуб – гэта ледзь не забіць?..” – здзівіўшыся, хацеў спытаць кожны з нас, але ніхто не спытаў.

– З Афрыкі! – зрабіўшы крок наперад, адказаў на пытанне маёра Лоб, які заўсёды адказваў на ўсе пытанні, калі думаў, што ведае, як на іх адказаць.

Маёр Гагарын спыніўся перад Лобам, пасвідраваў яго позіркам і стаў казаць да яго і да ўсіх нас, сямёх, бо астатніх са спартовай залы адпусцілі. Пачаў ён ціха, з кожнай наступнай фразай падвышаючы і падвышаючы голас, нібы голасам сваім хацеў пасцяліць нас на паркеце пад боты.

– Няма такой краіны: Афрыка. Ён прыехаў з Гвінеі, якая першай на афрыканскім кантыненце стала на сацыялістычны шлях развіцця, кінуўшы выклік амерыканскаму імперыялізму! Амерыканскі

імперыялізм пагражае гвінейскаму народу агрэсіяй! Гвінейскі народ просіць дапамогі ў Савецкага Саюза, пасылае вучыцца ў нас абаронцаў сваіх рэвалюцыйных заваёў, а мы іх як сустракаем?! А мы ім зубы выбіваем! – не з усёй сілы, але і не слаба ўрэзаў Лобу ў зубы маёр, і я падумаў пра яго з дырэктарам: вось для чаго яны аднолькавую ваду ў сваіх кабінетах п'юць. – Хто выбіў?! Ты?..

Лоб стаяў патыліцай да мяне, але й з паталіцы лобавай я ўбачыў, як галава ягоная напаўняецца і напаўняецца страхам, ад якога ён – менавіта ад страху, а не ад удару – нават пахіснуўся, і калі б ён ведаў, хто выбіў зуб абаронцу рэвалюцыйных заваёў братняга гвінейскага народа, ён сказаў бы, але Лоб не ведаў гэтага, таму адказаў толькі тое, што ведаў:

– Не! Не я...

Маёр Гагарын дастаў насоўку і выцер кулак.

– Не ты, дык не ты... Я вам што хачу сказаць... – Ён зрабіў паўзу, паклаў насоўку ў кішэнь. – Мы ведаем, што ў той вечар не было ў інтэрнаце двух вашых сяброў. Пашка, як вы іх называеце, і Лана. Пашкова і Ланскага. А паколькі іх не было, значыць, яны не вінаватыя. Дык вось: калі не прызнаецца той, хто гэта зрабіў, з тэхнікума будуць выключаныя менавіта Пашкоў і Ланскі, вашы ні ў чым не вінаватыя сябры. Праз некага... – ён зноў пасунуўся на Лоба... – ві-на-ва-та-га... – і калі Лоб стаў ад яго адступаць, маёр рэзка павярнуў яго тварам да нас. – Ты пачуў, што я сказаў, староста?.. Калі пачуў, паўтары для тых, хто праслухаў! Ну!..

Лоб, канечне, пачуў, што яму сказаў маёр Гагарын, але відаць было, што ён, як і кожны з нас, не зразумеў: як гэта не вінаватых караць замест вінаватага?

– Калі не прызнаецца той, хто гэта зрабіў, з тэхнікума будуць выключаныя нашы ні ў чым не вінаватыя сябры, – амаль слова ў слова паўтарыў тое, што сказаў маёр, Лоб, адзіны з нас, хто потым скончыў тэхнікум з чырвоным дымломам. – І павярнуўся да маёра Гагарына. – Не выганяйце Пашкова і Ланскага. У Пашка бацька інвалід вайны.

Маёр паківаў, нібы паспачуваў.

– Вось і падумайце пра гэта... – І зноў рэзка падвысіў голас. – Пра сваіх бацькоў, якія змагаліся на вайне супраць фашызму, падумайце! А вы амерыканскім фашыстам дапамагаеце! Ды вас за гэта на вайне... – адступіў ён да гэбістаў, якія шэрагам стаялі за ім, і адразу ясна стала, мы такое ў кіно бачылі, што было б з намі, калі б нас вось так, шэраг насупраць шэрагу, паставілі на вайне, а маёр Гагарын скамандаваў. – Той, хто зрабіў гэта сам, ці ведае, хто гэта

зрабіў, крок наперад!..

Ніхто не крочыў. А калі нехта зварухнуўся, дык не наперад, а назад.

Прычына, па якой Аджы выбілі зуб, была. Не расавая, а тая, па якой біліся, б'юцца і будуць біцца хлопцы ва ўсім свеце незалежна ад таго, чорныя яны, белыя ці жоўтыя.

Прычына звалася Нэлай. Калі я з'ехаў ад яе на першым тралейбусе, яна пачала ўсяляк выпрабляцца і паказваць, што ёй на мяне напляваць. З танцаў у Палацы прафсаюзаў пайшла з Аджы, у якім ускіпела афрыканская кроў – і ён татарку Нэлу згвалціў. У яе ж доме, у кватэры Джыма Калеснікава, які даў яму ключ. Нэла прыйшла дахаты падраная, ва ўсім прызналася бацькам, тыя ледзь на вуліцу яе не выгналі, але сказалі, каб маўчала: сораму не абярэшся.

Зуб Аджы выбіў я. І ў спартзале, стоячы ў шэрагу сяброў насупраць шэрагу гэбістаў на чале з маёрам Гагарыным, я ступіў бы крок наперад, проста са страху прызнаўся б, калі б Палкоўнік, якому я расказаў пра ўсё, не загадаў гэтаксама, як Нэле загадалі яе бацькі: маўчаць! "Сам ні ў якім разе ні ў чым не прызнавайся! І з тэхнікума паляціш, і ў калоніі для малявак апынешся. Здадуць цябе свае – тады што ж… А сам прызнацца не ўздумай!"

Здаць мяне маглі трое. Гарык Клябанаў, які лямпачку ў калідоры выкруціў, і Сатуш са Жданам, якія ў пачатку і канцы калідора глядзелі, каб сведкаў не было. Перад тым, выпіваючы з імі партвейн "Агдам", я распавёў, як Аджа згвалціў татарку Нэлу, і Гарык кулакі сціснуў: "Калі ты не дасі яму за гэта ў лыч, я табе не сябар". І Сатуш са Жданам сціснулі кулакі: "Мы табе тады таксама не сябры".

Кампанія, у якой насіў я порткі-дудачкі і кашулю з папугамі, чытаў вершы і слухаў джаз "на рэбрах", з кампаніяй, у якой біўся на Грушаўцы і ў Сельгаспасёлку, вывучаў тэлевізійную тэхніку і радыёрэлейную сувязь, амаль ніяк, калі не лічыць Гарыка Клябанава, які ў абедзвюх кампаніях выпіваў партвейн, не перасякалася. Тая, стыляжная, была гарадская, у якой я, хоць яна мяне й вабіла, пачуваў сябе не надта ўтульна. Усе ў той кампаніі былі старэйшымі за мяне, болей за мяне ўмелі, ведалі, нікому там не быў я роўня, а тут, сярод маіх аднагодкаў і гэткіх самых, як я, местачковых і вясковых хлопцаў, я быў не толькі роўня, але й адным з першых, калі не найпершы – і вось жа Гарык, які з гарадскіх, і Сатуш са Жданам, якія з местачковых, у адзін голас кажуць, кулакі сціскаючы: калі не дасі Аджы ў лыч, мы табе не сябры. Там я, значыць, ніколі не стану роўным – і тут з першых сыйду…

Хоць і выпіўшы "Агдаму", але разумеючы, што нам за бойку з

замежным студэнтам можа пагражаць, мы зрабілі ўсё так, каб нас ніхто не заўважыў. І сышлі, прыбраўшыся перад тым у пакоі, з інтэрната. Спачатку, каб там разам засвяціцца, на танцы ў Палац прафсаюзаў, адтуль да Палкоўніка, а пасля да Гарыка, у якога й заначавалі. Назаўтра прыехалі ў тэхнікум, а тут Чапаеў з маёрам Гагарыным – і паўсюль рыпяць партупеі.

– Што ж, – паправіў партупею маёр Гагарын і ўпершыню паглядзеў на мяне не так, як на ўсіх. Асобна. – Калі не выходзіць разам, паспрабуем па адным. Але цяпер ужо вы ў любым выпадку выляціце з камсамола. Гэта я вам кажу, каб не думалі, што Ланскім ды Пашковым усё абыйдзецца.

Са спартовай залы мяне прывялі ў кабінет каменданта вучэбнага корпуса. За каменданцкім сталом сядзеў не камендант, а старшы лейтэнант Гурковіч. Гурык. Не ведаю, ці ён сам захацеў мяне дапытаць, ці так яно выпадкова выйшла, але я чакаў, што яго ўбачу, і не здзівіўся, убачыўшы.

– Мне выйсці? – спытаў камендант, які быў не толькі п’янтос і злодзей, але яшчэ й гомік. У ягоным кабінеце стаяла рыпучая канапа, на якой ён прапаноўваў начаваць хлопцам, якіх ягоны сябрук, камендант інтэрната, высяляў, а гомік ноччу лез да іх. Да Лоба, якога выселілі, бо Лоб тэлевізар сабраў і чэмпіянат свету па хакеі ўсіх нашых сяброў з Грушаўкі і Сельгаспасёлка глядзець паклікаў, а тыя так тупалі і крычалі, калі нашы канадцам шайбы забівалі, што ўнізе над вахцёрам люстра са столі зляцела, – камендант таксама палез. Лоб яму ў лоб… Ды яшчэ гантэлінай, якую намацаў за канапай. Камендант тыдні два ў шпіталі праляжаў, прыдумаўшы, што балванку ў такарным станку не заціснуў, і ўсё прасіў Лоба нікому не казаць нічога. Пра гэта Лоб нічога й не сказаў, але пайшоў да дырэктара: “Я сабраў тэлевізар! Першы зрабіў тое, што нас у тэхнікуме рабіць вучылі, а мяне за гэта…” – і камендант займеў вымову, а Лоб – свой ложак у пакоі са сваім тэлевізарам.

Камендант выйшаў са свайго кабінета з канапай, на якую Гурык кіўнуў:

– Сядай. Дзе вы ўсе сямёра костачкі на руках пазбівалі?

На гэта ў мяне быў адказ. Тры дні таму я разам з Конам, Грыцам і Балікам біўся ў парку Чалюскінцаў з грушаўскімі. Але Лоба, Ждана і Сатуша з намі не было.

– А Лоб, Ждан і Сатуш? – спытаў Гурык. Адкуль у іх баявая раны?

– Не ведаю. Лоб нібыта ў такарным цэху руку збіў… Балванку не закруціў.

Гурык падышоў да мяне, паклаў руку на плячо і абсадзіў, бо я стаяў, на канапу.

– Ты вось што, Князь… – Чаму ў цябе, дарэчы, мянушка такая?.. Ну ды гэта я так, з цікаўнасці… Ты мне балванку не закручвай. Я ведаю, хто Аджы зуб выбіў. Няўжо ты думаеш, што ніхто з вашых не прызнаўся? Але для цябе лепей, каб ты прызнаўся сам. І для Пашкова лепей, – дадаў ён з такой інтанацыяй, што, маўляў, табе вырашаць лёс тваіх сяброў, – і для Ланскага. Ты ж з імі сябруеш, у адным пакоі жывеш…

Падобнае я ўжо чуў і ад яго, і ад маёра Гагарына. “Для цябе ж лепей, калі прызнаешся…” І руку на плячо… Можа, не паслухаць Палкоўніка – і сапраўды прызнацца? Бо ўсё адно нехта скажа. Не Ждан, дык Сатуш. Не Сатуш, дык Ждан. Але чаму я павінен думаць, што яны прызнаюцца, калі мы ў ноч, якую начавалі ў Гарыка Клябанава, дамовіліся, як параіў Палкоўнік, маўчаць?

– Скажы, калі ведаеш, – адсунуўся я ад Гурыка. – Мне самому цікава.

Гурык не стаў да мяне падсоўвацца.

– Цікава, дык паслухай. Ты ў дзвюх кампаніях. У адной – са звычайнымі хлопцамі, тваімі равеснікамі, з якімі вучышся ў адным тэхнікуме. У другой – са старэйшымі за цябе людзьмі, сярод якіх адзін – асуджаны за антысавецкую дзейнасць, а трое – грамадзяне капіталістычных дзяржаў. Два канадцы і адзін амерыканец з ваенна-марскога флоту ЗША. Ты ведаеш, што Амерыка рыхтуецца да вайны супраць Кубы? Ты гэтага можаш не ведаць, але ведаюць гэта твае старэйшыя сябры. Ведаюць яны і тое, што Савецкі Саюз гатовы абараніць востраў свабоды ад агрэсіі, і ў гэтым яму і Кубе дамагае маладая афрыканская рэспубліка Гвінея. І ведаеш, што ворагі нашы прыдумалі? Каб Гвінея нам не дапамагала, вырашылі пасварыць яе з СССР. Як? А так: у СССР вучыцца пляменнік прэзідэнта Гвінеі. І амерыканскаму грамадзяніну, былому марскому пехацінцу, які жыве ў тым жа горадзе, у якім вучыцца пляменнік гвінейскага прэзідэнта, даецца заданне гэтую сітуацыю скарыстаць. І ён скарыстоўвае цябе, а ты скарыстоўваеш сваіх аднакурснікаў. З якімі працуеш на незарэгістраванай радыёстанцыі… – Гурык усё ж падсунуўся бліжэй. – Далей табе цікава, ці не? Ты пойдзеш пад суд за шпіянаж, за здраду Радзіме, на тваіх бацьку і маці будуць пальцам паказваць, калі я табе не дапамагу! А каб дапамог, кажы, як было!..

Гурык, падсунуўшыся, апошнія словы амаль выплёўваў мне ў твар і так горача дыхаў, сціскаючы мне, як і ў сутарэнні “амерыканкі”, плячо, што я не вытрываў:

– Ды ён Нэлу…

І асекся.

– Што “ён Нэлу”? Хто? – яшчэ мацней учапіўся ў мяне Гурык, і я падумаў, як тады, калі мяне дапытваў маёр Гагарын: “Госпадзі, дзіця я горкае, з кім боркацца ўздумаў!..” І ўжо хацеў выкласці ўсё, як яно было, бо гэта ўсё ж Гурык, а не хто-небудзь, і ён ведае, як я кахаў і раскахаў татарку Нэлу, бо закахаўся ў Асю, бо ён таксама Асю кахае і сам бы даў у лыч Аджы, калі б той Асю згвалціў, ці паспрабаваў бы згвалціць, ды я проста забіў бы Аджы за Асю, і Гурык мне дапамагаў бы забіваць, як зараз, можа быць, дапаможа выкруціцца… – і тут я згадаў тое, што казаў мне Гурык у сутарэнні турмы КДБ, як вучыў ісці ў жыцці па жывых і па мёртвых, успомніў, што ён Асінага бацьку да смерці давёў: “Дык з чаго раптам ён дапаможа мне выкруціцца?..”

Гурык трос мяне за плечы: “Што Нэлу?.. Хто Нэлу?.. Ну? Хто і што?..” Я маўчаў – і Гурык падняўся раптам: “Пакуль можаш ісці. Заўтра скончым”. Ён першы пачаў апранацца – і я зразумеў, куды ён спяшаецца…

Госпадзі, што ж цяпер будзе? Бацька Нэлы мне сказаў, калі мы з Нэлай раскахаліся: “Пачакай, усё выправіцца…” Дык як яно цяпер выправіцца, калі сораму не абярэшся?..

Гурык выйшаў з тэхнікума, я скочыў за ім і паспеў убачыць, што ў машыне, у якую ён сеў – маёр Гагарын.

Хуткія яны…

Што рабіць?

Я кінуўся да тэлефона-аўтамата каля інтэрната. Дзвюх капеек у мяне не было, але былі шайбачкі, якія мы выточвалі ў такарнай майстэрні: па вазе і памеры – манетка ў дзве капейчыны. Нэла ў гэты час, мусіць, была яшчэ на занятках, ці, можа, ехала дахаты ў першым тралейбусе – трубку падняла маці. Я ў двух словах сказаў ёй, што адбылося, яна ўсё зразумела – і кінула разам з трубкай: “Ну ты й засранец!..”

“Ну я й засранец… Ну я й засранец… Ну я й засранец…” – патрусіў я ўніз па вуліцы Падлеснай да Першай клінікі, да медычнай вучыльні, дзе Нэла па нейкай прычыне магла й затрымацца, яна часцяком затрымлівалася то ў хоры, то ў гуртку філатэлістаў, бо маркі збірала, але ніхто сёння не спяваў і маркамі не абменьваўся, ніякіх прычын, каб затрымацца, сёння ў Нэлы не знайшлося – у вучэльні ўвогуле не было нікога, апроч вахцёра.

– Нэла? – перапытаў ён. – Якая Нэла? Тая, што на сук села?..

Ён быў з адстаўных гэбістаў, яны пры ўсіх дзвярах ва ўсіх установах сядзяць, я іх нюхам распазнаю, і, можа, гэты пацук нічога

не меў на ўвазе, проста гэтак пажартаваў па-гэбісцку, але з мяне вырвалася: “Морда пацучыная!” – і пакуль ён, пузаты, падымаўся, крывёй наліваючыся, я грымнуў дзвярыма. Выскачыўшы, прайшоў па Падлеснай да Ленінскага праспекта, павярнуў назад, спыніўся, не ведаючы, куды і да каго ісці... Сеў на зледзянелыя прыступкі каля ўваходу ў Першую клініку і заплакаў.

Я прабалбатаўся... Насексоціў... І пра каго прабалбатаўся?.. На каго насексоціў?.. На каханую... Няхай мы раскахаліся, але яна ўсё адно каханая, бо я кахаю яе й цяпер, калі раскахаў...

Па вуліцы Падлеснай спяшаліся па сваіх праднавагодніх клопатах мінчукі. Мужчыны, жанкі... Старэйшыя і маладзейшыя... Хто з перавязанымі шпагатам елкамі, хто з упакаванымі, здабытымі ў праднавагоднім паляванні на ўсё, што можна здабыць на стол ці пад елку, падарункамі. Каля політэхнічнага інстытута прадавалі мандарыны – людзі душыліся ў чарзе. Ружовашчокая, як той мандарын, і апранутая, як снягурка, жанчына вырвалася з натоўпу, перайшла праспект і пабегла, каб хутчэй дахаты, каб мандарыны не памерзлі, па Падлеснай. Адзін мандарын выпаў з сеткі, якая матлялася ў яе руцэ, і пакаціўся мне пад ногі. Ён яшчэ каціўся – я ўжо загадаў: калі жанчына пакіне мне яго, Нэла даруе і зноў пакахае... Ружовашчокая спынілася, тузанулася йсці далей: хай сабе будзе хлопцу падарунак на Новы год! – але ў апошні момант неяк недаверліва зірнула на мяне і падабрала мандарын. На маім лобе, мусібыць, напісана, што я сексот, – а якія сексоту – нават на Новы год! – мандарыны?..

Сексот і засранец...

Засранец і сексот...

І яшчэ шпіён, здраднік... І яшчэ на маці і бацьку, за плячамі якога вайна, ордэн з медалямі на грудзях – будуць пальцамі паказваць...

І на Нэлу пальцамі паказваць будуць...

І ўсё праз мяне...

Як з гэтым жыць?

Жыць з гэтым ніяк нельга.

Падняўшыся, я рушыў на праспект. Сеў у першы тралейбус, даехаў да Круглай плошчы. Прайшоў на мост, пад якім яшчэ нядаўна, гэтым летам, але ўжо нібыта ў іншым жыцці мы плавалі на лодках і пілі шампанскае. Глянуў уніз – скрозь лёд на рацэ, толькі пры беразе наўскасяк ад дома, дзе жыве Амерыканец, цямнее і паблісквае святлом ужо запаленых ліхтароў палонка. Зірнуў на вокны кватэры Амерыканца – два цені на фіранках. Амерыканец і Марына. Па чарзе

нахіляюцца і выпростваюцца, як рэчы ў валізу складваюць. Збіраюцца, мусіць, у Амерыку. Што іх там чакае?..

Палонка схоплівалася па крайках лядком – я абламаў яго. “Што мяне тут чакае?..” І скочыў у палонку.

Ніколі не думаў, што так проста гэта зраблю. Пра самагубства – упершыню недзе ў 12–13 гадоў, калі ўбачыў і адчуў недасканаласць, агіднасць, несправядлівасць свету – думаў, але не так проста. Ці хопіць на гэта ў мяне волі, мужнасці, сілы? У тое, што з жыццём сваім самагубна развітваюцца толькі слабыя, бязвольныя людзі, не верыў. І вось я – слабы, бязвольны, засранец, сексот – і скок!..

Вада не ўцягнула мяне пад лёд, як я тое ўяўляў – яна была па пояс. Мяне апякло, сцяла пранізлівым, вострым холадам, я нават не паспрабаваў пад лёд паднырнуць, каб па-мужчынску давесці да канца справу. Здзіраючы пазногці, стаў караскацца, выбірацца на гранітныя прыступкі парапета, на бераг і, выбраўшыся, кінуўся бегчы, як тая жанчына, каб не памарозіць мандарыны, куды найбліжэй – да Амерыканца з Марынай. Прабягаючы пад аркай у двор, ледзьве не патрапіў пад колы машыны “хуткай дапамогі”, якая падляцела праз іншую арку да таго самага, што і я, пад’езда, выкліканая ў тую ж 24-ю, у якую бег я, кватэру, у якой цені Амерыканца і Марыны на фіранках нахіляліся не рэчы складваць, а рабіць масаж сэрца дзядзьку Марыны, які, дазнаўшыся, што яна з’язджае ў Амерыку, схапіўся за грудзі – і хуткая дапамога спазнілася. Я пераапранаўся ў сухое, якое даў Амерыканец, і мяне біла дрыготка, але не ад холаду, ад усведамлення: вось я мог ляжаць цяпер, як ляжыць дзядзька Марыны, і доктар “хуткай дапамогі” глядзеў бы то на Марыну, то на Амерыканца і разводзіў бы рукамі… І пранізвала думка: у той самы час, калі я спрабаваў развітацца з жыццём, нехта зусім побач з усіх сіл за яго чапляўся! Я, абдзіраючы пазногці, зачапіўся, а ён – не.

– Начуй у нас, – прапанавала Марына, калі прыйшлі і пайшлі два міліцыянты, сказаўшы, што ім для таго, каб напісаць даведку пра смерць, ну, што дзядзька сам памёр, патрэбнае заключэнне паталагаанатама. “Бо ці мала што…”, – паглядзеў няветліва адзін з іх на Амерыканца. Марына дамовілася з доктарам “хуткай дапамогі”, медсястра з доктарам заўсёды дамовяцца – і дзядзьку забралі ў морг.

Паклаўшыся на раскладушку на тым самым месцы каля акна, на якім толькі што ляжаў на падлозе дзядзька Марыны, я не спаў. Думаў: ну вось, я мог цяпер не спрабаваць заснуць… не спаць… не быць… як яно было б? Думаў бы я пра гэта?.. Не, мусіць, пра гэта не думаў бы, бо мяне тут не было б, дзе зараз не сплю. А ці думаў бы я

там пра тое, што тут памёр? Што адбылося б, калі б вада ўцягнула мяне пад лёд? Як яно ўвогуле адбываецца, што яна такое – смерць? Нешта падобнае на тое, што цяпер у маёй галаве, ці проста заключэнне паталагаанатама?

Вось не стала, няма дзядзькі Марыны. І што? Марына дамовілася з доктарам, выправіла дзядзьку ў морг, трохі паплакала, пакуль па лесвіцы з двара ў дом падымалася, і спіць з Амерыканцам. Амерыканцу ўвогуле: хто і што гэты дзядзька? А дзядзьку што? Кепска яму? Як яму можа быць кепска? Ніяк. Дык ці так ужо добра, што я не пад лёдам? Калі заўтра Ждан ці Сатуш скажуць, што гэта я выбіў Аджы зуб – і мяне выганяць… І маці прыедзе, кленчыць перад дырэктарам пойдзе… Ці яшчэ горш: Гурык з маёрам Гагарыным давядуць, што я здраднік нашай савецкай Радзімы, што я з канадцамі і амерыканцам, былым марскім пехацінцам… – і тут я падхапіўся на раскладушцы: дык я ж у яго дома! А за домам сочаць! І заўтра Гурык ці маёр Гагарын спытаюць: “А што ты рабіў у доме ворага ўсю ноч? Спаў на раскладушцы? Так савецкая Радзіма табе й паверыла, што спаў!..”

Мае транты, якія Марына павесіла на батарэю, былі яшчэ мокрыя, але ж не ісці заўтра ў тэхнікум, акупаваны старшымі лейтэнантамі з маёрамі, у адзежы ворага! Я нацягнуў сваю, улез у набраклыя чаравікі, пакінуўшы на нагах сухія амерыканскія шкарпэткі, апрануў куртку, шапку, асцярожна прабраўся ў прыхожую, паціху адчыніў і зачыніў дзверы – і болей не бачыў ніколі ні Аліка, ні Марыны, якая сказала мне, калі Амерыканцу далі дазвол на вяртанне ў ягоную Амерыку: “Страшна ехаць. Нібы нешта там здарыцца страшнае. Не са мной страшнае – з усімі”.

“Страшнае з усімі… страшнае з усімі… страшнае з усімі…” – грукала ўва мне, калі я з усіх ног, каб не абмарозіцца, зноў бег туды, куды і да каго найбліжэй: на Старажоўскую да Палкоўніка. Каля штаба Беларускай ваеннай акругі спыніўся, як укопаны: ад каго і куды бягу? Ад шпіёна, марскога амерыканскага пехацінца – да антысаветчыка? “Самае страшнае з усімі – гэта вайна! – прыпусціў я ад Беларускай ваеннай акругі да Дома афіцэраў, цераз сквер ад якога жыў Гарык Клябанаў. – А чаму вайна?.. А таму што я выбіў зуб Аджы, які пляменнік прэзідэнта Гвінеі, якая цяпер не стане дапамагаць Савецкаму Саюзу, а Савецкі Саюз не здолее дапамагчы Кубе, на якую нападуць амерыканцы, скінуць на яе, як на Хірасіму, атамную бомбу, з чаго самае срашнае і пачнецца. Гарык прачнецца, а Мінска ўжо няма…” – пагрукаў я, прабегшы цераз сквер, у акно на першым паверсе дома, дзе жыў Гарык, які звычайна спаў на тапчане ў

калідоры і які спытаў, успораты сярод ночы: “Што? Вайна?..” А калі мы селі на падлогу каля батарэі ў кухні, ён сказаў, што прыходзіў Гурык і пытаў, ці праўда, што Аджа… ну, зрабіў тое, што зрабіў, з Нэлай? “Я адказаў, што нічога не ведаю, – наліў ён вялізны кубак гарачай, якая рукі апякала, гарбаты. – Ці я павінен быў нешта іншае сказаць? І скуль Гурык пра тое ведае?..”

Я расказаў, скуль… Гарык Клябанаў быў паэтам і не стаў казаць, што я сексот і засранец, ён увогуле ніколі не абражаў нікога, толькі паківаў галавой: “Та-а-к… І як цяпер Нэла?..”

Да раніцы сядзець са мной ён не захацеў, хоць звычайна сядзеў – лёг на свой тапчан і заснуў. Сам, маўляў, думай, як цяпер Нэла – і хто цяпер ты…

Раніцай Гарык не пускаў мяне нікуды: “Ды ў цябе жар! – І ўступаў свой тапчан. – Табе ляжаць трэба!”

Ад ягонага дома на вуліцы Леніна да вуліцы Савецкай, дзе жыла татарка Нэла, я йшоў ці не гадзіну – гэтак мяне хістала. Дахістаўся якраз у час: Нэла з пад’езда выходзіла. Убачыла мяне – і павярнула ў бок вакзала да прыпынку першага тралейбуса. Я за ёй не паспяваў, але ў тралейбус паспеў усунуцца. Сеў за ёй – што сказаць? Нэла, прабач?.. Пакуль муліўся, падбіраў словы, тралейбус праехаў мост цераз раку Свіслач, у якой я ўчора вечарам спрабаваў развітацца з жыццём. Можа, сказаць ёй пра гэта? Як яно будзе гучаць?.. “Нэла, я так цябе кахаю, што ўчора загадаў… не… што калі ты развітаешся са мной, развітаюся з жыццём…” Яна ж рассмяецца… Ну й няхай сабе – абы не маўчала, нібы мяне на свеце няма. “Нэла…” – пачаў я, не пазнаўшы свайго голасу, такога, нібы ён зусім не мой і наогул не чалавечы, і тут тралейбус спыніўся на Круглай плошчы.

“Жы-шу-шых!..” – расчыніліся дзверы – і ў іх лёгка, як парушынка, выскачыла Нэла.

Нават не развіталася.

Нават кандуктарка здзівілася.

Нават бабулі ёй услед зірнулі.

Больш ніхто з тралейбуса не выйшаў, ніхто не ўвайшоў – і дзверы зачыніліся: “Шых-жы-шу!..”

Мне ўспомніўся сіні каптурык у гэтым жа першым тралейбусе, толькі не зімовым, а вясновым, у якім пахла пралескамі – і я не паспрабаваў выскачыць у дзверы, пакуль яны зачыняліся. Раптам зразумеў, што Нэлу, як і сіні каптурык, не даганю ўжо ніколі. І ніколі Нэла зноў не пакахае мяне, калі нават я знайду на Падлеснай тую ружовашчокую снягурку – і яна сыпане мне пад ногі ўсе, якія не закруціла яшчэ ў срэбныя фанцікі і не павесіла на елку, мандарыны.

Каля ўваходу ў тэхнікум мяне чакаў Лоб: “Табе да дырэктара”. “Чаго?” “Скуль мне ведаць? Я стараста, мне сказалі табе сказаць. Змерз, чакаючы. Да дырэктара – і ўсё”.

– Заходзь, – сам выйшаў у прыёмную дырэктар, як толькі сакратарка прыадчыніла дзверы ў кабінет. – І ў кабінеце спытаў, калі я прытуліўся да кніжнай шафы, каб не хістацца. – Ты чаму не сказаў мне пра Нэлу?..

Адкуль ён ведае? Нехта з нашых сказаў? Ці Гурык? Або маёр Гагарын?

Мусіць, Гурык ці маёр… А калі нехта з нашых, дык хто?

Я хацеў адказаць: “Вы не пыталіся…” – але не знайшоў у сабе голаса. У кабінеце дырэктара Тумаса чамусьці паўтаралася ўсё тое, што было ў кабінеце маёра Гагарына. З графінам з саланаватай вадой, з голасам…

Дырэктар вырашыў не чакаць, пакуль голас да мяне вернецца. Падышоў бліжэй – я прыкінуў, як лепей за шафу ўпасці, калі ў пашчэнкі ўрэжа. А ён сказаў: “Вось што, Валодзя. Не вінаватых Пашкова з Ланскім выгнаць я не дам. Але больш не магу нічога. Глядзі сам, хлопчык, што табе па сіле. – І крануў даланёй мой лоб. – Ты хворы?..

Які я хворы! Як з такім дырэктарам можна захварэць! З такім дырэктарам мне пляваць і на Чапаева, і на маёра Гагарына, не кажучы ўжо пра Гурыка!

– Не, Павел Федаравіч, – сам сябе знайшоў ува мне мой голас. – Я не хворы, проста не спаў усю ноч.

Дырэктар пацёр пераноссе, вочы.

– І я не спаў… Ды яго судзіць трэба! – ускінуў ён руку і ўскудлаціў валасы. – Я ўсім гэтым партупеям так і сказаў. Гэта ж жах! А што будзе, калі гэта па Мінску пойдзе? Уяўляеш?.. Таму не аддадуць пад суд, хоць маёр моцна раззлаваўся. З характарам… Ён праўда біў Лоба?

– Ды не… Даў раз у зубы.

– Даў раз у зубы… Якое мае права?..

З апошняга пытання вынікала, што даць раз у зубы студэнту электратэхнікама сувязі мае права толькі дырэктар электратэхнікума сувязі, што абсалютна правільна – і я сказаў для сябе самога нечакана:

– Трэба было, каб вы самі Аджы ў лыч далі. Вы дырэктар – вам і не было б нічога.

Дырэктар хакнуў, як Палкоўнік звычайна хакаў, калі лічыў, што нехта дазваляе сабе болей, чым мае на тое права, і выштурхаў мяне,

хворага, у дзверы, у якія недзе праз месяц, пасля зімовых канікулаў, выштурхалі й здаровага яго… Нэла заяву ў міліцыю не напісала, Аджы ўставілі новы зуб і перавялі з тэхнікума электрасувязі ў радыётэхнічны інстытут, удвая падвысілі стыпендыю, але дзядзька ягоны сябраваць з Хрушчовым усё адно не прыехаў, Савецкі Саюз пад ціскам амерыканцаў быў змушаны забраць з Кубы свае ракеты, праз якія ледзь не пачалася трэцяя сусветная вайна – і ва ўсім гэтым удзельнічала група ТР Мінскага электратэхнікума сувязі, дырэктара якога не выштурхаць з кабінета за ўсё гэта ну ніяк не маглі… Ды яшчэ маёр Гагарын раптам прыйшоў на выпускную вечарыну, пачаў шукаць дырэктара, а той б'ецца ў падвале з выпускнікамі. Дык хіба дзіва, што з такім дырэктарам студэнты зубы адзін аднаму выбіваюць?..

Калі Павел Федаравіч Тумас памёр, група ТР зайшла ў цір радыёзавода, узяла там усе, якія былі, вінтоўкі – і тройчы адсалютавала свайму дырэктару.

– Давайце за Паўла Фёдаравіча! – ужо не зважаючы на тое, што ў спартовай зале трэба спортам займацца, а не піць, кажа Лоб. – Я вось цяпер таксама дырэктар. Але я дырэктар не такі.

Лоб – дырэктар таго самага радыёзавода, на якім некалі кралі мы дэталі. Але сапраўды ён дырэктар не такі.

Усе па чарзе вып'юць, і расійскі алігарх Сатуш, які выпівае апошні, кажа:

– Мы ўсе не такія… – І пытае, як кожны раз пры нашых сустрэчах праз кожныя пяць гадоў. – Дык хто Князя здаў? Хто прызнаўся, калі дамаўляліся не прызнавацца, крок наперад руш!..

Ён не скамандаваў, забыўся, бо не стараста, каб мы сталі ў шэраг – і мы становімся ў шэраг самі. Як рабілі гэта пяць, дзесяць і дваццаць гадоў таму. Сатуш глядзіць па чарзе на Лоба, Баліка, Ханеню, Жука, Ігана, Івашку, Сцепаненку, Стукача, Кашыца, на шэраг, які раз ад разу карацее і карацее, а яны глядзяць на мяне… І я ступіў бы крок наперад, але пра што тады праз наступныя пяць гадоў пытацца расійскаму алігарху Сатушу, калі ўсе ведаюць, хто павінен крок наперад ступіць – і гэта ў нас такая гульня.

Навінкі, вар'ятня

– Ці хацеў я забіць Хрушчова?.. Хацеў! І Падгорнага забіць хацеў, і Мікаяна, і Брэжнева, і Суслава, і Шверніка, і Касыгіна, і Палянскага, і Воранава, і Казлова, і Ота Вільгельмавіча Куусінена з Нурытдзінам Акрамавічам Мухітдзінавым!..

Віл крычаў гэта ў нашай "курылцы" пад лесвіцай – у бібліятэцы. У ленінцы гразіў забіць самых верных ленінцаў з Прэзідыума ЦК КПСС...

Пасля "замаху" на жыццё Хрушчова нас каго праз дзень, каго праз тыдзень выпусцілі з турмы КДБ, але штодня цягалі на допыты. Праз допыты ў Віла пасыпаліся клёпкі.

Збоку ад лесвіцы ў бібліятэцы ўздымалася сцяна, з якой дзенідзе паападала тынкоўка, і Віл палез па сцяне, чапляючыся за шчыліны і выбоіны. Са сцяны й крычаў: "...і Ота Вільгельмавіча Куусінена з Нурытдзінам Акрамавічам Мухітдзінавым!.." – як толькі такое запомніў? Падняўся да трэцяга паверху – і зрынуўся. Нехта б забіўся, а ён нават палец не зламаў.

– Убогіх ды слесараў Бог беражэ, – сказаў Палкоўнік. Маючы на ўвазе, што Віл – убогі, а Біг – слесар.

Палкоўнік прарочыў Бігу: "Цябе адусюль папруць і ты скончыш жыццё на заводзе цеплавых агрэгатаў". І ўгадаў. Біга, які ведаў ці не ўсе мовы свету, выгналі з інстытута замежных моў – і ён зарабляў на хлеб слесарам. Кнігу напісаў: "Я – слесар!" Яе адразу ж выдала прафсаюзнае выдавецтва, Біг атрымаў ганарар ды яшчэ прэмію, за якую ўсе мы паехалі ў Крым і амаль месяц пілі навасвецкае шампанскае.

Праз тое, што ў Віла пасыпаліся клёпкі, ён зблізіўся з Бігам, які, ведаючы сто моваў свету ўключна з іўрытам, проста не мог быць нармальным. У яго нават меўся свой лекар – і Біг угаварыў Віла таму лекару паказацца.

– Мне сніцца, – казаў Віл, калі лекар спытаў, на што ён жаліцца, – адзін і той жа сон. З ночы ў ноч. Нібыта ў нейкім горадзе, дзе я невядома як апынуўся і не ведаю, што гэта за горад, атамны выбух. І ўздымаецца, вырастае над горадам ядзерны грыб. Я разумею, што зараз павінны палыхнуць агонь і ўдарыць выбуховая хваля, а яе ўсё няма. Грыб вісіць, я чакаю – няма хвалі! Я мярцвею, мяне халодны пот прабівае: куды яна падзелася?.. Так не можа быць, гэта супраць законаў фізікі!

– Але не супраць законаў псіхіятрыі, – расцягваў Вілу павекі і зазіраў у вочы лекар, які, сябруючы з бацькамі Біга, лекаваў іх сына і згадзіўся падлячыць Віла. А заадно й мяне, бо ў мяне бяссонніца – і круціцца ў галаве адно і тое:

Самалёт ляціць
Над усёй бальніцай.

Болей нічога ў галаве не круціцца.

Гэты лекар, які ўвесь круглы, таму ўсе Круглым яго й называюць, увогуле дзіўны. Яго б самога, як Воран кажа, лячыць. Вось ён сказаў Бігу пра законы псіхіятрыі – і тут жа дадаў, што ніякіх законаў у псіхіятрыі няма. Як у сне – хвалі ад выбуху. “Увогуле, – ён кажа, – няма нідзе і нічога”.

У Круглага рэпутацыя аднаго з лепшых псіхіятраў, ён друкуецца ў замежных спецыялізаваных выданнях, яго куды толькі ні запрашалі і што толькі яму ні прапаноўвалі, а ён працуе санітарам у вар’ятні ў Навінках, куды ўладкаваўся, каб капейчыну падрабіць, яшчэ тады, калі быў студэнтам. Цяпер ён, зразумела, лекар, але ў штатным раскладзе вар’ятні, як і ў студэнцкія гады, запісаны санітарам – і не жадае перапісвацца ў лекара. “Як я, – пытае, – магу быць лекарам, калі не ведаю, што я лякую?..”

Гарык Клябанаў казаў, што Круглы працуе не толькі ў вар’ятні, але і ў КДБ. Кансультантам. Выяўляе сімулянтаў, якія падрабляюцца пад псіхаў. Працу такую прапанавалі яму як ганаровую – і адмовіцца ад такой ганаровай працы ён не мог.

Яшчэ Гарык казаў, што якраз круглы лекар паставіў Палкоўніку, які на камсамольскім сходзе назваў Сталіна людажэрам, дыягназ: шызафрэнія. І Палкоўніка не расстралялі.

Віл з Бігам не баяліся, што іх расстраляюць. Псіхі расстрэлу не баяцца. А вось, што пасадзяць, баяліся. Нават перакананыя былі, што пасадзяць, і заклаліся на “амерыканку”, каго пасадзяць першага. Віл заклаўся, што першым пасадзяць Біга, Біг – што Віла. Хто прайграе, той, як дамовіліся яны ў закладзе на “амерыканку”, галяком прабягае па “брадвэі” паўз будыніну КДБ ад вуліцы Камсамольскай да вуліцы Валадарскага.

Першым пасадзілі Эдзіка Гарачага. Біг з Вілам абодва прайгралі і вырашылі галяком не бегаць, але Палкоўнік, якога тады яшчэ не пасадзілі, сказаў, што гэта няправільна. Калі абодва прайгралі – абодва павінны бегчы. Іначай парушаецца прынцып гульні ў “амерыканку”, а прынцыпы парушаць нельга. З Палкоўнікам не паспрачаешся – і Віл з Бігам пабеглі на пару, павязаўшы на грудзі, як

лёгкаатлеты, папяровыя нумары: 3012 і 3623. З парадных дзвярэй КДБ, у якія, здавалася, ніхто ніколі не ўваходзіў і з якіх ніхто не выходзіў, гэтым разам выйшлі два гэбісты і няўцямна праводзілі позіркамі двух голых лёгкаатлетаў, якія на рагу вуліцы Валадарскага і праспекта Леніна ўскочылі ў таксі. З таксістам загадзя было пра ўсё дамоўлена – і ён рвануў да Нямігі.

Круглы доктар, вярнуўшыся з КДБ пасля сваіх кансультацый, сказаў бацькам Біга, што калі іх сына арыштуюць, дык не за тое, што голы па горадзе бегае. Як і Віла не за тое пасадзяць. Справу антысавецкай групоўкі запатрабавалі ў Маскву. Значыць, рыхтуюць нешта сур'ёзнае. Так што трэба думаць, як выкручвацца. Недзе хавацца. А як выкручвацца? Дзе хавацца? І доктар, які кансультаваў КДБ адносна сімулянтаў, прапанаваў: у Навінках. У бальніцы для такіх псіхаў, як Біг з Вілам, якія голымі па вуліцах бегаюць. Нічога лепшага яны, калі б і хацелі, не прыдумалі б...

Паколькі я таксама баяўся, што мяне пасадзяць, і ў маёй галаве круціўся самалёт над усёй бальніцай, я разам з Вілам і Бігам прыйшоў да круглага доктара на прыём, і ён Бігу, Вілу і мне паставіў дыягназ: дэлірыёзны сіндром. Адзін на трох. "Пілі, – спытаў, – партвейн? Вось і дапіліся". І сказаў, каб заўтра прыехалі ў бальніцу. Я не хацеў, у мяне клёпкі не сыпаліся, а Круглы прапанаваў: "Тады едзь на Калыму".

Я ўспомніў, якім з Калымы вярнуўся Эдзі Рознэр, і назаўтра разам з Бігам і Вілам быў у вар'ятні.

Круглы паклаў нас у палату да сапраўдных псіхаў. "Каб усё, – сказаў, – можна было пацвердзіць дакументальна".

У палаце было дзесяць хворых на галаву – з намі стала трынаццаць. Віл пералічыў: "Чортаў тузін. Нічога добрага нас тут не чакае".

А калі б не чортаў тузін, дык што ў вар'ятні магло чакаць добрага? З якога боку?..

Мой сусед злева чакаў таракана. Да яго ўжо прыходзіў таракан, сказаў, што прынясе пельмені. І не прынёс. Сусед чакаў і ўдзень, і ўночы, бо пры дэлірыёзе – бяссонне.

Віл, каб майму суседу весялей было чакаць, гуляў з ім у дурня на шчаўбаны. Казаў, калі выйграваў: "Я шчаўбаню – ты прайграў". Калі прайграваў, казаў: "Ты выйграў – я шчаўбаню". І мой сусед падстаўляў лоб – ніводнага разу не запярэчыў. "Не таму, што дурны, – казаў Віл. – А таму, што логіка".

На ложку справа ад мяне ляжаў чалавек, які з дня ў дзень чытаў адну і тую кнігу, назву якой я не мог разгледзець, бо кніга была ў абгортцы. Час ад часу ён усклікваў: "Як сказана! Ах, як сказана! На

вякі!..” – і мне карцела дазнацца: што ж там за кніга такая вечная?

– Абсалютная ісціна!.. – ускочыў аднойчы, неяк асабліва ўзбудзіўшыся, чытач вечнай кнігі. – Вы паслухайце!.. “Ці мысліць чалавек пры дапамозе мозга?” Пытанне? Яшчэ якое! І паслухайце, як яно развіваецца!.. “Адчуванне ёсць суб’ектыўны вобраз аб’ектыўнага свету. Прызнаваць аб’ектыўную, гэта значыць такую, якая не залежыць ад чалавека і чалавецтва ісціну, азначае так ці інакш прызнаць ісціну абсалютную”. Вы прызнаеце абсалютную ісціну?..

Я не ведаў, ці прызнаю я абсалютную ісціну, але на ўсялякі выпадак кіўнуў…

– І тым самым сцвярджаеце яе! – абсалютна задаволіўся маім кіўком мой сусед. – Бо, як сказана, “абсалютная ісціна складваецца з сумы адносных ісцін!” Ідзём далей! Глядзіце, якая логіка! Якая няўмольнасць!.. “Рух матэрыі не можа адбывацца інакш, як у часе і прасторы. З гэтага вынікае, што той, хто прызнае існаванне аб’ектыўнай рэальнасці, нашай з вамі, – сусед паказаў на сябе і на мяне, – абсалютнай ісціны, непазбежна павінен прызнаваць таксама аб’ектыўную рэальнасць часу і прасторы!” Вы прызнаеце аб’ектыўную рэальнасць часу і прасторы?..

Ён быў утрая старэйшы за мяне, але звяртаўся да мяне на вы, да таго ж, падобна было, лічыў, што я гэткі ж разумны, як ён, таму аб’ектыўную рэальнасць часу і прасторы я прызнаў без ваганняў.

– Дык вось, – усклікнуў сусед так, нібы, каб мы з ім гэтага не прызналі, часу і прасторы не было б, – цяпер галоўнае. Усё гэта адносіцца як да рэальнасці ў рэальнасці, так і да рэальнасці ў нашай свядомасці. “Свядомасць існуе рэальна; яна не ёсць нешта, што не ўласцівае прыродзе, а гэткі самы натуральны яе прадукт, як і тыя матэрыяльныя аб’екты, якія надзеленыя свядомасцю, як уласцівай ім унутранай якасцю. Таму супрацьпастаўленне матэрыі і свядомасці адноснае і мае безумоўнае значэнне толькі ў вышэйназваных межах. За гэтымі межамі аперыраваць з супрацьпастаўленнямі матэрыі і духу, фізічнага і псіхічнага, як з абсалютным супрацьпастаўленнем, было б велізарнай памылкай”. Рузумееце? А доктар аперыруе! Ён проста рэжа мяне без нажа!..

Сусед сеў на ложку ў позе лотаса, прыціснуў кнігу да грудзей:

– Ну, як вам?..

Я не ведаў, што сказаць, і сказаў: “На вякі…”

– Так! – адкінуў кнігу і накінуўся з абдымкамі сусед. – На вякі! І ўсе правы навечна пераходзяць да мяне, жывы застаўся толькі пляменнік, але ён у Мюнхене, параноік і хутка памрэ. Разумееце?..

Я не стаў удакладняць, хто гэты параноік, які ў Мюнхене хутка

пампрэ.

– Чаму да вас?

– Бо мая маці, перш чым стаць жонкай Гітлера, была жонкай Леніна. І захавала права спадчыны на ўсё, што напісаў Гітлер, як новая жонка, і на ўсё, што напісаў Ленін, як жонка старая. Ну, былая. Разумееце?..

Аказалася: мой сусед справа – сын Надзеі Канстанцінаўны Крупскай і Адольфа Гітлера, за якога Крупская выйшла замуж, калі Ленін памёр. Болей у Гітлера дзяцей няма. І ў Леніна няма, але жывы пакуль сын ягонага старэйшага брата. Вось той сын у Мюнхене пампрэ – і мой сусед застанецца адзіным праваўладальнікам спадчыны Гітлера і Леніна. З правам на ганарар ад выдання ўсіх іх кніг. “Вы не ўяўляеце, якія гэта грошы! – Ён паказаў на абшарпаныя, з аблупленай фарбай сцены палаты. – Хопіць на новую бальніцу для ўсяго Мінска! Для БССР і ўсяго СССР! І яшчэ на самалёт…”

Самалёт ляціць

Над усёй бальніцай.

І нічога болей.

З маімі суседзямі праблем не было. Адзін ціха чакаў таракана, які прынясе пельмені, другі чытаў сабе і чытаў “Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм”, чакаючы, пакуль пляменнік Леніна ў Мюнхіне пампрэ. А вось с суседзямі Віла былі праблемы. Асабліва з адным.

Суседам Віла быў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў. Першы сакратар ЦК КПСС, праз якога мы й апынуліся ў псіхушцы. Днём ён ставаў за тумбачку, што імітавала трыбуну, і чытаў лекцыі па міжнароднай сітуацыі, якая з кожнай лекцыяй усё ўскладнялася, а начамі ўскокваў і патрабаваў неадкладна склікаць Прэзідыум ЦК КПСС. Штоночы яго вязалі санітары Цмок з Цыклопам, а ён штоночы ўскокваў, крычаў, патрабаваў…

– Ды дайце вы яму правесці прэзідыум! – праз тыдзень не вытраваў Віл. – Дастаў!

– Дадзім, – згадзіўся Круглы. – Калі вы згодныя ўвайсці ў ягоны склад.

Ні Віл, ні Біг, ні я Круглага не зразумелі.

– У склад чаго?

– Прэзідыума ЦК КПСС. Швернікам, Касыгіным і Казловым. Хрушчоў, Падгорны, Брэжнеў, Мікаян, Палянскі, Суслаў і астатнія ў нас ёсць.

Палкоўнік праўду казаў: гэтага лекара самога лячыць трэба.

– А Ота Вільгельмавіч Куусінен з Нурытдзінам Акрамавічам Мухітдзінавым, – спытаў Віл, бо толькі ён мог гэта выгаварыць, – ёсць

таксама?

– Ёсць, – паказаў Круглы ў кут палаты, дзе ляжаў такі сухенькі, нібы ён муміфікаваны, дзядок. – І што цікава: адзін за двух. Куусінен-Мухітдзінаў. Не верыце? Спытайце яго самога.

Віл не паленаваўся, падышоў да дзядка:

– Скажыце: вы хто?

– Куусінен-Мухітдзінаў.

Віл сказаў вінавата: “Выбачайце, не пазнаў”. І падаў руку:

– Швернік.

Біг згадзіўся быць Касыгіным, а ў мяне ўжо не было выбару: толькі Казлоў. Я да гэтай пары не ведаю, чым ён, той Казлоў, у тым прэзідыуме ЦК КПСС займаўся. Можа, і нічым, проста быў у прэзідыуме. Як мы ў вар’ятні.

Калі наведаць нас прыйшлі Палкоўнік з Асяй і Воранам, і мы сказалі ім, хто мы цяпер ёсць, і што ў вар’ятні рыхтуецца паседжанне Прэзідыума ЦК КПСС, яны таксама захацелі на тым паседжанні быць. Паколькі вакантнымі заставаліся толькі месцы кандыдатаў у склад Прэзідыума, Круглы прапанаваў Палкоўніку стаць Рашыдавым, а Ворану – Шчарбіцкім. Асі ён сказаў, што яна, калі хоча, можа быць Мжаванадзэ, бо мужчына гэта ці жанчына – па прозвішчы не распазнаць.

Ася згадзілася, а Воран раптам заўпарціўся, захацеў стаць не першым сакратаром ЦК кампартыі Украіны Шчарбіцкім, а першым сакратаром ЦК кампартыі Беларусі Мазуравым. Каб уратаваць Нямігу. Круглы не стаў пярэчыць. “Ставай. Ратуй. Ты Мазураў”.

Хрушчоў склікаў Прэзідыум у той жа дзень: “Нарэшце, таварышы, у нас кворум!..”

Апроч сяброў Прэзідыума і кандыдатаў у яго, быў запрошаны, як сакратар, доктар Круглы, а таксама, па прапанове сакратара, таварышы Цмок і Цыклоп – прадстаўнікі братняй румынскай і братняй албанскай камуністычных партый. Узнікла пытанне з сынам Крупскай і Гітлера, які, як сын Крупскай, а значыць, не чужы чалавек Леніну, на Прэзідыуме прысутнічаць нібыта мог, а як сын Гітлера – ні ў якім разе. На гэта сын Гітлера сказаў, што ён, можа быць, і не сын Гітлера, а сын Леніна, тут ёсць няпэўнасць, а вось тое, што ён сын Крупскай – гэта пэўна, і пэўнасць у такім выпадку няпэўнасць пераважае. Пачаліся спрэчкі, якія спыніў Хрушчоў, сказаўшы, што сын Гітлера ці Леніна выступае фундатарам пабудовы новай бальніцы, так што не мае значэння, чый ён сын – няхай сабе і Гітлера. Тым больш, што ягоная маці – Крупская.

– Дарэчы, пра жанчын, – працягнуў Хрушчоў, палічыўшы

папярэдняе пытанне вырашаным. – Пераважная большасць насельніцтва СССР – жанчыны, а яны не прадстаўленыя ў Прэзідыуме ЦК КПСС належным чынам. Гэта наша недапрацоўка, таварышы. Палітычная памылка. Трэба яе выпраўляць. Я прапаную, каб у склад Прэзідыума ўвайшла таварыш Мжаванадзэ. Хто – за?

Паглядзеўшы на Асю, паднялі рукі ўсе, апроч сухенькага дзядка ў куце палаты: Куусінена-Мухітдзінава.

– Аднагалосна, – з уласцівым яму валюнтарызмам пастанавіў Хрушчоў, але Куусінен-Мухітдзінаў не згадзіўся:

– Я супраць. Таварыша Мжаванадзэ я ведаю, ён першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі, а не жанчына.

– Тым больш, – сказаў Хрушчоў. – Пераходзім да міжнароднай сітуацыі. – Слова прадастаўляецца мне. І вось што я вам скажу: пры Сталіне Савецкаму Саюзу не ўдаўся ваенны прарыў у Лацінскую Амерыку, а пры мне ўдаўся! І мы не павінны выводзіць з Кубы нашы ракеты! Калі ўжо мы іх туды ўвялі, няхай яны там стаяць! Гэта правільна! А ўвесці і вывесці – няправільна! Тут і галасаваць няма чаго, таму пераходзім…

– Як гэта няма чаго?.. – падняў руку Палкоўнік, і Круглы, які вёў пратакол, сказаў:

– Таварыш Рашыдаў супраць.

Палкоўнік падышоў да тумбачкі, за якой стаяў Хрушчоў. Я здзівіўся – і ўсе нашы, як і я, здзівіліся: чаго раптам ён у гэта ўлез?

– Так, я супраць. Нашы ракеты на Кубе – гэта вайна. Ваенны патэнцыял СССР значна саступае ваеннаму патэнцыялу ЗША. У выпадку вайны не толькі ад Кубы нічога не застанецца – нас таксама не стане. Таму…

– Таму, – перапыніў яго Хрушчоў, – я прапаную вывесці таварыша Рашыдава са складу Прэзідыума ЦК КПСС за дыскрэдытацыю палітыкі партыі і савецкіх узброеных сіл. Пайшо-о-ў во-о-н! – зняўшы тапак, ляснуў ён па тумбачцы.

Гэты “Хрушчоў” здорава ўжыўся ў ролю сапраўднага Хрушчова… Да яго, раз’юшанага, падскочылі прадстаўнікі румынскай і албанскай кампартый, паглядзелі на Круглага, але той пакруціў галавой: “Не чапаць…” – і Цмок з Цыклопам узялі пад рукі і адвялі ўбок Палкоўніка.

– Прапаную прысвоіць нашым румынскім і албанскім таварышам званне Герой Савецкага Саюза, – нацягваючы тапак і падскокваючы на адной назе доўжыў Хрушчоў, – і перайсці да пытання будаўніцтва бальніцы. Без яе немагчымая пабудова камунізму. У камунізме неабходна: а) нешта есці; б) недзе жыць; в) неяк лекавацца.

Усе гэтыя праблемы комплексна вырашае бальніца. Мы ў ёй: а) ядзім; б) жывём; в) лякуемся. Але бальніца старая, цесная. Нам трэба вырашыць, на колькі месцаў будаваць новую? Інакш кажучы: колькі савецкіх людзей мы прапускаем у камунізм? Слова мае таварыш Крупскі.

– Грамадства ёсць адасобленая частка прыроды, – з кнігай у руках падышоў да тумбачкі сын Крупскай і Гітлера. – У гэтай адасобленай частцы ёсць яшчэ свае адасобленыя часткі. Таму таварыш Ленін убачыў магчымасць пабудовы сацыялізму ў адной, асобна ўзятай краіне. А таварыш Хрушчоў – камунізму ў асобнай бальніцы. Прыблізна на 250 мільёнаў чалавек. Я падлічыў… – ён дастаў з кнігі паперчыну. – Пры норме 6 квадратных метраў на чалавека плошча бальніцы камунізма – 1 мільярд 500 мільёнаў квадратных метраў. Гэта 1 % зямной сушы. Прыблізна.

– Не так і многа, – сказаў вечна задыханы, бо ўсё некуды бегаў і нешта шукаў чарнявы мужык. – Мінск у колькі разоў большы?

– Мінск значна меншы, – неяк вінавата сказаў сын Гітлера і Крупскай, – і чарнявы няўцямна паглядзеў на яго і павярнуўся да ўсіх:

– Як гэта?.. Як мы ў меншым збудуем большае?..

Усе, апроч Хрушчова, задумаліся.

– Ты служыў, Лёня, – спытаў ён чарнявага, – у дэсантных войсках?.. Нідзе ты не служыў, толькі ў камсамоле. Але парашут бачыў? Ён жа большы за валізу, у якую яго запіхваюць! – Хрушчоў выйшаў з-за тумбачкі. – Мы выйдзем за Мінск. За БССР! За Савецкі Саюз выйдзем! Да нас ужо практычна далучыліся Балгарыя і Манголія! Камунізм пераможа ва ўсім свеце, таварыш Брэжнеў! Ці ты ў гэта не верыш?.. Хто яшчэ не верыць?

Чарнявы абмяк: “Веру, Мікіта Сяргеевіч…” – а Палкоўнік зноў падняў руку:

– Я не веру!

Хрушчова на плямы пабіла.

– Таварыш Рашыдаў выведзены са складу Прэзідыума ЦК КПСС! Вывесці яго!

Героі Савецкага Саюза Цмок і Цыклоп пацягнулі Палкоўніка да дзвярэй. Ён упіраўся, крычаў: “Хрушчоў стварае новы культ!..” – і азіраўся на Круглага, але той быў безуважны, і Цмок з Цыклопам выпіхнулі Палкоўніка з палаты.

Калі адчыняліся і зачыняліся дзверы, я паспеў заўважыць, як за імі мільгнуў маёр Гагарын. Што ён робіць тут? Чаму ён у вар’ятні? Стаў касманаўтам Гагарыным?..

Палкоўнік, канечне, не зусім нармальны, гэта факт, калі ў спрэчкі з вар'ятамі ўлез. Але ж і Біг з Вілам таксама не зусім нармальныя, Біг нават больш ненармальны, чым Палкоўнік, а яны вунь сядзяць, ні ў што не ўлазячы, толькі галасуюць за ўсё, што прапаноўвае Хрушчоў, які спытаў пераможна:

– Хто, апроч Рашыдава, лічыць, што я ствараю культ?..

Прэзідыум маўчаў. Падобна было, што ніхто, апроч Рашыдава, гэтак не лічыць, але раптам мучніста-белы, па-жаночаму на два бакі расчасаны псіх пераміргнуўся з Брэжневым і выскачыў на сярэдзіну палаты:

– Я!

– Слова таварышу Палянскаму! – тут жа абвясціў Круглы, пра якога я ўжо не думаў, як пра доктара. Гэткі ж хворы на галаву, як Куусінен-Мухітдзінаў ці сын Крупскай і Гітлера.

– Хто ў нас таварыш Хрушчоў? – нечакана цвёрда спытаў мучністы Палянскі. – Ён і Першы сакратар ЦК партыі, і Старшыня Савета Міністраў СССР, і Старшыня Бюро ЦК КПСС па РСФСР, і Вярхоўны галоўнакамандуючы – чым не Сталін? У ягоных руках уся ўлада! І як ён карыстаецца ёю? Узнагароджвае не толькі румынскіх і албанскіх таварышаў – Насэра ўзнагародзіў! Нацыяналіста! Прысвоіў яму званне Героя Савецкага Саюза ды яшчэ даў 300 мільёнаў залатых рублёў – і цяпер нам не хапае сродкаў на бальніцу!

Хрушчоў падскочыў:

– Таварыш Насэр будуе ў Егіпце сацыялізм!

– Які сацыялізм?.. Сацыялізм у імя Алаха, па волі якога Насэр знішчае камуністаў! Што гэта за сацыялізм без камуністаў? Можа, вы і камунізм такі, без камуністаў, збіраецеся будаваць, Мікіта Сяргеевіч? – І Палянскі ўзмахнуў рукамі, як бы абдымаючы ўвесь Прэзідыум ЦК і кандыдатаў у яго чальцы. – Без нас?

– Ды я цябе... ды я вас... – абапіраючыся на тумбачку, пачаў налівацца крывёй Хрушчоў... – ды кім вы былі, пакуль я вас не падняў, не выцягнуў... вось ты кім быў, Палянскі-Падлянскі!? Арэнбургскім валёнкам! А я цябе са стэпу ў Крэмль! Ці ты, Ста-аршыня Прэ-э-зідыума Вярхоўнага Савета таварыш Па-а-дгорны, кім быў? Нікім! Ды ты нікім і не стаў! Як быў цукровым інжынерам, так ім і застаўся. Ты цукру ў гарбату больш за іншых насыпаеш, я колькі разоў заўважаў!.. – раптам з кулакамі накінуўся Хрушчоў чамусьці менавіта на Падгорнага, лысага псіха, які сядзеў на ложку, слова не прамовіўшы, а Хрушчоў так заехаў яму, што кроў пайшла... Палянскі з Брэжневым заступіліся за Падгорнага, Куусінен-Мухітдзінаў, які аказаўся дзядком на дзіва спрытным – за Хрушчова, паўскоквалі

астатнія псіхі, і пачалася штурханіна, якая перарасла ў такую бойку, што героі Савецкага Саюза Цмок з Цыклопам ледзь спраўляліся расцягваць і вязаць да ложкаў сяброў і кандыдатаў у чальцы Прэзідыума ЦК КПСС…

– Што гэта было? – спытаў Віл Круглага, які прывёў нас з палаты ў свой, каля адной сцяны завалены матрацамі, кабінет, і Круглы пачаў тлумачыць распрацаваную ім новую методыку лекавання, па якой для псіхаў ствараюцца рэальныя ўмовы, што адпавядаюць іх хворым уяўленням, даюць магчымасць “Хрушчову” выявіць сябе Хрушчовым, “Палянскаму” – Палянскім, і ў такіх умовах пры адпаведнай схеме медыкаметознага ўздзеяння гэтыя леніны з гітлерамі і хрушчовы з палянскімі пачынаюць успрымаць і асэнсоўваць свае хворыя ўяўленні менавіта як хваробу, што і ёсць першы крок да нармалізацыі іх псіхічнага стану. Далей ужо лекаваць прасцей, бо да лекавання падключаецца свядомасць хворага, але для таго, каб увесь гэты працэс пачаўся, неабходная моцная псіхалагічная правакацыя. Вось яна сёння і ўдалася, за што дзякуй нам усім і найперш Палкоўніку – толькі не трэба было правакаваць антысаветчынай, хоць, з іншага боку, чым яшчэ?..

Я не надта разумеў тое, што тлумачыў Круглы, і не надта ў тое верыў. Віл з Бігам, якім я паспеў сказаць, што ў вар’ятні не толькі мы, але і маёр Гагарын, таксама, як я бачыў, не надта Кругламу паверылі, і ён паклікаў, чаго не было раней, Цмока, каб той адвёў нас у палату, у якой на ложку псіха, які называў сябе сакратарам ЦК Суславым, мы ўбачылі Палкоўніка. Ён сядзеў, паклаўшы на галаву падушку і ўчапіўшыся рукамі ў навалку.

– А Суслаў дзе? – спытаў Віл Хрушчова, і той сказаў, што не ведае, бо Суслаў ніякі не Суслаў, яго ў Прэзідыум ЦК КПСС падсунулі.

Біг спытаў: “Хто падсунуў?” Хрушчоў адказаў: “Амерыканцы”.

– Значыць, стукач, – з боку ў бок закалыхаўся Палкоўнік. – Мяне не выпусцілі. Ворана з Асяй выпусцілі, а мяне – не. І да Круглага мяне не пускаюць. Вось пабачыце: нас тут прызнаюць хворымі – і будзем сядзець. Без суда. Гэты гэбэшнік нас надурыў.

Я падумаў, ён пра маёра Гагарына, а ён, аказалася, пра Круглага, які яшчэ тады, калі Палкоўніка пасадзілі ў вар’ятню за Сталіна, даў заключэнне, што Палкоўнік нармальны і можа несці адказнасць за свае дзеянні. А Гарык Клябанаў казаў, што Палкоўніка якраз Круглы зратаваў.

Палкоўнік сцягнуў з галавы падушку – скура каля правай скроні была здзёртая, на падушцы засталася кроў.

– Гэта сам Круглы і прыдумаў, і ўсім распавядаў, нібы мяне

ўратаваў, калі ў КДБ вырашылі, што лепш усё ж мець ненармальнага студэнта, які Сталіна людажэрам назваў, чым нармальнага. Тое самае, відаць, яны й цяпер пастанавілі. Хто рыхтаваў замах на Хрушчова ў Мінску? Вар’яты! І дзе яны? У турме? А што з імі ў турме рабіць? Яны ў вар’ятні, дзе іх лечаць! Яны там яшчэ й вар’яцкае паседжанне Прэзідыума ЦК КПСС правялі, Хрушчова хацелі скінуць…

Палкоўнік прамаўляў гэта, раз-пораз кранаючы рану каля скроні, кранаў пальцам і палец аблізваў, кранаў і аблізваў – і раптам я зразумеў тое, чаго не хацеў разумець: мне адсюль не выйсці! Невядома на колькі, калі не на ўсё жыццё, я застануся тут – і мой сусед злева будзе чакаць і чакаць таракана, а сусед справа чытаць і чытаць Леніна!

Я звар’яцею!

– Пусціце! – кінуўся я да дзвярэй, зачапіўся за тумбачку, упаў, Цмок з Цыклопам схапілі мяне, пацягнулі на ложак, прывязалі, я біўся ў канвульсіях: “Не хачу!.. Пусціце!.. Гады! Гады! Гады!..”– і Цыклоп сеў на мяне, прыдушыў, прыціснуў да матраца руку, а Цмок нешта ўкалоў – і перш, чым мяне не стала, я ўбачыў сон, які сніўся Вілу, толькі даўжэйшы і з іншым канцом:

…нібыта ў нейкім горадзе, дзе я невядома як апынуўся і не ведаю, што гэта за горад, атамны выбух. І ўздымаецца, вырастае над горадам ядзерны грыб. Я разумею, што зараз павінен палыхнуць агонь і ўдарыць выбуховая хваля – і далёка, на небасхіле, нешта бліскае, як маланка, бляск шырыцца, запаўняе нябёсы, становіцца нясцерпным, але ўсё ж большая за нясцерпнасць святла нясцерпнасць глухаты і нема\ты, адсутнасць хоць якога-небудзь гуку: я крычу, крычу, крычу, не чуючы свайго голасу, і ад гэтага яшчэ страшней. Выбуховая хваля змятае горад у поўнай цішыні: вунь звон сарвала з царкоўнай званіцы, і ён, нема матляючы языком, ляціць разам з дрэвамі, бёрнамі, камянямі, жалеззем, і ўсё гэта сыплецца, падае, абрынаецца на людзей, што выбягаюць з разбураных дамоў і крычаць, крычаць, крычаць, а іх не чуваць, яны не чуюць самі сябе і ніхто іх не чуе. На імгненне я азіраюся: ззаду сіняя рака, за ёй, на тым беразе, зялёная лугавіна, над якой блакітнае, з белымі аблачынкамі, неба, і трэба бегчы ў той бок, а ўсе бягуць у бок зваротны, туды, дзе бляск, дзе ўсе запальваюцца адзін ад аднаго, нібы паходня ад паходні. Я ўспыхваю, агорнуты, як чырвонай прасцінай, агнём, які зусім не пячэ, у якім можна купацца, як у сіняй рацэ, за якой зялёная лугавіна і блакітнае, з белымі аблачынкамі, неба, у якім я чую нарэшце гук: лёгкі-лёгкі пошум полымя – і мяне пакідае страх.

Новы свет, былы рай

Палкоўніка зноў забралі, калі мы яшчэ ў вар'ятні былі, і Гурык сказаў, што ўжо не выпусцяць, а яго чамусьці выпусцілі. Мы сабраліся ў Крым, каб прагуляць ганарар, які Біг атрымаў за кнігу пра слесара, і не думалі, што Палкоўнік з намі паедзе, таму й прапанавалі яму паехаць, а ён згадзіўся: «Збягу. Няхай ловяць». У яго таксама было не пуста ў кішэнях, з ім разлічыліся за дысертацыю, напісаную для нейкага новага доктара навук па этнаграфіі, і Палкоўнік даклаў заробак у агульную касу – да ганарара Біга за кнігу.

У нас была гара грошай. Столькі я ніколі не бачыў.

– Калі Палкоўнік едзе, тады й Аса давайце возьмем, – прапанаваў Віл. – Каб у гурце вар'ятаў быў камплект.

У нашай кампаніі гралі на гітары не толькі Гарык Клябанаў і Віл, але й Воран, а таксама, што ўсіх здзіўляла, Ас. Прычым, Ас, умеючы лепш за ўсіх свістаць, імітуючы палёт куль ды асколкаў, яшчэ і граў лепш за ўсіх: не адно так званым гітарным "боем", усімі пальцамі па ўсіх струнах, але й шчыпкамі, пераборамі, і ніхто не мог ад яго дазнацца, дзе ён так граць навучыўся, бо ён сам гэтага не ведаў. Вось Віл і прыдумаў паехаць у Крым не проста звычайнай кампаніяй, адной з многіх, якія едуць летам на поўдзень, а музычным гуртам "Varjaty".

Шкада, што ні Вілу, ні яшчэ камусьці з нас не прыйшло ў галаву назвацца гуртам "Beatles". Гралі мы ў той час амаль тое самае, што й ліверпульская чацвёрка: запісы з альбомаў Літла Рычарда, Чака Беры, Карла Пернікса, якія дасылалі Вілу ягоныя сябры па радыёэфіры. Гэтаксама як Ленан з Макартні, Гарык з Вілам перараблялі ў рок-н-ролы блюзы і джаз, і, выступаючы на прыступках Тэатра юнага гледача ў Мінску з Асам і Воранам, мелі поспех не меншы, чым мелі яго ў клубе "Jacaranada" ў Ліверпулі хлопцы з гурту "Quarrymen" – будучыя бітлы. Так што хто ведае, як яно магло стацца, калі б наш Палкоўнік быў Аланам Уільямсам, які сасватаў нячэсаных ліверпульцаў немцу Бруна Кашмідзеру, а той выцягнуў іх у Гамбург, дзе яны запісалі свае першыя песні, адна з якіх, "My Bonnie", зусім і не іхняя, прыдуманая народам Ірландыі. Ці калі б Ася Бланк была Астрыд Кірхгер, якая прыдумала для бітлаў зачэсаныя на лоб і вушы валасы і пінжакі без каўнерыкаў і лацканаў. Хоць яшчэ невядома, што круцей: тыя пінжакі ад Кардэна ці генеральскі шынель Аса…

Біг прапанаваў назваць гурт "Crazy", бо яно тое самае, што

вар'яты, толькі па-ангельску, але ягоную прапанову адмялі. Ангельскую мову на Крымскай паўвыспе нехта ж можа ведаць, а беларускую – ніхто, таму надпісы Varjaty на нашых гітарах будуць чытаццца, хутчэй за ўсё, як вар'етэ, за што міліцыя, можа быць, і не прычэпіцца. А калі прычэпіцца, дык у нас ёсць даведкі, што мы насамрэч прыдуркі: лячыліся ў псіхушцы. Гэтыя даведкі з круглымі пячаткамі, выдадзеныя нам круглым доктарам, Біг з Вілам хацелі выкінуць, дый мне такая даведка была без патрэбы, але Палкоўнік, вар'ят з досведам, сказаў, што мы проста не разумеем, якія займелі дакументы, і загадаў здаць іх яму, як дырэктару гурта "Varjaty".

Ас вельмі хацеў паехаць з намі. Каб мы ўзялі яго, ён сказаў, што ў Крыме ваяваў, і правядзе нас па баявых мясцінах.

– Па якіх? – спытаў Воран, і Ас адказаў, што збіваў нямецкія самалёты над усім Крымам, так што баявыя мясціны там у яго паўсюль, але найлепшая мясціна ў Гурзуфе, дзе ён папраўляў здароўе ў санаторыі пасля вайны.

Вырашылі ехаць у Гурзуф.

У плацкартным вагоне цягніка «Мінск-Сімферопаль» было душна і віскліва. Вагон быў набіты дзецьмі, якіх везлі аздараўляцца ў «Артэк», самы прэстыжны ў СССР піянерскі лагер, праз што дзеці лічылі сябе, мусібыць, элітнымі і паводзіліся нахабна. Палкоўнік, які не трываў дзяцей ні хворых, ні здаровых, ні звычайных, ні элітных, прыгразіў, што будзе скідваць іх пад адхон каля кожнага кіламетровага слупа, і тады Віл, які дзяцей любіў, схадзіў да брыгадзіра цягніка, вярнуўшыся з квітком у мяккае купэ, куды й перавялі Палкоўніка. Перад тым, на вакзале, брыгадзір крычаў пасажырам, якія штурмавалі цягнік: «У мяне й без вас людзі на галовах адзін у аднаго сядзяць! Ні ў адным вагоне ніводнага вольнага месца!..» – і тым не менш месца знайшлося. Некаму, мусібыць, брыгадзір адарваў галаву.

Грошы дапамагаюць не толькі вырашаць праблемы, але й ствараюць іх. Не было б у нас грошай – не перасеў бы Палкоўнік у мяккае купэ і не пазнаёміўся б з круглаватым у таліі мужыком, з якім выйшаў з вагона на вакзале ў Сімферопалі і абвясціў, што мы едзем не ў Гурзуф, дзе пасля вайны папраўляў здароўе Ас і дзе цяпер наўрад ці нас нехта чакае, а ў Новы Свет, дзе да вайны, прычым, яшчэ да першай сусветнай, жыў граф Галіцын, які вырабляў знакамітае навасвецкае шампанскае, і куды запрашае нас таварыш Маркач – старшыня Навасвецкай пасялковай рады і наш зямляк.

Старшыню пасялковай рады чакаў на вакзале грузавік. Цяжкагрузны «КРАЗ», які, як сказаў Віл, зжырае на адзін кіламетр

прыблізна столькі ж бензіну, колькі легкавушка на сто. І такая махіна амаль дзвесце кіламетраў ехала па старшыню сюды – і амаль дзвесце будзе ехаць назад? «Службовую рамантуюць», – патлумачыў Маркач. Ён запрасіў Палкоўніка ў кабіну, а ўсе астатнія з намётамі, гумавай лодкай, аквалангам, заплечнікамі і гітарамі залезлі ў кузаў. У меншую машыну мы і не ўмясціліся б, так што ад пачатку былі ўдзячныя нашаму земляку, які не звык ездзіць на грамадскім транспарце.

Доўга-доўга мы трэсліся ў кузаве «КРАЗа» да Судака, паўзлі па горнай дарозе, ледзь не зваліўшыся з яе, да Новага Свету, сапрэлі, згаладаліся, а Палкоўнік пацягнуў нас з дарогі на сход, на якім мы, артысты гурту «Varjaty», павінны зараз жа выступіць у падтрымку нашага земляка – кандыдата ў дэпутаты Навасвецкай пасялковай рады, у якую ён павінен абрацца, каб застацца старшынёй, за што абяцае накарміць нас шашлыкамі. Аказалася, мы патрапілі ў Новы Свет за два тыдні да мясцовых выбараў – і Палкоўнік вырашыў уключыцца ў выбарчую кампанію.

У Савецкім Саюзе і мясцовыя, і немясцовыя выбары праводзіліся аднолькава проста. За тыдзень да іх у газетах з'яўляліся заклікі: "Усе на выбары!" – а ў дзень галасавання грамадзяне СССР спяшалі не столькі на выбарчыя ўчасткі, колькі ў буфеты пры іх, дзе куплялі апельсіны, якія ў дні і гады паміж выбарамі можна было ўбачыць хіба на ілюстрацыях у кнізе Чукоўскага пра доктара Айбаліта, якому, як вядома, пашчасціла з камандзіроўкай у Афрыку. Праз пару дзён у тых жа газетах пад лозунгам "Народ і партыя адзіныя!" друкаваліся вынікі галасавання: 99,99 % – і ўсе галасы за таго народнага кандыдата, які быў адзіны з партыяй. Іншых кандыдатаў, як і іншых апельсінаў, не было.

Што да сустрэч з кандыдатамі ў дэпутаты, дык на іх збіраліся хіба ў тыя часы, калі не бачылі не толькі апельсінаў, але й тэлевізараў, а ў клубе перад сходам круцілі кіно. Але ж не летам на беразе мора…

Летам на беразе мора наш кандыдат мог сустрэцца толькі з намі – і паколькі болей не было нікога, распавёў нам, землякам і артыстам, як угору пайшоў, у начальства выбіўся. Ён працаваў на заводзе шампанскіх вінаў, стаў ударнікам камуністычнай працы і яго выбралі партыйным сакратаром. На з'езд партыйны паслалі, а там, на тым партыйным з'ездзе, рэгістрацыя па партыйных білетах. А ў яго білет толькі на цягнік ад Сімферопаля да Кіева. Бо ён не камуніст… Кіеўскія камуністы за галовы схапіліся: "Госпадзі! Што рабіць?" Яго ўжо ў спіс партыйных дэлегатаў на з'езд у Маскве ўключылі! І цяпер выкрэсліваць, бо ён не камуніст? Як тады партыйным сакратаром яго выбралі, дэлегатам з'езда ў Кіеве? Такі шум уздымецца, такое

пачнецца! І гэтаму Маркачу-смаркачу – што? Найбольшае – званне ўдарніка камуністычнай працы пазбавяць. А тых, хто такое дапусціў, правароніў, могуць пазбавіць куды большага…

І прынялі нашага земляка ў партыю! Залічылі ў камуністы заднім чыслом!.. І правільна зрабілі, бо ён, хоць на сустрэчу з ім ніхто не прыйшоў і падтрымліваць яго нам не давялося, усё ж, як і абяцаў, накарміў нас шашлыкамі, якія да гэтай пары дымяцца ў маім хатнім альбоме на чорна-белым фотаздымку, падпісаным: “Першы ганарар гурту “Varjaty”, Крым, Новы Свет”.

У тыя часы ў тым райскім кутку, які да таго, як стаць Новым Светам, менавіта раем, Парадызам і называўся, былі адкрытыя для ўсіх і Зялёная, і Сіняя, і Блакітная, або Царская, бо ў ёй купаўся цар Мікалай II, бухты, але калі мы пачалі ставіць намёты каля Скразнога грота, да нас падышлі людзі з аўтаматамі і спыталі, ці ёсць у нас дазвол, бо мы ў памежнай зоне. “Вунь там, – кіўнуў адзін з іх аўтаматам за марскі небасхіл, – Турцыя. А ў вас акваланг і лодка”.

– Наш дазвол у таварыша Маркача, які запрасіў нас, прадстаўнікоў савецкага эстраднага мастацтва, для агітацыі на мясцовых выбарах дэпутатаў працоўных, – нахабна заявіў Палкоўнік, і памежнікі не асмеліліся яму не паверыць, папярэдзіўшы толькі, каб мы не заплывалі ў мора далей за выступ мысу Капчык. Назаўтра Палкоўнік з нашым земляком з’ездзілі ў Судак да памежнага камандавання і прывезлі паперу, у якой былі пералічаныя нашыя прозвішчы і напісана, што ўсе мы – добраахвотныя памочнікі памежнікаў. І пачалося райскае жыццё…

Не ведаю, што б я аддаў за тое, каб прачнуцца рана-рана на беразе Сіняй бухты і ўбачыць Асю, якая, уздрыгваючы спінай і сціскаючы лапаткі, кранае пальчыкамі ног такую празрыстую, што яе не відно, ваду, робіць з берага крок, другі, трэці, уваходзіць у мора па шчыкалаткі, па калені, па клубы, прысядае па локці, па плечы – і плыве. Яна плыве насустрач сонцу, якое толькі-толькі ўзыходзіць, і здаецца, што сонца, узыходзячы, спяшае ёй насустрач – яшчэ б яму не спяшаць!..

Ася плавае датуль, пакуль сонца цалкам не вынырвае з мора. Тады яна паварочвае да берага, выходзіць, атрасаючы валасы, з празрыстай хвалі, кладзецца, раскінуўшы рукі і запрашаючы сонца ў абдымкі, на пясок – і як я зайздрошчу сонцу, якое, абліваючы Асю з ног да галавы дрыготкім ранішнім святлом, можа яе ўсю-ўсю абдымаць, абдымаць, абдымаць, цалаваць, цалаваць, цалаваць… Потым я зайздрошчу ветру, калі мы, знайшоўшы пакручастую, стромую, але ўсё ж адольную сцяжыну, падымаемся амаль на самую

вяршыню гары Сокал, дзе Ася мяне, бо мы толькі ўдваіх, пытае: «Калі Біг з Вілам голыя па Мінску бегалі, дык можна мне голай на гары пастаяць?» – і скідвае сукеначку, і ўскідвае рукі, і стаіць тварам да мора, мармурова-белая, як статуя, якую тысячы гадоў таму паставілі тут таўры ці скіфы, грэкі ці рымляне, каб выплывалі з туману, як на агонь маяка, караблі на пажар яе валасоў, і даплыўшы, любаваліся ёй заваёўнікі і арганаўты, і маліліся ёй, як багіні, каля ног якой ляжыць Новы Свет і, як сабачка, круціцца вецер…

Чаму Ася мяне не саромелася? Гэтак не саромеліся мяне жанчыны ў лазні, куды брала мяне маленькага маці. Не помню, як я побач з тымі жанчынамі ў той лазні пачуваўся, відаць, ніяк, хацеў толькі хутчэй вырасці, каб хадзіць у лазню з мужчынамі, а тут, на гары побач з Асяй мне было крыўдна. Я хацеў хутчэй стаць мужчынам, у чым, што начамі сніў і пра што днямі марыў, мне магла дапамагчы Ася, але яна не дапамагала мне і не збіралася дапамагаць.

Аднойчы ў Скразным гроце, дзе мы шукалі скарбы піратаў, і Ася пры мне прысела на кукішкі, я спытаў: чаму? Чаму яна мяне не саромеецца? Таму што я для яе хлопчык, якога можна ўзяць з сабой у лазню? Яна засмяялася: «Дурненькі! Глядзі: я не саромеюся мора, сонца, ветру… Ты ў такой кампаніі – і крыўдуеш?»

Я крыўдаваў. Я раўнаваў яе да мора, сонца, ветру… Ужо не кажучы пра Ворана, якому таксама давялося ўзрэўнаваць.

Да нашай кампаніі прыбіліся, бо не былі добраахвотнымі сябрамі памежнікаў і іх не пускалі ў памежную зону, а ім, канечне ж, хацелася туды, куды не пускаюць, артысты, што здымаліся ў фільме «Два плюс тры». Палкоўнік, прачытаўшы сцэнар фільма, напісаны аўтарам гімна СССР, сказаў, што такую пустышку глядзець нават выбаршчыкі зімой у клуб не пойдуць – і не ўгадаў: пайшлі. Перш за ўсё, мусібыць, з-за прыгажунь артыстак, адну з якіх, Наталлю, Віл адразу прыгарнуў песняй “Шлях далёкі да Ціперэры”, сказаўшы, што напісаў яе сам, хоць проста пераклаў маршавую песню брытанскай арміі. Але як прыгарнуў ён да сябе брытанскім маршам зорку савецкага кіно, гэтак яна ад яго і адгарнулася, бо аднекуль марш брытанскай арміі “It’s a long way to Tipperary”, напісаны, зразумела, не Вілам, а Джэкам Даджам і Вернанам Горэйсам, ведаў актор, які быў партнёрам Наталлі ў фільме – і праспяваў ёй той марш па-ангельску.

Да любоўнай паразы Віла дадалася яшчэ і параза творчая. У яго быў акваланг, ён здорава плаваў, дапамагаў у здымках пад вадой, за што выцыганіў у рэжысёра, вясёлага армяніна, эпізадычную ролю афіцыянта. Па сцэнары той афіцыянт абслугоўваў у рэстаране дрэсіроўшчыцу Зою, ролю якой грала Наталля – і Віл штодня

прызначаў ёй “рэпетыцыі” ў рэстаране, запрашаючы, паколькі меліся грошы, і сваіх сяброў, і яе сябровак. Праз тое, што артысткі цягаюцца па рэстаранах з добраахвотнымі памочнікамі памежнікаў, рэжысёр быў не ў захапленні, і ў самы разгар рэпетыцый раптам вырашыў, што аўтар марша брытанскай арміі на ролю савецкага афіцыянта не падыходзіць – і ён сыграе яе сам. Для Віла, які ўжо бачыў сябе на вокладцы часопіса “Савецкі экран”, гэта было ўдарам пад дых. Ускрыўдаваўшы на ўвесь белы свет, ён не вылазіў з сіняга мора, лавіў рыбу і збіраў рапанаў.

Праз год, калі фільм быў зняты, я прапанаваў Вілу яго паглядзець, на што Віл буркнуў, у бок адвярнуўшыся: “Ідзі паглядзі адзін”. Я пайшоў паглядзець не адзін, а з Асяй, і калі дайшло да сцэны ў рэстаране, якую рэжысёр, вясёлы армянін, яшчэ й агучыў брытанскім вайсковым маршам, мы з Асяй так разрагаталіся, што кантралёрка вывела нас з залы, і я дасюль не ведаю, чым жа скончылася тое кіно.

Палкоўнік казаў, што кожны час мае не толькі сваё мастацтва і сваю палітыку, філасофію і паэзію, але і свой колер. Калі яно так, дык колер таго часу – гэта трохі размыты колер тагачасных фільмаў, знятых на стужках вытворчасці фабрыкі “Свема”.

Між тым, набліжаліся выбары. Кожны вечар, агітуючы за нашага кандыдата ў Навасвецкую пасялковую раду, мы выступалі з канцэртамі ў гроце Шаляпіна, названым так, бо нібыта ў тым гроце Шаляпін спяваў некалі для цара. Невядома, спяваў ці не спяваў, для цара ці не для цара, але імем Шаляпіна грот назвалі нездарма, бо ў ім была такая акустыка, што не трэба было ніякай гукаўзмацняльнай апаратуры, а тэнар Гарыка і барытон Віла гучалі не горай, чым гучаў тут, калі ён тут гучаў, знакаміты рускі бас. Мы мелі гэтакі поспех, што Віл, прагуляўшы грошы на “рэпетыцыях” у рэстаране і падрабляючы цяпер на рапанах, прапанаваў квіткі на канцэрты прадаваць, і на адзін канцэрт мы прадалі іх, па рублю квіток, зарабіўшы болей за сотню, але камерцыялізацыю мясцовых выбараў рашуча спыніла мясцовая ўлада ў асобе нашага кандыдата ў дэпутаты, што прынцыпова паўплывала на нашы адносіны да яго – і не ў лепшы бок.

– Тое, што вы наш зямляк і корміце нас шашлыкамі, не азначае, што выбары павінны быць недэмакратычнымі, – заявіў пасля канцэрта Палкоўнік на нарадзе нашага выбарчага штаба ў прысутнасці нашага кандыдата ў дэпутаты Навасвецкай пасялковай рады. – Вось глядзіце: колькасць жыхароў Новага Свету – 182 чалавекі. Па законе ў мясцовую раду павінен абірацца адзін чалавек ад пяцідзесяці. Разам з вамі зарэгістраваныя яшчэ два кандыдаты.

Усяго, значыць, тры. Але ж 182 бліжэй да 200, чым да 150! Чаму тады тры, а не чатыры? Таму што ў пасялковай радзе тры пасады: старшыня, намеснік і сакратар. Чацвёрты – лішні, бо стварае вам альтэрнатыву. Але ён лішні для вас, а не для дэмакратыі! Канечне, каб выбары былі дэмакратычнымі, не абавязковая альтэрнатыва. Ды ў дадзеным выпадку яна неабходная! Сапраўдная перамога, якая ўмацуе ваш аўтарытэт – гэта перамога ў змаганні! Толькі тады людзі ў вас паверацаць і пойдуць за вамі! Вы зможаце сказаць ім: я перамог у сумленнай барацьбе! І мы, ваш выбарчы штаб, зможам пацвердзіць: так!

Наш зямляк глядзеў на Палкоўніка, міргаючы, з хвіліну… Позірк быў такі, што я б яго не стрываў, а Палкоўніку хоць бы што – і не стрываў наш зямляк.

– Я і зараз магу сказаць, што перамог у сумленнай барацьбе, – перавёў ён позірк з Палкоўніка на Віла, на Ворана, па чарзе з уважлівай цікаўнасцю ўзіраючыся ў кожнага з нашай кампаніі. – І мне не трэба, каб вы тое пацвердзілі. Як не трэба, каб нехта за мной некуды йшоў. Мне трэба, каб мяне не выклікалі ў гаркам партыі і не спыталі:

«Што ў цябе ў Новым Свеце робіцца?..» І не прапанавалі пакласці партбілет. Таму, калі хочаце есці шашлыкі, проста грайце і спявайце. Каб усім весялей было. Больш нічога. Гэта я вам, – зноў паглядзеў ён, цяпер ужо не міргаючы, на Палкоўніка, – па-зямляцку дапамагаю, а не вы мне. Зразумелі?..

Мы зразумелі. Усе, апроч Палкоўніка.

– Не мае значэнне, хто каму дапамагае, – спыніў ён Маркача, які збіраўся пайсці, бо вырашыў, што размова скончаная. – Значэнне мае толькі вынік. А які ён можа быць без ніякай палітычнай праграмы? Без ніякай палітычнай праграмы і вынік ніякі. А якой можа быць наша праграма? Калі ставіць перад сабой маштабныя мэты. Думаць не пра тое, як стварыць ферму па гадоўлі божых каровак, – націснуў Палкоўнік на любімы мазоль Маркача, які дзеля захавання крыштальнай чысціні навасвецкага шампанскага спрабаваў змагацца з тлёй, што пажырае вінаграднікі, не з дапамогай хіміі, а з дапамогай божых каровак, якія пажыраюць тлю. – Ясна, што праграма павінна быць не мясцовага разліву. Са 182-х жыхароў Новага Свету 151 – рускія. 2 – карэйцы, 9 – габрэі, 10 – украінцы і столькі ж – татары. Таксама 10. Прыблізна такая ж карціна па ўсім Крыме. Тады чаму Крым не падзялілі паміж украінцамі і татарамі, калі іх пароўну?

Палкоўнік зрабіў паўзу, даючы магчымасць нашаму кандыдату

асэнсаваць пачутае, і працягнуў.

– Гэтае пытанне рытарычнае. Сутнаснае ж у нашай праграме вось што: у 1954 годзе, калі са складу Расійскай Федэрацыі Крым быў перададзены ў склад Украіны, была зробленая памылка, якую неабходна выправіць. Мадэль, у якой існуе сёння Савецкі Саюз, не вечная. Пры зменах яе можа выбухнуць канфлікт, закладзены ў змене статуса Крыма, што можа прывесці да непрадказальных наступстваў. Да глабальнай катастрофы, якую сёння яшчэ можна прадухіліць. Вось з якой праграмай я прапаную вам пайсці на выбары, калі думаць не пра пасялковую – пра Вярхоўную Раду, а, можа быць, і пра большае.

Пра тое, што ён мае на ўвазе пад большым, Палкоўнік не сказаў, але па выглядзе Маркача не цяжка было здагадацца, што найменшае, пра што ён зараз думае – гэта як нас прыбіць і дзе закапаць. І калі сесці, дык за забойства, а не за палітыку. Нічога ў адказ Палкоўніку не сказаўшы, ён павярнуўся і выйшаў, так ляснуўшы дзвярыма, што ў шашлычнай, дзе праводзілі мы штабную нараду, сарвалася карціна ў раме пад шклом: «Крым у час руска-турэцкай вайны».

– Я тут ваяваў, – сказаў Ас, калі карціну ўжо без шкла, якое сабрала і выкінула Ася, зноў павесілі на сцяну. – За савецкую дэмакратыю супраць нямецкага фашызму. – І ўсе павярнуліся да Палкоўніка, а той кіўнуў галавой.

– Заўтра ў нас на канцэрце будзе намеснік дырэктара вінзавода. Я з ім размаўляў, ён хоча быць чацвёртым. Хоць і ферму для гадоўлі божых каровак таксама хоча.

“Божая кароўка, што заўтра будзе?..” – спяваў назаўтра гурт “Varjaty” песню, пад якую Ас у генеральскім шынялі скакаў упрысядку:

“Хай пра будучыню слова
Скажа дэпутат Маркач,
А не нейкая карова
І не нейкі смаркач!”

О, гэта было відовішча… Ас у генеральскім шынялі, Віл у ластах і аквалангу, Гарык у касцюме божай кароўкі, Воран у гумавай лодцы… Гурт “Varjaty”, дырэктар – Палкоўнік, які выконваў яшчэ й ролю (без чаго не абыходзіўся ў тыя часы ні адзін канцэрт савецкай эстрады) канферансье:

«У якім лагеры ён быў? У піянерскім?

Хто табе сёння будзе цалаваць пальцы? Начальнік пашпартнага стала.

Ад спецыяліста па намёках нельга патрабаваць дакладнай

інфармацыі.

Дзве малпы, а сутнасць адна і тая.

Усялякая жывёліна мае права жыць, а некаторыя яшчэ й жывуць.

Вы таксама не збіраецеся жыць у гэтым свеце? Тады чаму такая асцярожнасць?..»

Чытаючы запісы з нататнікаў Паўла Уліціна, Палкоўнік не надта разлічваў на тое, што з такога канферансу будуць смяяцца. Ніхто й не смяяўся. “Ландышы! Ландышы давай!..” – крычалі падпітыя мужыкі ў дзіцячых панамках. Яны прыпёрліся на першы наш канцэрт, не давалі граць, мы не ведалі, што рабіць, бо не было каму ў нас “Ландышы” спяваць, і тады на сцэну, кіўнуўшы нам, каб падыгралі, выйшла Ася.

Мужыкі ў панамках сціхлі і сядзелі, як ламы праглынуўшы, пакуль мы падбіралі для Асі танальнасць, прабягалі мелодыю… У яе быў не такі голас, каб спяваць у дуэце з Шаляпіным, але саспявала яна “Ландышы” так, нібы толькі для таго, каб саспяваць “Ландышы”, на свет нарадзілася. “Біс!.. Брава!.. Біс!..” – паўскоквалі мужыкі ў дзіцячых панамках, і я не ўпэўнены, што такіх авацый дачакаўся б ад іх Шаляпін.

На тым канцэрце разам з мужыкамі ў дзіцячых панамках крычаў Асі “брава” Андрэй. Ён не быў яшчэ такім знакамітым акторам, якім стаў, саспяваўшы: «Ён яе, галубачку, шмяк-шмяк-шмяк, ням-ням-ням ды і шмыг-шмыг-шмыг», – але ўжо сыграў у фільме «А калі гэта каханне?», які Ася бачыла.

Назаўтра Андрэй прыйшоў на канцэрт з лілеямі. Адкуль ён ведаў, якія яна любіць кветкі?..

«Хто ў параўнанні з ім, маскоўскім акторам, героем-палюбоўнікам, нейкі мінскі архітэктар? – спытаў, калі Андрэй прыйшоў і на трэці канцэрт, Палкоўнік. – Ніхто». І аднойчы ранкам, кранаючы пальчыкамі ваду і ўздрыгваючы лапаткамі, Ася ўвайшла ў мора разам з Андрэем.

Косця глядзеў на гэта з берага разам са мной… Я раўнаваў, але не верыў, што Ася яму, мне, нам усім здрадзіла, а Воран раўнаваў і верыў, і каўтаў жаўлакі.

– У яе жаніх гэбіст, так што глядзі… – нібыта жартам кінуў ён Андрэю, калі мы ўсе разам, вар’яты, сябры памежнікаў, акторы, снедалі ў выдзеленай нам Маркачам шашлычнай, і Ася, бліснуўшы на Ворана позіркам, поўным пагарды, сказала: “Што ж, калі ён мне жаніх, за яго й пайду”. І паднялася, і пайшла.

Я ўпершыню тады падумаў, што Ася Бланк Асяй Воран можа і

не стаць.

Пад вечар таго ж дня я ўбачыў Косцю з Андрэем на сцяжыне Галіцына, якую князь загадаў ад падножжа гары Арол пратаптаць, каб з царом гуляць. Не так высока, але… Яны, Косця з Андрэем, стаялі адзін насупраць аднаго ў самым вузкім месцы сцяжыны, якая за спінамі іх строма абрывалася, і, як пеўні, штурхаліся грудзьмі. Вышэй па сцяжыне йшла Ася, і Косця з Андрэем, штурхаючыся, пакручвалі галовамі ёй услед, чакаючы, што на некага з іх яна азірнецца, убачыць, як яны, рызыкуючы жыццём, за яе б'юцца, а яна йшла і не азіралася… Тады Андрэй махнуў рукой і рушыў па сцяжыне ўніз.

Праз шмат-шмат часу, недзе за паўгады да смерці Андрэя, я пабачыўся з ім у Маскве. Мы выпадкова спаткаліся каля Дома кіно, пацiснулі адзін аднаму рукі і пастаялі, як стаяць на горнай сцяжыне, якая за спінамі абрываецца. І ў яго, і ў мяне за спінай было жыццё, у якім многае можна было ўспомніць, а ён паглядзеў на мяне сумнымі – чамусьці яны амаль заўсёды былі ў яго сумнымі – вачыма і ўсё, што спытаў: "Як Ася?.."

Ася прапала. У дзень выбараў, які запісаўся ў маёй памяці як дзень божых каровак.

З самай раніцы, яшчэ да галасавання, Маркач вырашыў прадэманстраваць сваім выбаршчыкам, як ён будзе змагацца са шкоднікамі, якія зжыраюць вінаграднікі, калі яго абяруць дэпутатам і ён застанецца старшынёй Навасвецкай пасялковай рады. З узыходам сонца над Коба-Кая, гарой Арол, у нетрах якой прабітыя штольні, дзе й захоўваецца выробленае з навасвецкага вінаграду шампанскае, застракатаў верталёт. Ён пакружыў над гарой, праляцеў над узбярэжжам, вярнуўся, з двух бакоў у ім расчыніліся люкі – і паляцелі ўніз такія, як для абутку, пушкі, якія адразу ж выбухалі, выкідваючы з сябе нешта падобнае на дым, на хмаркі. Разрастаючыся ад Коба-Кая да Куш-Кая, гары Сокал, дымныя хмаркі апускаліся ўсё ніжэй, ніжэй, і па самых нізкіх ужо відаць было, што гэта не хмаркі, а нешта лятуча-жывое – і з нябёс сыпанулі божыя кароўкі! Іх былі тысячы, мільёны, мільярды, і сыпацца яны павінны былі на вінаграднікі, каб пажэрці шкоднікаў, але верталётчыкі не разлічылі напрамак і сілу ветру: кароўкі пасыпаліся на пасёлак, на пляжы, на Зялёную, Сінюю і Блакітную бухты, вада ў якіх імгненна стала чырвонай. Бухты кішэлі кароўкамі, немагчыма было знайсці хоць лапік чыстай вады, і Ася, якая плыла ў гэтай чырвонай кішэчы, на бераг вылезла ў кроў скусаная – я б ніколі не падумаў, што кароўкі божыя могуць гэтак скусаць.

Ася сядзела на беразе, накрыўшы галаву рукамі, і плакала,

плакала, плакала... Я падышоў, каб суцешыць, яна ўсхліпнула: “Прэч!..” І столькі было ў тым усхліпе нянавісці, што мяне сцяла ад яго, як ад шыпу змяі. Падумаўшы, што гэта яна праз боль, я сказаў: “Пройдзе...” – а яна ўскочыла: “Ніколі!..” – і пабегла, страсаючы кроў на пясок...

Андрэй сказаў, калі мы спаткаліся каля Дома кіно, што ў засыпаным божымі кароўкамі Новым Свеце Асі прапаноўвалі зняцца ў фільме замест Наталлі. Не ён прапаноўваў, рэжысёр, які вырашыў, што Ася болей на ролю дрэсіроўшчыцы падыходзіць, і сказаў ёй, што пасля здымкаў яна можа паехаць у Маскву, у інстытут кінематаграфіі, і Ася згадзілася, але нехта заклаў яе рэжысёру: маўляў, ваша справа, можаце й не звяртаць увагі на тое, што яна – дачка ворага народа. “Хто мог яе закласці?..” – разгублена спытаў я, і Андрэй пацепнуў плячыма: “Не Наталля ж, скуль яна ведала... Нехта з вашых. Можа, той вар’ят, які на вашых канцэртах антысавеччыну нёс. Ці Воран, каб яна ад яго не з’ехала”.

Ён і Ворана помніў. Нічога, што з Асяй звязанае, не забываецца.

У Асі мог быць зусім іншы лёс. Не абавязкова, але мог. І не плакала б яна на беразе Сіняй бухты, і не збягала б ад таго лёсу, у якім нехта з нас яе пакінуў, у Ізраіль, а піла б шампанскае ў Маскве ў Доме кіно... Хоць яна і так піла шампанскае ў Маскве ў Доме кіно, дзе толькі жонкі генералаў КДБ шампанскае і п’юць.

“Хто?..” – гляджу я на даўні чорна-бела фотаздымак, на якім дымяцца шашлыкі над надпісам: “Першы ганарар гурту “Varjaty”, Крым, Новы Свет”. Па правы бок ад Асі – Гарык, Ас, Воран, па левы – Віл, Біг, Палкоўнік. Я фатаграфую, мяне няма.

“Пайшоў прэч!..” Ася магла падумаць, што гэта я...

Я сказаў ёй у Скразным гроце, у якім мы скарбы піратаў шукалі, дзе яна пры мне на кукішкі прысела, што злаўлю яе, як вецер, утаплю, як мора, і спалю, як сонца, да якіх яе раўную, калі яна пакіне мяне. Яна ўстала з кукішкаў, прыгарнулася і шапнула на вуха: “Я дарую табе”.

Калі яна даруе мне? У будучым? І што даруе? Тое, што, як вецер, злаўлю, як мора, утаплю і, як сонца, спалю?.. Наўрад ці. Тым больш, што ведала: і не злаўлю, і не ўтаплю, і не спалю.

– Я не пытаўся ў Рубена (гэта Андрэй пра рэжысёра): хто? Не мая справа. Дый дазнаўся я пра ўсё пазней. Ужо ў Маскве, калі на Лубянку паклікалі... – Ён засмяўся. – “Вы таксама за вяртанне Крыма ў Расію?” А ў нас касцюмер быў з прозвішчам Крым, які ў Амерыку з’ехаў. Дай, думаю, пажартую. І кажу: “Як ён захоча”. “Дык вы, – мяне пытаюць, – за рэферэндум?” Ледзь не дажартаваўся... Усю нашую

здымачную групу, як толькі вас забралі, там, на месцы дапытвалі, а мяне з Рубенам яшчэ й тут, на Лубянцы. Так я і не зразумеў: якую там вялі вы прапаганду – і што за тэлеграма ў Новы Свет з амерыканскага сената прыйшла?..

У атрадзе памежнікаў у Судаку была радыёстанцыя, і Вілу, які меў пасведчанне чэмпіёнаў свету па радыёспорце, памежнае камандаванне дазволіла час ад часу, калі радыёстанцыя не занятая, ёй карыстацца. Ну, каб чэмпіён не страціў форму… Чэмпіён форму не страціў, і калі праз дзень пасля мясцовых выбараў прыйшла ў Судацкі райкам партыі тэлеграма, падпісаная сенатарам Злучаных Штатаў Амерыкі Бары Галдуотэрам, у Сімферопальскім аддзяленні КДБ Украіны аказаўся не толькі Віл, а ўсе, апроч Асі і Аса, добраахвотныя памочнікі памежнікаў.

У тэлеграме было напісана: “Віншую дэпутата Маркача перамогай выбарах (клч). Жадаю поспехаў развіцці дэмакратыі (клч). Сенатар Галдуотэр”.

Тое, што тэлеграма прыйшла з сената ЗША, з Вашыгтона, а не пасланая нейкім жартаўнікам з Гурзуфа, сумненняў не выклікала: праверылі. І адразу пачалі правяраць паказанні грамадзяніна Маркача (старшынёй ён праз тую тэлеграму не стаў, рады быў, што не пасадзілі), у якіх былы старшыня (а новым старшынёй прызначылі намесніка дырэктара вінзавода, так што Палкоўнік дабіўся свайго) сцвярджаў, што музыканты гурту “Varjaty” вялі агітацыю за вяртанне Крыма ў склад Расіі, і што на канцэртах дазвалялі сабе антысавецкія выказванні, з якіх ён запомніў такое: «Дзве малпы, а сутнасць адна і тая».

Пасля запыту ў Белдзяржфілармонію аказалася, што ніякага гурту “Varjaty” не існуе. А па паказаннях таго ж Маркача гурт прадаваў на свае канцэрты квіткі. “Каб пасадзіць вас, – сказалі крымскія гэбісты, – нам і палітыкі не трэба. Так што кайцеся.”

Што гэбісты крымскія, што гэбісты мінскія…

А ў чым каяцца? Хіба ў тым, што Ася пабегла, пырскаючы крывёй на пясок, і ні я, ні Воран – ніхто не кінуўся за ёй услед? У тым, што Ас залез на вяршыню Коба-Кая, спусціўся і сказаў, што ўбачыў Асю ў моры за мысам Капчык, схапіў лодку, паплыў – і ні я, ні Палкоўнік, ніхто яго не спыніў? А тут наляцеў амаль што ўраганны вецер, пачаўся рэдкі для гэтай пары года шторм, мора на дыбы ўставала, выкідваючы на бераг з мешанінай божых каровак водарасці, палкі, карэнні, смецце – і выкінула вясло лодкі, на якой паплыў Ас… Ні выратавальнікі, ні памежнікі на сваім кацеры не змаглі ў такі шторм выйсці з бухты.

Я быў агаломшаны, прыгнечаны, раструшчаны тым, што сталася, пакутаваў віной перад Асяй і Асам, і мне было ўсё адно, што будзе са мной. Гэтаксама пачувалі сябе і Віл, і Воран, і Гарык, і Біг – усе. Мы не толькі выглядалі неадэкватнымі, мы такімі былі, і калі Палкоўнік у адказ на абвінавачванні прад'явіў даведкі, выдадзеныя ў псіхушцы, з якіх вынікала, што такімі, якімі мы выглядаем, мы і ёсць, крымскія гэбісты вырашылі не звязвацца з прыдуркамі – і назаўтра прад намі прадсталі маёр Гагарын і старшы лейтэнант Гурковіч. Ва ўсёй красе, бліскучыя.

Гурык знайшоў Асю. У Новым Свеце не было паліклінікі, Ася пабегла ў Судак, адкуль яе, амаль непрытомую ад таксікацыі, распухлую ад алергіі, на кацеры выправілі ў Феадосію, у шпіталь, дзе трымалі ў ізалятары, асцерагаючыся, што ў яе якая-небудзь небяспечная для ўсіх інфекцыя.

Аса Гурык не знайшоў, як не знайшлі яго ні выратавальнікі, ні памежнікі, ні крымскія гэбісты… Ніхто. Палкоўнік сказаў, што ён, можа быць, прычаліў недзе да берага і пайшоў па месцах баявой славы.

Можа быць.

Палкоўніка Гурык з маёрам Гагарыным забралі ў Мінск, а нас адпусцілі. "Прыедзеце, – сказаў маёр, – разбярэмся". І калі мы сталі збірацца дахаты, Ася, якая выйшла са шпіталя, зноў прапала. Гэтым разам не надоўга. Праз пару гадзін мы ўбачылі яе на вяршыні Коба-Кая. Не паверыўшы, што Ас недзе прычаліў да берага, Ася стаяла і глядзела ў мора. У белай сукні яна была, як мармуровая статуя, якую тысячы гадоў таму паставілі тут таўры ці скіфы, грэкі ці рымляне, каб выплывалі з туману, як на агонь маяка, караблі на пажар яе валасоў, і даплыўшы, любаваліся ёй заваёўнікі і арганаўты, і маліліся ёй, як багіні, каля ног якой ляжыць Новы Свет і, як сабачка, круціцца вецер…

Мы прывязалі да выкінутага на бераг вясла папярэчыну, паставілі крыж на месцы намёта, у якім жыў Ас, узялі гітары. Заспявалі: "It's a long way to Tipperary…" – і пачулі, як Ася там, дзе аблокі, анёлы ды божыя кароўкі,высока-высока заспявала з намі:

Up to mighty London
Came an Irishman one day
As the streets are paved with gold
Sure, everyone was gay
Singing songs of Piccadilly,
Strand and Leicester Square
Till Paddy got excited
And he shouted to them there…

Песня жаўнераў брытанскай арміі сплывала над морам за мыс Капчык – зусім у іншы бок ад Ціперэры, дзе марыў Пэдзі сустрэцца з Мэры.

Вуліца Залатога пылу

– А ты памятаеш, як праз цябе нас ледзь не расстралялі?.. – пытае Воран Гурыка, які прыехаў з Масквы на пахаванне Палкоўніка. Ён чакаў, што Ася прыедзе з Ізраіля Палкоўніка хаваць, але яна не прыехала.

Косця злуе на Гурыка – і Гурык злуе на Косцю. Учора, калі хавалі Палкоўніка, яны пабіліся.

На памінках яны сядзелі найдалей адзін ад аднаго. Гурык усім жаліўся, як яму кепска. Але не праз тое, што Палкоўнік памёр. На Палкоўніка яму напляваць, дастаў яго па жыцці Палкоўнік. Кепска Гурыку без Асі. Ён без яе не можа жыць – і не можа да яе паехаць. Не кажа, чаму. Проста не можа – і ўсё. Магчыма, таму што адстаўных гэбэшных генералаў не бывае.

Гурыку непрыемна згадваць, як праз яго нас расстраляць маглі – ён хоча ўспамінаць пра Асю.

Я кажу:

– Але ж і Асю маглі расстраляць.

– Ды не маглі! Каго расстралялі, каго? Цябе? Ворана? Віла?.. Вось калі б я багажнік тады адчыніў…

– І сам бы ваду зліў, – перабівае яго Віл. – Так што не круці нам мэйсы, нібы ты нас ратаваў.

Віл кожнаму, хто спрабуе яго, як ён думае, дурыць, кажа: “Не круці мне мэйсы!..” – а калі я спытаў аднойчы: “Віл, што такое мэйсы?..” – аказалася, што нічога.

Пахаваўшы ўчора Палкоўніка, мы сустрэліся сёння ў кавярні, каб паўспамінаць пра яго ды пра нас – калі яшчэ давядзецца?.. Па старой памяці дамовіліся сабрацца ў “Вясне”, але кавярня гэтая называецца цяпер інакшай, нічога былога, нічога нашага тут даўно няма – і нам няўтульна. Таму й размова няўтульная, і Эдзік Гарачы злосна кідае Гурыку:

– Мяне расстраляць маглі!

– Хто цябе мог расстраляць? Дзе?

– Вертухаі ў лагеры! Калі Алік забіў Кенэдзі! І пасля!.. Калі ўзбек адзін пабегчы ўздумаў! Яго паклалі на калючым дроце. Кум крычыць: “Усе па бараках!” Кум для зэка важней за начальніка, а я нібы не чую кума, сунуся да таго ўзбека… І тут дзве чаргі з аўтаматаў. Пад ногі і над галавой. Шапку драпанула. Каб на палец ніжэй… А хлопцы сапраўдныя ўцёкі рыхтавалі. Зрабілі падкоп. Адклалі праз узбека.

Пабеглі пазней. Пачатак красавіка, зямля адтала, асела – і яны не змаглі выпаўзці нават за нейтральную зону. Пастралялі ўсіх праз аднаго дурня. Вось як лёсы звязаныя. Не пабег бы дурань, збеглі б і засталіся жывымі разумныя.

"Не схавала б Нэла карабін..."

Эдзіка ўчора не было, ён толькі сёння дазнаўся, што Палкоўнік памёр, разнерваваўся, выпіў лішак, таму пераскоквае з аднаго на другое, а Гурык не пераскоквае:

– А пры чым тут я? Пры чым я да твайго ўзбека і да хлопцаў тваіх?

Эдзік нахіляецца да яго цераз стол:

– Пры тым! Ты да ўсіх пры чым! Разам з хеўрай! Вы толькі й рабілі, што ці стралялі, ці садзілі! Ваша кантора ледзь у вар'ятню нас не запёрла!

На хаўтурах учора пра такое казаць не выпадала, ціха пасядзелі, а вось сёння...

– Каго нас? – пытае, падымаючыся, Гурык. – Цябе там не было!

Эдзік падымаецца таксама – лоб у лоб з Гурыкам:

– Не было! Бо ў лагеры быў!

У лагеры Эдзік быў пазней, але якая розніца, калі быць у лагеры...

Відаць, як Эдзіку хочацца стукнуцца з Гурыкам лабамі, але ён стрымлівае сябе.

– Вось скажы: чаму ты, ведаючы пра гэта, нас не папярэдзіў? Толькі не кажы, што не ведаў!

Гурык кажа:

– Я не ведаў.

Я таксама пытаў Гурыка пра вар'ятню. Даўно, калі Палкоўнік з Эдзікам яшчэ сядзелі. "Калі б санітар, – спытаў я, – не пераблытаў, не ўкалоў мне ў вену тое, што колецца ў мышцу, калі б не мая клінічная смерць, выпусцілі б нас з вар'ятні, ці не?" І тады Гурык адказаў мне тое самае, што цяпер Эдзіку: "Я нічога пра гэта не ведаў".

– Ведаў! – глядзіць яму ў вочы Эдзік. – У, які ў цябе позірк гэбісцкі! Натрэніраваны, каб запудзіць.

– Пудлівыя вы ўсе, – адхіляецца ад Эдзіка і глядзіць на ўсіх Гурык. – Як Палкоўнік.

Воран падымае шклянку:

– За Палкоўніка!.. І ты нам, Гурык, пра яго не расказвай. Мы самі ведаем, які ён быў.

Як раней, так і цяпер Гурык хоча нам давесці, нібы ўсё, што рабіў Палкоўнік, ён рабіў са страху. Нават са страху жыў.

– Вось, паглядзі... – дастае з кішэні, разгортвае і падае Гурыку зашмальцаваны, яшчэ савецкі пашпарт Гарык Клябанаў. – Гэта ён дваццаць гадоў таму напісаў.

“Гарык! – уголас чытае Гурык запіс, які пачынаецца на першай стронцы ў графе нацыянальнасць і доўжыцца на старонцы, дзе стаіць штэмпель прапіска. – Калі б ты быў сапраўдны габрэй, ты б купіў пісталет, паехаў бы ў Маскву і стрэліў у задніцу старшыні КДБ Сямічаснага!”

– І што?.. – адкідвае Гурык пашпарт Гарыку. – Як ты пражыў дваццаць гадоў з гэтакім дакументам?

Гарык акуратна, як нешта дарагое, хавае пашпарт у кішэню.

– Жыў і баяўся. Ты б напісаў такое дваццаць гадоў таму?.. Ты пасадзіў бы на дваццаць гадоў за такое!

– У вар’ятню! – не можа супакоіцца Эдзік Гарачы.

Гурыка сёння ніхто не любіць. Дый раней не любілі. Баяліся. А яму хочацца, каб яго любілі. Ці хоць выгляд рабілі, нібы любяць. Ён жа не вінаваты, што ён гэбіст.

Учора на хаўтурах Гурык так і сказаў: “Палкоўнік не вінаваты, што ён антысаветчык. А я не вінаваты, што генерал КДБ. Проста калі ёсць адно, дык павінна быць іншае. Я мог быць Палкоўнікам, а Палкоўнік – мной”.

“Ага, – сказаў Віл. – Генералам”.

Гурык нават слязу пусціў, выпіўшы. “Ведаеце, за што я любіў Палкоўніка?.. Бо ён, можа, адзіны, хто любіў мяне...”

Гэта ўчора Гурык прыдумаў нападпітку. Ён не любіў Палкоўніка – і Палкоўнік яго не любіў. Палкоўнік увогуле не любіў нікога і нічога. Апроч, як ён казаў, чыстага розуму. І, можа быць, Асі... Хоць Ася – не чысты розум.

Але Асю і Гурык любіў. Кахаў. А яна кахала Палкоўніка, які памёр – і Ася не прыехала на пахаванне. А Гурык прыехаў. І ўчора на хаўтурах быў, і сёння застаўся. Разам з усімі... І глядзіць на ўсіх нас па чарзе, на тых, хто яшчэ жывы, і чакае падтрымкі, але ніхто яго не падтрымлівае, усе на баку Эдзіка, хаця той выпіў лішняе і пераскоквае з аднаго на другое.

– Я табе ўспомню! Усіх успомню, не толькі лагерных. Лёню Макаранку, Валеру Высоцкага, Віцю Лібенсона, Іллю Фраўчы, Алу Мельнікаву, Таню Барэйку...

– Таня з Алай пры чым? – не вытрымлівае Гурык. – Гэта ж проста вашы дзеўкі! Іх у ложках вашых расстралялі, га? У задніцы?..

– Файнберг... Як яе звалі, дачку акадэміка?.. – доўжыць, нібы не чуе яго, Эдзік. – Фаіна?..

– Фаня! – раптам цвёрда кажа Віл. – І досыць! Мы не для таго сабраліся. Вы хоць разумееце, што жыццё прайшло?

Ён так спытаў, што цяпер ужо не толькі Гурык – усё пагглядзелі адзін на аднаго. І я на ўсіх пагглядзеў. Якія ўсе… Не тое, што старыя – не тыя.

– Чаго гэта жыццё прайшло?.. – насупіўшыся на Віла, бо той нібыта заступіўся за Гурыка, пытае Воран. – Я вунь толькі-толькі ажаніўся, у мяне дачка яшчэ ў пялюшках.

Воран сапраўды нядаўна ажаніўся, і дачка ў яго нарадзілася. Ася. Жонка Ворана ўдвая за яго маладзейшая, ёй не да таго, каб разбірацца, чаму Воран дачку гэтак захацеў назваць. Ася дык Ася, хоць магла быць Кася. Чаму? Бо зараз модна дзяцей па-беларуску называць.

Я такога не заўважаў, але модна дык модна. Многае незаўважна змянілася.

На пахаванне Палкоўніка людзей прыйшло няшмат. А павінен быў бы прыйсці ўвесь горад праводзіць свайго вар'ята. Калі б многае незаўважна не змянілася.

Пахавалі Палкоўніка непадалёк ад Саламона Майсеевіча.

– Давайце да яго сходзім, – нечакана прапанаваў Гурык мне і Ворану, калі магілу Палкоўніка пачалі засыпаць. І пайшоў да магілы Саламона Майсеевіча з кветкамі, якія прынёс Палкоўніку.

Магіла Саламона Майсеевіча выглядала закінутай. Асі няма – няма каму дагглядаць.

– З'ехала… – паклаў Гурык кветкі на магілу. – Бацьку кінула, ніхто ёй не радня.

Ён азірнуўся наўкол, нібы шукаючы некага, хто б з ім пагадзіўся: “Ну, так… Кінула бацьку…” Але ні я, ні Воран з ім не пагадзіліся, а болей не было каму. Ніхто не пачуў Гурыка – не зварухнуўся ні пад шасціканечнымі крыжамі, ні пад шасцікутнымі зоркамі.

– Вернецца, – сказаў я. – Вунь месца сабе каля бацькі адгарадзіла.

Гурык нахіліўся, вырваў пук пустазелля.

– Тут маё месца.

Я паспрабаваў не здзівіцца, але мне гэта не ўдалося, як і Ворану, які, глянуўшы на Гурыка, прысвіснуў.

– Запомніце: маё! – Гурык дастаў з кішэні і сунуў мне ў рукі канверт. – Ты маладзейшы, нас усіх перажывеш. І тут мяне пахаваеш. Абяцаеш?

Я не ведаў, што адказаць. Не знаходзіў, куды падзець канверт, і глядзеў на Ворана. Той пацепнуў плячыма.

– Вось і дамовіліся, – не стаў чакаць майго адказу Гурык. – А за гэта я скажу Ворану, чаму ты пахаваеш мяне побач з Саламонам Майсеевічам…

Ён раптам страшным мне здаўся. Такім, як тады, калі дапытваў мяне і расказаў, як Саламона Майсеевіча не стала, і я, як і тады, папрасіў:

– Гурык, не трэба…

Ён зноў нахіліўся, каб вырваць пустазелле, але не стаў рваць, выцер далонь аб далонь.

– Бо я кончыў яго. Не ў патыліцу з пісталета, – выпрастаўся ён, убачыўшы, як напружыўся Воран. – На допыце яму стала кепска, відаць было, што сэрца, а я не паспяшаўся паклікаць доктара. Паклікаў ужо тады, калі…

Ён дагаварыць не паспеў – Косця на яго кінуўся:

– Сука!

Гурык ухіліўся, зрабіў падсечку і зваліў Ворана на магілу. Скочыў на яго, заламаў руку. Павярнуўся да мяне – страшны, злы:

– Ты хіба не казаў яму?

– Не…

– Чаму?

– Бо гэта ўсіх…

– Што ўсіх?..

– Нічога! Ты не казаў мне казаць…

– Сука! – вырываўся Косця, Гурык прыціснуў яму шыю каленам.

– Ты б чуў, што ён мне крычаў! Што я г…но, і ён не дазволіць мне смярдзець каля Асі! Што гэтага не будзе, пакуль ён жывы!

– Сука! – вывернуўся з-пад Гурыка Косця, і яны пачалі, качаючыся на магіле, біцца. Гэтаксама, як некалі ў рэстаране “Лета”. – Ты ж казаў, што яго ратаваў! Ася замуж за цябе… праз гэта…

– А ты хацеў, каб за цябе! Ты ўсё жыццё мне…

– За такога смердзюка… поскудзь…

– Праз каханне!.. Чуеш?.. Ты!.. Яна кахала мяне! Не цябе!

– Кахала?.. Ге-не-ра-ла! Чаму ж кінула?..

– Бо я сказаў ёй!

Косця ўдала патрапіў Гурыку ў сківіцу, замахнуўся яшчэ раз – і раптам апусціў кулак.

– Што ты ёй сказаў?..

Гурык сеў, памацаў пашчэнкі.

– Тое самае, што й табе. – Ён кіўнуў на мяне. – Што й яму некалі… І Асі нядаўна… Яна таксама біцца кінулася. Потым з’ехала ў Ізраіль. А я пакаяцца хацеў…

Косця сплюнуў – Гурык яму губу разбіў.

– Табе пакаяцца, як мне плюнуць.

Гурык падаў яму насоўку – Косця не ўзяў…

Дзіўнае яны жыццё пражылі. Не любячы, нават ледзь трываючы адзін аднаго, пражылі яго разам. І Ася, не кахаючы Гурыка, з ім жыццё пражыла…

Як мы ўсе жывём?

– Можаш пляваць, колькі хочаш… – схаваў насоўку ў кішэнь Гурык. – Распляваўся… Я што: павінен быў аддаць табе Асю? Ты б мне аддаў?.. І Саламон Майсеевіч аддаваць не хацеў. “Ася не будзе тваёй!..” І да мяне раптам дайшло, што так! Што не будзе!.. Ён упарты быў, Саламон. Сказаць, за што мы яго ўзялі? Вы думаеце: за байкі пра Леніна? Ха! Няхай бы баіў… Памятаеце, Ася ў Вену ездзіла? Чаго? Па кока-колу, якую яна пасмакаваць вам прывезла?.. Па сваіх справах яе Саламон паслаў! Яго самога мы не выпусцілі. Ён уваходзіў у міжнародную сіяніцкую арганіцыю з цэнтрам у Вене. Быў у Мінску яе прадстаўніком. За гэта сядзеў бы да смерці, калі б не памёр…

Гурык гарадзіў абы-што, я спытаў:

– У якую арганізацыю?

– У сіяніцкую, – адказаў за Гурыка Косця. – Як мы з табой у антысавецкую. – І зноў сплюнуў, у яго ўсё цякла кроў з губы. – Дык выходзіць, ты яго ўратаваў? А то ён сядзеў бы да смерці? Не ляжаў бы тут, дзе так хораша ляжыць… Скажы мне, Гурык: як ты ўсё гэта змог? І цяпер, пасля ўсяго, ты яшчэ хочаш легчы з ім побач?..

Гурык маўчаў, пастукваючы наском чаравіка ў схіл грудка, Косця павярнуўся да мяне.

– Можа, ты мне растлумачыш? Ты зразумеў, чаго ён хоча?..

Мне здалося, што зразумеў… Гурык хацеў быць з Асяй, якая некалі вернецца да бацькі. Вось так ён яе кахаў і кахае. Наўрад ці так кахаў яе Косця. Але сказаў я іншае.

– Ён пакаяцца хоча.

– Гэта я чуў… Ну, кайся, – цвіркнуў Косця крывёй пад ногі Гурыку, а той сказаў раптам, развёўшы рукамі над зоркамі і крыжамі, нібы тых, хто ляжаў пад імі, клікаў у сведкі:

– А няма ў чым…

І рушыў з могілак.

– Вы хоць разумееце, што жыццё прайшло? – спытаў у былой кавярні “Вясна”, дзе мы сабраліся Палкоўніка памянуць, Віл, і ўсе паглядзелі адзін на аднаго, а Піля сказаў: “Жыццё прайшло, але мы яшчэ ходзім…” – і прапанаваў па “Брадвэі” прайсціся ў гонар Палкоўніка ды нашай маладосці.

– А праўда што! – першы падняўся Віл, і ўсе пачалі падымацца, а Воран раптам падсунуўся бліжэй да Гурыка на вызваленае месца:

– Ты што ўчора пра Асю плёў?

Не трэба было яму падсоўвацца.

Гурык зірнуў на Косцю, як мне здалося, грэбліва. Як моцны на слабога.

– Табе так трэба, каб я сказаў? Ты ж здагадаўся…

– Скажы.

– Не плёў… Як ты думаеш, Косця: калі ў той час дачку чалавека, які падазраваўся ў антысавецкай дзейнасці, выпускалі за мяжу – што гэта азначаць магло? Маўчыш? Маўчыш, бо ведаеш… Мне сказалі завербаваць яе. І я згадзіўся, бо падумаў: калі бацька пойдзе пад суд, які лёс чакае дачку? Мяне, калі я буду з ёй?.. Гэта ж не з канторы, не з партыі выганяць – выкінуць з жыцця!.. І калі Саламону на допыце стала кепска, я падумаў: няхай. Нябожчыкаў не судзяць… Чакай-чакай, – прыціснуў ён да стала кулакі Ворана. – Паспееш. Слухай, калі захацеў. Ася вербавалася пад Амерыканца. Гэта ўжо калі Марына пад яго падкруцілася, вырашылі, што так нават лепш. – І Гурык зняў рукі з кулакоў Ворана. – Вось цяпер бíся…

Косця падняўся, апусціў кулакі, кіўнуў у той бок праспекта, дзе стаяла амаль насупраць кавярні будыніна КДБ.

– Не хадзі ты з намі. Ідзі да сваіх…

– З вамі не пайду, – наліў партвейну, які мы прынеслі с сабой, Гурык. – А сваіх у мяне няма.

Каля кавярні “Вясна” нас чакалі Эдзік Гарачы, Гарык Клябанаў, Віл, які сказаў: “Зараз астатнія падцягнуцца…” – і мы рушылі па нашым “Брадвэі”.

Якая кампанія!.. Я не сніў, не марыў!.. Як мы йшлі!.. Як стракатыя кашулі шапталіся ды скураныя шузы парыпвалі!.. “Брадвэй” рассцілаўся, расцякаўся перад намі, а мы па ім – культурненька, акуратненька. Не каля самых сценаў, але і не нахабна пасярод, каб не надта сучаснікам замінаць, суайчыннікаў не моцна раздражняць, бо яны не вінаватыя, што такія… І кожнаму, каго выпадкова зачэпім, нашае даруйце, прабачце, а вось жа ўсё адно ўслед нам: “Малпы! Дармаеды! Куды міліцыя глядзіць!..”

А вось яна, міліцыя, якраз на нас глядзіць… І ў скверы на вуліцы Камсамольскай, дзе помнік Дзяржынскаму, як стаяў, гэтак і стаіць, да нас падыходзіць. “Так… Вы сёння доўга тут?..” “А мы не ведаем! Сквер у колькі зачыняецца?” “Ты, Воран, глядзі! Дажартуешся!..” А што глядзець?” “А тое… Акуркі ў сметніцу кідаць!..” “Ёсць!” “Даказыраешся! Сустрэнемся яшчэ…”

Пагаварылі – і разышліся.

Нармальная міліцыя – гэта нармалёва. Горш – спецпадраздзяленні “Альфа” ці “Алмаз” з шокерамі. Ці АМАП, які налятае з дубінкамі. Вунь яны трох хлопцаў малоцяць, якія на спіне жалезнага Фелікса напісалі: КАТ. “Гэта ТАК напісана! – крычаць хлопцы, Кон, Грыц і Балік. – Вы не з таго канца прачыталі!..” Заблыталі амапаўцаў, якія прачытаць не могуць, КАТ ці ТАК? – і да нас. “Вы куды гэта, – пытаюць, – калі Саламон Майсеевіч каля яткі чакае? У яго сёння сіроп ананасны! Можна, мы з вамі?..”

Во як Кона, Грыца і Баліка АМАП перавыхаваў! Не тое што некалі брыгадміл… Нашымі сталі! Стылягамі!

Мы ідзем па Камсамольскай да Нямігі паўз 42-ю школу, дзе вучылася Ася і дзе раней, да рэвалюцыі, калі Камсамольская называлася Багадзельнай, а перад тым Феліцыянскай, на месцы школы была прыватная чатырохкласная габрэйская жаночая гімназія мадам Лявідавай-Нейфах, якую скончыла цётка Асі, сястра Саламона Майсеевіча прыгажуня Ада, у час вайны павешаная ў гестапа на вуліцы Астроўскага, якая некалі была і цяпер зноў стала вуліцай Ракаўскай, дзе жыве Якаў Барысавіч Мельцэрзон, які ў 42-й школе выкладаў фізіку і Косцю Ворану, і Ігару Гурковічу, і шмат каму яшчэ, але на фізіка вывучыўся толькі Жарэс Алфёраў, які стаў доктарам навук і нават Нобелеўскім лаўрэатам, хоць быў стылягам, насіў порткі-дудачкі ды кашулю з малпамі, у якой і стаіць ён каля школьнай брамы насупраць брамы КДБ, дзе турма “амерыканка”, і Віл крычыць яму: “Давай з намі, у Саламона Майсеевіча сёння сіроп ананасны!..”, – а Жарэс галавой круціць: “Не магу!..”, – нечым ён заняты, ну, канечне, Нобелеўскаму лаўрэату па фізіцы не да ананасных сіропаў, але з-за ягонай спіны Ас выскоквае: “Я з вамі!..”, – і, абагнаўшы ўсіх нас, ідзе паперадзе ў сваім генеральскім шынялі, бо дзе яшчэ ісці вайсковаму генералу, хай сабе і падвар’яцеламу, ён жа не гэбэшны генерал Гурковіч, які ўсё ж пацягнуўся за намі з кавярні, але, дайшоўшы да брамы КДБ насупраць школы, пастаяў, падумаў і павярнуў да сваіх, у двор, куды некалі завозілі нас, каб расстраляць за тое, што, як прыдумалі Гурык з маёрам Гагарыным, мы хацелі забіць Хрушчова, які не дапамог нам, як Воран яго ні ўгаворваў, зратаваць Нямігу, вуліцу, на якую мы выходзім, нібы патрапляем у даўжэзны калідор вялізнай камунальнай кватэры з драўлянымі і жалезнымі, кованымі брамамі і брамкамі, у якія проста так не зойдзеш, бо нехта, седзячы пры керагазе ці дыван выбіваючы, абавязкова спытае: “А вы да каго будзеце?..”, – і дзякуй Богу, што Саламон Майсеевіч нас заўважае, крычыць з акенца яткі: “Яны да

Мне тут товарищ Полянский рассказал… У него на свадьбе обсуждался этот вид искусства музыкального. И тоже какой-то молодой человек говорит, ну просто изрекает истину: «Мы, говорит, утратили мелодию». Это он уже говорит: «Мы – народ». За народ, значит, говорит, за общество, что оно утратило мелодию. Поэтому джазу дано сейчас развиваться. *(Пауза).* Может быть, это немодно, старорежимно… Но я человек по возрасту старорежимный… Мне нравится слушать, когда Ойстрах играет на скрипке. Почему мы сейчас должны пойти и взять на вооружение джазовскую музыку? Скажут, что это новшество.

А как тогда называется этот танец?.. Свист или вист? Твист? Ну а что это?!! Говорят, есть секта – трясуны. Да-да, есть такая. Трясуны!!! Я знаю это по произведениям чекистов. Они этим занимаются. Я их (трясунов) не видел, но они (чекисты) мне

докладывали, что это за секция… Говорят, там так танцуют!!! То есть до исступления, понимаете ли. Потом падают, понимаете ли. И это танец?!!

Почему мы должны отказаться от своего танца – народного? Я, так сказать, бродячий человек по своему положению в партии. Я уж не говорю: русские, украинцы. Возьмите узбеков, казахов, любые народы – танец у них плавный, красивый. А это, слушайте, это же неприлично!!!

Такие жесты делать определенными частями тела!!! Это неприлично в обществе. И это новое?!! Я считаю, товарищи, давайте все-таки постоим за старину. Да, за старину. Чтобы не поддаваться этому упадничеству. Я, черт, не знаю, какие тут слова употребить…

З даклада Прэзідыума ЦК КПСС на Кастрычніцкім пленуме ЦК КПСС

Не пазней за 13 кастрычніка 1964 г. Дакладчык – член Прэзідыума ЦК КПСС, намеснік старшыні Савета Міністраў СССР Д. С. Палянскі

Товарищи!

Суть дела состоит в следующем. За последние годы по вине тов. Хрущева у нас создалась нетерпимая обстановка. Тов. Хрущев, сосредоточив в своих руках неограниченную власть, обнаружил полное неумение, да и нежелание правильно пользоваться ею.

Тов. Хрущев особенно за последнее время вышел из-под контроля ЦК КПСС и его Президиума. Он возомнил себя непогрешимым, зазнался, стал претендовать, без всяких к тому оснований, на роль великого теоретика и практика марксизма-ленинизма. Для него теперь стали обычными высокомерие, грубость и нетерпимость к товарищам.

Все достижения партии и народа, победу ленинского курса в жизни нашего общества он приписывает не партии, а себе лично. На любом мало-мальски существенном мероприятии в нашей стране, на всем обязательно должно стоять клеймо: «Сделано Хрущевым».

Что касается методов и стиля, то характерным в этом отношении является практика его руководства работой Президиума ЦК КПСС. Такие «методы», как гневный окрик, командование, грубые нецензурные оскорбления, матерная брань, стали постоянной нормой его поведения. Так он нередко доводит товарищей до полной душевной депрессии. Он перестал считаться даже с элементарными приличиями и нормами поведения и так отвратительно сквернословит, что, как говорится, не только уши вянут, – чугунные тумбы краснеют. «Дурак, бездельник, лентяй, вонь, грязная муха, мокрая курица, дерьмо, говно, жопа» – это только «печатные» из употребляемых им оскорблений. А наиболее «ходкие», к которым он прибегает гораздо чаще, никакая бумага не выдержит и язык не поворачивается произнести. И это сыплется без разбора даже в присутствии женщин.

Короче говоря, тов. Хрущев стремится установить личную диктатуру, поставить себя над партией, над ее руководящими

органами, над всей страной. Теперь стало ясно, что партия имеет дело с человеком, который на место культа личности Сталина, по существу, выдвигает культ своей личности.

Ни для кого не секрет, что у нас создан и безмерно раздувается своего рода миф о якобы «великом десятилетии» в развитии нашей экономики. Доказывается, будто за 10 лет, в течение которых тов. Хрущев находится у власти, в хозяйственном развитии страны произошли чудеса. У нас вроде бы вот-вот наступит коммунизм. Разумеется, все мы могли только радоваться, если бы это было так. Но мы коммунисты и обязаны смотреть правде в глаза. В прошлом году в стране возникли серьезные трудности даже с хлебом. В связи с этим тов. Хрущев предлагал ввести карточную систему. И это через 20 лет после войны.

По воле тов. Хрущева мы шарахаемся в сельском хозяйстве из одной крайности в другую. Сегодня всюду, вплоть до северных районов, заставляем сеять кукурузу, а после того как обожглись на ней, потратили много средств и труда и ничего не получили – даем отбой. То кричим: внедряй в животноводство «елочку», то «елочку» долой – давай «карусель». Действительно, карусель получается!

Наша страна не раз оказывалась втянутой то в одну, то в другую ситуацию, при которой становилась очень близкой опасность войны.

Вспомните Суэцкий кризис. Тогда мы находились на волосок от большой войны! А на каком основании воевать? Ведь с Египтом у нас не имелось даже договора о взаимопомощи; не было и просьбы о помощи. Да и как можно было практически вступать в бой?

А пресловутый «берлинский вопрос»! При встрече тов. Хрущева с Кеннеди в Вене из-за этого вопроса дело дошло до такого накала, что Кеннеди заявил: «Если так пойдет и дальше, то погода в Европе в ближайшее время станет отвратительной». Он имел в виду войну.

Теперь о карибском кризисе. Тов. Хрущев самодовольно заявляет, что Сталину не удалось проникнуть в Латинскую Америку, а ему удалось. Только авантюрист может утверждать, будто в современных условиях наше государство может оказать реальную военную помощь странам этого континента. Ведь он отстоит от нас на расстоянии многих тысяч километров и отделен океанами. Как туда переправить войска, как снабжать их? Ракеты в этом случае не годятся: они сожгут страну, которой надо помочь, – только и всего. Спросите любого нашего маршала, генерала, и они скажут, что планы военного «проникновения» в Южную Америку – это бред, чреватый громадной опасностью войны.

В свете всего этого особенно ярко виден авантюризм политики в

отношении Кубы. Тов. Хрущев заявил, что если США тронут Кубу, то мы нанесем по ним удар. Он настоял на том, чтобы на Кубу были направлены наши ракеты. Это вызвало глубочайший кризис, привело мир на грань ядерной войны, это страшно перепугало и самого организатора столь опасной затеи. Не имея другого выхода, мы вынуждены были принять все требования и условия, продиктованные США, вплоть до позорного осмотра американцами наших кораблей. Но вы знаете, что поражение в карибском кризисе тов. Хрущев также выдает за победу. Более того, он и далее намерен идти той же дорогой, то есть путем авантюр. Недавно он членам Президиума ЦК заявил буквально следующее: «Надо заключить с Кубой договор о взаимопомощи. Будут кричать, что это авантюра. Ну и черт с ними – пусть кричат».

Откровеннее не скажешь.

Грубость и несдержанность, высокомерие и оскорбительные выражения он проявляет в беседах с руководителями братских стран. Мао Цзэдуна он публично назвал «старой калошей», тот узнал об этом и, конечно, пришел в ярость. В недопустимом тоне говорил он и с Георгиу Деж во время пребывания в Румынии, грубо вмешивался во внутренние дела румын. Недавно в беседе с Бен Беллой, этим лучшим другом Кастро, тов. Хрущев назвал Кастро быком, готовым броситься на любую красную тряпку. Настороженности социалистических стран в отношениях с нами немало способствует и то, что тов. Хрущев вынашивает планы добровольного присоединения к Советскому Союзу Болгарии и Монгольской Народной Республики.

Необходимо разобраться и в таком важном вопросе внешней политики нашей партии и государства, как оказание экономической и финансовой помощи другим странам. Хрущев стремится за счет интересов нашей страны быть добрым и этим завоевать себе авторитет. Результаты во многих случаях оказались плачевные: съев то, что мы им дали, руководители некоторых из этих стран отвернулись от нас. Вот несколько примеров. В Гвинее с помощью СССР построен аэродром, консервный и лесопильный заводы, электростанция, радиостанция, холодильник, госпиталь на 500 мест, гостиница, политехнический институт, животноводческая ферма, ведутся геологоразведочные и изыскательские работы. А сколько туда поставлено машин и оборудования! И все это брошено псу под хвост. Так называемый социалист Секу Туре вышиб нас оттуда и даже не разрешил пользоваться при полетах на Кубу аэродромом, который мы построили в Конакри.

Около 200 млн золотых рублей были отданы Индии, Эфиопии и

другим странам в порядке безвозмездной помощи, не считая огромных средств и оружия, выделенных для их вооруженных сил. В настоящее время общая сумма советских кредитов только для 20 развивающихся стран составила 3 млрд 400 млн рублей в новых деньгах.

Уместно сказать о зарубежных поездках тов. Хрущева. Только за прошлый год тов. Хрущев находился в поездках за границей и по стране 170 дней, а сейчас, когда 1964 год еще не закончился, он отсутствовал на работе 150 дней. Если к этому добавить, что в 1963 году им было проведено 128 парадных приемов, обедов и завтраков, т. е. каждый третий день, то сколько же времени остается на работу?

Он ездит с огромной свитой, причем в отдельные поездки берет, кроме родственников, много других людей. Например, в США с ним ездили 150 человек. В каждую поездку он берет дорогостоящие подарки: самолеты, автомашины, меха, ружья по спецзаказу и т. п. Иногда дает их людям недостойным. Например, Секу Туре подарил «Ил-18». В Египет повез две автомашины «Чайка», автомашины «Москвич» для детей Насера и другие. Там в свою очередь подарили автомашины ему и жене, дочери и зятю.

Разрешите на примере поездки в Египет показать крайнее своеволие тов. Хрущева. Перед его отъездом на Президиуме был поднят и вопрос о присвоении Насеру звания Героя Советского Союза. Все высказались против. Казалось, вопрос решен. Вдруг с дороги – шифровка: «Насеру надо присвоить звание Героя. Пусть Георгадзе вылетает в Каир с наградой». Все были поражены, за какие заслуги присваивать Насеру столь высочайшее звание? Довод: Насер будто бы строит социализм. И какой это будет социализм? Сам Насер не раз заявлял, что это социализм «во имя Аллаха, великого и всемилостивого», а «основы» его заложены якобы в Коране.

Пока висела смертельная опасность в Суэце, Насер – наш друг. Миновала гроза, и послышались другие песни. «Мы разгромили врага с помощью Аллаха», – заявлял он, а про нас забыл. И вот этому-то деятелю Египта вручается орден Ленина и Звезда Героя Советского Союза!

Престижу нашей дипломатии и государства тов. Хрущев наносит существенный вред и тем, что попирает элементарные нормы международного этикета. На заседании Организации Объединенных Наций он снял ботинок и стал стучать им по столу в знак протеста. Это позорное поведение он и до сих пор выдает за доблесть. Или вспомните, как премьер реагировал на пресс-конференции в Париже на то, что какие-то личности что-то выкрикнули из зала. «На три

метра в землю вобьем», – кричал он тогда во всеуслышание.

Позвольте рассказать о том, как тов. Хрущев исполняет свои прямые обязанности. Скажу прямо: он в последнее время, по существу, забросил их. Тов. Хрущев любит заявлять, что у нас много замечательных кадров, а сам занял все посты – он и Первый секретарь ЦК партии, и Председатель Совета Министров Союза, он и Председатель Бюро ЦК КПСС по РСФСР, и верховный главнокомандующий, он и КГБ ведет, и МИД, и Министерство обороны.

Таковы, товарищи, факты. Тов. Хрущев всерьез убежден, будто он выше, умнее и дальновиднее всех. Везде ему хочется играть главенствующую роль: в тяжелой промышленности – Главного металлурга, в сельском хозяйстве – Верховного агронома и животновода, строительстве – Генерального архитектора и т. д. и т. п.

Хрущев все время утверждает, что он ленинец и будто бы делает все для народа. А посмотрите, сколько в его семье автомашин! Сын имеет их 4, зять – 2, жена и дочь поскромнее – по одной машине. Кроме того, за семьей закреплено еще 4 машины. В составе обслуживающего персонала и охраны насчитывается 110 человек. Вот вам и «ленинская скромность и простота».

А до чего падок этот «ленинец» на награды и подарки – трудно даже представить! Он берет их ото всех: и от трудящихся, и от капиталистов. Наград нахватал столько, что их ему уже и вешать некуда.

До какой степени тов. Хрущев зазнался и как много о себе возомнил, говорит тот факт, что в последнее время он позволяет себе неуважительно отзываться даже о Ленине, допускает нападки на него. На одном большом приеме, где было около двух тысяч человек, и среди них много иностранцев, он заявил, что Великую Октябрьскую революцию (а ею руководил Ленин) будто бы совершили не рабочий класс и вооруженные солдаты, а бабы. Что это такое, как не попытка принизить роль Владимира Ильича и вознести себя! Как только язык поворачивается произносить такие кощунственные слова!

В этом свете надо критически оценить и позицию тов. Хрущева в борьбе против культа личности. Разве можно изображать Сталина только шизофреником, маньяком и диктатором, действовавшим лишь с помощью топора и плахи? В связи с этим возникает законный вопрос: а не в целях ли самовозвеличения поступает так тов. Хрущев. Уж очень похоже на это! Кстати, в последнее время он все чаще сопоставляет себя со Сталиным. И это настораживает: сегодня только сравнивает, а завтра и на другое потянет.

Встает вопрос: как же выйти из создавшейся обстановки. Мы считаем, что есть единственно правильный способ исправить положение – поступить так, как советовал Ленин.

Помните, он писал по адресу Сталина о том, что этот человек «становится нетерпимым в должности генсека, поэтому, – указывал Владимир Ильич, – я предлагаю всем обдумать способ перемещения Сталина с этого места и назначить на это место другого человека».

Как видите, другого способа борьбы с такого рода явлениями, кроме перемещения, Ленин не видел.

Таким образом, практические меры, которые необходимо предпринять и которые вносятся сейчас на ваше рассмотрение, сводятся к следующему:

1. Освободить тов. Хрущева Н. С. от обязанностей Первого секретаря ЦК КПСС, члена Президиума ЦК КПСС, Председателя Совета Министров СССР и Председателя Бюро ЦК КПСС по РСФСР.

(АГТ РФ. Ф. 3. Оп. 67. Пакет № 223. Подлинник. Машинопись. Опубликовано: Вестник Архива Президента Российской Федерации. 1998. № 2. С. 102–125).

Фальклор (сярэдзіна 60-х)

Товарищ, верь! Придет она —
На водку старая цена!
И на продукты будет скидка,
Ушел на пенсию Никитка!

Хроніка падзей пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя – апошніх гадоў хрушчоўскай адлігі

1960.02.09. Усесаюзная нарада кукурузаводаў.

1960.03.16. Прывітальная тэлеграма М. С. Хрушчова малодшаму сержанту Зіганшану, радавым Паплаўскаму, Кручкоўскаму і Фядотаву ў сувязі з гераізмам, праяўленым імі ў час 49-дзённага плавання ў Ціхім акіяне.

1960.03.16. Тэлеграмы Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова прэзідэнту ЗША Д. Эйзенхаўэру і мэру горада Сан-Францыска Дж. Крыстоферу з падзякай за выратаванне чатырох савецкіх вайскоўцаў у Ціхім акіяне.

1960.05. 01. У небе над Свярдлоўскам савецкай ракетай збіты амерыканскі самалёт-разведчык “У-2”.

1960.05.04. Пастанова Савета Міністраў СССР аб грашовай рэформе (замене старых грошай на новыя ў суадносінах дзесяць да аднаго).

1960.05.05. Пастанова Вярхоўнага Савета СССР аб вызваленні К. Я. Варашылава ад абавязкаў Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Пастанова аб абранні Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева.

1960.05.11. Прэс-канферэнцыя міністра замежных спраў СССР А. А. Грамыкі ў звязку з парушэннем амерыканскім самалётам паветранай прасторы СССР.

1960.05.13. Гутарка М. С. Хрушчова з савецкімі і замежнымі журналістамі на выставе рэшткаў збітага амерыканскага самалёта “У-2”, які парушыў паветраную прастору СССР.

1960.07.17. Сустрэча кіраўнікоў партыі і ўраду з прадстаўнікамі савецкай інтэлігенцыі.

1960.08.19. Запуск другога касмічнага карабля з жывымі істотамі (сабакамі) на арбіту спадарожніка Зямлі.

1960.09.17. Адказ на ноту ўрада ЗША ў звязку з пратэстам Савецкага ўраду супраць спробы ўстанавіць дыскрымінацыйныя меры ў адносінах да кіраўніка дэлегацыі СССР на 15-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН М. С. Хрушчова.

1960.09.23. Прамова і заява кіраўніка савецкай дэлегацыі М. С Хрушчова на 15-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

1960.11.17. Урачыстае адкрыццё ў Маскве Універсітэта дружбы народаў.

1960.12.01. Запуск трэцяга касмічнага карабля з жывымі істотамі (сабакамі) на арбіту спадарожніка Зямлі.

1961.01.14. Нота пратэсту ўрада СССР ўраду ЗША ў звязку з правакацыйнымі дзеяннямі амерыканскіх ваенных караблёў у нейтральных водах Карыбскага мора ў адносінах да савецкага танкера “Свярдлоўск”.

1961.01.20. Віншавальная тэлеграма Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова і Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева Прэзідэнту ЗША Дж. Ф. Кэнэдзі ў звязку з інаугурацыяй.

1961.02.10. Пратэст урада СССР ураду Францыі ў звязку з нападзеннем над водамі Сяродземнага мора французскага ваеннага самалёта на савецкі грамадзянскі самалёт, на борце якога знаходзіўся Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Л. І. Брэжнеў.

1961.02.14. Заява савецкага ўрада ў сувязі з забойствам Патрыса Лумумбы.

1961.04.12. Першы ў гісторыі чалавецтва запуск касмічнага карабля з чалавекам на борце – грамадзянінам СССР Ю. А. Гагарыным.

1961.04.23. Пасланне Прэзідэнта ЗША Дж. Кенэдзі Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчову і пасланне М. С. Хрушчова Прэзідэнту Дж. Кенэдзі ў звязку з узброенай прысутнасцю СССР на Кубе.

1961.06.17. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагародзе Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў СССР, двойчы Героя Сацыялістычнай Працы М. С. Хрушчова ордэнам Леніна і трэцім залатым медалём “Серп і Молат” за выключныя заслугі ў кіраўніцтве па стварэнні і развіцці ракетнай прамысловасці, навукі і тэхнікі.

1961.07.25. Сусветны фестываль моладзі ў Маскве.

1961.08.06. Запуск на арбіту спадарожніка Зямлі касмічнага карабля “Усход-2” з пілотам, лётчыкам-касманаўтам Г. С. Цітовым.

1961.08.31. Заява ўрада СССР аб узнаўленні эксперыментальных выпрабаванняў ядзернай зброі.

1961.09.01. Паведамленне аб стварэнні Інстытута савецка-амерыканскіх адносінаў.

1961.10.17. Адкрыццё XXII з’езду КПСС, які прыняў новую Праграму (“Сённяшняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пра камунізме!”) і новы Статут КПСС.

1961.10. 30. На Новай Зямлі выпрабавана 58-мегатонная вадародная бомба (“кузькіна маць”).

1962.02.15. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб

узмацненні адказнасці за замах на жыццё, здароўе і годнасць супрацоўнікаў міліцыі і народных дружыннікаў.

1962.04.04. Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прымяненні мераў уздзеяння за злоснае непавінавенне законнаму распараджэнню або патрабаванні супрацоўніка міліцыі або народнага дружынніка.

1962.06.01. Зварот ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР да ўсіх рабочых, калгаснікаў, савецкай інтэлігенцыі, да ўсяго савецкага народа ў сувязі з Пастановай Савета Міністраў СССР аб павышэнні з 1 чэрвеня 1962 года коштаў на мяса і масла.

1962.08.11. Запуск на арбіту спадарожніка Зямлі касмічнага карабля “Усход-3” з пілотам, лётчыкам-касманаўтам А. Г. Мікалаевым.

1962.08.12. Запуск на арбіту спадарожніка Зямлі касмічнага карабля “Усход-4” з пілотам, лётчыкам-касманаўтам П. Р. Паповічам.

1962.08.23. Паведамленне Міністэрства абароны СССР аб скасаванні камендатуры гарнізона савецкіх войскаў у Берліне.

1962.10.16. Запуск новай шматступеннай ракеты-носьбіта для касмічных аб’ектаў у раёне цэнтральнай часткі Ціхага акіяна.

1962.10.24. Заява Савецкага ўрада ўсувязі з беспрэцэдэнтнымі агрэсіўнымі дзеяннямі ЗША, якія фактычна сталёўваюць марскую блакаду Рэспублікі Куба.

1962.10.27. Пасланне М. С. Хрушчова прэзідэнту ЗША Дж. Кенэдзі, копія в. а. генеральнага сакратара ААН У Тану. М. С. Хрушчоў паведаміў прэзідэнту ЗША, што ён з задавальненнем азнаёміўся з яго адказам У Тану, у якім выяўляецца гатоўнасць прыняць меры, неабходныя для таго, каб выключыць судотыкі савецкіх і амерыканскіх караблёў у Карыбскім моры і тым самым пазбегнуць фатальных наступстваў.

1962.10.28. Тэлеграма М. С. Хрушчова У Тану аб тым, што ўрад СССР прымае ягоную прапанову і дае ўказанне капітанам савецкіх суднаў, якія знаходзяцца на подступах да Кубы, але яшчэ не ўвайшлі ў зону піяцкіх дзеянняў амерыканскіх караблёў, трымацца ў баку ад раёна перахопу.

1962.10.28. Пасланне Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова прэзідэнту ЗША Дж. Кенэдзі ў адказ на ягонае пасланне ад 27 кастрычніка 1962 г.

1962.11.22–26. Знаходжанне ў Рэспубліцы Куба першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР А. І. Мікаяна для абмену меркаваннямі з прэм’ер-міністрам рэвалюцыйнага ўрада Кубы Ф. Кастра ды іншымі кубінскімі кіраўнікамі па пытаннях міжнароднага становішча.

1962.11.27. Пастанова ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР аб стварэнні Камітэта партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

1962.12.24. Паседжанне Ідэалагічнай камісіі пры ЦК КПСС з удзелам маладых пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, творчых работнікаў кінатэатраў.

1962.12.29. Першы палёт транспартнага самалёта "ТУ-114" па трасе СССР – Куба.

1963.03.07. Прамова М. С. Хрушчова на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва.

1963.05.23. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза Фідэлю Кастра Рус.

1963.06.14. На арбіту спадарожніка Зямлі выведзены касмічны карабель "Усход-5" з пілотам, лётчыкам-касманаўтам падпалкоўнікам У. Ф. Быкоўскім.

1963.06.16. На арбіту спадарожніка Зямлі выведзены касмічны карабель "Усход-6", які ўпершыню ў свеце пілатуе жанчына-касманаўт Валянціна Церашкова.

1963.06.27. Нота МЗ СССР пасольству КНР у Маскве, у якой МЗ СССР патрабуе неадкладнага спынення беспрэцэдэнтнай практыкі нелегальнага распаўсюджвання супрацоўнікамі пасольства і некаторымі кітайскімі грамадзянамі ў СССР тэкстуліста ЦК КПК ад 14 чэрвеня 1963 г. у адрас ЦК КПСС. Паколькі МЗСК НР паспяшалася апублікаваць у друку сваю тэндэнцыйную версію па пытанні, аб якім ішла размова ў савецкай ноце, і дае скажонае тлумачэнне фактаў, МЗ СССР змушанае зрабіць у сувязі з заявай прадстаўніка МЗ СКНР неабходныя тлумачэнні.

1963.08.31. У адпаведнасці з дамовай, падпісанай 20 чэрвеня 1963 г. у Жэневе паміж СССР і ЗША, уведзеная ў эксплуатацыю прамая тэлеграфная сувязь кругласутачнага дзеяння паміж Масквой і Вашынгтонам (Крэмль – Белы дом).

1963.11.23. Тэлеграмы М. С. Хрушчова і Л. І. Брэжнева віцэ-прэзідэнту ЗША Ліндану Б. Джонсану ў сувязі са звесткай аб трагічнай смерці Прэзідэнта ЗША Дж. Ф. Кенэдзі.

1964.04.16. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні М. С. Хрушчову звання Героя Савецкага Саюза ў сувязі з 70-годдзем з дня нарадзінаў.

1964.04.30. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза прэзідэнту АНДР, генеральнаму сакратару партыі Фронт нацыянальнага вызвалення Алжыра А. БэнБэле.

1964.05.13. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза прэзідэнту ААР Гамаль Абдэль Насэру.

1964.05.13. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза першаму віцэ-прэзідэнту ААР Абдель Хакім Амеру.

1964.10.12. На арбіту спадарожніка Зямлі новай ракетай-носьбітам выведзены касмічны карабель "Усход" з экіпажам у складзе камандзіра карабля, лётчыка-касманаўта У. Камарова, навуковага супрацоўніка-касманаўта, кандыдата тэхнічных навук К. Феакцістава і доктара-касманаўта Б. Ягорава.

1964.10.14. Пленум ЦК КПСС задаволіў просьбу М. С. Хрушчова аб вызваленні яго ад абавязкаўПершага сакратара ЦК КПСС і Старшыні Савета Міністраў СССР па ўзросце і ў звязку з пагаршэннем стану здароўя.

Пленум ЦК КПСС абраў Першым сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжнева.

1964.10.15. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР задаволіў просьбу М. С. Хрушчова аб вызваленні яго ад абавязкаў Старшыні Савет аМіністраў СССР па ўзросце і ў звязку з пагаршэннем стану здароўя. Старшынёй Савета Міністраў СССР прызначаны А. М. Касыгін.

1971.09.11. Паведамленне ў газеце "Праўда" пра смерць пенсіянера саюзнага значэння М. С. Хрушчова.

Вуліца Уладзіміра Някляева

Пасляслоўе Віктара Ледзенева (Віла)

Ніколі не думаў, што давядзецца прачытаць раман, у якім буду адным з галоўных персанажаў. І вось давялося…

Дзіўнае адчуванне.

Як і аўтар рамана, я не мінчук, прыехаў у Мінск у жніўні 1961-га з Масквы, а ў Маскву – з Новасібірска. Быў я хакеістам, гуляў у камандах майстроў, але праз траўму мая спартыўная кар’ера завяршылася. У Мінску працаваў карэспандэнтам Усесаюзнага радыё і Цэнтральнага тэлебачання мой старэйшы брат (таксама прататып аднаго з персанажаў гэтага рамана), які і прапанаваў мне перавесціся з Маскоўскага педагагічнага інстутыта імя Леніна (быў яшчэ ў Маскве педагагічны інстытут імя Крупскай) у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Леніна. Так бы мовіць, з Леніна перавесціся ў Леніна, што нібы не павінна было стаць праблемай – і тым не менш праблемай стала: перавесціся не ўдалося. Таму я прыехаў, як і ўсе, здаваць уступныя экзамены ва ўніверсітэт – і ў гэты ж час прыехаў са Смаргоні здаваць уступныя экзамены ў Мінскі электратэхнікум сувязі Валодзя Някляеў. Вось тады я і ўбачыў яго на прыступках Тэатра юнага гледача, куды прыйшоў разам з Кімам Хадзеевым, Гарыкам Клябанавым ды іншымі персанажамі Мінскага рамана, з якімі пазнаёміўся ў нядзелю 6 жніўня ў скверыку на вуліцы Леніна.

Чаму праз столькі гадоў гэтак дакладна называю дату? Запомніў, бо святкаваўся Дзень чыгуначніка, а ён святкуецца менавіта ў першую нядзелю жніўня, якая ў 1961 прыпадала на 6-е. Так што пераносячы пачатак дзеі рамана ў 1960 год, аўтар храналагічна не надта дакладны, але ж гэта не дакументальны раман. Ва ўсякім разе, вы нідзе не знойдзеце дакументаў, якія б пацвярджалі, што жыў-быў у Мінску ў 60-х гадах дваццатага стагоддзя сваяк Уладзіміра Ільіча Леніна Саламон Майсеевіч Бланк, ці што грамадзянін ЗША Лі Гарві Освальд уваходзіў у антысавецкую групоўку, якая рыхтавала замах на жыццё Першага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў СССР таварыша Мікіты Сяргеевіча Хрушчова. Тым не менш, чытаючы пра гэта, я кожны раз лавіў сябе на адной і той жа думцы: няхай сабе так не было, але так магло быць. Верагоднасць развіцця падзей і ў тым накірунку, у якім

яны развіваліся рэальна, і ў тым, у якім развіў іх аўтар Мінскага рамана, прыблізна аднолькавая.

Пры ўваходзе ў Тэатр юнага гледача тоўпілася чалавек сорак. Каля крайняй правай калоны, прыляпіўшыся да яе так, што, здавалася, яго ўжо ніколі ад той калоны не адляпіць, бляненькі хлапчук у сіняй вельветавай куртачцы з замочкамі на кішэнях чытаў верш пра вайну. Нешта такое гераічнае… Не помню ні радка з таго верша, але помню, што Кім, у якога быў нюх на таленты, сказаў, што з хлопчыка можа быць толк. І, як аказалася, не памыліўся.

Пачаліся ўступныя экзамены. Я ва ўніверсітэт паступіў, а Валодзя ў электратэхнікум сувязі – не. Ён закахаўся ў дзяўчынку, якая жыла на Вакзальнай плошчы (у Мінскім рамане яе, "татарку Нэлу", аўтар перасяліў на вуліцу Савецкую), і працэс закаханасці ўвайшоў у неадольную супярэчнасць з працэсам здачы экзаменаў. Прычым, супярэчнасць гэтая выявілася не ўпершыню: па той жа прычыне ў 1960 годзе Валодзя не паступіў у геолагаразведачны тэхнікум у Кіеве. "У чатырнаццаць год «паступаць на геолага» паехаў у Кіеў, дзе драматычна закахаўся. Бляненькая такая, яснавокая… Не помню, як яе звалі, але помню, як мяне праз яе білі. Пяцёра таксама ў яе закаханых хлопцаў, з якімі жыў я ў адным інтэрнацкім пакоі. Старэйшыя за мяне, ужо пасля арміі… Закручвалі ў коўдру – і кедамі! Каб раскахаўся… Справіцца з імі было мне не па сіле, паскардзіцца не дазваляў характар. Трываў, колькі мог. Аднойчы закашляўся – на насоўцы кроў. Ну, думаю, рамантыка рамантыкай, каханне каханнем, а жыццё даражэй. Бывай, бляявая!..» – успамінае Някляеў у аўтабіяграфічным эсэ "Цуды ўсе ў адным адзіным цудзе".

Другім разам паступаць у электратэхнікум сувязі Валодзя не збіраўся, думаў паступаць у музычную вучэльню ў Маладзечна, але… Але, мяркую, вырашыла ўсё знаёмства з Нэлай і з намі – найперш з Кімам, да якога яго пацягнула не менш, чым да Нэлы: была ў знешне непрыцягальным Кіме ўнутраная прыцягальная сіла.

Пры знаёмстве з Кімам Хадзеевым многіх насцярожвала і нават палохала ягоная турэмная, "антысавецкая біяграфія". Мяне – не. У Сібіры я жыў у спецпасяленні для сем'яў "ворагаў народа" – там усе былі "турэмшчыкі і антысаветчыкі". У школу я пайшоў у Навасібірску (у спецпасяленні школы не было, да таго ж я хварэў на туберкулёз, хранічную хваробу дзяцей баракаў) адразу ў чацвёрты клас. Старшыня савета школьнай піянерскай дружыны біў мяне тварам аб парту: "Ты чаму не носіш гульштук?!." – і я адказваў: "Я ашыйнік не надзену!" Таму ў асяродку Хадзеева ў Мінску я знайшоў калі не блізкіх, дык зразумелых мне сваімі поглядамі і настроямі маладых

людзей. Чаго нельга сказаць пра Валодзю, для якога тое, што ён чуў ад нас, найперш ад Кіма, чытаў у нечытаных раней кнігах, было нечым накшталт землятрусу, які абрушваў ранейшыя ягоныя ўяўленні. Не магу сцвярджаць, што менавіта ў нашым асяродку фармаваўся ягоны светапогляд, але ўплыў усё ж быў.

Мы ўсе былі старэйшыя за Валодзю, для нас ён быў зусім хлопчыкам, які, саромеючыся і адчуваючы сябе сярод старэйшых не надта ўтульна, з'яўляўся ў нашай кампаніі зрэдку, кантактуючы пераважна з Кімам і са мной. З Кімам, таму што той быў гуру, а са мной, бо я займаўся радыёспортам. Зблізіла мяне з ім яшчэ тое, што ў нечым падобныя былі лёсы нашых быцькоў-франтавікоў: майго, рэпрасаванага, і ягонага, які цудам пазбегнуў рэпрэсій.

Валодзя хацеў стаць геолагам, музыкантам, баксёрам, паэтам, астраномам, касманаўтам, радыётэхнікам, але найбольш і найперш ён хацеў стаць стылягам! І ўявіце сабе смаргонскага “стылягу” ў вельветавай куртачцы і картовых штанах побач з мінскімі стылягамі ў портках-дудачках і стракатых кашулях пад шыракаплечымі пінжакамі… Адпаведна мы да яго й ставіліся: не заўважалі, часам нават крыўдзілі, але ён упарта не адступаўся ад нас – і не адступіў нават тады, калі “антысавецкай групоўкай Хадзеева” заняўся Камітэт дзяржаўнай бяспекі. Ён, 15-гадовы хлапчук (хоць і мы, 19-20-гадовыя, былі не нашмат старэйшыя) не меў да гэтай “антысавецкай групоўкі” ніякіх адносінаў, проста прыйшоў да Кіма па новую кнігу, а ў кватэру Хадзеева якраз з'явіліся “таварышы ў цывільным” з ператрусам. Яны й вырашылі: калі на хлопчыка, які чытае не тыя, якія трэба чытаць, кнігі, як след не паўздзейнічаць, дык хто яго ведае, што з яго выйдзе. Тым больш, што ў яго такі настаўнік…

Аднойчы, калі мы ўспаміналі тыя часы і, натуральна, Кіма Хадзеева, я спытаў Валодзю, ужо вядомага ўсім Уладзіміра Някляева: “Як ты думаеш, за што я адразу палюбіў Кіма?” І Валодзя адказаў нібы жартам, каб асабліва не ўдавацца ў сантыменты: “За тое, што Кім насіў берэт”. І ўгадаў! З часоў майго спецпасяленскага дзяцінства я насцярожана адносіўся на людзей у фуражках і паважаў (гэта ўжо асобная гісторыя: чаму?) тых, хто насіў берэты. Яны заўсёды аказваліся цікавымі, цудоўнымі людзьмі – і Кім Хадзееў не стаў выключэннем.

Аўтар Мінскага рамана ўбачыў і запомніў яго некалькі інакш, чым убачыў і запомніў я. Але знайдзіце вы чалавека, якога б усе ўспрымалі аднолькава? Хай сабе нават чалавека самага простага, а Кім быў самым няпростым чалавекам з усіх, каго я ведаў. І ўжо што-што, а гэтая якасць у характары Палкоўніка, ці Сысоя, як яшчэ

называлі Кіма, створаным у Мінскім рамане, відавочна выўляецца і ў ягоных адносінах да ўсіх астатніх персанажаў, і ў адносінах усіх астатніх персанажаў да яго. «Я кахала Косцю, але не так, як Палкоўніка, якога любіла, разумееш, любіла, як, можа быць, Бога трэба любіць, – спавядаецца гераіня рамана Ася. – Ён адзін ведаў столькі, колькі ўсе, і адзін сярод усіх быў вольны ў той савецкай турме, тады, у той час не баяўся, роўных яму людзей я побач не бачыла, таму прыйшла да яго аднойчы пад ноч і сказала, што гатова аддаць яму, такая дурненькая была, гатова аддаць яму ўсё, што маю, а ён засмяяўся: "А што ў цябе ёсць, апроч пыткі?" – я ўпершыню слова такое пачула: пытка. "Дык яна ў любой лярвы ёсць, але што ж, даеш, дык вазьму, кладзіся..." – і я лягла, а ён сказаў, што яму некуда схадзіць трэба, пайшоў, я да раніцы чакала, мяне ўсю клапы скусалі, бо ў ягоным ложку, ды які там ложак, матрац падраты з падратай коўдрай на падлозе, можа, толькі скарпіёнаў не было, а ён недзе цягаўся ўсю ноч, вярнуўся п'яны і спытаў: "Ты што тут робіш?.." – і калі я паўтарыла, што ён для мяне, як Бог, і я гатова аддаць яму ўсё, што маю, закрычаў: "Ідзі Гурыку ўсё аддай, у-ё-біш-ча!.." – і выпіхнуў мяне, голую, у калідор, следам адзежу кінуўшы..." Згадзіцеся, што не толькі кахаць, сябраваць, а проста быць побач, мець хоць нейкія адносіны з такім чалавекам складана.

Ася – выдумка аўтара, ягоная мроя. Ім самім, як Пігмаліёнам, створаная. Яна таксама, як і Палкоўнік, далёка не простая, але, пэўна, такая, якую аўтар Мінскага рамана хацеў бы спаткаць у сваім – шмат у чым фантастычным – горадзе і пакахаць. У кожнага хлапчука і мужчыны ёсць гэткая мара, – і ў той жа час Ася як бы зборны вобраз усіх тых дзяўчат, якія былі побач з намі, у якіх мы былі закаханыя. Цяпер, калі я ўспамінаю іх, яны ўсе здаюцца мне падобнымі на Асю.

Увогуле я не помню аўтара Мінскага рамана не закаханым. І кожны раз гэта было нечым вулканічным – з перападамі ад ясных зорак да цёмных нетраў. Калі ў яго з Нэлай урэшце не склалася, ён ледзь не кінуўся з маста ў Свіслач. Мы з Бігам (яшчэ адным персанажам Мінскага рамана) выплылі з-пад маста з труной у лодцы, труну ўзяўшы ў Рускім тэатры, а лодку на лодачнай станцыі: "Ну, давай! Кідайся!.." Гумар, нават такі чарнаваты, вельмі добры сродак супраць занадта рамантычных памкненняў.

Увогуле без жартаў, ці, як сёння кажуць, "прыколаў", не праміналa ў нашай кампаніі, бадай, ніводнага дня. Скажам, у тыя часы строга забаранялася што-небудзь дзе-небудзь распіваць, апроч як у кавярні ці рэстаране, і міліцыянты ганяліся літаральна за

кожным, хто выглядаў на вулічнага выпівоху, штрафавалі – і з тых штрафаў мелі прэміі. Мы заклаліся на скрыню "Гымзы" (было такое сухое віно) з іншай кампаніяй, што вып'ем навідавоку ў міліцыянтаў – і яны нас не затрымаюць і не аштрафуюць. І вось уявіце карціну: на трох лодках плывуць ад лодачнай станцыі да таго маста цераз Свіслач, з якога збіраўся кінуцца праз няшчаснае каханне будучы аўтар Мінскага рамана, маладыя джэнтльмены ў канацье, кашулях фасону "матылёк" і гэткага ж фасону гальштуках, а з імі маладыя ледзі ў аляпавата-каляровых сукенках са штучнымі кветкамі пад кітайскімі парасончыкамі – і гэтыя дзіўныя джэнтльмены з гэтымі дзіўнымі ледзі пад зайздроснымі позіркамі натоўпу, які сабраўся на мосце, шумна пра нешта размаўляюць, смяюцца, з нечым самі сябе віншуюць і распіваюць з крыштальных бакалаў савецкае шампанскае. Па мосце ўзрашана забегалі ў прадчуванні прэміі міліцыянты – і тут нейкі чалавек у натоўпе (наш, наўмысна намі дзеля гэтага пакінуты на беразе чалавек) пачынае крычаць: "Што вы стоўпіліся! Зараз мост абваліцца! Не бачылі, як кіно здымаюць!" – і міліцыянты самотна (бо калі кіно, дык, значыць, дазволена, і як аштрафуеш?) разыходзяцца разам з натоўпам…

Мы запускалі ў Свіслач кракадзілаў, хадзілі ў лазню з патэфонам, на Круглай плошчы пад гімн Савецкага Саюза тушылі Вечны агонь – чаго толькі ні было! Але ўсе нашы прыколы нішто ў параўнанні з прыколам КДБ, які раптам зляпіў з нас "антысавецкую групоўку"!

Мяне затрымалі каля трапа самалёта ў Маскву. Магчыма, падумалі, што я праз Маскву збіраюся збегчы ў Амерыку ўслед за Освальдам. Допытваў мяне ў КДБ чалавек, які назваўся Уладзімірам Іванавічам. Дапыт ён пачаў з пытанняў пра мае заняткі радыёспортам. Сваёй радыёстанцыі я ў той час яшчэ не меў, працаваў на калектыўнай, і, мусіць, нехта з "калектыву" радыёстанцыі праінфармаваў "калектыў" КДБ пра тое, з кім я звязваюся ў радыёэфіры. І Уладзімір Іванавіч спытаў, пільна гледзячы мне ў вочы: навошта я, просты, як сцвярджаю, хакеіст і радыёаматар, абмяркоўваў з каралём Іярданіі палітычную сітуацыю на Блізкім Усходзе? Я ні з кім не абмяркоўваў ніякай палітычнай сітуацыі ні на Блізкім Усходзе, ні на далёкім, мне ўвогуле тыя Усходы не да галавы былі, таму я нават не ведаў, што Уладзіміру Іванавічу адказаць. А тут яшчэ аказалася, што КДБ кантраляваў не толькі мае кантакты ў радыёэфіры, але і па тэлефоне: "18 снежня вам тэлефанаваў нейкі Васіль. Хто гэта, пра што была размова?.. 5 студзеня вам званіла Святлана. Яе адрас?.." І так допыт за допытам,

дзень за днём… На гэткіх самых допытах Барыс Галушка (выведзены ў Мінскім рамане пад мянушкай Біг), які меў дыягназ шызафрэніка і наперад ведаў, што яму нічога, апроч псіхушкі, не пагражае, да шаленства даводзіў свайго следчага тым, што пасля кожнага нязручнага пытання патрабаваў вывесці яго ў прыбіральню. “Калі не выведзеце, я зраблю вам лужу на дыване…”

“Лужай на дыване” можна назваць усё тое, што прыдумалі з “антысавецкай групоўкай” беларускія гэбэшнікі. І, мусіць, для таго, каб самім не сесці ў тую лужу, яны пасадзілі ў турму Кіма Хадзеева і Эдуарда Гарачага. Астатніх павыганялі з інстытутаў, з камсамола. Мяне таксама выключылі з камсамола, у якім я, між іншым, ніколі не быў.

Валодзя абышоўся страхам – яго раз ці два выклікалі ў КДБ і больш не чапалі. Дый што з яго, хлапчука, было ўзяць? Як, зрэшты, і з усіх нас, апроч хіба Кіма, які быў значна старэйшы і ўжо сядзеў у турме як антысаветчык. Мы не ведалі, што з намі будзе, і, канечне, баяліся.

На допытах я ўсё чакаў пытанняў пра Освальда, але ні мяне, ні некага іншага пра яго не распытвалі. Потым, абмяркоўваючы тое, што ў каго пыталіся і што хто адказваў, мы прыйшлі да высновы, што гэбэшнікі ведалі пра Амерыканца значна больш, чым мы. Але не Амерыканец найбольш нас цікавіў – не ён жа нас здаў. І не Палкоўнік, бо ён даваў паказанні, як і ўсе мы, ужо на допытах. Тады хто? “Хто сярод нас стукач?” – вось галоўнае пытанне ўсіх нашых абмеркаванняў. Яго задае і аўтар Мінскага рамана – і гэтаксама, як і ўсе, не дае адказу. Хоць усе падазравалі А.Б., які з’явіўся ў нашай кампаніі найпазней і як бы невядома адкуль: ніхто яго не запрашаў – сам прыйшоў. Ды падазрэнні так і засталіся падазрэннямі, з цягам часам развеяўшыся разам з залатым пылам нашага юнацтва.

Залаты пыл юнацтва, які лятае ў пранізанай святлом прасторы Мінскага рамана Уладзіміра Някляева, – галоўнае, што ў рамане ёсць. Хай не ўсё было так, як напісаў аўтар, але вось гэта: наша маладая рамантыка, чысціня нашых юначых парыванняў, сяброўства, кахання, музыкі, паэзіі – усё было так. І апроч смаку газіроўкі з сіропам, яшчэ адчуў я ў рамане смак паветра таго Мінску – Мінску пачатку шасцідзясятых, “апошніх гадоў адлігі, вясновы пах якой ледзьве даносіўся да Мінску з Масквы, перацякаў з левага берага Свіслачы на правы, ад Круглай плошчы да пляца Волі, блукаў па вуліцах Маркса і Энгельса, і, завіваючыся, губляўся ў псеўдаантычных калонах тэатра Юнага гледача…”

Не магу адмовіць сабе ў асалодзе яшчэ раз прайсціся разам з

аўтарам Мінскага рамана па вулках і завулках, вуліцах і плошчах нашага юнацтва! Па старой, якой ужо няма, Нямізе – хоць трохі, хоць квартал. “Старая Няміга – нават не вуліца, а даўжэзны калідор вялізнай камунальнай кватэры. Справа і злева – драўляныя і жалезныя, каваныя брамы і брамкі ў двары і дворыкі, у якія проста так не зойдзеш, бо нехта, седзячы пры керагазе ці дыван выбіваючы, абавязкова спытае: “А вы да каго будзеце?..” “Да Косці Ворана…” “Косця-я-я!.. – адразу ж прагалёкае на ўвесь двор, на ўсю Нямігу той, хто спытаў. – Шпэндрык да цябе нейкі!..” – і зноў зоймецца керагазам ці дываном, залаты пыл з яго выбіваючы, і нават не спрабуй даводзіць некаму ў тым пыле, што ты не шпэндрык. Не ведаюць цябе на Нямізе, значыць, шпэндрык.

А пад вуліцай Нямігай бяжыць Няміга-рака…”

Бяжыць – хоць і ў трубе – Няміга-рака, бяжыць час, бяжыць жыццё. Пад сярэдзіну 60-х мы з Някляевым згубілі адзін аднаго. Ён скончыў свой тэхнікум сувязі, паехаў на Далёкі Усход, на Поўнач. Я апынуўся ў Паўднёва-Усходняй Азіі – на в’етнамскай вайне. Вярнуўшыся ў Мінск, прафесійна заняўся журналістыкай. Валодзя паступіў у Літаратурны інстытут у Маскве – і нечакана, як і ў пачатку 60-х, зноў аб’явіўся ў пачатку 70-х. Яму было ўжо не пятнаццаць, а дваццаць пяць – і ён патэлефанаваў мне, шукаючы працу. Я працаваў тады ў рэдакцыі газеты “Знамя юности» разам з Валерыем Холадам, у якога былі добрыя адносіны з галоўным рэдактарам, і па нашых рэкамендацыях Някляеў быў прыняты ў штат рэдакцыі. Праз шмат гадоў ужо па рэкамендацыі Уладзіміра Някляева, знакамітага паэта, я буду прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў, ён напіша прадмову да маёй кнігі… Але гэтая мая, якую вы чытаеце, прадмова (ці пасляслоўе, не ведаю, як яно выйдзе) – не аддзяка за колішнюю прадмову Някляева, зусім не. Гэта ўдзячнасць за наша юначае, якое паклалася праз лёс, сяброўства – і ўдзячнасць не ад аднаго мяне. Ад усіх нас, бо колькі разоў не толькі я, але і Біг, і Гарык збіраліся напісаць такую кнігу! А напісаў, не дачакаўшыся, калі яе напішам мы, Някляеў. За мяне напісаў, за Біга, за Гарыка – за ўсіх. Нават за Асю і за яе бацьку Саламона Майсеевіча, якіх да гэтай кнігі не было, а цяпер яны ёсць – і ўжо назаўсёды, як рэальныя людзі, застануцца разам з намі. Такі гэта цуд – сапраўдная літаратура.

І нарэшце вось пра што – дзе і калі яшчэ давядзецца пра гэта сказаць…

Шмат хто – і асабіста, і публічна – папракае Уладзіміра Някляева ў тым, што ён пайшоў у палітыку. Маўляў, гэта не для паэта. Прызнаюся, я таксама думаў: колькі ён страціць часу, колькі не

напіша вершаў, паэм, якіх за яго не напіша ніхто! Я ні ў чым не знаходзіў прычыны, па якой дзеля палітыкі можна было б ахвяраваць паэзіяй. Грошы? Ён заўсёды глядзеў на іх абы як. Амбіцыі? Ён цалкам задавальняў іх у творчасці. Улада? Ён ніколі яе не прагнуў. Тады што?.. Паўстагоддзя ведаючы Някляева, я разумеў, што прычына павінна быць – і ўрэшце знайшоў яе ў ягоным Мінскім рамане і ў тым, што за ім.

Мяркуючы па даце напісання, пачаты раман “Аўтамат з газіроўкай з сіропам і без” да турмы, у якую аўтара, кандыдата ў прэзідэнты Беларусі кінулі ў снежні 2010-га, а скончаны пасля турмы. Пасля таго, як яго ледзь не забілі… І дзе яго ледзь не забілі? На ягонай любімай Нямізе! І калі па тэлеканале “Еўраньюс” я ўбачыў Някляева, скрываўленага, на снезе, дык першае, што ўспомніў: на гэтым самым месцы, тут, дзе ў Нямігу ўпадае вуліца Калектарная, калісьці нас, стылягаў, білі брыгадмілы! Брыгада садзейнічання міліцыі. За што? Ды ні за што! За тое, што мы не так, як яны, апраналіся, не пра тое і не так, як яны, размаўлялі, не так думалі. Нас білі за тое, што мы не такія, як усе…

“Наш (XX) век и политически, и социально, и культурно (даже в вопросах науки) был наглядным и почти непрерывным историческим доказательством безусловной вредности всяких претензий на всеобщность и всеобязательность каких бы то ни было убеждений, идей, верований и мнений”, – пісаў Кім Хадзееў у сваім філасофскім трактаце “Мы цяжарныя цывілізацыяй будучыні…” Пазбаўляе нас ад прэтэнзій на ўсеагульнасць і ўсеабавязковасць толькі грамадства, якое арганізаванае як “договорное содружество с вольным выбором каждой личности и каждой группы. Личность и Человечество – две равнозначные и равноправные силы, а вся социальная организация общества – лишь инструмент их взаимодействия и гармонизации”.

Вось з чаго выйшаў Някляеў.

Прамінула амаль паўвека, брыгадмілаў змянілі амапаўцы, спецназаўцы. За што яны напалі на кандыдата ў прэзідэнты Някляева і ягоных паплечнікаў? Ды па сутнасці за тое самае, за што некалі на нас напалі брыгадмілы!

Змянілася Няміга – не змянілася нічога наўкол яе. Такое не можа доўжыцца бясконца… Гэта і ёсць тая, бадай, адзіная прычына, па якой дзеля палітыкі можна ахвяраваць паэзіяй. Някляеў пайшоў на гэта – і тут жа, прабачаючыся, стаў перад паэзіяй на калені, напісаўшы ў турме, дзе займеў волю ад волі, ад выбару, такую паэму, якая нават для яго, паэта неверагоднай энергетыкі, неверагодная.

Ён неверагодны чалавек – мой даўні сябар Уладзімір Някляеў. Як

у жыцці, гэтак і ў літаратуры, у рэальных дзеях і ў фантазіях. А яны, рэальнасць і фантазіі, амаль адно і тое, што я магу засведчыць, пражыўшы не малое жыццё, у якім іншым разам перападала шклянка газіроўкі з сіропам, але часцей – без.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2016
© PDF: Камунікат.org, 2016